ARCHE Зьмест № 1’03 РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ

1. Зьмест / Уводзіны
2. Прадмова. Валерка Булгакаў у ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
3. Апытаньне ў ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
4. Расійская школьная гісторыя. Мікалай Паўловіч у ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
5. Тэзы пра былую й цяперашнюю Расею. Ален Бэзансон у ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
6. Не генацыд, а зьверская манера. Размова з Жоржам Ніва ў ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
7. Імпэрыя як дыскурс. Мікола Рабчук у ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
8. Беларускія СМІ ў 2002 годзе. Андрэй Дынько ў ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
9. Круглы стол. Чатыры новыя выданьні ў ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
10. Нічога ня мае быць дарожшага над вольнасьць. Натальля Якавенка ў ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
11. Штурханьне ўбок. Аляксей Бацюкоў у ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
12. Словы, якіх я чакаю. Наталка Бабіна ў ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
13. Мініятуры. Леанід Маракоў у ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
14. Паэты і паэзія. Усевалад Гарачка ў ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
15. Наконт фашызму. Максім Шчур у ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
16. Ваўкі — па сьведчаньні дрэў… Алесь Макрацоў у ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
17. Парнаграфія. Віталь Стахіевіч у ARCHE 1(24)-2003.

"РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
18. Журавіны. Мікола Нікановіч у ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
19. Памяці маці. Юлія Андрэева ў ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
20. Новае выданьне па гісторыі Беларусі. Уладзімер Сакалоўскі ў ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
21. Фарфалкі старапольскія. Андрэй Хамярліньскі-Дзеражыньскі ў ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
22. Лісты Яна Станкевіча да Антона Адамовіча. (Працяг) у ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
23. Літаратура і рынак: лепш пазьней ці ніколі? Васіль Аўраменка ў ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"
24. Шоў я плошчаю аднойчы, ды крывымі вечарамі…. Вінцэнт Масіяш-Крывавячэрскі ў ARCHE 1(24)-2003. "РАСЕЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ"."…"

[illegible]ізм

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (24) – 2003**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум

Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

Расейскае пытаньне

[image] [image] [image]

аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

З ь м е с т

Валерка Булгакаў. **Прадмова**

расейскае пытаньне

Апытаньне «Arche»:

1. Ці застаецца Расея імпэрыяй? 2. Ці чакае Расею распад?

Мікалай Паўловіч. **Расійская школьная гісторыя**

Ален Бэзансон. **Тэзы пра былую й цяперашнюю Расею**

гутарка

Не генацыд, а зьверская манера. Размова з Жоржам Ніва.

гуманістыка

Мікола Рабчук. **Імпэрыя як дыскурс**

мэдыі

Андрэй Дынько. **Беларускія СМІ ў 2002 годзе**

Круглы стол. Чатыры новыя выданьні

рэцэнзія

Натальля Якавенка.

Нічога ня мае быць дарожшага над вольнасьць

крытыка

Аляксей Бацюкоў. **Штурханьне ўбок**

гісторыі

Наталка Бабіна. **Словы, якіх я чакаю**

запісы

Леанід Маракоў. **Мініятуры**

Усевалад Гарачка. **Паэты і паэзія**

беларуская думка

Максім Шчур. **Наконт фашызму**

лірыка
Алесь Макрацоў. **Ваўкі — па сьведчаньні дрэў…**
Віталь Стахіевіч. **Парнаграфія**
архіў
Мікола Нікановіч. **Журавіны**
сьветліня
Юлія Андрэева. **Памяці маці**
спавешчаньні
Уладзімер Сакалоўскі. **Новае выданьне па гісторыі Беларусі**
вожык
Андрэй Хамярліньскі-Дзеражыньскі.
Фарфалкі старапольскія
ліставаньне
Лісты Яна Станкевіча да Антона Адамовіча. (Працяг)
водгукі
Васіль Аўраменка.
Літаратура і рынак: лепш пазьней ці ніколі?
Вінцэнт Масіяш-Крывавячэрскі.
Шоў я плошчаю аднойчы, ды крывымі вечарамі…

[image]
[image]

№ 3 (23) – 2002

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн і майстраваньне: **mk**
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/02/17
[image]

Валерка Булгакаў

Прадмова

Аднаго разу я наіўна запытаўся ў сваіх знаёмых немцаў аб беларусах, што апыналіся ў Нямеччыне: скажэце, а ці можна іх вылучыць з агульнага натоўпу? Скажэце, ці неяк адрозніваюцца яны ад астатніх? Мо паводзяцца інакш? Мо выдаюць сябе гаворкай? У адказ мае эўрапейскія сябры звычайна пацiскалі плячамі і мармыталі нешта няўцямнае: ну, беларусы сябе выдаюць ружовымі нумарамі на сваіх аўтамашынах. Яны давалі зразумець, што для эўрапейцаў беларусы застаюцца нацыяй без хоць якіх нацыянальных рысаў, нацыяй без уласьцівасьцяў.
Аднак бадай супольная для ўсіх беларусаў нацыянальная рыса такі ёсьць — пакланеньне перад Расіяй. Расія прысутнічае ў рыторыцы нашых палітыкаў, маячыць у плянах нашага эканамічнага разьвіцьця, не зьнікае са старонак нашых газэт. У нядаўнім навагоднім віншаваньні народу прэзыдэнт Лукашэнка, які па-майстэрску ўмее разыгрываць “расійскую карту”, зноў пацьвердзіў курс на будаўніцтва раўнапраўнага саюзу з “братняй Расіяй”. У прапагандзе лукашэнкаўскага рэжыму курс на аб’яднаньне з Расіяй займае пачэснае месца

недзе нароўні з “забесьпячэньнем станаўленьня здаровай і адукаванай нацыі” і “павышэньнем узроўню мэдыцыны ў краіне”.
Расію абагаўляюць, Расію ненавідзяць, з Расіяй змагаюцца, Расіяй захапляюцца — адным словам, Расіі пакланяюцца. Для адных Расія — краіна найвялікшай у сьвеце культуры, цэнтар сусьветнай цывілізацыі, аплот сапраўднай, не заплямленай Захадам духоўнасьці, вечная пуцяводная зорка, сьвятло якой сагравае нашы душы. Для другіх Расія — увасабленьне пекла на зямлі, дэманічная тэрыторыя, краіна, дзе пануе нечуваны на плянэце гвалт і бяспраўе, а хрысьціянства выродзілася ў напаўпаганскую сэкту з складанай абраднасьцю.
Расія займае асаблівае месца ў нашай карціне сьвету. Беларускае тэлебачаньне ў зводках навін падае інфармацыю асобна пра Расію і пра астатні сьвет, тым самым умацоўваючы асаблівы статус гэтай краіны ў нашай сьвядомасьці. Калі мая суседка ў тралейбусе кажа, што ездзіла ў Маскву купляць пыласос, я гэтаму не зьдзіўляюся: насамрэч яна ездзіла пакланіцца сталіцы свайго культурнага сьвету, чароўнага і прывабнага, як менскі дзяржцырк для дзетак зь Петрыкаўскага раёну.

Тая Расія, якая прысутнічае ў нашым мысьленьні, часам вельмі далёкая ад рэальнай расійскай дзяржавы. Гэтую першую Расію, Расію глянцавую, нам прэзэнтуюць літаратурныя творы, тэлевізійныя перадачы і вокладкі дарагіх часопісаў. Матэрыялізацыя гэтага ідэалу ў Расіі рэальнай ня можа не засмучаць, таму пра яе стараюцца ня згадваць. Сапраўды, каму хочацца згадваць пра зьнявечаную сацыяльнымі экспэрымэнтамі, эканамічна адсталую тэрыторыю, на якой не сьціхаюць крывавыя міжнацыянальныя канфлікты?
Расія ў нашай сьвядомасьці прысутнічае як раскручаны рэклямай брэнд, у падтрыманьне спажывецкай прывабнасьці якога робяцца ўсё новыя і новыя інвэстыцыі. Лібэральная прэса стракаціць загалоўкамі ў дусе “Расія вучыць нас рэформам”. Хоць, здаецца, нават ідыёту павінна быць ясна, што менскі рэжым, праводзячы рэформы, зацікаўлены адно ў тым, як яшчэ зьменшыць залежнасьць ад Расіі.
Нашых усходніх суседзяў моцна хвалююць пытаньні нашталт “Ці мае Расія будучыню?” або “Ці ўтрымае расійскі фэдэральны

цэнтар кантроль над рэгіёнамі?”. У іх адказах Расія мае будучыню, безумоўна, лепшую, чымся Аўстрыя ўлетку 1914 году. На іх думку, расійскі фэдэральны цэнтар здольны разграміць рэгіянальныя сэпаратызмы. Для нас жа “расійскае пытаньне” палягае ў нечым іншым: наколькі доўга Беларусі наканавана заставацца ў расійскім цені і ці не засланяе гэты цень шляху да яе аўтэнтычнага разьвіцьця? Ці наагул магчымае гэтае разьвіцьцё ў адрыве ад Расіі?
Вось такім “расійскім пытаньням” прысьвечаная падборка матэрыялаў у гэтым нумары “ARCHE”.
Валерка Булгакаў

[image]
[image]

№ 1 (24) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/02/18**
[image]

Апытаньне «Arche»:

1. Ці застаецца Расея імпэрыяй?
2. Ці чакае Расею распад?

Іван Антановіч, былы міністар замежных справаў Беларусі, выкладчык МДУ, доктар філязофскіх навук; Масква, Расейская Фэдэрацыя

1. На такое кароткае пытаньне — кароткі адказ: не. Не застаецца. А зараз крыху аргумэнтаў. Я павінен сказаць, што сёньня ў грамадзкай думцы ў самой Расеі і ў многіх эўрапейскіх краінах ёсьць такі архаічны, застарэлы стэрэатып, быццам бы цяперашняя Расея — гэта або містычнае ўвасабленьне СССР, або яна сама пакутуе ад комплексу імпэрскасьці. Гэта памылковае ўяўленьне, тут трэба дакладна зразумець, што дэмакратычная і фэдэратыўная краіна, якой сёньня зьяўляецца Расея, па вызначэньні ня можа быць імпэрыяй. І тут трэба згадзіцца з тым, што Расея сёньня — і гістарычна, і геапалітычна, і тэрытарыяльна, і эканамічна, і ў ваенных адносінах — зусім новая краіна. І ў гэтым сэнсе як у

Рэспублікі Беларусі, так і ў Расейскай Фэдэрацыі адзін узрост пасьля распаду СССР. І гэтыя новыя краіны, самыя маладыя на Эўразійскай прасторы, ня маюць імпэрскіх амбіцыяў. Ёсьць, канечне, некаторыя плыні грамадзкай думкі, якія ўсё яшчэ думаюць пра аднаўленьне былой імпэрскай моцы, але моцы гэтай ніхто не вызначае дакладна, а пра імпэрскасьць гавораць толькі людзі майго ці больш сталага ўзросту, якія любілі той час, калі яны былі маладыя, калі СССР быў другой краінай сьвету. Ня можа Расея быць імпэрыяй паводле сёньняшняга стэрэатыпу замежнапалітычных паводзінаў, унутранага дэмакратычнага жыцьця, фэдэратыўнай канстытуцыйнай будовы.

2. Мы гаворым толькі аб сучаснай гісторыі, мы ведаем, што паўсюль, дзе існуюць фэдэратыўныя дзяржавы, існуе міжэтнічная, міжкультурная напружанасьць, але ў больш лятэнтным ці больш адкрытым выглядзе. Такая небясьпека распаду для Расеі была рэальнай у сярэдзіне 90-х гадоў, калі зь лёгкай парады, вясёла-хмельнай парады Барыса Мікалаевіча [Ельцына] многія з аўтаномных рэспублік праглынулі сувэрэнітэту столькі, колькі яны думалі ператравіць. Аднак яны яго не ператравілі, і з прыходам да ўлады Ўладзімера Ўладзімеравіча Пуціна была зробленая ціхая, вельмі дакладная і далікатная рэвалюцыя. Усе гэтыя канстытуцыйныя перагіны аўтаноміяў былі прыведзеныя ў адпаведнасьць з фэдэратыўнай расейскай канстытуцыяй. Я не магу, аднак, сказаць, што няма пагрозы распаду. Перад фэдэратыўнай дзяржавай заўсёды стаіць пагроза распаду пасьля доўгіх выпрабаваньняў — альбо ваеннага характару, альбо эканамічнага крызысу. Або нечаканых ці нават тых, якія можна было прадугледзець, абвастрэньняў міжнацыянальных дачыненьняў. Але на гэтым сваім этапе Расея выйшла з працяглага эканамічнага крызысу. Пры ўсіх недарэчнасьцях маладой дэмакратыі, пэрсанальных усхліпаў і нават боек, жыцьцё разьвіваецца дэмакратычна. Я б сказаў, што непасрэднай пагрозы я ня бачу, але думаю, што кіраўнікі дзяржавы павінны пра такую небясьпеку думаць і заўсёды памятаць.

Пётар Вайль, пісьменьнік, рэдактар інфармацыйных праграмаў Расейскай службы радыё “Свабода”; Прага, Чэхія

1. Вядома, застаецца. Але зусім ня ў тым, што ляжыць на палітычна-ідэалягічнай паверхні: крывавай вайне ў Чачэніі, барацьбе за Чарнаморскі флёт, нежаданьні абмяркоўваць пытаньне Курыльскіх астравоў. Галоўная імпэрская спадчына — цяжкі комплекс непаўнавартасьці ў дачыненьні да Захаду: сумесь прыніжанасьці, заснаванай на разуменьні сваёй адсталасьці, з ганарлівасьцю зусім беспадстаўнае вышэйшасьці. Старая гісторыя: усё талковае прыходзіць з Захаду, але сьвятло калі-небудзь узыдзе і на Ўсходзе. Можа быць, яшчэ больш важны фактар імпэрскай сьвядомасьці — імкненьне схавацца за займеньнікам “мы”, падпісацца адразу і за краіну, і за народ, гэтым самым схаваўшы пад гэтымі непразрыстымі паняткамі нежаданьне і няўменьне адказваць за сябе і сваю сям’ю, за сваю канкрэтную справу. Як мне адказаў на пачатку 90-х афіцыянт хабараўскага рэстарану на просьбу прынесьці масла: “У краіне масла няма!”
2. Гэта нікому ня выгадна. Расейскіх “наместников” заўсёды саджалі “на харчы” — гэта значыць, па сутнасьці, на ўзаконены ці паўузаконены крадзеж. Так цэнтральная ўлада разумела іх інтарэсы раней, так разумее і цяпер. Цяперашні намесьнік, называй ён сябе губэрнатарам ці прэзыдэнтам, з аднаго боку, прыкрыты Масквой ад усялякіх сур’ёзных непрыемнасьцяў, з другога боку — дакладна ведае, што пры выкананьні ўсім вядомых правілаў ніхто ня будзе прэтэндаваць на яго самавольства. Навошта ў такім становішчы прэтэнзіі на сапраўдную незалежнасьць і сэпаратызм?

Ганс-Георг Вік, нямецкі дыплямат, былы пасол Нямеччыны ў СССР, экс-кіраўнік нямецкае выведкі, экс-кіраўнік місіі АБСЭ ў Беларусі; Бэрлін, Нямеччына

1. На міжнароднай арэне — па-за тэрыторыяй былога СССР — Расейская Фэдэрацыя паводзіць сябе ў бальшыні выпадкаў як вялікая, але не імпэрская сіла. Мы можам дыскутаваць адносна прычынаў зьменаў у параўнаньні з палітыкай СССР ці нават Расейскай імпэрыі да 1918 году. Гэтых прычынаў мноства. Натуральна, цяперашняя расейская палітыка і эканоміка імкнуцца каапэравацца зь міжнароднай палітыкай. Але гэта толькі адна, магчыма, ня самая галоўная прычына.
У адрозьненьне ад міжнароднай ролі Савецкага Саюзу, новая Расея хоча зьявіцца на міжнароднай сцэне запатрабаваным,

незаменным партнэрам, якому давяраюць. Аналіз рашэньняў Рады Бясьпекі ААН можа пацьвердзіць такую выснову. Дачыненьні зь некаторымі краінамі былога СССР зьяўляюцца раўнапраўнымі, а вось да Грузіі і Беларусі, як і да некаторых краінаў Цэнтральнай Азіі, стаўленьне нэаімпэрскае. Зь іншага боку, Масква прымае прысутнасьць і актыўнасьць заходніх краінаў у многіх краінах былога СССР. СНД магла б у будучыні стаць як імпэрскім інструмэнтам, так і альтэрнатывай яму для разьвіцьця партнэрства і ўзаемапавагі. У любым выпадку, Чачэнія працягвае быць крывавай ранай для Расейскай Фэдэрацыі. І таму неабходна дасягнуць стабільнага і справядлівага міру ў гэтым рэгіёне.
2. Не! Галоўная мэта прэзыдэнцтваў Ельцына і Пуціна была, ёсьць і працягваецца — стабільнасьць Расейскай Фэдэрацыі і разьвіцьцё сапраўднай дэмакратыі. Цяпер, праўда, ёсьць небясьпека захопу Крамлём незалежнай прэсы і электронных СМІ. Левыя і правыя фундамэнталісты няздольныя мабілізаваць грамадзкую падтрымку для супрацьдзеяньня цэнтрысцкім сілам і палітыцы адчыненых дзьвярэй, якую Крэмль праводзіць у дачыненьні да Эўропы і ЗША. Крэмль выйграе час і дабіваецца ўсё большай падтрымкі грамадзтва ня толькі таму, што заваяваў міжнародную павагу для новай Расеі. Цягам некаторых пэрыядаў XIX стагодзьдзя Расея была паважанай сілай у эўрапейскім ансамблі звышдзяржаваў. Цяпер Расея стараецца аднавіць гэтыя пазыцыі. Праз дэманстрацыю сілы гэтага дабіцца немагчыма, а магчыма толькі праз разьвіцьцё канструктыўнага супрацоўніцтва.

Гелена Дэмакава, дэпутат Латвійскага парлямэнту ў 1998—2002 гг., старшыня латвійскай дэлегацыі Парлямэнцкай Асамблеі АБСЭ, член групы АБСЭ па Беларусі; Рыга, Латвія
1. Мой адказ пра імпэрыялізм Расеі ня можа быць ня зьвязаны з геапалітыкай. У балтыйскіх краінах для карэннага мясцовага насельніцтва гэта не пытаньне — гэта відавочнасьць, якую пракамэнтаваў дэпутат Эўрапарлямэнту Ота фон Габсбург у сваёй прамове яшчэ ў 1983 годзе (іронія лёсу: чалец манаршай сям'і былой імпэрыі, стаўшы дэмакратам, гаварыў пра сёньняшнюю Расейскую (Савецкую) імпэрыю), што Балтыйскія краіны ня толькі акупаваныя, але і калянізаваныя. На жаль, афіцыйная Расея як спадкаемца Савецкага Саюзу яшчэ не

прызнала факту акупацыі незалежных балтыйскіх краінаў у 1940 годзе. Расея — безумоўна імпэрыя, гэта склалася даўно і гістарычна, але гэта не галоўнае пытаньне Расеі сёньня, гледзячы з-за мяжы. Сёньня галоўнае пытаньне пра шлях Расеі. Калі адбудзецца "вэстэрнізацыя", якую ўсё ж рэпрэзэнтуе Пуцін, то з дэмакратызацыяй Расеі і большай прадказальнасьцю пытаньне пра імпэрыю ня будзе так непакоіць ні суседзяў, ні Эўропу з Амэрыкай.
2. Як гаварыў у інтэрвію латыскай газэце "Diena" вядомы нямецкі паэт Ганс-Магнус Энцэнсбэргер у 2002 годзе, імпэрыялізм Расеі цяпер стаіць на гліняных нагах. Але ў хуткім распадзе гэтага глінянага калоса ніхто не зацікаўлены, нават чачэнцы, якіх цікавіць толькі іх пытаньне. Калі Расея будзе трансфармавацца да сваіх этнічных межаў, то гэта мае быць асьцярожны працэс. Цяпер дэмакратычнай міжнароднай супольнасьці патрэбна цьвярозая Расея, зь якой можна разам змагацца супраць нябачнага міжнароднага тэрарызму. Гэта таксама ў інтарэсах Расеі.

Валерыя Навадворская, лідэр Дэмакратычнага саюзу Расеі, дысыдэнтка; Масква, Расейская Фэдэрацыя
1. Псыхалягічна — так, застаецца каляніяльнай імпэрыяй, бо імпэрская псыхалёгія не адышла разам з калёніямі. Яна застаецца і імпэрыяй зла. Яна ніколі нічога не давала калёніям, але забірала ўсё, што магла. Апошні каляніяльны бастыён, які просіцца на волю, але трымаецца ў палітычнай вязьніцы — невядома чаму, — гэта Чачэнія. Рэальная частка Расеі, якая — падрыхтаваная ці не — але гатовая зрабіць намаганьне для самастойнага існаваньня. Калі гаварыць пра сусьветныя стандарты, дык і Расея ня можа існаваць самастойна, таму й пра Чачэнію няма чаго гаварыць — можа яна ці ня можа існаваць самастойна. Шматлікія анклявы на тэрыторыі Расеі — гэта не зусім каляніяльныя знаходкі, але сьляды вельмі даўняга пашырэньня, экспансіі: ханты-мансі, башкіры, татары — гэта нашыя індзейцы. Але ў ЗША індзейцы атрымалі самыя высокія эканамічныя і палітычныя ўмовы. У Расеі народы пратэстуюць, што яны нічога не атрымалі, але ж іх тэрыторыі так разьмешчаныя, што нічога большага ніхто іншы ім ня дасьць. Калі б яны атрымалі самастойнасьць, невядома, ці хацелі б яны свабоды. Узгадайце забойства ў Калмыкіі журналісткі Ларысы

Юдзінай! Тое ж з суседнім Туркмэнбашы. Спэцыфіка Расеі — Расея застаецца імпэрыяй, а яе ўнутраныя калёніі, апрача Чачэніі, — гэта галовы дракона, аднаго цела, яны не валодаюць чалавечым, маральным, эканамічным патэнцыялам, іх немагчыма параўнаць з краінамі Балтыі, якія былі сапраўднымі калёніямі, што, вырваўшыся, змаглі выкарыстаць свабоду. У каляніяльным пляне няма каму тут спачуваць, апроч Чачэніі. Калі Шаймієў заявіць, што хоча незалежнасьці, гэта не азначае, што ён хоча свабоды. Расея страціла права нешта рабіць з Чачэніяй, але Чачэнія патрабуе дапамогі Захаду.
2. Ці чакае Расею распад? Ды не! Гэта адзін зь мітаў, якія распаўсюджваюць расейскія нацыяналісты: дайце свабоду Чачэніі, дык іншыя разьбягуцца. Анклявы тыпу Дагестану, Татарстану, Калмыкіі нікуды ня пойдуць. Нават калі іх гнаць венікам. Яны паразытуюць на расейскім бюджэце. Ілюмжынаў? Куды ён дзенецца? Што ён і дзе будзе красьці? Анклявы з маленькімі туркмэнбашы сыходзіць не зьбіраюцца. Яны спадзяюцца, што ніхто ня будзе мяшацца ў іхныя справы, а яны будуць рабіць што хочуць. Гэта трэба ламаць, такое ня можа адбывацца пры расейскай Канстытуцыі! Распад — гэта ўсьвядомленая воля тэрыторыяў, куды йсьці, і адказнасьць за свой выбар. Свабода — гэта цана, тэст. Незалежнасьць — неабходнасьць здабываць харчы, будаваць эканоміку, але людзі дзесяцігодзьдзямі адвучваліся працаваць. Людзі гатовыя памерці ад голаду, але не працаваць на сябе. Чачэнскі народ добра захаваўся ў гэтым пляне, чачэнцы — могуць. Я пыталася розных кіраўнікоў — Аўшава, Абдулаціпава, — чаму яны не дамагаюцца свабоды. Дэмакратычны саюз гатовы (Дэмсаюз прызнаў незалежнасьць Чачэніі ў 1991 годзе) — дык тыя шарахаліся. Ня могуць яны жыць без Расеі, у іх, маўляў, 120 народаў, якія накінуцца адзін на аднаго. Я не сутыкалася з тым, каб яны былі гатовыя змагацца за незалежнасьць. Ілюмжынаў шантажуе Маскву, тое ж робяць Шаймієў, Рахімаў. Якуція ня зможа з сваімі дыямэнтамі — там 80 % расейцаў. Пры разводзе паводле правілаў ёсьць такая штука, як рэфэрэндум. У Татарстане 50 % расейцаў. Будзе як у Квэбэку, але тут не Канада. Замест рэфэрэндуму цэнтар бярэцца за кулямёты, танкі, а тэрыторыі йдуць у горы. Гэта не краіны Балтыі. Расеі, на жаль, не пагражае распад, распад нічога ня дасьць. Калі ракавую клетку разьбіць на кавалкі, гэта не

азначае выздараўленьня арганізму. Чаму на жаль? Распад мог бы быць выйсьцем, як, напрыклад, было з Аўстра-Вугорскай імпэрыяй. Ідэі несьлі здаровыя сілы. Як цудоўна жыве Славенія, Харватыя; Сэрбія будзе жыць цудоўна. Але ў Расеі няма Славеніі.

Уладзімер Някляеў, паэт, у 1998—2001 г. старшыня праўленьня Саюзу беларускіх пісьменьнікаў; Хельсынкі, Фінляндыя

1. Імпэрыя — гэта сіла, багацьце, дзяржаўная моц, трэск зямлі пад цяжарам каляніяльных слоноў. Альбо гэта сёньняшняя Амэрыка, эканоміка якой — траціна сусьветнай. З інвэстыцыямі ў яе — мільярд даляраў штодзённа. Сёньняшняя Расея такіх прыкметаў і блізка ня мае. Бюджэт Расеі, шостай часткі Зямлі, суадносны зь бюджэтам Швэцыі, а доля Расеі ў сусьветным гандлі, за выняткам сыравіны, — 1 %. Калі заўтра Расеі раптам ня стане, дык эканамічна сьвет гэтага й не заўважыць.
Тады — якая ж імпэрыя?.. Расея — імпэрыя памяці пра імпэрыю. Час гэтай памяці самы небясьпечны, бо моцы ўжо не стае, а пыха ўсё тая ж і памяць імпэрская падбівае да спробаў рэанімацыі. Даводзячы да максымуму, што імпэрыя можа быць або толькі імпэрыяй, або нічым. Магчымасьцяў — апроч, хіба, сымбалічных: гербу, гімну — для рэанімацыі няма. Сымбалямі рэальных праблемаў ня вырашыць. Эканамічны і палітычны крызыс спараджае сацыяльны, маральны, і ўсё, урэшце, зьліваецца ў плынь крыміналу.
Так сталася ў Рымскай імпэрыі, у такім стане і імпэрыя Расейская...
За мінулы год па Расейскай Фэдэрацыі — 25 тысяч апазнаных трупаў, 35 тысяч неапазнаных — значыць, 60 тысяч забойцаў; 33 тысячы людзей прапалі бязь зьвестак, і яшчэ 78 тысячаў заяваў пададзеныя для пошуку зьніклых — ніхто ня ведае, колькі зь іх жывыя; 15 мільёнаў чалавек (кожны дзясяты з усяго, разам зь дзецьмі, насельніцтва!) асуджаныя ў апошнія 10 год за злачынствы — і гэта ж толькі тыя, каго ўжо не выпадала за руку не злавіць...
Дык на чым жа і на кім трымалася б імпэрыя, калі б яна была?.. Адно на ўладзе? На сілавых структурах?.. Але ўлада зь сілавамі структурамі, лепш за ўсіх ведаючы, што адбываецца, хутчэй за ўсіх і расьцягвае срэбра ды золата, рэшткі імпэрыі, па

куфэрках.
Імпэрыя абрынулася, ды засталася ў руінах імпэрскасьць. Тая самая памяць пра імпэрыю, толькі ўжо як складнік нацыянальнай самасьвядомасьці, расейскай ідэі, якая пераважна геаграфічная. Па вэртыкалі — дзе Бог і неба — яна можа быць і вышэйшай, і ніжэйшай, але па гарызанталі — дзе зямля і людзі — не дапускае ніякіх звужэньняў. Тут ёй прасторна, ёй абумоўленыя ўсе паходы Расеі на ўсе бакі сьвету, у ёй ці ня ўся былая слава, таму й рабаўніцкая вайна ў Чачэніі — не злачынства. Яна — акцыя дзеля захаваньня тэрытарыяльнай цэласнасьці, дзеяньне ў імя ідэі... Самае подлае выпірала з імпэрый якраз па распадзе, калі асыпаліся з імпэрскіх елак імпэрскія цацкі. Расея тут не выключэньне.
2. Распад Расейскай імпэрыі — не распад Расеі. Але чым больш будзе Расея, як цяпер, цэнтралізавацца, намагацца вярнуцца да імпэрскай мадэлі, тым большае напружаньне будзе ўзьнікаць у згонах, па якіх яна можа распасьціся. І пакуль што сапраўды падобна на тое, што Расея здольная быць або толькі імпэрыяй, або нічым. Што ж, не Эўропа... Захад ёсьць Захад, Усход ёсьць Усход, і разам ім не бываць.
Крэўна любячы Расею, бо крэўную любоў не выбіраюць, я менш за ўсё хацеў бы, каб яна распалася. Тым больш што ў часе, калі ў сьвеце скончыліся войны за тэрыторыі, узьнікаюць прынцыпова новыя міждзяржаўныя ды наддзяржаўныя ўтварэньні і сама дзяржаўнасьць вымыкае за межы дзяржаваў. Сьвет трансфармуецца, перацякае цераз межы, запаўняецца — пры ўсіх канфліктах — адзінай прасторай выжываньня, а Расея ўсё йдзе ды йдзе нейкім сваім асаблівым, для яе самой няўцямным шляхам. На якім нібы й не зьбіраецца выжываць, які відавочна пазначаны перасьцерагальнымі знакамі распаду.

Зянон Пазьняк, старшыня Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі — БНФ; Варшава, Польшча
1. Паняцьце “імпэрыя” ўключае ў сябе, перш за ўсё, спосаб існаваньня і тэхналёгію ажыцьцяўленьня ўлады поліэтнічнай (каляніяльнай) дзяржавы, заснаванай на агрэсіі і несвабодзе. Імпэрыя — гэта вайна. Імпэрыя імкнецца да абсалютызму ўлады, да захопу і ўтрыманьня чужых тэрыторыяў, да стварэньня і абсалютызацыі імпэрскай дзяржаўнай ідэалёгіі. Насельнікі імпэрыі характарызуюцца імпэрскай

мэнтальнасьцю. Імпэрская ўлада — гэта ўціск (здушэньне свабоднай дзейнасьці людзей, эксплюатацыя народаў рознымі мэтадамі: палітычнымі, эканамічнымі, прапагандысцкімі, вайсковымі, паліцэйскімі, крымінальнымі, інфармацыйна-прапагандысцкімі). Імпэрская ўлада ажыцьцяўляецца пастаяннай групай. Расея царская, камуністычная (СССР) і цяперашняя, пасьлясавецкая, адпавядае ўсім вышэй пералічаным прыкметам імпэрыі. Цяперашняя Расейская імпэрыя вядзе збройныя, палітычныя, эканамічныя, інфармацыйныя войны, тэрор, войны спэцслужбаў, тэхналягічныя і іншыя войны за ўтрыманьне і прыўлашчваньне тэрыторыяў. У пасьлясавецкай Расеі адбываецца працэс пераходу (пераемнасьці) абсалютнай дзяржаўнай улады ад кампартыі да КГБ, з адначаснай зьменай ідэалёгіі і адносінаў уласнасьці. Вялікадзяржаўна-камуністычная ідэалёгія зьмяняецца на вялікадзяржаўна-шавіністычную. Дзяржаўна-партыйная ўласнасьць зьмяняецца на мафіёзна-прыватную. Гэбоўска-мафіёзная Расея, гэтак жа як і камуністычна-савецкі СССР, выкарыстоўвае па-імпэрску асэнсаваныя дэмакратычныя мэханізмы фармаваньня ўлады (выбары, Канстытуцыю, падзел функцыяў улады і г.д.). Расейская імпэрыя зьяўляецца на сёньняшні дзень найбольшай пагрозай для міру і стабільнасьці ў Эўропе і для ўсяго Заходняга Сьвету.

2. У працэсе распаду Расеі вырашальнчае значэньне маюць вонкавыя чыньнікі. Бяз вонкавых узьдзеяньняў распад Расеі можа доўжыцца бясконца доўга, лягічна — аж да поўнага выміраньня насельніцтва. Расея небясьпечная тым, што яна здольная самазадушваць унутраныя сілы распаду і — самазахоўвацца. Гэтаму найбольш спрыяюць два фактары: паталягічная масавая мэнтальнасьць і пэрманэнтна нізкі ўзровень жыцьця, які ўспрымаецца як норма. Аналіз цяперашняй Расеі (гэтак жа, як і аналіз СССР) паказвае, што існая імпэрская сыстэма доўга існаваць ня можа. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя працэсы рухаюцца ў бок каляпсу і наступнага распаду. Вузкагрупавы кагэбоўскі кантроль над эканомікай, фінансамі, бізнэсам, прыбыткамі, кланавы допуск да прыбыткаў прывялі да канцэнтрацыі імпэрскіх фінансаў і бюджэту ў Маскве. Сродкі выцягваюцца з правінцыі ў сталіцу. Аднак грошы ад прыбыткаў вывозяцца на Захад (на 2002 год там знаходзілася больш за 300 мільярдаў даляраў з Расеі).

Такім чынам, клан КГБ, які кіруе ў Расеі і выкарыстоўвае постсавецкую імпэрыю, сам ня верыць у яе будучыню. Паглыбленьне бездані паміж правінцыяй і Масквой, паміж беднасьцю і багацьцем павінна прывесьці да павелічэньня міжтэрытарыяльнага напружаньня, да ўзрастаньня фінансава-гаспадарчага і палітычнага ўплыву іншых краінаў на ўскраінах Расейскай імпэрыі. Пагроза чарговага распаду, магчыма, выкліча новыя перамены (“перабудову”) імпэрыі. Але нічога ўжо ня можа яе выратаваць у пэрспэктыве. На працягу стагодзьдзяў жорсткай улады і вынішчэньня ў Расеі адбываўся адмоўны натуральны адбор. Усё высокае, разумнае, добрае, сьветлае, лепшае вынішчалася, затоптавалася, выганялася. Заставалася “скопішча” зла. На сёньняшні дзень гэта слабасільная краіна, валавы нацыянальны прадукт якой меншы, чым у маленькага Тайваню. Гэта краіна, якая ня можа ўтрымліваць сваю (непасільную для яе) армію і велізарныя тэрыторыі, але вырошчвае непамерныя амбіцыі і паталягічныя прэтэнзіі на вырашэньне лёсаў цэлых народаў.

Зэлімхан Яндарбіеў, экс-прэзыдэнт Чачэнскай рэспублікі, паўнамоцны прадстаўнік прэзыдэнта А. Масхадава ў краінах Блізкага Ўсходу, паэт; Доха, Катар

1. Як мне падаецца, гэтае пытаньне можна падзяліць на дзьве часткі. Калі пад імпэрыяй разумець дзяржаўнае ўтварэньне, якое праводзіць міжнародную буйную палітыку гвалту над іншымі народамі, генацыд у пэўных формах, як гэта цяпер робіць Расея, калі разумець яе як машыну зла, як утварэньне, якое нясе зло, зыходзячы з сваіх самадастатковых дзяржаўных матывацыяў, — натуральна, Расея застаецца імпэрыяй. Калі ж яе разглядаць з пункту гледжаньня вагі на міжнароднай арэне — Расея ўжо ня тая дзяржава, якая можа дыктаваць свае ўмовы ў міжнароднай палітыцы, напрыклад у кантынэнтальных маштабах. Хаця Расея застаецца монстрам міжнароднага, арганізаванага дзяржаўнага тэрарызму. Яшчэ адзін бок гэтага пытаньня — сьвет і чалавецтва павінны дакладна ўсьвядоміць, што імпэрыя можа быць і дэмакратычнай. Дэмакратычны тып імпэрыі зьяўляецца самай жахлівай формай імпэрыі зла. Расея — вельмі дакладны прыклад выраджанага тыпу дэмакратычнай імпэрыі зла. Расея застаецца імпэрыяй зла.

2. Распад Расеі йдзе даўно. Але, як сьведчыць гісторыя, такі

распад не бывае хуткім і бачным для грамадзкасьці, для тых, хто не займаецца палітыкай. Гэты распад цягнецца вельмі доўга, гэта шматэтапны, шматузроўневы працэс. І яго заўважаюць толькі тыя спэцыялісты, якія займаюцца міжнароднай палітыкай. Пра тое, што распад ідзе, сьведчыць апошняе дзесяцігодзьдзе Расеі, а таксама сёньняшні ваенна-палітычны ФСБэшны рэжым, які Расеяй кіруе. Гэты рэжым, на маю думку, павінен давесьці Расею да апагею, пасьля чаго распад павінен набраць хуткасьць.

Спадару Яндарбіеву мы задалі трэцяе пытаньне:
Ці зьменіцца стаўленьне расейскай грамадзкасьці да Чачэніі зь зьменай пуцінскай адміністрацыі?
Пра тое, што гэта немагчыма за кароткі час, вы й самі, беларусы, добра ведаеце, гэтаксама як і ўкраінцы, народы Балтыі, азэрбайджанцы, грузіны. Уся былая прастора СССР вельмі адчувае, што цяжка дасягнуць іншага стаўленьня расейскай улады да суседніх народаў. Для таго каб Расея паважала, трэба быць моцным, як Амэрыка. Іншы стандарт не падыходзіць. Калі ў іншых краінах, напрыклад у краінах заходняй дэмакратыі, ёсьць цывілізаваны падыход да праблемаў правоў грамадзянаў, то ў Расеі ўсе гэтыя паняцьці базуюцца, фармуюцца і рэалізоўваюцца зьверху, з Крамля. Якой будзе ідэалёгія Крамля, як яны будуць падаваць, якое стаўленьне будзе дэманстраванае расейскаму народанасельніцтву ў дачыненьні да любога народу ў Расеі ці на плянэце — такое стаўленьне ў расейскіх грамадзянаў і будзе. Грамадзянскага мэнталітэту няма й блізка. Грамадзянскай сьвядомасьці там няма. Гэта вельмі глыбокая праблема. Калі спадзявацца, што ў Расеі можна так хутка і кардынальна памяняць стаўленьне, — гэта наіўна. Гэта будзе для нашага народу доўгі, цяжкі, вельмі складаны шлях…
Апытвала Вольга Караткевіч

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (24) – 2003
[image]да Зьместу

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/02/18**
[image]

Мікалай Паўловіч

Расійская школьная гісторыя

З лёгкай рукі вялікага Карамзіна школьнікам дэмакратычнай Расіі працягваюць убіваць у галаву манархічную схему расійскай гісторыі. І тым самым адвучваюць дзейнічаць у рэальным жыцці, дзе няма ўжо ні цара, ні генеральнага сакратара, якія ўсё за цябе вырашаць.

Год таму расійскі ўрад раптам ахапіла надзвычайная занепакоенасць станам школьнага выкладання гісторыі. Прэм'ер-міністра Касьянава асабліва абурыла тое, як апісваецца постсавецкая эпоха. Міністэрства адукацыі ўзяло пад казырок і абвясціла конкурс на новы падручнік найноўшай расійскай гісторыі. Нічога добрага з гэтага не выйшла. І не магло выйсці. Таму што гісторыя з канца — ад сучаснасці назад у глыб вякоў — пераасэнсоўваецца, але пішацца яна ўсё-такі па парадку: ад найстаражытнейшых часоў да нашых дзён. Нельга прышыць адэкватны і аб'ектыўны канец — гісторыю Расіі ў XX стагоддзі — да знявечанага пачатку.

У галіне палітычнай гісторыі, на якую перш за ўсё звярнуў увагу прэм'ер, гэта асабліва цяжка, бо грамадскія сістэмы маюць даволі вялікую інерцыю. І роля палітычнай традыцыі

велізарная. Так што гаворку пра школьную гісторыю давядзецца пачынаць ab ovo.

“Гісторыя народу належыць Цару”

Ужо пры абеглым аглядзе падручнікаў, выдадзеных на працягу апошняга дзесяцігоддзя, кідаецца ў вочы іх незвычайнае родавае падабенства. (Далей мы будзем цытаваць толькі тры безумоўна найлепшыя дапаможнікі: Т. В. Чэрнікавай для 6-га і 7-га класаў ды Н. І. Паўленкі і І. Л. Андрэева — для 10-га, што ўвайшлі ў пералік “рэкамендаваных” міністэрствам.) Нягледзячы на прыватныя, фрагментарныя ўкрапіны асобных палажэнняў, выпрацаваных пазнейшай навукай, у цэлым усе яны прытрымліваюцца старадаўняй схемы, якую без вялікай нацяжкі можна называць карамзінскай.

Сутнасць яе афарыстычна выказаная ў выніковай “Запісцы пра старажытную і новую Расію”, складзенай вялікім гістарыёграфам у 1811 годзе: “Расія заснавалася перамогамі і адзінаўладдзем, гінула ад рознаўладдзя, а ўратавалася мудрым самаўладдзем”. Ці, у менш патэтычных сучасных тэрмінах: без моцнай уладнай вертыкалі Расія асуджаная на пагібель. Менавіта “апошні летапісец” Мікалай Міхайлавіч Карамзін падвёў гістарычныя падпоркі пад гэты міф. Ён вылучыў тэзіс пра манархічны характар княскай улады ў Старажытнарускай дзяржаве, “жалю варты” заняпад якой быццам бы і адбыўся ад аслаблення гэтай улады. І ўсе нашыя школьныя падручнікі дагэтуль убіваюць у дзіцячыя галовы, што “паводле формы кіравання Старажытнарускую дзяржаву можна аднесці да феадальнай манархіі”, дзе “найвышэйшая ўлада належала кіеўскаму князю” (Паўленка і Андрэеў). Аднак князі Старажытнай Русі ўпарта не хочуць упісвацца ў гэты пастулат. У адным толькі сучасным падручніку (цікава, што ў тых самых Паўленкі і Андрэева) удалося знайсці млявае напаўпрызнанне таго несумненнага факту, што “ўлада кіеўскага князя не была абсалютная. Ён мусіў лічыцца з волевыяўленнем свабоднага вясковага і гарадскога насельніцтва зямлі-воласці, якое збіралася на народны сход — веча. Веча, не зважаючы на вызначаны парадак спадкавання ўлады, магло паклікаць на княжанне ўпадабанага ім князя; магло адмовіць князю і

прымусіць яго пакінуць пасад; магло не падтрымаць таго ці іншага пачынання князя і пабудаваць з ім узаемадачыненні на дамоўных падставах, уклаўшы рад — дамову". Іншымі словамі, агульнавядомы эпізод выгнання князя Аляксандра Неўскага — зусім не ўнікальны прыклад буянства неўтаймоўных наўгародцаў, а паўсюдная і звычайная ў Старажытнай Русі практыка. Неўпадабанага князя, які парушаў умовы раду-дамовы і рабіў замах на гарадскія вольнасці, прасілі вон.

Але расійская школьная гісторыя нават цяпер не можа прызнаць навуковую непераканаўчасць манархіста Карамзіна і ўзяць на ўзбраенне адэкватную тэорыю ўладкавання старажытнарускай палітычнай сістэмы, распрацаваную яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя В. І. Сергяевічам і развітую ўжо ў 80-я гады XX стагоддзя І. Я. Фраянавым і ягонымі вучнямі. Згодна з гэтай тэорыяй, Старажытная Русь не манархія, а хутчэй федэрацыя зямель-воласцей, палітычнае жыццё якіх вызначаецца ўзаемадзеяннем трох цалкам незалежных і аднолькава магутных уладных інстытутаў — князя, дружыны і веча.
Зразумела — і гэта прызнаюць сучасныя гісторыкі, — "старажытны князь патэнцыйна валодаў манархічнымі якасцямі і ўласцівасцямі. Але для таго, каб яны праявіліся і запанавалі, былі неабходныя іншыя сацыяльныя і палітычныя ўмовы. Гэтыя ўмовы ўзніклі за межамі старажытнарускага перыяду айчыннай гісторыі" (І. Я. Фраянаў і А. Ю. Дварнічэнка).
Наконт гэтых умоваў Карамзін і сам не меў ілюзій. Пераадоленне "жалю вартай" раздробленасці ўлады ва ўдзельны перыяд ён звязваў з падпарадкаваннем князёў Паўночна-Ўсходняй Русі манголам. І адзіны школьны падручнік па нашай гісторыі, які застаўся ў міністэрскім спісе рэкамендаваных для старшай школы, ахвотна за ім паўтарае: "Яшчэ вялікі расійскі гісторык М. М. Карамзін пісаў пра дадатны ўплыў ханавай улады на палітычнае развіццё Русі, паколькі міжусобныя войны пайшлі на спад і вярхоўная ўлада сканцэнтравалася ў адных руках" (Паўленка і Андрэеў). Нам фактычна прапануюць узрадавацца канцэнтрацыі ўлады ў адных руках як дабру, якое кампенсавала іншыя, безумоўна бядотныя, вынікі ардынскага панавання на Русі.
Не зусім ёмка зрабіць гэта адкрыта, і зноў бярэцца на

ўзбраенне вынайдзеная тым жа Карамзіным камуфляжная канцэпцыя ардынскага “ярма”. “Прыблізна з 1240 году пачало фармавацца ярмо — сістэма залежнасці падпарадкаванай Батыем Русі ад ханаў Залатой Арды”, — эпічна апавядаецца ў падручніку Чэрнікавай для 6-га класа. Насамрэч загадкавае “ярмо” — звычайныя данніцкія адносіны, юрыдычна замацаваныя прысягай, якую прынёс Батыю ў 1243 годзе вялікі князь Уладзімірскі Яраслаў Усеваладавіч. Князі Паўночна-Ўсходняй Русі прызналі сябе васаламі Арды, а яна абавязалася абараняць іх у выпадку вонкавых нападаў. Хочацца запытаць: нашто спатрэбілася прыдумляць новае слова? А каб схаваць тую акалічнасць, што роль васала не толькі не прыгнятала расійскіх князёў — яны яе дабіваліся.
Ізноў падручнікі спрабуюць нас пераканаць, што выбару ў Яраслава не было, нібыта расійскія “князі не знайшлі і не мелі сілаў для супраціўлення”. У абгрунтаванне прыводзяцца міфічныя летапісныя звесткі пра колькасць мангольскіх войскаў, якіх не здольны ўспрымаць усур’ёз ніводзін вучоны-дэмограф. Дый дзіўна, што Ўладзімірскае княства не “знайшло сілаў”, а значна слабейшае Смаленскае — знайшло. Адбіліся ад мангольскай навалы чэхі і венгры, таксама цалкам раздробленыя.

Аляксандр Яраславіч Неўскі дзейнічаў якраз наадварот — ён гвалтам прымусіў падуладныя яму расійскія воласці падпарадкавацца манголам. З усіх падручнікаў толькі ў Чэрнікавай, дый тое мімаходзь, згадваецца пра драматычныя акалічнасці гэтага “прымучвання”: “Адны навукоўцы асуджаюць імкненне Неўскага любымі шляхамі падтрымліваць мір з Ардой. Другія сцвярджаюць, што ў Русі не было сілаў для супраціўлення і курс Аляксандра Неўскага быў адзіна слушным”. Адпаведна па-рознаму ацэньваецца і з’яўленне на Русі ў 1252 годзе мангольскага войска царэвіча Няўруя, якое адбылося пасля падарожжа Аляксандра Неўскага да Батыя. Цікава, што сучаснікі зусім не падзялялі пераканання гісторыкаў-карамзіністаў у непераадольнасці Батыевай сілы. Сумна вядомая “няўруева раць” была наведзеная на Русь Аляксандрам для разгрому антыардынскай кааліцыі, якую ўзначальвалі ўласны ягоны брат Андрэй Яраславіч і галіцкі князь Даніла Раманавіч. У 1257 годзе адмовіліся

падпарадкавацца Ардзе ды пусціць да сябе ардынскіх перапісчыкаў наўгародцы, і з імі родны сын Неўскага Васіль, які стаў на абарону гараджан. Тады святы дабраверны князь Аляксандр Яраславіч з'явіўся ў горад разам з манголамі і сурова расправіўся з паўстанцамі (іх завадатарам "вылуплялі вочы").
Сучасная навука тлумачыць гэтую зусім свядомую палітыку проста: у саюзе з манголамі князям Паўночна-Ўсходняй Русі было нашмат зручней дабіць вечавыя інстытуты, з якімі яны энергічна змагаліся паўтара стагоддзя. Вольныя гарады, дзякуючы якім у Еўропе сфармаваўся прававы, а затым ужо і ліберальна-дэмакратычны лад, на Русі былі свядома задушаныя расійскімі князямі, што абапіраліся на мангольскую сілу. І пра гэта ні ў адным падручніку не сказана ні слова.
Немагчыма знайсці ў падручніках і яснага ўказання на тое, што далёка не ўсе рускія землі дазволілі здзейсніць над сабой такі гвалт. Карамзін прыклаў нямала намаганняў, каб намаляваць "дзікую" Літву — галоўнага канкурэнта Масквы ў аб'яднанні рускіх земляў — зусім чужой рускаму чалавеку дзяржавай. Так што нават нельга зразумець, як выжыў там князь Андрэй Курбскі, які ўцёк ад дзікунстваў Івана Грознага — пра што, зрэшты, далёка не ва ўсіх падручніках згадваецца. Пра тое ж, што ў Літву, дзяржаву з вольным федэратыўным уладкаваннем і гарадамі, якія карысталіся шырокім самакіраваннем, так званым магдэбургскім правам, маскоўскія падданыя — і знатныя баяры, і "подлыя" мужыкі — уцякалі тысячамі, цікаўны школьнік можа даведацца толькі са спецыяльнай літаратуры. Беглі, між тым, без страху, бо Вялікае Княства Літоўскае і Рускае (такая яго афіцыйная назва) было і па мове, і па культуры такім жа рускім, як Маскоўскае. Адрозненне было толькі ў паходжанні кіроўных дынастый: на Маскве сядзелі варагі-рурыкавічы, у Вільні — літоўцы-гедымінавічы.

Народ мадзеў
Падручнікі маўчаць і аб тым, што празмерная цэнтралізацыя, якая стала вынікам маскоўска-ардынскага альянсу, віталася на Русі далёка не ўсімі. Апазіцыйныя сілы на працягу некалькіх стагоддзяў спрабавалі трансфармаваць маскоўскую палітычную сістэму ў значнай ступені на літоўскі ўзор. Часам мірна, як у эпоху Аляксея Адашава, які імкнуўся ператварыць Расію ў

нармальную станава-прадстаўнічую манархію еўрапейскага тыпу. У 1547 — 1560 гадах яму ўдалося правесці рэформы (станавае прадстаўніцтва, мясцовае самакіраванне, незалежны суд — практычна суд прысяжных). Калі ж Іван Жахлівы пры дапамозе адмыслова для гэтай мэты заснаванага тэрарыстычнага апрычнага корпусу павярнуў палітычнае развіццё назад, да азіяцкай дэспатыі, апазіцыя ўзялася за зброю.

Ні ў адным падручніку не знойдзем мы даўно прынятай навуковай супольнасцю трактоўкі Смуты пачатку XVII стагоддзя як грамадзянскай вайны. Бо тады ж давядзецца казаць пра тое, што пад сцягі лжэдзмітрыяў-балотнікавых збіраліся зусім не авантурысты, а праціўнікі маскоўска-апрычнай палітычнай сістэмы, прычым з розных станавых груп. Апазіцыя пацярпела чарговую паразу, але адтэрмінавала панаванне абсалютызму. Нездарма пры першых Раманавых захоўваўся інстытут станавага прадстаўніцтва — Земскі сабор. Далей за Смуту сам Карамзін не пасунуўся, але канцэпцыя яго лёгка развіваецца. І школьнікаў вучаць, што рэформы Пятра “значна ўмацавалі Расійскую дзяржаву, паставілі яе ў шэраг вялікіх еўрапейскіх краінаў”. Пра цану “ўмацавання” — спусташэнні і голад — ні слова. Калектыў аўтараў на чале з Паўленкам наагул завяршае раздзел пра Пятра патэтычнай кантатай: “На пытанне, што Пётр Вялікі зрабіў для Расіі, лепш за ўсё адказаць словамі, якія ў дзень ягоных хаўтураў прамовіў Феафан Пракаповіч: “Якою ён Расію зрабіў, такая і будзе; зрабіў дабру любаю, любая і будзе; зрабіў ворагам страшнаю, страшная і будзе; зрабіў на ўвесь свет слыннаю, слынная і быці не перастане”. Добра яшчэ, што не словамі канцлера Гаўрылы Галоўкіна, сказанымі на ўрачыстасцях з нагоды ўкладання Нэйштацкага міру са Швецыяй: той і ўвогуле прыпадобніў Пятра да Бога-творцы.

Дзяцей вучаць любіць моцную ўладу. Моцную любой цаной.

Гісторыя працягваецца

Пры тым, што асобныя элементы навуковай канцэпцыі расійскай гісторыі прарываюцца ў новыя школьныя падручнікі, ніводзін аўтар не наважыўся прадставіць звязную некарамзінскую палітычную гісторыю. Жывучасць манархічнай карамзінскай схемы забяспечваецца не толькі прывабнасцю яе

для ўлады. Галоўным чынам гэта сведчыць пра непадрыхтаванасць цяперашняга расійскага грамадства ясна сфармуляваць “тэхнічнае заданне”, а навукова-педагагічнай супольнасці — стварыць прынцыпова новы курс нацыянальнай гісторыі. Такой гісторыі, аб’ектам якой будзе не міфалагізаваная ўлада (клас, нацыя…), што выконвае тую ці іншую высокую місію, а звычайныя людзі, якія дасягаюць сваіх цалкам зямных мэтаў і маюць у галаве розныя праекты будучыні, аднолькава магчымыя і аднолькава законныя.
Цікава, што падручнікі постсавецкі час так і прадстаўляюць. На сучасных дзеячаў ужо не навешваюць ярлыкоў прагрэсіўных і рэакцыйных, гэта значыць такіх, што набліжаюць ці аддаляюць нацыю ад нейкай найвышэйшай мэты, а проста апісваюць палітычную барацьбу ў вярхах і вельмі ўскосныя дачыненні гэтай барацьбы да народных патрэбаў.
У гэтым пераходзе, падазраём, і палягае прычына нездаволенасці нашых дзяржаўных дзеячаў, чыім вестуном выступіў Міхаіл Касьянаў. У дачыненні да найноўшай гісторыі надзвычай цяжка містыфікаваць уладу. Немагчыма паверыць у “богаабранасць” Юр’я Лужкова ці “гістарычную непазбежнасць” з’яўлення “кіндэр-сюрпрызу” Сяргея Кірыенкі. У падзеях найноўшага часу занадта выразна выяўляецца барацьба чалавечых, цалкам прыземленых інтарэсаў, у тым ліку і ва ўладзе.
Улада нездаволеная. І сапраўды, кантраст з папярэднімі эпохамі ў школьным пераказе выходзіць занадта вялікі і крыўдна несправядлівы. Аднак выйсце знаходзіцца не ў тым, каб напісаць новыя падручнікі найноўшай гісторыі, дзе ўлада зноў паўстала б агентам татальна-скіраванай і татальна-асэнсаванай гісторыі карамзінскага тыпу, а ў тым, каб перапісаць падручнікі па старажытнай і новай гісторыі, даўшы магчымасць і там дзейнічаць свабоднаму чалавеку на свой страх і рызыку. Ну як сёння.
Пераклаў Сяргей Петрыкевіч
паводле “Еженедельного журнала”, № 46/2002,
з ласкавае згоды выдання і аўтара.

[image]
[image]

№ 1 (24) – 2003

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/02/18
[image]

Ален Бэзансон

Тэзы пра былую й цяперашнюю Расею

АЛЕН БЭЗАНСОН – прафэсар расейскай гісторыі й літаратуры, загадчык катэдры ў *l'École des hautes études*.

Даўняя Русь

1) **К** алі мы перанясёмся ў эпоху пачаткаў Кіеўскай Русі, мы апынёмся ў дзяржаве на ўскрайку Эўропы, якая, тым ня менш, ужо ўваходзіла ў эўрапейскую галяктыку, што якраз тады фармавалася. Ноўгарад быў ганзейскім тэрміналам і жыў паводле балтыйскага часу, аж пакуль яго не зруйнаваў Іван Жахлівы. Калі ж мы перамесьцімся ў Маскоўскую Расею пярэдадня пятроўскае рэвалюцыі, інакш кажучы, у канец XVII стагодзьдзя, мы, згодна з гісторыкам Каштанавым, зможам назіраць расейскае адставаньне прыблізна ў шэсьцьсот-сямсот гадоў і ў структуры ўласнасьці, т.зв. фэадальных адносінах, і на прыкладзе прыгону, і ў разьвіцьці земляробчай тэхнікі, і ў інтэлектуальным жыцьці. Уявіце сабе Францыю часоў Карла Вялікага, але без Алькуіна, прысаборных школаў, бязь сеткі біскупстваў, лаціны і г.д. Хоцькі-няхоцькі ўзьнікаюць асацыяцыі з эпохаю Мэравінгаў.

2) Расейская адрознасьць не палягае адно ў адставаньні, яна экзыстэнцыйная. Яе ключавы пункт — адносіны між манархам і дваранствам. На Захадзе сувэрэн вянчае сабой дваранскую гіерархію, ён вырастае зь ёй з аднаго кораня і падзяляе зь ёй знатнае паходжаньне. Мімэтычныя стасункі, што вызначаюць норавы, гонар і асабістую годнасьць, зьвязваюць і найменшага васала зь ягоным гаспадаром, сюзэрэнам, манархам. Тым часам у Расеі, карыстаючыся словамі Івана III, *“усе халопы”*.
Грамадзкае піраміды мы тут не знаходзім, тутака ўсе роўныя; зрэшты, у краіне дэспатыі падобную роўнасьць нават цэняць, такой роўнасьці, а не гіерархіі вольнасьцяў, нават аддаюць перавагу. Цару ўдалося захаваць за сабою непадзельнае валоданьне зямлёй. У якасьці ўзнагароды за службу ён надзяляе маёнткамі (дварамі) частку сваіх службітаў (“дваранаў”). Каб тыя маглі на гэтай зямлі гаспадарыць і забясьпечваць патрэбы цара, ён прывязвае вясковае насельніцтва да гэтых двароў. У Расеі доўга пратрымаўся прыгон, не адбылося ані замацаваньня прыватнае ўласнасьці на зямлю, ані праведзенае зьверху (панамі, зацікаўленымі стаць уласьнікамі) аграрнае рэвалюцыі. Арыстакраты заўдзячваюць свой дабрабыт выключна выслужаным пасадам. Дваране ня б’юцца на шпагах — аблаюць адзін аднаго ды дадуць пад зад. Калі ж дваранін не дагодзіць манарху, быць яму бітым.
Тут нават няма гарадоў у заходнім сэнсе гэтага слова, а толькі мясцовыя асяродкі ўлады, гарнізоны. Купецкая праслойка тут заўжды адмаўлялася ад палітычнай адказнасьці. Якраз таму Маскоўская Расея ня зьведала рэвалюцыйных зьменаў XII і XIII стагодзьдзяў, там не стварыліся ўнівэрсытэты, ня дзейнічалі вучоныя “жабрацкія карпарацыі”, не існавалі купецкія саюзы, што гандлявалі на далёкія адлегласьці, а пазьней не было пэрыяду рэнэсансу.
Расею, як якарам, трымае ў Эўропе яе хрысьціянская рэлігія, якая, дарма што праваслаўная, усё ж досыць розьніцца як ад лацінскага, так і ад бізантыйскага хрысьціянства. Яе літургія, абрады, нібы дэкарацыя, прыхоўваюць значна больш старажытную абраднасьць, што ідзе ад паганскай магіі, горнецца да маці-зямлі, цара, праваслаўнага “міру”; яна ня здольная вызваліцца ад унутранай, інстынктыўнай, панічнай агіды да ўсяго чужога: лаціны, каталіцтва, габрэйства. Ужо ў часы мангольскага ярма выразна паўстала мяжа пэўнае *умы*,

цяжка пранікальная як з аднаго, так і з другога боку. У выніку ўсяго гэтага ў XV стагодзьдзі ўтвараюцца міты, уплыў якіх не заўсёды быў аднолькава магутны, аднак якім наканавана час ад часу ўваскрасаць у расейскай гісторыі (напрыклад, міт пра *“Трэці Рым”* або пра *“Сьвятую Русь”*).

Эўрапеізацыя

3) З XVIII стагодзьдзя Расея пачала “даганяць”, што прывяло да эўрапеізацыі.

Гэтая палітыка праходзіла па дзьвюх лініях.

Лінія, зьвязаная зь імем Пятра Вялікага, палягала ў кансалідацыі й актывізацыі сродкаў, якія меліся ў распараджэньні манарха і найвышэйшага вайсковага кіраўніцтва. Падоўжала службовая павіннасьць (яна стала практычна пажыцьцёвай), павялічылася паншчына, узмацніліся прыгоньніцтва і прывязка вяскоўцаў да панскага маёнтку, вырасьлі падаткі. Гэты аўтарытарны, валюнтарысцкі шлях “разьвіцьця” (які ставіць сабе за мэту дасягненьне вайсковай і дзяржаўнай магутнасьці, але ніяк не дабрабыту падданых) рэалізоўваўся на працягу ўсяго існаваньня “старога”, то бок царскага, *Ancien Régime*. Аднак ён увесь час прайграваў у сваім змаганьні з другой лініяй, зьвязанай зь імем Кацярыны II. Яна бачыцца нам адзінай манаршай асобай, здатнай дасягаць пастаўленых задачаў, а таксама ўвогуле адзінай, якая мела шанец зэўрапеіць краіну.

Гэтая другая лінія палягала на ўпартым і, як паказаў час, пасьпяховым намаганьні ператварыць пэўную частку служылага дваранства ў ядро арыстакратыі ў эўрапейскім сэнсе слова. Апошняй даруюцца пэўныя правы. Дваранін ужо ня можа быць біты. Ён стаецца ўласьнікам свайго маёнтку і ўсіх прыгонных, што знаходзяцца на ягонай тэрыторыі. Так паступова ўсталёўваецца поўнае права на ўласнасьць. Дваранін, да таго ж, атрымлівае лібэральную адукацыю ў вайсковых вучэльнях, дзе вучаць “манерам”, а неўзабаве — і норавам эўрапейскага арыстакрата. На пачатку XIX стагодзьдзя засноўваецца эфэктыўная сыстэма асьветы. Ядро разрастаецца. Чыноўнікі праходзяць праз навучаньне ў прэстыжных унівэрсытэтах, арганізаваных на нямецкі ўзор. У сярэдзіне XIX стагодзьдзя пачынае дзейнічаць сетка сярэдніх школаў, у якіх вучыцца больш за дваццаць тысячаў навучэнцаў. Пры канцы

таго ж стагодзьдзя пачатковыя школы ліквідуюць масавую непісьменнасьць сярод вясковага насельніцтва.

Тым часам вёска застаецца ў палоне расейскае “старыны”. Вясковец, вызвалены ад прыгону ў 1861 годзе, аднак, ня стаў вольны, бо застаўся ва ўладзе вясковае грамады; ён не зрабіўся ўласьнікам, і на яго не пашырылася юрысдыкцыя судовай сыстэмы, якая абараняе толькі вярхі грамадзтва. Гэта там, на сяле, пад маскаю хрысьціянства перахоўваецца дахрысьціянская абраднасьць са сваімі прымхамі, забабонамі, страхамі і, можна сказаць, са сваім “нацыяналізмам”, калі б размова не ішла пра абагаўленьне чагось значна больш даўняга й цьмянага, чым нацыя ў сучасным палітычным сэнсе. Нягледзячы на ўсё гэта, у XIX стагодзьдзі стваралася ўражаньне, быццам Расеі ўдаецца выбудаваць уласны цэльны *Ancien Régime* эўрапейскага тыпу, з такой самай клясавай гіерархіяй, праўнай культурай і гуманнасьцю. Яе найвялікшым посьпехам было стварэньне літаратуры і музыкі, цалкам эўрапейскіх паводле сваіх тэмаў, крыніцаў натхненьня і высокае вартасьці. Каля 1840 году Бялінскі справядліва бачыў у іх доказ эўрапеізацыі Расеі. Нават стагодзьдзем пазьней яны былі па-ранейшаму найлепшыя. Мы ня можам адмаўляць тое, што расейская культура, створаная намаганьнямі кацярынінскай арыстакратыі, пасьпяхова разьвівалася за часамі Мікалая I і Аляксандра II і існавала ў прыстойных матэрыяльных умовах, што ў вузкага слою людзей (нейкіх паўмільёна асобаў) часта выклікала пэўныя згрызоты сумленьня.
4) Гэты “стары рэжым”, аднак, ня меў тае легітымнасьці, якою перад Францускай рэвалюцыяй цешыліся эўрапейскія “старыя рэжымы”. Рэвалюцыя са сваімі радыкальна новымі прынцыпамі сьмяротна параніла дагэтулешнюю легітымнасьць. Расейскі рэжым, кажучы словамі Русо, *“перасьпеў, не дасьпеўшы”*. З гэтага вынікала наступная дылема: або і далей праставаць да канчатковай эўрапеізацыі (што, аднак, азначае непазьбежнасьць надзвычай глыбокага палітычнага крызысу, які пагражае перакрэсьліць усе ранейшыя дасягненьні), або спыніцца на паўдарозе, што прывядзе да аслабленьня і выцісканьня Расеі з эўрапейскай палітыкі (што пазьней выявіла Крымская вайна).

Урад шукае трэцяга шляху, каб вырашыць гэтую дылему. І знаходзіць для яго апору ў вяртаньні да старажытных сакральных вытокаў, на аснове якіх утвараецца панятак *Сьвятой Русі* і афіцыйны лёзунг рэжыму *“Самаўладзьдзе, праваслаўе, народнасьць”*. Пад гэтай ахоўнаю шыльдаю можа працягвацца і аўтарытарны “пятроўскі” шлях, што вядзе да мацаваньня ўлады, і “кацярынінскі” шлях, нацэлены на цывілізаваньне й гуманізацыю грамадзтва. Ім, аднак, паўстае канкурэнцыя ў выглядзе ўкарэненых у істотна міталягізаванай мінуўшчыне інтэлектуальных дактрынаў, якія імкліва набылі новае жыцьцё і папулярнасьць: рэлігійны “нацыяналізм”, мэсіянізм Расеі як новай абранай нацыі, пакліканьне якой — выратаваць чалавецтва, крайні імпэрыялізм. Моц гэтых ідэяў расьце ў меру павелічэньня нелегітымнасьці рэжыму і набліжэньня яго канца.

5) Паступовая страта легітымнасьці расейскім “старым рэжымам” зрабіла магчымым узмацненьне двух відаў апазыцыі. Першая мела выразна акрэсьленую мэту — новы парлямэнцкі і лібэральны лад на ўзор заходне- або, прынамсі, сяроднеэўрапейскага. Яна ўмацоўвалася ў меру станаўленьня грамадзянскай супольнасьці, абапіраючыся спачатку на слой асьвечанага дваранства, пасьля — на новыя клясы, узгадаваныя гімназіямі і ўнівэрсытэтамі, на ўрбанізаваныя пласты насельніцтва, прадпрымальнікаў і купцоў, а таксама на тыя колы заможнага сялянства, што здабылі свае прадстаўнічыя інстытуцыі. Праз разьвіцьцё такой апазыцыі прайшла ўся Эўропа, і гэта надае Расеі эўрапейскае аблічча. Гэтае разьвіцьцё — вынік мадэрнізацыйных намаганьняў і пятроўскай, і кацярынінскай расейскай дзяржавы. Гэта нацыяналістычная апазыцыя эўрапейскага кшталту, якая не адмаўляе Расейскую імпэрыю як такую і ейную экспансію ў Эўропу.

Другая апазыцыя ставіць сабе неабсяжную мэту — стварэньне грамадзтва, мадэль якога яшчэ нідзе не ажыцьцёўленая, грамадзтва, больш дасканалага і за расейскае, і за грамадзтва эўрапейскага ці амэрыканскага тыпу. Гэтая рэвалюцыйная плынь запазычвае тэзу пра расейскую выключнасьць, асаблівае пакліканьне Расеі і адмаўляе заходнюю мадэрнасьць у імя архаічнага сялянскага калектывізму, падаванага як будучыня сьвету. Наступная, маладзейшая плынь трапляе пад

узьдзеяньне нямецкага марксізму, набывае выгляд сэкты і пераходзіць у падпольле, ставячы сабе мэты скіданьня ўлады, разбурэньня ўсіх сацыяльных, рэлігійных, гуманітарных інстытутаў Расеі і Эўропы, што павінна расчысьціць шлях да ўзьнікненьня дасканалага грамадзтва. Свой валюнтарызм і пропаведзь гвалту гэтая другая апазыцыя пераняла ад пятроўскай дзяржавы. Сваімі хімэрнымі эсхаталягічнымі ўстаноўкамі яна па-свойму працягвае аблудныя мэсіянскія традыцыі, якія пецярбурская дзяржава спрабавала ажывіць, прадчуваючы свой блізкі канец. Галоўны праціўнік гэтае апазыцыі — канстытуцыйны лібэралізм, які вырас на глебе тагачаснай грамадзянскай супольнасьці і разьлічваў, зыходзячы з унівэрсальнасьці лібэральнага шляху, пераняць уладу ад “старога рэжыму” ў адпаведнасьці з эўрапейскім досьведам, не парушаючы права.

Камуністычны эпізод

6) Першая сусьветная вайна вынесла на грэбень хвалі самую экстрэмальную сэкту, якая пратрымаецца пры ўладзе семдзесят гадоў, прыстасоўваючыся да абставінаў, але не мяняючы сваёй сутнасьці. Яна зьнішчыла грамадзянскую супольнасьць, права, уласнасьць і амаль усе цывілізацыйныя элемэнты, што назапашваліся ад часоў Кацярыны II. У пагоні за сваёй утопіяй, недасяжнай, нібы гарызонт, яна ня грэбавала самымі дэспатычнымі вялікадзяржаўніцкімі мэтадамі, якія толькі адшукваліся ў маскоўска-пецярбурскай гісторыі, даводзячы іх да жахлівае дасканаласьці, так што яны станавіліся адначасова пазнавальнымі й непазнавальнымі, бо скарыстаныя сродкі выходзілі за межы ўсякага гістарычнага досьведу дый увогуле чалавечага ўяўленьня. Расея сама пакінула сям’ю эўрапейскіх народаў і абвясьціла сьвету вайну на зьнішчэньне.
Доўга здавалася, што камуністычны ідэал здольны каналізаваць патэнцыял расейскай сакральнасьці, надаць ёй новую форму — непранікальнай заслоны, экзыстэнцыйнага адрозьненьня між сацыялістычным і капіталістычным “лягерамі” (параўнальнага з падзелам паміж мусульманскім *dar el islam* і *dar el harb*), мэсіянскага праекту, праекту стварэньня новага грамадзтва. Аднак па меры расчараваньня ў ідэале, калі сталі назапашвацца збоі ў ягонай рэалізацыі, гэтая сакральнасьць пачала зноў вылазіць вонкі. Захад памылкова

зводзіў яе да нацыяналізму.
Заходняя дыпляматыя, мяркуючы, што мае справу зь нечым даўно вядомым, цягам амаль усёй савецкай эпохі ад 1920 да 1988 году імкнулася зноў увесьці СССР у новы эўрапейскі й сусьветны палітычны кантэкст. Першай ініцыятыву праявіла Нямеччына ўжо ў 1922 годзе (Рапалё). Дэ Голь, вярнуўшыся да ўлады, прымаў жаданае за рэальнасьць, мяркуючы, што Расея ўяўляе сабой такую ж палітычную нацыю, як, скажам, Нямеччына ці Ангельшчына. У сваім антыамэрыканскім запале ён марна спрабаваў пагадзіць уласнае ўяўленьне пра іманэнтны вобраз Эўропы народаў *“ад Атлянтыкі да Ўралу”* з савецкай рэчаіснасьцю, якая распасьціралася ад Эльбы да Ціхага акіяну і масава пладзіла свае псэўдаподыі ў Афрыцы, Азіі, Амэрыцы, а за пасярэдніцтвам камуністычных партыяў — і ў Заходняй Эўропе. Яснае разуменьне ролі ленінскай ідэалёгіі меў Кісынджэр, які пагаджаўся лічыць Савецкі Саюз адным з наяўных полюсаў сілы ў акрэсьленых ім схемах балянсу сілаў на міжнароднай арэне і ўлічваць яго магчымыя “нацыянальныя” інтарэсы. Але ж савецкія ўлады ніколі не ішлі ні на якія саступкі. Да самага свайго скону яны рабілі стаўку на “міжнародную камуністычную сыстэму”, распраўляючыся зь любымі схізматыкамі, пакуль камуністычная ідэя не памерла, пакуль не рассыпалася канчаткова камуністычная структура. Абстрактная ідэя камунізму, гэтаксама як у самой Расеі, паўсюль у сьвеце шукала напаўненьня рэальным зьместам — прагай улады й панаваньня, нацыянальным гонарам, нянавісьцю да варожага “лягеру”. Камунізм паўсюль, дзе пускаў карані, вымушана задавальняў гэтыя мясцовыя патрабаваньні і дзякуючы гэтаму існаваў. Да самага свайго краху камуністычны праект заставаўся сусьветным, інтэрнацыянальным, і заходняй дыпляматыі, нягледзячы на ўсе яе высілкі, так і не ўдалося стрымаць яго ў вызначаных, агульнапрынятых рамках. Дзеля стрыманьня гэтага праекту прыйшлося стварыць небывалы вайсковы патэнцыял.

Посткамуністычная інвэнтарызацыя
7) Урэшце ў 1990 годзе рэжым абрынуўся. Фактычна ён стаўся ахвяраю адданасьці ўласнаму неабсяжнаму сусьветнаму праекту, які прадугледжваў выкарыстоўваньне ўсяго эканамічнага і тэхнічнага патэнцыялу гэтае часткі сьвету для

вайсковых патрэбаў. Варта было дзяржаўнаму апарату ўсьвядоміць, што і ў гэтай галіне ён не вытрымлівае заходняе канкурэнцыі, як ручнік быў кінуты на рынг. Імпэрыя развалілася ўмомант: Расея вярнулася ў свае межы часоў узыходжаньня Пятра Вялікага на пасад. Яна страціла нават частку Ўкраіны, здабытую за царом Аляксеем Міхайлавічам. Жудасная карціна адкрылася сьвету, калі адхлынуў чорны камуністычны прыліў. Ані Захад, падмануты фальшаванымі зьвесткамі, ані Саветы (нават уладныя функцыянэры кампартыі, інтаксыкаваныя ўласнай ілжывай палітыкай) не ўяўлялі, што вынік сямідзесяці гадоў панаваньня ўтапічна настроенай абсалютнай улады будзе гэткі катастрафічны. Давайце зірнём, што паказала “інвэнтарызацыя”.
Колькасьць насельніцтва Расеі сёньня прыкладна роўная паказьніку 1917 году. Нават у Францыі зь яе нізкімі тэмпамі дэмаграфічнага росту насельніцтва за гэты самы пэрыяд часу павялічылася на 50%. Бразылія, жыхарства якой у 1917 годзе было ў сем разоў меншае за расейскае, сёньня абагнала Расею ў колькасьці насельнікаў. І гэта яшчэ ня ўсё: па колькасьці дзяцей Расея адстае ад Нямеччыны, і пэрспэктывы гэтых дзяцей змрочныя: прагназаваная працягласьць жыцьця нізкая, стан здароўя нездавальняльны. Папуляцыя зьмяншаецца з хуткасьцю адзін мільён чалавек у год, нягледзячы на імклівы прыток імігрантаў з мусульманскіх краінаў Цэнтральнай Азіі і Закаўказьзя.
Прадукцыя прамысловасьці, дэфармаванай сямюдзесяцьцю гадамі эканамічна неабгрунтаванай інвэстыцыйнай палітыкі, неканкурэнтаздольная на сусьветных рынках. Сельская гаспадарка вырабляе прадукты нізкае якасьці, што робіць немагчымым узьнікненьне канкурэнтнае харчовае прамысловасьці, і гэта нягледзячы на неабсяжныя чарназёмы. Жыльлёвы фонд, як і сетка аўтадарог і чыгунак, надзвычай састарэлы. Па структуры замежнага гандлю Расея вельмі нагадвае разьвіваную краіну: яна экспартуе газ, нафту, сыравіну, а імпартуе тавары з высокай даданай вартасьцю.

І ўсё ж рэжым пакінуў па сабе і пэўныя плюсы. З прычыны ягонай закасьнеласьці ў Расеі захаваліся некаторыя добрыя завядзёнкі, якіх у сябе мы ўжо ня знойдзем. Перадусім гэта традыцыйная, з па-старасьвецку строгім адборам, сыстэма

адукацыі, прасоўваньне па ступенях якой залежыць ад асабістых здольнасьцяў. Гэтым тлумачыцца той факт, чаму Расея багатая на першаклясных музыкаў, матэматыкаў, інжынэраў — нават насуперак таму, што доўгі час таленты прыцягваў найперш вайсковы сэктар. Спасярод гэтых людзей, якія заслугоўваюць найбольшай павагі, сёньня вялікая доля беспрацоўных, гатовых прадаць свае таленты ў краіны са спрыяльнейшымі ўмовамі.
Аднак наяўнасьць гэтага адоранага слою не павінна выклікаць у нас лішніх ілюзій. Галоўная шкода, зробленая камунізмам, — гэта атупеньне й дэмаралізацыя масаў. Расейскі народ кепска інфармаваны, не навучаны думаць самастойна. Хоць заходняя школа і ўнівэрсытэт даўно ўжо ня тое, чым былі, але яны параней шаму стаяць вышэй за расейскую сыстэму сярэдняй і вышэйшай адукацыі. У савецкай Расеі было адносна мала студэнтаў, у тым сэнсе гэтага слова, у якім яно ўжываецца ў Амэрыцы або Эўропе, і, апрача вывучэньня спэцыялізаваных дысцыплінаў, яны не атрымлівалі добрае гуманітарнае адукацыі, неабходнай для разьвіцьця інтэлекту. Ад зубрэньня ленінскіх бязглузьдзіц карысьці мазгам было няшмат. Дэмаралізацыя была выкліканая ўсімі бакамі камуністычнага жыцьця: лянотай, безадказнасьцю, хлусьнёй, карупцыяй, зьнішчэньнем сямейных повязяў — сьпіс можна было б працягваць доўга. Расейцы не падрыхтаваныя да інтэнсіўнага актывізму заходніх грамадзтваў, і гэта іх прыгнятае.

Перадача ўлады
8) Як у 1989 або 1990 годзе магло паўстаць пытаньне аб перадачы ўлады?
На люты 1917 году ў Расеі існавала паўнавартасная грамадзянская супольнасьць, якая абапіралася на высокадынамічную эканоміку. Аднак вайна яе аслабіла, бальшавіцкая сэкта са сваімі хаўрусьнікамі не дапусьцілі яе да ўлады, а пасьля кастрычніка 1917-га распачалі яе пасьлядоўную ліквідацыю.
Якія групы тэарэтычна можна было ўлучыць у 1989 годзе ў новую грамадзянскую супольнасьць?
Старую грамадзянскую супольнасьць рэпрэзэнтавалі толькі аскепкі колішняй інтэлігенцыі, якая ня здолела выпладзіць болей за танюткую праслойку актыўных “дысыдэнтаў”, — пара

соцень асобаў. Зь іншага боку, у ядры савецкай уладнай эліты выкрышталізавалася новая шматлікая кляса. Гэтыя людзі ўжо зусім ня верылі ў камунізм і імкнуліся адно здабыць пасады, грошы, “выгоды”, якія рабіліся тым больш жаданымі, чым больш паглыблялася агульная беднасьць. Яны трымалі ў сваіх руках вытворчасьць і разьмеркаваньне. Старшыні калгасаў, дырэктары крамаў, дырэктары заводаў у брэжнеўскія гады лічыліся “гаспадарнікамі”, яны заўзята “гаспадарылі” і тым самым знаёміліся з рэальнаю эканомікай, тавараабменам, рынкам. Тэарэтычна яны маглі ўтварыць аснову новай грамадзянскай супольнасьці.
“Кляса гаспадарнікаў” існавала ў цесным перапляценьні з уладнымі структурамі — велізарным камуністычным апаратам. Пасьля краху рэжыму багацьці краіны дасталіся верхавіне “камуністаў-рыначнікаў”. Раней, згодна з афіцыйнай ідэалёгіяй, ім дазвалялася толькі “распараджацца” імі. Распад камунізму зрабіў іх поўнымі ўласьнікамі. Адны лідэры кампартыі дэкляравалі свой паварот да рынкавай эканомікі і абвесьцілі сябе *“рыначнікамі”*; ім удалося амаль задарма прыўласьніць большасьць рэнтабэльных актываў краіны. Іншыя камуністы, якім засталіся адно рэшткі пірага, засталіся вернымі камуністычнай ідэі і паспрабавалі аднавіць сваю партыю.
Заходнія эканамісты паставілі на разьвіцьцё клясы “рыначнікаў”, спадзеючыся, што вакол апошняй утворыцца нарэшце сапраўдная грамадзянская супольнасьць. Гэтая надзея ня спраўдзілася. У выніку надзвычай імклівай канцэнтрацыі капіталу нацыянальнае багацьце апынулася ў руках усяго некалькіх груповак, зьвязаных з новым дзяржаўным апаратам. Ці да месца было б параўнаньне іх з амэрыканскімі *“robber barons”* дзевяностых гадоў XIX стагодзьдзя — Морганамі, Ракфэлерамі, Вандэрбільдамі? Ні ў якім разе, бо яны не будавалі заводаў, як амэрыканцы, а імкнуліся за кароткі час атрымаць максымальны прыбытак. Яны здолелі вывезьці са спустошанай краіны мільярды даляраў, завалодалі заходнімі крэдытамі і перавялі іх у “афшоры”, падманам раскралі ашчаджэньні расейскага люду. Усе гэтыя круцельствы яны правялі ў хаўрусе зь дзяржаўнай уладай.

І гэта зноў вяртае нас да пытаньня ўлады.

Вузкае кола дысыдэнтаў распалася ў першыя посткамуністычныя дні. Габрэі, якія ўтваралі ягонае ядро, зьехалі ў Ізраіль або Штаты. Найбольш слынныя дысыдэнты, якіх савецкая ўлада за часамі Брэжнева — Андропава выгнала з краіны, вяртацца не сьпяшаліся. А нешматлікія вяртанцы прыстасоўваліся да новай улады (асабліва зьдзівіў запал Зіноўева). Інтэлігенцыя часткова здрадзіла сваёй традыцыі й перастала быць апазыцыйнаю сілай. Зрэшты, яна ўжо была ня ў стане змагацца за ўладу. Яна ўсё больш аддалялася ад народу, бо паходзіла з прывілеяваных групаў старога рэжыму. Інтэлігенцыя імкліва губляла сваё значэньне. Магчыма, яна зноў набудзе аўтарытэт, калі рэжым пачне разьвівацца ў бок дыктатуры.

Пачалося змаганьне між фракцыямі, што выйшлі з камуністычнай партыі. Сама ж камуністычная партыя гульню хутка прайграла. Яе прыхільнікі — гэта пераважна найменш прывілеяваныя колы паноўчае касты, якія, тым ня менш, займалі ў пэўнай ступені прывілеяванае становішча ў параўнаньні з астатняй часткай насельніцтва. Хочацца параўнаць іх з “звычайнымі белымі” ў каляніяльных грамадзтвах. Гэта зусім не абсурднае параўнаньне, бо камуністычная каста ў дачыненьні да астатняга люду займала становішча калянізатара. Пэнсіянэры, вэтэраны вайны, вайскоўцы, начальнікі і начальнічкі, армада прапагандыстаў, афіцыёзных журналістаў, саўгасна-калгасных бюракратаў у адзін момант сталі бязродныя, страцілі свой “дабрабыт” і статус, замацаваны безьліччу прывілеяў. Камуністычная ідэя захавалася ў іхным асяродзьдзі не таму, што яны былі леніністамі ў старым ідэалягічным значэньні гэтага слова, а таму, што ім было шкада Саюзу і ягонае славы. Гэтыя змагары, што засталіся “*не у дел*”, аплаквалі камунізм не ў апошнюю чаргу з-за абразы іхнага нацыяналістычнага пачуцьця.

За апошнія трыццаць гадоў існаваньня рэжыму, тым ня менш, у балянсе сілаў усярэдзіне камуністычнае касты адбыліся зьмены. Прафэсійныя ідэолягі, перакананыя прыхільнікі й прапагандысты камуністычнай ідэі паступова гублялі свой аўтарытэт. Патрэбы, што вынікалі з імкненьня ўмацаваць вялікадзяржаўніцкі статус, рэаліі змаганьня “сьвету сацыялізму” з “імпэрыялістычным лягерам” — усё гэта павышала значэньне апарату ўлады. Вайсковы апарат ня мог

жыць толькі “зь Леніным у сэрцы”, ён меў патрэбу ў якаснай тэхніцы, арганізатарах, вучоных. І вытворчы комплекс, цесна зьвязаны з вайсковым, таксама. Задачу кантролю за насельніцтвам ад камісараў перанялі органы міліцыі. КГБ стаўся арганізацыяй, якая славілася сваім усёведаньнем. Тым часам як у партыі шырыліся ўсе прыкметы раскладаньня й карупцыі, КГБ ганарыўся сваімі посьпехамі ў справе міжнароднага шпіянажу, сваёю дысцыплінаванасьцю, арганізацыйнаю згуртаванасьцю. Кваліфікаваны дыпляматычны апарат існаваў у сымбіёзе з КГБ, быў ягонаю спэцыялізаванаю галіной. Гэтая элітарная, тэхнакратычная, сучасная праслойка ў партыі неўзабаве пераняла лідэрства. За Андропавым і Гарбачовым яна паспрабавала рэфармаваць камунізм. І зь лёгкасьцю ад камунізму адраклася, калі рэформа вылілася ў абвал сыстэмы. КГБ перачакаў гэтае міжчасьсе, захаваўшы ўнутранае адзінства, і ўрэшце ўся паўната ўлады вярнулася акурат у ягоныя рукі.

9) Параўнаньне з Польшчай магло б сёе-тое праясьніць.
У Польшчу камунізм быў імпартаваны звонку ў 1945 годзе, прычым наткнуўся на супраціў, які быў хутка зламаны. Старая грамадзянская супольнасьць, часткова панішчаная нацызмам, хоць і папала гэтым разам пад удар камунізму, але выжыла. Нацыяналізаваць сельскую гаспадарку так і не ўдалося. Сялянства гарнулася да сваіх нівак. Выстаяў і папулярны касьцёл на чале з шанаванымі біскупамі, цесна зьвязаны з Ватыканам. Не спынілася настроенае на заходні час інтэлектуальнае жыцьцё. Сьвядомасьць права і прага волі ня сьцерліся з памяці. Патрыятызм бунтаваў супраць камунізму, насуперак распальваньню апошнім антысэміцкага й антынямецкага нацыяналізму, бо гэты нацыяналізм не знаходзіў пунктаў судакрананьня з польскім нацыянальным пачуцьцём. Грамадзянская супольнасьць у 1956 годзе прыўзьняла голаў і пазьней толькі ўзмацнялася і загартоўвалася. У 1988 годзе камуністычная партыя мусіла падзяліцца зь ёю ўладай. На самай справе камуністы тым самым улучыліся ў грамадзянскую супольнасьць, інтэграваліся ў яе. Адкінуўшы ідэалы, пра якія гаварылі сорак гадоў, польскія камуністы пачалі паводзіць сябе паводле новых заходніх нормаў, дбаючы толькі пра тое, каб утрымацца на сваіх месцах.

Ім гэта выдатна ўдалося, дзякуючы салідарнасьці, абумоўленай супольным досьведам, дзякуючы адміністрацыйным здольнасьцям, кваліфікацыі, а таксама палітычнаму спрыту. Іхная замежная палітыка — гэта палітыка любога польскага ўраду: на Захад! У Польшчы абышлося бяз чыстак. Палякі, дзеячы вызваленчага руху, мусяць сужыхарыць з гэнымі людзьмі, якімі яны пагарджаюць, але якім, тым ня менш, паабяцалі, што ня будуць іх ані судзіць, ані караць. Гэтых камуністаў, што зноў ухапіліся за ўладу, нехта параўноўваў з тэрмідарыянскімі функцыянэрамі ў Францыі, якія па зьнікненьні ўсіх рэвалюцыйных ідэалаў у XIX стагодзьдзі аж да самае сьмерці заставаліся на высокіх пасадах. Параўнаньне з Тэрмідорам як характарыстыка новай расейскай улады гучала значна часьцей, чым у дачыненьні да новай польскай улады, але якраз у выпадку Расеі гэтае параўнаньне зусім не да месца.
10) Прычына, вядома, у слабасьці незалежнай грамадзянскай супольнасьці. Партыя ня можа інтэгравацца ў яе — ёй прыйшлося б інтэгравацца з самою сабой. У якабінскай Францыі прынцыпы ўласнасьці і часткова права не былі ліквідаваныя. Якабінцы былі ўласьнікамі, сяляне, іхная апора, сталіся ўласьнікамі законным шляхам. Расея 1990 году ня ведала ні прыватнай уласнасьці, ні права. Уласнасьць была сьпешна разьмеркаваная зьверху неправавым шляхам. Падзел нацыянальнага багацьця, такім чынам, адбыўся выключна на падставе суадносінаў сілаў, і багацьце прыхапіў кіроўчы пласт, які складаўся з партыйных тэхнакратаў, цесна зьвязаных з "кастай рыначнікаў". Тое, што атрымала назву *"мафія"*, — ня што іншае, як сындыкат палітычных і эканамічных інтарэсаў. Ён правёў на сваю карысьць "прыватызацыю" прыбытковых актываў і стварыў алігархію звышмагутных груповак — алігархію настолькі нестабільную, што яе можна параўнаць хіба што з зграяй акулаў, што пажыраюць кіта. І дзейнічала ў гэтай зграі адзінае правіла — правіла суадносінаў сілы.

Ельцынаў момант

11) Які лёс напаткаў грамадзянскую супольнасьць у ельцынскія гады?
Страх зьнік. Людзі перасталі гаварыць на "навамоўі" і ўдаваць сваю адданасьць прынцыпам дыялектычнага матэрыялізму. Да іх вярнулася выбарчае права. У гэтым сэнсе ленінскі

таталітарызм зьнік папросту ў адзін дух. Разьвеяўся неакрэсьлены, бязьмежны страх, у якім людзі жылі семдзесят гадоў, які пранікаў у сем'і ды разьдзяляў іх, ахінаў недаверам усіх і да ўсіх. Зьявілася неабмежаваная свабода думкі і свабода выказваць яе, свабода прыватнага жыцьця. Палёгка гэта была бязьмерная.

У пэўнай ступені сталася магчымай эканамічная ініцыятыва. Як грыбы расьлі крамкі й напаўлегальныя кіёскі. Паціху пачалі ўзьнікаць і ўмацоўвацца прыватныя прадпрыемствы, дарма што даводзілася плаціць адкупное як "недзяржаўнаму" рэкету, так і абдзяржаўленай мафіі, што кантралявалі рынак. Прадажная бюракратыя таксама зьбірала свой хабар.

Бяспраўе — вось галоўная перашкода, якая замінае росквіту "сярэдняе клясы", чаго нецярпліва, але дагэтуль марна чакаюць ад Расеі заходнія назіральнікі. Расейскія законы — гэта звычайная фармалізацыя рашэньняў, прынятых дзяржаўным апаратам. Юстыцыя ўсё яшчэ ня сталася настолькі незалежнай, каб ёй можна было даваяраць вырашэньне канфліктаў. Заканадаўчая база аб прыватнай уласнасьці да сёньня ня створаная. Празь дзесяць гадоў пасьля краху рэжыму ў краіне застаюцца калгасы. Улады абяцаюць зацьвердзіць права прыватнай уласнасьці на зямлю, аднак тут жа дадаюць, што яно не закране ворных зямель.

Як бачым, права ў Расеі недастаткова распрацаванае, аднак значна важнейшае тое, што ў краіне адсутнічае ўсякая прававая культура. Ідэю права ў Расейскай дзяржаве за часамі Мікалая I прышчапіў Сьпяранскі, які першым уклаў і выдаў збор законаў маскоўска-пецярбурскай дзяржавы. Вядома, ня ўсіх, бо некаторыя "сакрэтныя" законы не прызначаліся для друку. Нягледзячы на гэта, ідэя права з тых часоў разьвівалася ў Расеі бесьперапынна ажно да канца старога рэжыму. Натуральна, гэтае разьвіцьцё не закранала сялянства, якое складала дзевяць дзясятых насельніцтва. Судовая сыстэма была разбураная ў першыя тыдні бальшавіцкай улады, а сама ідэя права зьнішчаная разам з правам на ўласнасьць.

Эканамічная ініцыятыва, такім чынам, у Расеі асуджаная на безуладнае, анархічнае жыцьцё, падуладная ціску ўсялякіх забаронаў, абмежаваная цяжарам падаткаў, якія зьбіраюцца рознымі карысьлівымі органамі. Такое спантаннае й спарадычнае эканамічнае жыцьцё ўжо існавала ў досыць

значным абсягу і ў апошнія гады бальшавіцкага рэжыму. За Ельцыным стыхійна засвоеныя навыкі эканамічнай дзейнасьці ўваходзілі ў супярэчнасьць з прававым рэжымам, пагатоў што намаганьні пераадолець невычэрпна вынаходлівую карупцыю, растраты, жульніцтва і раскраданьні так і не былі ажыцьцёўленыя.

Крах сацыялістычных структураў меў як нешчасьлівыя, так і памысныя для разьвіцьця грамадзянскай супольнасьці наступствы. У савецкай эканоміцы існаваў дзяржаўны сэктар і сэктар "ценявы", чытай — нелегальны. Дзяржаўны быў вышэйапісаным чынам "прыватызаваны", а паступова й разрабаваны незьлічонымі актывістамі "ценявога" сэктару, якія за камунізмам былі функцыянэрамі дзяржаўнага сэктару, а ў выніку "прыватызацыі" сталі папросту аддадзеныя самі сабе. Гэта прывяло да зьбядненьня цэлых катэгорыяў насельніцтва, якія, з увагі на сваю пасаду, прафэсію і здольнасьці, не маглі ўзяць удзел у рабунку. Маю на ўвазе настаўнікаў і мэдыцынскі пэрсанал, пэнсіянэраў, сярэднія вайсковыя кадры.

Дадатныя вынікі дало скасаваньне розных сацыялістычных бязглузьдзіц, асабліва плянаваньня, а таксама аслабленьне кантролю і дэцэнтралізацыя сфэры вытворчасьці і разьмеркаваньня. Аднак гэтыя станоўчыя вынікі былі ўраўнаважаныя згубнымі наступствамі ўсеагульнай анархіі і карупцыі. Эканамічная эфэктыўнасьць постсавецкай Расеі відавочна расчаравала ўсіх назіральнікаў, нават тых, што не былі схільныя ідэалізаваць яе і раней. Цяжка давяраць статыстыцы, якая пры камуністах фальсыфікавалася на загад зьверху, а цяпер вельмі слаба пацьвярджаецца дакумэнтальна. Факт, што ў выніку распаду старых сувязяў вытворчасьць рэзка ўпала, а агульны жыцьцёвы ўзровень зьнізіўся. Дэмаграфічныя зьвесткі, узровень сьмяротнасьці і захворваньняў гэта пацьвярджаюць. Сёньняшнюю Расею параўноўваюць ужо ня з Захадам, а з слабаразьвітымі афрыканскімі й азіяцкімі краінамі.

У гэтай агульнай карціне неабходна бачыць розьніцу між Масквой і правінцыяй. У Маскве канцэнтруецца значная частка расейскага багацьця. Гэта сапраўдны мэгаполіс, у якім жыве каля дзесяці мільёнаў чалавек, па сваім памеры блізкі да Стамбулу або парыскай аглямэрацыі. Масква жывая, стракатая, неаднародная. Калі ў Расеі і можна недзе знайсьці дынамічную

грамадзянскую супольнасьць з пэўнай ступеньню аўтаноміі і творчае сілы, дык хіба толькі ў Маскве. Правінцыя зьмянілася страшэнна мала. Чынавенства засталося на сваіх месцах разам з помнікамі Леніну й лёзунгамі пра славу камунізму. Народ захаваў вернасьць звычкам, набытым у брэжнеўскія часы: ён усё трывае моўчкі, цягне ўсё тое, што кепска ляжыць, на ўсё плюе, б'е лынды, п'е і яшчэ раз п'е — у Расеі, паводле статыстычных зьвестак, кожны дарослы мужчына выпівае амаль пляшку гарэлкі ў дзень. За Ельцыным рэгіянальныя кіраўнікі перанялі згубныя звычкі цэнтральнае ўлады. Сэпаратысцкія настроі існуюць толькі ў аўтаномных рэспубліках, дзе, праўда, жыве 20 % насельніцтва краіны (прыкладам, у Татарстане і Башкірыі). Увогуле ж расейская цывілізацыя й расейская нацыя надзіва гамагенная. Аднолькавай расейскай мовай карыстаюцца ад Смаленску да Ўладзівастоку. Гэтае адзінства стварыла земляробчая калянізацыя вялікіх абшараў, пільна кантраляваная сеткай цэнтральнай улады. Сельская мясцовасьць, у якой дамінуюць калгасныя гаспадаркі, у выніку савецкай індактрынацыі сталася яшчэ больш аднатыпнай.
Няпроста зразумець палітычныя памкненьні расейскай грамадзянскай супольнасьці. Яна, безумоўна, задаволеная зьнікненьнем цяжару ленінскай ідэакратыі. З другога боку, яна не без шкадаваньня згадвае тую атупелую пэўнасьць, якою гарантаваў разьвіты брэжнявізм. Яна пакутуе ад посткамуністычнай анархіі і прагне аднаўленьня "парадку". Палітычныя свабоды, актыўны ўдзел у палітычным жыцьці і дэмакратыя не ўваходзяць у лік ейных прыярытэтаў.

Рэлігія і нацыяналізм

12) Заходнія хрысьціяне марылі пра "духоўнае адраджэньне" расейскае нацыі. Яны горка расчараваліся. Старая царкоўная гіерархія, рэкрутаваная з блаславеньня КГБ, не зьмянілася. Багата людзей з усіх узроўняў расейскага грамадзтва (і дзяржаўная эліта, вядома) адведвае царкву. Адчынілася шмат новых манастыроў. Па хвілінным запале, аднак, узровень рэлігійнасьці зноўку ўпаў прыкладна на французкі ўзровень, (г.зн. толькі блізу 4 % вернікаў рэгулярна ходзяць у царкву і выконваюць хрысьціянскія абрады).
Рэлігія, уласна кажучы, — паказьнік прывязанасьці да

старажытнай расейскай сакральнасьці, да абагаўленьня грамады. У XIX стагодзьдзі славянафільскі рух у Расеі канчаткова зьнітаваў рэлігію з нацыяналізмам, а нацыяналізм — з рэлігіяй. Усё рэлігійнае зрабілася нацыянальным і наадварот. Самавар набыў рэлігійную афарбоўку, Дух Сьвяты — нацыянальную. Калі адна частка расейскае літаратуры была лібэральная і эўрапейская (Пушкін, Чэхаў), то другая — Гогаль, Дастаеўскі, сымбалісты, большасьць філёзафаў і палітычных мысьляроў — жыла славянафільствам. У 1941 годзе, калі Сталін дазволіў царкве выйсьці з падпольля, яна пакорліва пайшла на службу дзяржаве, каб на ёй і застацца. Кандыдатура цяпершняга патрыярха Аляксія II была ня толькі ўхваленая КГБ, як і кандыдатуры ягоных папярэднікаў, але нават, як сьцьвярджаюць, непасрэдна выйшла з шэрагаў гэтай арганізацыі.

У Расеі заўжды існавала два праваслаўі. Першае — легітымная галіна хрысьціянства, якая дала сьвету пакутнікаў, сьвятых, сапраўдных вернікаў. Другое жыве сваёю агідаю да лацінства, да каталіцкага Захаду. Менавіта гэтую царкву дазволілі Сталін і ягоныя наступнікі, менавіта зь ёю новая расейская дзяржава лічыцца і на яе абапіраецца. У 1999 годзе екацярынбурскі япіскап загадаў спаліць на сваім падворку нават не каталіцкія ці пратэстанцкія кнігі, а выданьні Расейскай замежнай праваслаўнай царквы. У сынадальнай царкве пасьля Пятра I нешта падобнае было б немагчыма, гэта вяртаньне практык часоў Русі Маскоўскае.

Прычым, каб індывід адчуў сваю прыналежнасьць да праваслаўнай Русі, яму зусім не абавязкова быць заўзятым вернікам. Шчыры хрысьціянін Салжаніцын не дапускае, каб расеец мог выбраць інакшую хрысьціянскую веру, чым расейскае праваслаўе. Паводле ягонага сьцьверджаньня, польскае ўварваньне ў XVII стагодзьдзі было горшым за мангольскае нашэсьце, бо магло зьмяніць веравызнаньне краіны. Калі чалавек расеец, ён праваслаўны, незалежна ад таго, верыць ён у Бога ці не. Так габрэй застанецца габрэем, нават калі зрачэцца Майсеевага Госпада і ягоных прыказаньняў. Русь-матухна, Сьвятая Русь… Гэтыя кандовыя паняткі дагэтуль “абуджаюць” глыбінныя, адвольныя рэфлексы расейскай душы. Паказальна, што расейскія ўлады спасылаюцца не на праваслаўе, а на “праваслаўнасьць”. Гэты

наватвор — сынонім *“расейскасьці”*. Гарбачоў, Ельцын, Прымакоў, Пуцін засьведчылі, што яны “практыкуючыя праваслаўныя”. Праваслаўе Маскоўскага патрыярхату атрымала маральны, а часткова й юрыдычны статус дзяржаўнай рэлігіі.

Часіна КГБ

13) 31 сьнежня 1999 году Ельцын падаў у адстаўку і вызваліў месца Пуціну, атрымаўшы гарантыі асабістай бясьпекі, захаваньня сваёй маёмасьці і недатыкальнасьці сваёй сям’і. Тым самым ён даў магчымасьць стварыць новы дзяржаўны апарат, самай выразнай рысай якога зьяўляецца блізкасьць да КГБ. Большасьць ключавых пасадаў у гэтым пераўвасабленьні намэнклятуры дасталася выхадцам з згаданай арганізацыі. Гэтаксама, як Леніну ў 1917 годзе ўдалося захаваць сваю хеўру ад раскладаньня, так у 1990—1999 гадох КГБ пашчасьціла ўтрымаць дысцыпліну, згуртаванасьць, элітарнасьць, тым часам як Камуністычная партыя збольшага разбадзялася. Так, як у 1917 годзе народ слушна разважыў, што анархія — самы невыносны з усіх рэжымаў, і зьмірыўся з рэжымам бальшавіцкім або яго падтрымаў, гэтак і Пуціну перамога на выбарах далася без усякіх праблемаў. Былая камуністычная партыя сваю легітымнасьць чэрпала з “праўдзівасьці” свайго вучэньня, якога ніхто ня мог аспрэчыць. Яна была “духоўнаю сілай”, што абапіралася на свае “органы”. Новай уладзе не патрэбна сваё вучэньне, бо сваю легітымнасьць яна чэрпае з “волі народу”, і каму якая справа, што свайго трыюмфу яна дасягнула шляхам падману і ціску. Верхавіна партыйцаў-рыначнікаў сваю сумнеўнага паходжаньня маёмасьць засьцерагла правам на прыватную ўласнасьць. Найвышэйшая тэхнакратычная й палітычная праслойка партыі ўмацавала сваю ўладу ўсеагульным выбарчым правам, з карысьцю для сябе засвоіўшы лекцыі Напалеона III і Бісмарка пра кансэрватыўную каштоўнасьць усеагульнага выбарчага права. Па атрыманьні мандату Пуцін абнавіў усталяваны “парадак”. Парлямэнт (Дума) ператварыўся ў рэгістратуру. Губэрнатары былі прадубляваныя “генэрал-губэрнатарамі” і ўцягнутыя ў новую каманду (ці, прынамсі, вымушаныя ўдаваць сваю ўцягненасьць). Застаўся друк і мэдыі. Пуціну не патрэбны татальны кантроль над імі, бо камуністычная прапаганда,

выхаваньне “новага чалавека” й індактрынацыя ўжо не стаяць на парадку дня. Велізарная армія “прапагандыстаў” і працаўнікоў галоўліту засталася бяз працы. Заходнім вачам улада імкнецца прэзэнтаваць дэмакратычны фасад. У савецкім па сваім духу і фактычна “дзяржаўным” друку дзе-нідзе дапускаецца дыскусія ці нават апазыцыйны настрой. Мэдыйныя магнаты не вярнуліся ў кола сяброў пуцінскай улады. Пара занадта цікаўных або адважных журналістаў паплаціліся здароўем ці жыццём. На іх прыкладзе ўсе наглядна пабачылі, што ад палітыкі варта трымацца ўбаку. Аднак унутраная лёгіка дзяржаўнага аўтарытарызму ня можа прымусіць Пуціна парушыць пачатковы намер і зусім заткнуць мэдыям рот. Пакуль да гэтага не дайшло, бо гэта й не патрэбна. Пераважная большасьць палітычнае касты далучылася да пуцінскай сыстэмы. Падпарадкаваліся і тыя, каго лічылі “лібэраламі”, хто імкнуўся правесьці прыватызацыю на польскі манер ды ўтварыць сапраўдную рынкавую эканоміку (як, напрыклад, Гайдар), і група, створаная Прымаковым — былым кіраўніком разьведкі, а пасьля пэўны час ельцынскім прэм’ерам — ды маскоўскім мэрам Лужковым, якая нейкі час стаяла за паўкроку ад трону. Падпарадкаваліся і былыя дысыдэнты. Камуністычная партыя старанна супрацоўнічае з рэжымам. Такім чынам, сучасны рэжым можна апісаць як аўтарытарны, кантраляваны дысцыплінаванай партыяй, што вырасла з КГБ і вайсковага істэблішмэнту. Так званыя “алігархі”, то бок карысьлівыя авантурысты, якія зьявіліся як Піліп з канапель, — або далучыліся да ўлады, або, на вялікую ўцеху грамадзкасьці, выстаўленыя за дзьверы.

Што рабіць?

14) Савецкая ўлада да канца заставалася ў палоне ленінскай ідэалёгіі і ніколі ня ставіла сабе за галоўную мэту павелічэньне дабрабыту грамадзян і дасягненьне ўсеагульнае заможнасьці. Гэтыя мэты толькі служылі іншай, больш важнай — павелічэньню вайсковай магутнасьці. Вядома, што вайсковыя выдаткі ў часе разьвітага брэжнявізму дасягалі 40 % ВУП. Астатнія 60 % уяўлялі сабою падмурак для нарошчваньня аб’ёмаў вытворчасьці ВПК і падтрыманьня матэрыяльных і інтэлектуальных рэсурсаў, неабходных для жыццядзейнасьці насельніцтва. Таму можна сьцьвярджаць, што на вайскова-

прамысловы комплекс працавала ўся вытворчасьць краіны. Аднак і ў гэтых умовах назіраўся пэўны “прагрэс”: прыгадайма будаўніцтва гарадоў, масавую асьвету, асваеньне тэхнікі і этапныя дасягненьні ў асобна ўзятых галінах.

Цяпер ранейшая ідэалёгія зьнікла і расейскаму ўраду даводзіцца вырашаць тыя самыя “нармальныя” праблемы, што і любому нетаталітарнаму ўраду. Расейскія кіраўнікі часта добрым словам згадваюць Піначэта, які ў варунках аўтарытарнай дыктатуры забясьпечыў рост чылійскай эканомікі, сур’ёзна разладжанай сацыялістычным экспэрымэнтам. Аналёгія зразумелая: эканамічныя мэханізмы, успадкаваныя Расеяй ад Савецкага Саюзу, былі надзвычай неэфэктыўныя. Эканоміка была ня ў стане вырабляць тавары, канкурэнтаздольныя на сусьветных рынках, ці нават задавальняць сьціплыя патрэбы насельніцтва, якое сёньня ўжо ведае, як жывецца на Захадзе.

Невялікая Германская Дэмакратычная Рэспубліка была самай сучаснаю й разьвітаю зонай “сацыялістычнага лягеру”. Аднак пасьля аб’яднаньня ўлады ФРГ, на сваё вялікае зьдзіўленьне, знайшлі там занядбаныя ворныя землі, неймаверна адсталыя тэхналёгіі, састарэлае прамысловае абсталяваньне, працоўных, якія страцілі жаданьне і ўменьне працаваць. ФРГ адразу ж увяла ва ўсходніх землях сучаснае грамадзянскае права, цалкам абнавіла сыстэму дзяржаўнае адміністрацыі і штогод інвэставала ва ўсходнія землі сто мільярдаў марак. Мінула дзесяцігодзьдзе, а ўзровень разьвіцьця ўсходніх земляў Нямеччыны ўсё яшчэ ніжэйшы за ўзровень заходніх.

Расея, насельніцтва якой у дзевяць разоў большае за ГДРаўскае, а плошча — у дзьвесьце разоў большая, знаходзіцца ў значна горшым стане. Няма сучасных аўтадарог, у больніцы не падаецца гарачая вада, у вёсках няма водаправодаў, а часта й электраэнэргіі, камунальная маёмасьць знаходзіцца ў жудасным стане, навакольнае асяродзьдзе страшэнна забруджанае. Працоўныя развучыліся працаваць. Расея здольная хіба што экспартаваць газ, у меншай ступені — нафту (за кошт зьніжэньня ўнутранага спажываньня), рэдкія мінэралы, прадукцыю зь нізкай даданай вартасьцю, урэшце, зброю. Заканадаўчы лад, грамадзянскае і прыватнае права, падатковая сыстэма ўсё яшчэ чакаюць свайго стварэньня. Наяўныя ўмовы робяць немагчымым прыток буйных замежных

інвэстыцыяў. Зрэшты, на мадэрнізацыю Расеі не хапіла б усіх грошай сьвету. Гэта не пад сілу любому ўраду, нават самаму адважнаму. Да таго ж, трэба яшчэ падумаць, а ці ў той бок разьвіваецца сучасная Расея. Галоўныя эканамічныя акторы даюць хрэстаматыйныя прыклады карупцыі і ўцёкаў капіталу. Грошы, якія міжнародныя банкі й фінансавыя інстытуцыі давалі хутчэй з палітычных, чым з эканамічных прычынаў, былі змарнаваныя. Аўтарытарныя структуры новай дзяржавы абяцаюць змагацца з карупцыяй, а насамрэч рэпрэсіі абрынаюцца на тых, хто ня мае “даху” ў Крамлі. Падобныя ўмовы не спрыяюць разьвіцьцю ў краіне прадпрымальніцкай ініцыятывы. Дый наўрад ці лібэралізм мог бы ўжыцца з адміністраваньнем і цэнтралізацыяй, калі на чале выканаўчых органаў стаяць людзі без усякай эканамічнай культуры. Магчыма, пасьля дзесяці гадоў крызысу спад у расейскай эканоміцы і ўдасца пераадолець. Назіральнікі, аднак, не заўважаюць нічога падобнага да скачка наперад, які зьдзейсьнілі Польшча ці Вугоршчына. Абсалютна відавочна, што гэтага скачка не адбудзецца ні заўтра, ні пазаўтра. У XVII стагодзьдзі Расея была бедным і барбарскім краем, з усіх бакоў аточаным бліскучымі цывілізацыямі: Эўропай, Асманскай імпэрыяй, Пэрсіяй сэфэвідаў, магольскай Індыяй, маньчжурскім Кітаем, Японіяй. Да 1917 году Расея заставалася хоць і адсталым, але ўсё ж праўдзівым эканамічным працягам Эўропы. На пачатку XXI стагодзьдзя Расея як бы вярнулася на свае пазыцыі XVII ст. — ня толькі адносна Эўропы, але, відаць, і адносна Турэччыны, Індыі і Кітаю, бо тэмпы эканамічнага росту ў гэтых краінах вышэйшыя за расейскія.

15) У сучаснай сыстэмы мала шанцаў на абгрунтаваньне сваёй легітымнасьці павелічэньнем усеагульнай заможнасьці, якое, напрыклад, ужо дваццаць гадоў легітымізуе ўладу ў Кітаі. Трэба шукаць іншыя, палітычныя, падставы. І першае пытаньне, якое паўстае перад Расеяй: што рабіць з расейскай мінуўшчынай? З тысячагадоваю спадчынаю Расеі, якую рэжым ужывае для легітымізацыі сваёй цяпершчыны й будучыні? Прынцыповае значэньне мае тое, што ніводзін з расейскіх урадаў па 1989 годзе публічна не асудзіў камунізму як такога. Кантраст зь Нямеччынай 1945 году самы выразны. Нацысцкая Нямеччына была акупаваная. Міжнародны трыбунал асудзіў на сьмерць найвышэйшых кіраўнікоў нацысцкае партыі. Нямецкая

юстыцыя гэтую эстафэту пераняла. *Damnatio memoriae* сьцерла ўсе знакі нацысцкага панаваньня. Нямецкі дух мусіў прайсьці праз зваротны чысьцец. Нямецкі народ быў закліканы да калектыўнай каяты. Гітлерава імя было выклятае навечна.

У Расеі нічога падобнага ня здарылася. Яна не прайшла праз акупацыі, і гэта вельмі кепска, бо Нямеччына і Японія вылечыліся ад уласнай атруты найменшым коштам без унутранай адказнасьці, без празьмернага цяжару для палітычнае будучыні. Ніводзін зь вядучых камуністычных функцыянэраў ня быў ані пакараны, ані асуджаны, ані ўдзельныя злачынствы — паняволеньне расейскага і іншых народаў. Палітычны актыў не падпаў пад люстрацыю і навіны зьменаў. Асабліва гэта тычыцца дыпляматычнага корпуса, які застаўся ўбаку ад усякага “абнаўленьня”. Помнікі Леніну-правадыру стаяць, як стаялі, ягоны маўзалей застаецца культавага паломніцтва. Не адбылося ніякага *damnatio memoriae*. Ані сам расейскі народ, ані ягоныя самыя аўтарытэтныя прадстаўнікі гэтага не зрабілі, навіны паспрабавалі гэтага зрабіць.

Савецкі пэрыяд — паўнавартасны складнік афіцыйнай вэрсіі расейскай гісторыі, і я не сустрэў ніводнага расейца, які б за яго гэтак саромеўся, каб выкрэсьліваць яго з гэтай памяці. Савецкі час асацыюецца найперш з ідэяй абароны айчыны. Маскоўскі мэр Лужкоў заставіў свой горад напышлівымі помнікамі героям вялікай айчыннай вайны. Расея дзейнічае як Францыя, якая ў імя нацыянальнага адзінства пасьля паразы 1870 году і перамогі Рэспублікі вярнула ў францускую гісторыю Канвэнт і Тэрор. У Расеі ў дадатак часткова рэабілітавалі Сталіна, а сьледам за ім і ўсіх бальшавіцкіх правадыроў, пачынаючы ад Леніна зь Дзяржынскім. Чырвоны сьцяг і надалей застаецца сьцягам расейскай арміі. Сталінскі савецкі гімн на ўцеху амаль усім ізноў вярнуў сабе статус дзяржаўнага, толькі аўтар ранейшага варыянту крыху падкарэктаваў словы, і згадку пра *“вялікага Сталіна”* замяніў хваласьпеў праваслаўнаму расейскаму Богу. Нешматлікая ініцыятыва “Мэмарыял”, створаная былымі дысыдэнтамі, імкнецца нагадваць расейскай памяці, што бальшавізм, тэрор, Гулаг не былі мімалётнаю недарэчнасьцю, пра якую лепей не ўспамінаць, не былі звычайным зьбегам абставінаў, якія

*** Андрэй Альмарык (нар. 1938 г.) - расейскі пісьменнік і дысыдэнт, аўтар кнігі "Андрей Альмарык. Статьи и письма 1967-1970". Амстердам: Фонд имени Герцена, 1971. Рэд.**

здараюцца ў гісторыі, — але што яны заслугоўваюць маральнага асуджэньня. Гэтая група вельмі самотная ў сваіх перакананьнях, праўда, наколькі я ведаю, у апошнія месяцы яе шэрагі пачалі расьці.
Архітэктурныя памяткі рэлігійнага нацыяналізму колішняй Маскоўскай Русі рэстаўраваныя. Масква, у якой савецкая ўлада зруйнавала сотні цэркваў, адбудавала іх зь дзіўнай хуткасьцю. Правінцыя не адстае ад сталіцы. Дзяржаўным гербам Расеі зноўку зрабіўся дзьвюхгаловы арол Івана III. Расейскі сьцяг адпавядае праекту Пятра I. Здаецца, найбольшую павагу ў расейцаў выклікаюць самыя дэспатычныя постаці: найперш Пётар Вялікі й Аляксандар III. Кацярына II і "цар-збаўца" Аляксандар II карыстаюцца нашмат меншай папулярнасьцю. Пятроўская "лінія" на валюнтарызм і дзяржаўны аўтарытарызм яўна бярэ верх над цывілізацыйнай і вызвольнай "лініяй" Кацярыны і Аляксандра II. Пуцін публічна выступае як верны прыхільнік цара Пятра (калясальны помнік у ягоны гонар ужо стаіць пэўны час на беразе Масквы-ракі), а непублічна — як прыхільнік Сталіна (праўда, гэты гарнітур яму пакуль яўна завялікі). Гэта, аднак, не замінае яму насіць на грудзях крыжык і прыслухоўвацца да фанатычнага прапаведніка "*расеянізму*" айца Ціхана.
Андрэй Амальрык * у 1970 годзе апісаў спэктар расейскіх ідэалягічных плыняў. Ён з дакладнасьцю паўтараў стан на 1913 год, бо саветызм усё замарозіў у ранейшым выглядзе, прыпыніўшы ідэйнае разьвіцьцё. Гэты спэктар сягаў ад патрыятычнага лібэралізму праз эўразійства ажно да заўзятага шавіністычнага славянафільства. Сёньня, здаецца, шалі схіляюцца ў бок эўразійства, бо лібэралы і нешматлікая грамадзянская супольнасьць, што іх падтрымлівала, пацярпелі паразу. Пераважаюць антызаходняя істэрыя, адстойваньне *"расейскасьці"* ды заклікі ісьці расейскім шляхам. Зь лёгка зразумелых прычынаў іх сілкуюць таксама расчараваньне ў камунізьме й сёньняшняя галеча. Увадначас іх інсьпіруе сама дзяржава, хоць і асьцярожна — толькі ў той ступені, каб яны выпадкова не парушылі вобразу, які яна стварыла для замежжа.
16) Пуцін сваё ўзыходжаньне да ўлады грунтаваў на відовішчных крымінальных учынках. Сэрыя тэрактаў, у якіх без найменшых доказаў былі абвінавачаныя чачэнцы, забрала болей за васямсот жыцьцяў. Сёньня ніхто ня можа сказаць, ці

не былі гэта падкопы ФСБ. Адразу ж была разьвязаная вынішчальная вайна супраць малога народу, які налічвае менш за мільён чалавек. Гэты блізкі да канчатковага завяршэньня генацыд атрымаў шырокую падтрымку грамадзкасьці і нават найвышэйшых маральных аўтарытэтаў краіны. Мы ня маем права зьмешваць гістарычны аналіз і маральнае асуджэньне, аднак гісторык мусіць канстатаваць, што палітычныя намеры, заснаваныя на злачынстве, рэдка калі вястуюць нешта добрае. Раней ці пазьней, як толькі намер сутыкнецца зь цяжкасьцямі, злачынства, як у антычнай трагедыі, "выплыве на паверхню", і раптам выявіцца, што легітымнасьць аўтарытэту была ім самім паціху выедзеная зь сярэдзіны, што ён страціў напаўненьне і зьмест і бурыцца — або вымагае далейшых злачынстваў.

"Блізкае замежжа"

17) *"Ня ведаю Расеі, ведаю толькі Расейскую імпэрыю",* — казаў славуты міністар Вітэ. Камуністычнае панаваньне ў сваім пачатку не насіла імпэрыялістычнага характару: у першыя яго гады расейцы ня мелі ніякіх прывілеяў у параўнаньні зь "мясцовым" насельніцтвам. Аднак мала-памалу сытуацыя зьмянілася. На схіле брэжнеўскіх часоў карціна выглядала інакш: мясцовыя нацыяналізмы жорстка душыліся на карысьць афіцыйнай, моцна афарбаванай у расейскі колер, "савецкай культуры" й "савецкага патрыятызму". Мясцовых камуністаў на ўсіх значных партыйных пасадах дублявалі расейцы.

У процівагу гэтаму ценявая эканоміка й мафія, зьвязаныя зь мясцовымі камуністычнымі партыямі, разьвіліся да такой ступені, што разам з нацыянальнымі меншасьцямі яны ўтварылі нейкі правобраз грамадзянскай супольнасьці, у якой было месца для нацыянальнае сьвядомасьці. У 1991 годзе СССР падзяліўся на "нацыі", пра жыцьцяздольнасьць якіх ніхто нават не падазраваў. У Сярэдняй Азіі лініі, накрэсьленыя на мапе Сталіным, сталіся раптам "нацыянальнымі" межамі. Іслам, які выжыў пад камуністычнай абалонкай, вымусіў эміграваць вялікую частку савецкіх прыбышоў. Балтыйскія краіны імгненна аддзяліліся, а за імі настаў чарод Украіны, Беларусі, Грузіі, Арменіі й Азэрбайджану.

Для расейскай сьвядомасьці гэта было страшэнным шокам. Некаторыя з гэтых тэрыторыяў былі здабытыя яшчэ ў XVIII стагодзьдзі. Імпэрыялістычная пыха, усьведамленьне ўлады над

многімі народамі былі ўцехай для Расеі цягам ажно двух стагодзьдзяў. *“Раб на каленях марыць пра ўладу над сьветам”,* — кажа Кюстын, перафразуючы ня менш славутыя словы Лермантава. Яшчэ ісламскіх ускраінаў расейцам было ня так шкада, а вось, скажам, жаль па славянскай і пераважна праваслаўнай Украіне, якую сам Ленін у 1918 годзе выменяў у Людэндорфа на пшаніцу, набываў проста гістэрычныя формы. Па маіх назіраньнях, ніводзін расеец да сёньня не зьмірыўся з стратай Украіны, а Салжаніцын наракае пра гэта пры ўсякай нагодзе.

Постсавецкая ўлада за мінулыя дзесяць гадоў скарыстоўвала розныя мэтады. Разгром Чачэніі засьцярог іншыя аўтаноміі ад праяўленьня самастойнасьці: гэта было папярэджаньне якутам, татарам, башкірам і памежным народам перадгор’яў Каўказу. Расея зноў узяла пад свой кантроль межы былога СССР паўсюль, акрамя Прыбалтыкі. Прыднястроўе — па сутнасьці, вайсковы анклаў — аблямоўвае Ўкраіну з захаду і дублюецца вайсковымі базамі ў Малдове і Беларусі. Турэцкая і іранская межы таксама пільна вартуюцца, а лякальныя канфлікты даюць зачэпку для знаходжаньня расейскіх войскаў на мяжы з Аўганістанам. Вайсковыя базы трывала асталяваліся ў Грузіі, ад якой адарваныя дзьве правінцыі. За межамі Расеі знаходзіцца больш як дзьвесьце тысяч расейскіх вайскоўцаў. Даўні канфлікт між армянамі й азэрбайджанцамі выкарыстоўваецца сёньня, як два стагодзьдзі таму. Аншлюс Беларусі запраграмаваны пагадненьнямі зь мясцовым дыктатарам. У балтыйскіх краінах жывуць вельмі моцныя расейскія меншасьці, ірэдэнтысцкія пачуцьці якіх аднойчы могуць прабудзіцца. Для Ўкраіны, у сваю чаргу, прыдаюцца любыя сродкі: заснаваньне партыі, якая выступае за ўзьяднаньне з Расеяй, кіраваньне праваслаўнай царквой з Маскоўскага патрыярхату, сабатаваньне рэформаў, якія ўкраінская дзяржава магла б распачаць, “нафтагазавы” ціск. Усе вышэйзгаданыя нацыі адчуваюць пагрозу і бароняцца хто як можа. І ўсё ж давайце паглядзім на гэта расейскімі вачыма: да чаго вядзе гэтая нягнуткая палітыка, гэтая сумесь лісьлівасьці, застрашэньня й грубай сілы? Да аднаўленьня СССР? Нашто? Мэта падаецца наўзьдзіў архаічнай, але яна адпавядае імкненьню максымальна павялічыць свае абшары, як гэта практыкавалі колішнія імпэрыі (зь якіх расейская

засталася апошняй). Ці мо гэта імкненьне да каляніяльнага разьвіцьця, лязо якога скіраванае супраць больш эўрапейскіх тэрыторыяў, чым сама Расея, г.зн. супраць Украіны і балтыйскіх дзяржаваў? Але гэтае памкненьне настолькі ж бясплённае, неправамоцнае й анахранічнае, як Гітлерава апантанае жаданьне здабыць “жыцьцёвую прастору на ўсходзе”, якую той лічыў жыцьцёва неабходнай для нямецкай нацыі ў той час, калі немцы пакідалі вёскі, пераяжджаючы ў гарады працаваць на фабрыках і ў сфэры паслугаў, і калі, да таго ж, зьніжалася нараджальнасьць. Гэта — манія мапы, геапалітычнае шаленства.
Гонар за неабсяжнасьць радзімы — адзін з галоўных складнікаў расейскага гонару і адна зь ейных галоўных матывацыяў. Яна таксама абапіраецца на значэньне *уммы* ў яе “расейскім” выглядзе. Расейскае грамадзтва ня можа і думкі дапусьціць, каб Японія, хай нават па цане золата, вярнула сабе дзьве нікчэмныя выспачкі, скрадзеныя Сталіным у 1945 годзе. Расейцы не зважаюць на тое, што сямнаццаць мільёнаў квадратных кілямэтраў уяўляюць для сучаснае эканомікі страшэнны цяжар. Цяпер за адлегласьці трэба плаціць. Але так не было ані тады, калі шляхам сельскагаспадарчай калянізацыі або гандлю футрам паступова заваёўваліся малазаселеныя тэрыторыі, ані пры рудымэнтарнай эканоміцы. Сёньня трэба карыстацца і кіраваць гаспадарліва, усё пралічваць, а гэта перавышае сілы расейскага народу. Сібір стаіць пусты й бязьлюдзее ўсё больш.
Вядома, ідэалістычнае абагаўленьне абшараў і зачараванасьць прасторай для расейскага грамадзтва — спрадвечныя вартасьці, якія цяжка зжыць, тым больш што ніякіх іншых яно ня мае. Але давайце ўявім сабе, што Пуцін або ягоныя пасьлядоўнікі дасягнуць сваіх мэтаў і ім удасца аднавіць СССР. Вынікам было б ператварэньне ўсяго гэтага рэгіёну ў мілітарызаваную імпэрыю, якая ня будзе мець нават цывілізацыйнага або культурнага прэстыжу колішняй царскай Расеі. Гэта цалкам вычарпала б сілы няшчаснага й зьняможанага расейскага народу.

Палітыка, заснаваная на страху
18) Расея гучна ўварвалася ў Эўропу пасьля перамогаў Пятра Вялікага над Швэцыяй. Яна імгненна была прынятая ў сям’ю

эўрапейскіх народаў, дарма што Эўропа добра ведала, чаго вартая расейская эўрапейскасьць. Як бліскуча паказаў Марцін Маля, яе прынялі, бо для астатніх партнэраў гэта было выгадна. Тым часам як Расея разрасталася на поўдзень і на захад, Аўстрыя, Прусія і Ангельшчына таксама ніяк сябе не абмяжоўвалі, а Францыя была вымушана адно фрустравана сачыць, як Расея душыць Швэцыю, адкідвае Асманскую імпэрыю і паглынае Польшчу — традыцыйных хаўрусьнікаў Парыжу. Толькі папа доўга адмаўляў цару ў імпэратарскім тытуле, а вялікія эўрапейскія дзяржавы прызналі тытул безь нічога ніякага.

Расея ніколі не шкадавала самых цывілізаваных ды інтэлігентных кадраў для свайго дыпляматычнага корпусу. Таксама яна ўмела сымуляваць прывабныя для эўрапейскай грамадзкасьці погляды, добра адчувала моду: за часамі Кацярыны гэта было асьветніцтва; піетысцкі масонскі інтэрнацыянал — за Аляксандрам I; абарона кансэрватызму і хрысьціянства — за Мікалаем I. Мішле ў 1842 годзе напісаў: *“Расея — гэта мана. Гэта crescendo маны і крывадушнасьці. Сёньня яна нам кажа: я — хрысьціянства, а заўтра скажа: я — сацыялізм”.*

Напярэдадні 1914 году Расея на міжнароднай арэне была такой самай краінай, як і ўсе астатнія. Імпэрыялістычная, але ня болей за Францыю ці Ангельшчыну, экспансіянісцкая, але ня больш, чым Аўстрыя ці Нямеччына. У першай сусьветнай вайне яна заставалася вернай хаўрусьнікам ажно да пярэдадня свайго краху. Вытрывай яна яшчэ год і сядзь за стол пераможцаў, то магла б атрымаць Царград, частку Балканаў, усю Польшчу, вялікі кавалак Нямеччыны — то бок амаль усё, што заваюе Сталін. Прынамсі, гэта абяцала ёй Францыя.

На ўсім працягу існаваньня камуністычнага рэжыму Расея заставалася вернай ленінскай праграме сусьветнае рэвалюцыі. Ленін і Сталін, аднак, заўжды ўмелі своечасова спыніцца, калі зьдзяйсьненьне праграмы ставіла пад пагрозу захаваньне ўлады. Ленін падпісаў Берасьцейскі мір, Сталін згарнуў рэвалюцыйныя акцыі ў Нямеччыне, Кітаі й Гішпаніі, падтрымаў нямецкую правіцу, падпісаў пакт з Гітлерам, потым з ангельцамі й амэрыканцамі і г.д. Знутры гэтая палітыка заўжды здавалася кіраванаю адзіным прынцыпам, вызначаным яшчэ ленінскай лёгікай. А звонку ствараласа ўражаньне, што яна

падпарадкоўваецца двум прынцыпам: Савецкі Саюз як пашыральнік камунізму ў сьвеце быў рэвалюцыйны і разбуральны, у сваёй жа абароне цэнтральных тэрыторыяў і Расеі як апошняй цьвярдыні рэвалюцыі ён як бы цалкам кіраваўся прынцыпам клясычнай палітыкі, што адстойвае імпэрыялістычныя або нацыянальныя інтарэсы. Я — Краіна Саветаў, гляньце на мае крылы, я — Расея, вось мае зубы. Заходняя дыпляматыя нястомна імкнулася разьдзяляць два гэтыя бакі, дыялектычны суплёт якіх яна адмаўлялася бачыць. Пачынаючы ад графа Брокдарфа-Ранцава і Лойд-Джорджа і канчаючы дэ Голем і Кісынджэрам, Маскве прапаноўвалі бартэр: вы спыняеце падрыўную дзейнасьць супраць нас, а мы ўзамен абавязуемся ўлічваць расейскія нацыянальныя інтарэсы. Гэтая падвойная гульня страціла ўжо ўсякі сэнс. Адзіная салідарнасьць, на якую *ad extra* Расея можа спасылацца, — салідарнасьць праваслаўная. Аднак кожная праваслаўная царква фармуецца ў сваіх нацыянальных рамках, а гэта рычаг, якім ня так проста авалодаць. Югаслаўскія падзеі выразна тое паказалі. Таксама дарэчы нагадаць, што саветызм надоўга зьнішчыў прэстыж Расеі, які перад першай сусьветнай вайной яна мела, напрыклад, сярод югаславаў і чэхаў. Тады нават у Польшчы існавала прарасейская партыя. Потым зьнікла.
19) У многіх заходніх экспэртаў і ў некаторых колах у самой Расеі ўзьнікла ўяўленьне, што замежная палітыка краіны магла б нагадваць польскую ці вугорскую мадэль: уваход у гульню, ляяльнае далучэньне да эўрапейскай і атлянтычнай сыстэмаў; выкарыстаньне пазыкаў, прапанаваных Эўропай і Амэрыкай, і адплата за іх бясьпекай й рэнтабэльнасьцю; закладаньне асноваў лібэралізму й капіталізму і ператварэньне ў паўнапраўную частку эўрапейскай і атлянтычнай супольнасьці. У гэта верылася тым ахвотней, што ўрад ужо ў 1991 годзе дэкляраваў сваё жаданьне пайсьці менавіта гэтым шляхам. Калі б Мішле быў жывы, ён так перафармуляваў бы сваю думку: *“Расея — гэта* crescendo *маны і крывадушнасьці; учора яна нам казала: я — сацыялізм, сёньня кажа: я — капіталізм”*.
У абарону новых палітыкаў варта адзначыць, што яны паставілі перад сабой амаль невыканальнае заданьне. Ленін казаў, што шлях да сацыялізму — гэта не *“тратуар Неўскага праспэкту”*. Шлях да капіталізму — таксама. Празь дзесяць гадоў мала ўжо засталося на сьвеце людзей, якія ўсё яшчэ вераць, што Расея на

гэтым шляху істотна прасунулася наперад.
Тым ня менш, Расея запатрабавала крэсла або прынамсі зэдлік у большасьці міжнародных фінансавых і эканамічных інстытутаў і яго атрымала. Увадначас, аднак, яна адпалохвае сваёй неахвотай плаціць па пазыках, заўзятым імкненьнем “зьмяніць графік працэнтных выплатаў” і нават такімі чыстай вады маніпуляцыямі, якой быў эканамічны крах 1998 году. Да месца было б сур’ёзна запытацца, ці яна дагэтуль дамагаецца паўнавартаснага сяброўства ў клюбе дэмакратычных дзяржаваў. Чэмпіён сьвету па шахматах Каспараў сёлета заявіў, што расейская замежная палітыка заснаваная на страху. Яна скарыстоўвае страх расейцаў перад “чачэнцамі” (і ўвогуле перад каўказцамі, грузінамі, татарамі і іншымі “чарнажопымі”), перад дзікім капіталізмам (іншы ёй не вядомы), перад *“глябалізацыяй”* (для яе гэта пустое слова). Яна скарыстоўвае і фобіі Захаду, а менавіта два ягоныя ўзаемавыключальныя страхі: з аднаго боку, Захад баіцца расейскай ядравай зброі, часткова таму, што ейны стан небясьпечна пагаршаецца, а таксама таму, што яна, у той самы час, мадэрнізуецца і дасканаліцца. Зь іншага боку, ён страшыцца распаду гэтай вялікай краіны і ўсеагульнай дэстабілізацыі, якую б такі распад мог выклікаць. Урад Пуціна грае на гэтым двайным рэгістры, нагадваючы, што расейскія ракеты ўсё яшчэ стаяць на баявым дзяжурстве, і за адным разам кажучы, што слабасьць Расеі ўзмацняе зусім ня ўяўныя сусьветныя пагрозы — тэрарызм, іслам, Кітай…
Аднак Пуцін чым далей, тым больш псуе жыцьцё заходняму сьвету. Ён адведвае сваіх былых хаўрусьнікаў, найперш, вядома, тых, каго Амэрыка ўважае за краіны-ізгоі: Паўночную Карэю, Кубу, Ірак, Іран… Ён аднаўляе кантакты з Індыяй. Мацуе добрыя стасункі з Кітаем, які на сучасным этапе свайго разьвіцьця цалкам задаволены такім суседзтвам. Сібірскі Далёкі Ўсход, адарваны ад Кітаю ў часе “няроўных дамоваў”, абжываюць кітайцы, а пачакаць крыху яны могуць… І ўсім гэтым краінам Пуцін прадае зброю.
Пакінем тут апісаньне расейскае замежнае палітыкі, бо нам невядома, у якім кірунку яна будзе разьвівацца. Ці можам мы паспрабаваць адгадаць гэты кірунак? Тут мы трапляем у поле гіпотэзаў. Мы ведаем, што рэальныя падзеі амаль заўжды іх абвяргаюць, але рызыкнём.

Расея мае выбар

20) Мне падаецца, што сёньня Расея можа выбіраць паміж адным з наступных варыянтаў сваёй палітыкі.

А. І надалей паводзіць сябе як міжнародная шкодніца. Я ня веру, каб такая палітыка, скіраваная на псоту, магла чагось дасягнуць. Яна можа задаволіць пыху расейскага народу й ягонае імкненьне цешыць сябе ілюзорным уяўленьнем, нібы Расея ўсё яшчэ належыць да кагорты “вялікіх дзяржаваў”. Такога хуткаплыннага задавальненьня дасягнуць прасьцей, чым больш саліднага здавальненьня эканамічным росквітам і прававой дзяржавай. У экзыстэнцыйнай раўнавазе Расея заўсёды аддавала перавагу тэрытарыяльным набыткам. Аднак Расея ня ёсьць сапраўды вялікай дзяржавай — хоць бы зыходзячы з таго, што яе зьнясіленае насельніцтва, не нашмат большае за японскае ці нямецкае, працягвае зьмяншацца. А пагатоў Расея не адпавядае тытулу вялікай дзяржавы па сваёй эканамічнай вазе, бо аб’ём расейскага ВУП меншы за аб’ём гішпанскага. Не адпавядае яна статусу “вялікай” і па сваім маральным духу: Расея пасіўна цягнецца за Пуціным, але і той сапраўды кантралюе толькі свой апарат. У яго няма добрай апоры нават у выглядзе моцнай і масавай партыі, якая пасьлядоўна і самастойна адстойвае нацыяналістычныя вартасьці. Большасьць ягоных бліскучых ініцыятываў урэшце грузьне ў багне ўсеагульнай бязьдзейнасьці. Сярод дзяржаваў, што спрабуюць неяк мадэрнізавацца, на мапе сьвету вылучаецца хіба што Кітай. Нават залішне вылучаецца, бо, як больш дынамічны і моцны партнэр, у саюзе з Расеяй ён бы дамінаваў, і Крэмль гэта добра ўсьведамляе. Ня выключана, што сёньня Пуцін удае зь сябе волата, толькі каб падрыхтаваць глебу для сур’ёзных перамоваў з ЗША.

Б. Апісаная палітыка, аднак, можа дасягнуць сваёй мэты — здольнасьці канкураваць з амэрыканскай магутнасьцю і пераўзыходзіць яе, як гэта было сорак гадоў, — аднак толькі пры той умове, што Расея далучыцца да Заходняй Эўропы. Нямецкая палітыка ў такім выпадку зноўку стаецца ключавым пытаньнем.

Так ужо было ў часы Фрыдрыха II ды Бісмарка. Нямецкая правіца і найперш *Reichswehr* узьвялі бальшавізм на расейскі пасад і абаранілі яго ад “белых” у 1918 годзе. Гэта яны

навучылі бальшавікоў карыстацца новай вайсковай тэхнікай у 20-я гады. Пераможная савецкая Расея ў 1945 годзе адсекла чвэрць нямецкае тэрыторыі (падараваўшы яе Польшчы), а другую чвэрць ператварыла ў паднявольную ды ізаляваную народную дэмакратыю. Цягам ажно сарака гадоў Расея зноў і зноў прапаноўвала Нямеччыне бартэрную ўгоду: адзінства Нямеччыны ўзамен за адмову ад саюзу з Заходняй Эўропай і Злучанымі Штатамі. Галоўным клопатам савецкае дыпляматыі было адарваць Нямеччыну ад Эўропы, а сьледам выціснуць з Эўропы Злучаныя Штаты. Калі б Расеі гэта ўдалося, яна авалодала б Эўропай, эксплюатавала б яе, а рэальная магутнасьць Расеі аказалася б куды большай за простую здольнасьць падтрымліваць раўнавагу страху дзякуючы сваім ядзерным арсэналам. Выцісканьня ЗША з Эўропы не адбылося, але колькі разоў Расея стаяла за крок ад ажыццяўленьня гэтых сваіх плянаў.

Адэнаўэраўская Нямеччына на прынаду не купілася, бо добра ведала моц Расеі і яе сусьветнай камуністычнай імпэрыі. Нават у найменш адназначныя моманты *Остпалітыкі* яна не імкнулася граць ролю стрэлкі на шалях паміж Усходам і Захадам, а заўжды сумленна выконвала свае хаўрусьніцкія абавязкі. Неадольную спакусу Бэрлін парадаксальна адчуў ажно ў 1988 годзе, калі ў СССР кіраваў Гарбачоў. Па словах Жоржа-Анры Суту, нязьменная палітыка СССР, падаваная пад прывабнай шыльдай “супольнаэўрапейскага дому”, ледзь не займела посьпеху. Гэта сталася, відаць, яшчэ і таму, што Нямеччына ўжо зважала на ўсё большую слабасьць магчымага партнэра. Для параўнаньня: французы ў 1981 годзе прынялі ўрад Аб’яднаных левых толькі пасьля таго, як стала ясна, што камуністычная партыя ў ім ня будзе дамінаваць.

Нямеччына прыйшла да свайго аб’яднаньня пры ўмовах, якія Расея магла ўскладніць, калі б, вядома, яе саму ў той момант не напаткаў сур’ёзны крызыс.

Сёньня Пуцін ня мае такой прыцягальнай прынады, якую мелі колісь камуністы. Затое ён малюе перад сваімі нямецкімі калегамі бліскучую пэрспэктыву ўсеагульнага партнэрства, у якім Нямеччыне выпадала б вядучая роля. Калі б Нямеччына ўхапілася за гэтую прапанову, Пуцін мог бы чакаць гэткай самай рэакцыі ад Францыі, якая пэўна мусіла б неяк рэагаваць. Для Нямеччыны гэта было б вяртаньнем да спрадвечнае мары,

для Францыі — вяртаньнем да традыцыі Дэлькасэ. Пакіньма, аднак, убаку гэтыя цьмяныя гіпотэзы, якія пакуль нічым не пацьвярджаюцца. Пуцін займае ўсе крэслы, якія эўрапейскія ўстановы яму прапануюць. Але зусім не абавязкова, што ягонае паступовае пасоўваньне зойдзе далей за пэўную мяжу.

В. Трэці магчымы варыянт расейскай палітыкі мог бы адпавядаць сапраўдным суадносінам сілаў і слушна зразуметым інтарэсам Расеі і сьвету. Расея, аднак, мусіла б выканаць адну перадумову — адмовіцца ад сваіх "вялікадзяржаўніцкіх" амбіцыяў, сваіх нэаімпэрыялістычных хімэраў у дачыненьні да былых рэспублік і шчыра прыняць статус "дзяржавы сярэдняй сілы". Што й казаць, пайсьці на гэта цяжка, і вельмі цяжка. Гішпанія адважылася на такі крок толькі ў канцы XIX стагодзьдзя, Францыя — пасьля сыходу дэ Голя, ды яшчэ зь якімі пакутамі! Што ўжо гаварыць пра Ангельшчыну… Можа, менавіта Нямеччына, з улікам маштабнасьці трагедыі і ганьбы, што яе напаткалі, здолела найбольш шчыра зьмірыцца са сваёй сытуацыяй, калі, вядома, мары, якія абуджае ў ёй Пуцін, не парушаць ейнага душэўнага спакою. Неабходна, каб Расея, трагедыя якой была таксама не з найменшых, наважылася на такі самы крок.

Дык чаго ж можна чакаць?

Пэрспэктывы, на жаль, пахмурныя. Калі Расея "прыме" правілы гульні Захаду, яна, безумоўна, атрымае дапамогу. Тая, аднак, прынясе плён вельмі няхутка. З часам Расея, як і ў 1900 годзе, можа вярнуцца ў Эўропу ў якасьці беднай, але прыстойнай пэрыфэрыі. Па плошчы яна ўяўляла б нешта накшталт Канады, але з эканомікай лацінаамэрыканскага тыпу. Тым ня менш, яна зноў заняла б у эўрапейскай цывілізацыі сваё месца, з уласным духам, магчыма, з такім самым бляскам, якім праславілася ў часы росквіту расейскага балету. У расейскай дзяржаве і расейскім грамадзтве заўжды знаходзіліся элемэнты, што заклікалі да шчырай эўрапеізацыі, — яны б атрымалі па заслугах. Сыстэма ўлады наблізілася б да эўрапейскіх нормаў. Царква часткова пазбавілася б сваёй падазронасьці, адчуваньня, што яна ўвесь час у аблозе, зрабілася б больш прыязнай да астатніх хрысьціянскіх веравызнаньняў.

Дзяржава сярэдняй сілы

Захад ужо дзесяць гадоў шкадуе Маскву — відаць, з-за

перакананьня, што, калі мінецца сёньняшняя “смута”, Расея зноў стане вялікай дзяржавай, якою была ўжо тры стагодзьдзі. Ён адчувае неабходнасьць зьмякчыць яе “прыніжэньне”, заплюшчыць вочы на ейныя дзівацтвы, мінімізаваць чачэнскі крызыс. Бо Расея ж ужо чатырыста гадоў кантралюе самае сэрца Эўразіі. Важна, каб гэтым выключна важным у геапалітычным сэнсе рэгіёнам валодала нацыя, бліжэйшая да Эўропы, чым да турэцка-мангольскага ці кітайскага сьвету. Пры бліжэйшым разглядзе, аднак, здаецца ня надта праўдападобным, што Расея зноў зможа стаць “звышдзяржавай” першае велічыні. Францыя страціла такую годнасьць у 1763—1815 гадох ды больш так і не ўзьнялася. Ангельшчына па 1918-м годзе — таксама. Нямеччына па 1945-м — тое самае. Сучасны стан Расеі зусім не гарантуе, што яна зможа па-ранейшаму кантраляваць эўразійскі *heartland*, якім яна толькі валодае, ня маючы змогі ўпарадкаваць. Калі ж у ёй — як я, зрэшты, спадзяюся — здолее ўсталявацца нармальны палітычны й эканамічны рэжым, яна будзе хутчэй праяўляць тэндэнцыю да сьцісканьня на сваіх цэнтральных гістарычных землях, адно якія яна і здольная прывесьці ў парадак.
Або Расея магла б парадаксальна сыграць ролю аднаго з полюсаў двухполюснага сьвету, да якога імкнецца Захад, — але толькі пры той умове, што яна ня будзе “заходняй” і абмяжуецца сваёй вычарпанай і згубнай для ўласных жа інтарэсаў вялікадзяржаўніцкай пазыцыяй.
Па-за межамі гэтага меркаваньня мы апынаемся ў полі чыстае фікцыі, і з нашага боку было б, мабыць, найлепшым на гэтым спыніцца.

Пераклаў Сяргей Смятрычэнка
паводле Commentaire, № 94, l’été 2001, p. 339—354.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (24) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса

Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/02/18
[image]

Размова з Жоржам Ніва

Не генацыд, а зьверская манера

— Францыя дала сьвету мысьліцеляў, якія досыць змрочна ацэньвалі цяпершчыну і будучыню Расеі. Кюстын, Мішле, цяпер Ален Бэзансон. Апошні перакананы ў тым, што Расею чакаюць вялікія ўзрушэньні. Наколькі гэта гарманує з вашымі ўражаньнямі аб сёньняшняй расейскай рэальнасьці?
— Гэта ня толькі не гарманує, але я і змагаюся з гэтым тэзысам. У адной з маіх кнігаў была публічная палеміка з Аленам Бэзансонам як русафобам. Ёсьць перадузятасьць у яго меркаваньнях пра Расею. Побач зь ім не аказалася Герцэна, як побач зь Мішле, які зьмяніў свой погляд на Расею пад уплывам Герцэна. Пасябраваўшы з Герцэнам, пачуўшы пра дзекабрыстаў, даведаўшыся пра іншую Расею, чым мікалаеўская, зразумеўшы, што нельга быць вузкім палянафілам і тым самым аўтаматычна русафобам, Мішле напісаў “Паўночныя легенды”. “Паўночныя легенды” — вялікая кніга.
Побач з нашымі новымі Катонамі, якія разважаюць пра Расею геапалітычна, на жаль, няма Герцэна. Яны, можа быць,

ЖОРЖ НІВА – францускa-швайцарскі славіст, (нар. 1935, асабістая вэб-старонка http://nivat.free.fr) зьяўляецца аўтарам кніг “Sur Soljénitsyne” (1974), “Vers la fin du mythe russe” (1982), “Russie—Europe, la fin du schisme” (1993), “Возращение в Европу. Статьи о русской литературе” (1999), загадчыкам Славянскай кніжнай сэрыі ў Лязанскім выдавецтве “l'Age

кантактавалі зь нябожчыкам Максімавым, але да Ніцшэ, не
пайшло. Яны ня езьдзяць па Расеі, ня ведаюць яе, не
Маскве, не чытаюць таго, што там друкуецца. М
гэтыя русафобскія погляды на Захадзе шкодныя,
скажаюць карціну. Яны ўласьцівыя ня ўсім аўтарам
Карэр д'Анкос няма такой перадузятасьці, затое
адваротная перадузятасьць. Іншымі словамі, наш
Расею ўсё яшчэ ідэалягічна абумоўлены, быццам
акцыя Салжаніцына не расплюшчыла вочы, не да
магчымасьці зразумець, што Расея жыве сваёй і
дынамікай. Гэтую дынаміку ня хочуць зразумець
саграшыла і Элен Карэр д'Анкос, калі напісала кн
гісторыя Расеі — гэта адно суцэльнае няшчасьце,

Анонімныя публікацыі Ж. Нівы “L'Univers et la vie de Dostoïevski d'après quelques inédits” (Le Temps, 21 ліпеня 2001). Нетрывіяльнай украінскамоўны зборнік эсэістыкі Ж. Ніва “Эўропа мэтафізыкі і бульбы” пабачыў сьвет у кіеўскім выдавецтве “Дух і літера”.

У амэрыканскага гісторыка Рычарда Пайпса Расея — гэта назапашваньне гвалту, усё болей, болей і болей, таму што ўдасканальваюцца спосабы ціснуць на калектыўную псыхіку. Хаця і ён трохі завагаўся падчас перабудовы, як і бальшыня саветолягаў тады (яго я ведаю па Гарвардзе). Але апошнія ягоныя рэчы — ізноў галёпам у тым кірунку, што
Ален Бэзансон. Маўляў, у Расеі ўсё болей гвалту
і шматкі палятуць. Між іншым, апанэнт Бэзансона
славянскай гісторыі Марцін Маля, на маю думку,
значна больш навуковыя, аб'ектыўныя і карэктныя
гісторыю. Ён перакладзены * на французскую, ра
польскую мовы. Так што, дзякаваць Богу, ня ўсё
Бэзансона.

Мацыцкаваць ўжо будзе, бухі Martin Malia. "Russia under Western Eyes. From the Bronze Horseman to the Lenin Mausoleum", Cambridge, Massachusetts-London, некалькі

Цяпер у Расеі — пэўная стабілізацыя. Краіна не
заставацца такім вульканам, якім яна была ў дзе
Ельцына. Ельцын, лічу, адыграў агромністую ро
чым Гарбачоў. Гарбачоў, натуральна, таксама ш
момант аслабленьня камуністычнай улады ён пр

рашэньняў, накшталт вываду войскаў з Цэнтральнай Еўропы, якія мелі вялікае значэньне. Ва ўнутранай жа палітыцы ён вагаўся, усё-такі ішоў на маленькія гвалтоўныя акцыі ва Украіне, Грузіі. І гэтыя ваганьні яму ня робяць гонару. Тым ня менш ён падарваў давер да сябе тых людзей, якія хацелі ўгледзець у ім вызваленьня сваёй краіны. Ну, а ў тых, хто жадаў вяртаньня Савецкі Саюз, ён усё роўна згубіў давер, лічыцца ворагам нумар адзін. Так ён застаўся без падтрымкі ў Расеі, і той час як на Захадзе ў яго папулярнасьць агромністая, горача трымаецца па сёньня. І ў той жа час на Захадзе пачынаюць зьдзекавацца зь Ельцына. А я думаю, што рашэньні Ельцына адмовіцца ад гвалту, ніколі не перасьледаваць прэсу, якая пісала бог знае што пра яго і супраць яго, пры хаатычнай палітычнай лініі, адыграла выдатную ролю, бо з кожным годам Расея адыходзіла ад традыцыі цэнзуры, страху, гвалту над самой сабой. Гэты адыход і стварае новую Расею.

Пры прэзыдэнту Пуціну, які, вядома, прыйшоў да ўлады, бо ўсе расейцы стаміліся, страшна стаміліся ад какафоніі, ад дзьвюхуладзьдзя парлямэнту й прэзыдэнта, адбываецца стабілізацыя розумаў. Пакуль мне здаецца, што гэта Realpolitic, даволі разумная, без буйных памылак, за адным выняткам — Чачэніі.

Трэба адкрыць праўду пра Чачэнію. Можа быць, гэта невырашальная праблема. Бываюць такія праблемы. Я ваяваў у Альжыры ў французкай арміі і ведаю, што сустракаюцца такія сытуацыі, для якіх па сукупнасьці прычын, праз упартасьць бакоў не відаць вырашэньня. Нельга сказаць, што тэрарысты — гэта бандыты, і ўсё. Самаахвярнасьць — гэта ўсё-такі традыцыя, якая доўжыцца спакон вякоў на розных этапах гісторыі. Зьвесьці гэта да крымінальнага тэрарызму — спрашчэньне, нежаданьне бачыць сытуацыю комплексна. А для здаровай палітыкі трэба бачыць сытуацыю комплексна.

Гэты дакор зьвернуты ня толькі да прэзыдэнта Пуціна, але й да грамадзкай думкі. У мяне вельмі шмат у Расеі сяброў — навукоўцаў, пісьменьнікаў. Яны ўсё-такі ня вельмі хочуць гаварыць на гэтую тэму, за выключэньнем такіх людзей, як пецярбурскі гісторык Якаў Гордан.

— Бэзансон у сваіх публікацыях называе палітыку расейскіх уладаў у Чачэніі генацыдам супраць народу, які

Emmanuel Besançon. Between Press of Human Rights and Universal Empire. Wesport, London: Praeger Publishers, 1999.

Дасканальна апублікавана ў часопісе "ARCHE" (№4, 2001).

налічвае менш чым мільён прадстаўнікоў.
— Я адкажу на пытаньне пра генацыд у Чачэніі. Я асабіста не прымаю гэткага выразу. Я б сказаў — “зьверская манера весьці вайну”. Гэтыя зачысткі, кантрактнікі, маскі... Мая дачка-журналістка, якая жыве ў Маскве, была інкогніта ў Чачэніі, што магчыма для жанчыны і, напэўна, немагчыма для мужчыны, і напісала кнігу, якая мела посьпех у Францыі, Амэрыцы, зараз будзе расейскі пераклад.
Калі словы маюць сэнс, генацыд — значыць намер зьнішчыць адзін генас, адзін этнас, адзін народ. Я ня думаю і ня бачу, каб такі намер быў у расейцаў, хаця б таму, што палова чачэнскага этнасу расьцярушаная ў самой Расеі. Ёсьць расізм, ёсьць антычачэнскія настроі — гэтыя падзеі ўвесну ў Маскве, калі былі пагромы, — але гэта не назавеш генацыдам, бо ў такім выпадку мы можам сказаць, што празь нейкія такія вельмі сумныя інцыдэнты ў Францыі ідзе генацыд арабаў, у Нямеччыне ідзе генацыд туркаў і нават у Стакгольме — генацыд курдаў. Не, гэта злоўжываньне словамі. Іншая рэч, што Расея вядзе гэтую вайну супраць партызанаў, расейская армія сустракаецца з вонкавымі праблемамі, ня ведае, як весьці вайну супраць партызан, якім сымпатызуе насельніцтва. У XIX стагодзьдзі Расея 60 год праваявала на Каўказе, аж да паланеньня Шаміля.
Ідзе вайна зацяжная. Мы ў Альжыры сутыкаліся з такім. У такім тыпе вайны нельга ўжываць такія сродкі, якія ня толькі зьверскія ў дачыненьні да ворага, але і прыніжаюць годнасьць тваёй арміі і празь яе — годнасьць тваёй нацыі, бо маладыя салдаты, якія прайшлі праз гэтыя акцыі, вяртаюцца дамоў калекамі — або ў літаральным сэнсе, або ў маральным, псыхалягічным.
— Эўрапейскія інтэлектуалы любяць гаварыць пра несфармаванасьць структур грамадзянскай супольнасьці ў Расеі. Гэты момант слабасьці грамадзянскай супольнасьці моцна збліжае сытуацыю ў Беларусі і Расеі, нягледзячы на адрозьненьні ў тэрыторыі, культуры і г.д. Чым патлумачыць, на Ваш погляд, крах спробаў пабудаваць грамадзянскую супольнасьць у абедзьвюх дзяржавах? Чым патлумачыць, што тут і там перамаглі аўтарытарныя тэндэнцыі, што апазыцыя кволая, улада мае дамінантную пазыцыю ў грамадзтве, права даволі часта

выкарыстоўваецца як рэсурс улады?

— Я ўсё-такі адрозніваю сытуацыю ў Расеі й сытуацыю ў Беларусі. Мне здаецца, што становішча ў Расеі не такое адназначнае, яно поліфанічнае. Улада далёка не ўсёмагутная, грамадзянская супольнасьць існуе, хаця ня ў тым выглядзе, як у Заходняй Эўропе, Амэрыцы або Японіі, але неяк існуе. Дзьвюхуладзьдзе ў губэрнях, барацьба двух бакоў, якую мы назіраем амаль скрозь, ва ўсіх губэрнях, — гэта зарука дэмакратыі. Ад плюралізму крыніцаў улады, камэнтаваньня яе дзеяньняў ідзе нейкае ўзбагачэньне, а не зьбядненьне. Гэта я адчуваю ў Расеі, дзе ўсё-такі ёсьць палітычныя аналітыкі, якія, як мне здаецца, усё-такі разважаюць самастойна. Ёсьць маса незалежных выданьняў, крытычных да ўладаў. У Расеі назіраецца росквіт палітычнай, багаслоўскай, філязофскай думкі. Нават ня ўсочыш за ўсімі цікавымі кнігамі, якія выходзяць. Іншая рэч, што яны распаўсюджваюцца не на ўсёй тэрыторыі — яны аказваюць уплыў у Піцеры, Маскве, а ня ў вёсках за Магаданам.

Вайна кланаў суцішылася, і гэтая стабілізацыя ідзе на карысьць краіне, бо маладой гадоўлі дэмакратыі патрэбна стабільнасьць, а не хаос. Вядома, забойства магаданскага губэрнатара ставіць мой аналіз пад сумнеў. Трывожна, калі адбываецца заказное забойства губэрнатара, які, як мне здаецца, быў ня з горшых, ня самы прадажны. У чым тут справа?

Ёсьць у Расеі, вядома, аграмадныя праблемы, нейкая пасіўнасьць тут і там, якая заўсёды дзівіць заходняга грамадзяніна. Ён таксама можа быць пасіўным, але ў цяперашнім мэханізьме нашай дэмакратыі, які благі б ні быў гэты мэханізм, усё-такі мы ня маем такога цярпеньня. Некаторыя штучкі так не праходзяць. Яны сустракаюць імгненную рэакцыю ў выглядзе страйкаў, пратэстаў у такім выглядзе, што ўлады імгненна даюць задні ход.

Я ўжо не кажу пра такую дэталь, што адзін міністар маленькай Жэнэўскай рэспублікі захацеў намаляваць месца для сваёй машыны — стаянку перад сваім маленечкім міністэрствам. Але суседні грамадзянін зьвярнуўся ў суд: якое права мае гэты міністар захапіць грамадзкае месца? Грамадзянін выйграў, міністар прайграў. А ўчора я вяртаўся з рэзыдэнцыі французскага пасла, і тут — бух! Мы павінны стаіцца ў лесе, бо

імчыцца афіцыйны картэж прэзыдэнта. Гэта неймаверна ў дэмакратычнай Швайцарыі, дзе прэзыдэнт ня мае права ні на адну прывілею. Гэта аснова Рэспублікі Швайцарыі, якая існуе на гэтай аснове 800 год.
У адрозьненьне ад Эўропы Расея ня можа пражыць па прынцыпе кантанальнай структуры Швайцарыі. Такая вялізная тэрыторыя мае патрэбу ў моцнай уладзе, так што бяз моцнага прэзыдэнта, напэўна, ня можа трымацца гэтая краіна. Але сказаць, што яна вяртаецца да аўтарытарызму, і зьвесьці ўсё да спрашчэньняў, якія робяць нашы Бэзансоны, я думаю, некарысна. Карысныя такія гісторыкі, як Марцін Маля, што не выкарыстоўваць гістарычнай навукі ў якасьці рупару для абвяшчэньня геапалітычных ідэалёгіяў.

— Погляд староньняга назіральніка — у чым адрозьненьні і падабенствы Беларусі і Расеі?
— Я цудоўна разумею, што я, як русіст, што прысьвяціў усю сваю кар'еру, жыцьцё, частку свайго лёсу Расеі, натуральна, быў расейскім імпэрыялістам. Русіст, дзякуючы нейкаму нябачнаму ўплыву, пры вывучэньні культуры па пэўных кнігах, ці то Карамзіна, ці то Ключэўскага, ці якога-небудзь эмігранцкага гісторыка, падпадае пад уплыў расейскіх вялікадзяржаўных поглядаў. Зь цягам часу я гэта ўсьвядоміў і паспрабаваў выправіць свае веды, сваё гледзішча што да Ўкраіны, а пасьля — Беларусі. Трэба ўвайсьці ў складанасьць гісторыі, асабліва тут. Трэба зразумець гэты складаны клубок — што такое Польшча, што такое Літва, чым было Вялікае Княства Літоўскае, якой была культура арыстакратыі, сялянства. Мне здаецца, што для Беларусі цяжка вызначыць сваю гісторыю, напісаць падручнік сваёй гісторыі, але ні ў якім разе нельга спрашчаць. Гэтыя складанасьці — гэта тое, што ёсьць. І гэта багацьце. Тое самае з Украінай. Гэта спрошчаны шлях — нацыяналістычныя падручнікі ўкраінскай гісторыі, выдадзеныя, скажам, у Атаве ў Канадзе. Яны ніяк не дапамагаюць быць грамадзянінам сваёй краіны сёньня і заўтра. Беларусь, Украіна, Расея — часткі Эўропы. Хочуць яны таго ці не. Часткі асаблівыя. Яны ўсе асаблівыя — Данія таксама асаблівая, Сыцылія таксама асаблівая. Розьніца між Даніяй і Сыцыліяй вялікая. Яны эўрапейскія, па-першае, па геаграфіі, паколькі мы можам сказаць: мяжа Эўропы праходзіць па Ўрале.

Яшчэ Тацішчаў устанавіў месца, дзе канчаецца Эўропа і пачынаецца Азія. Маладыя на Ўрале ў дзень вясельля паводле традыцыі мусяць пастаяць адной нагой у Эўропе, другой — у Азіі. І здымаюцца на фота, я таксама здымаўся (*сьмяецца*). І яшчэ на некалькі тысяч кілямэтраў працягваецца адно і тое ж — і краявід, і людзі, і побыт. Па гісторыі, па хрысьціянстве, па культурных асяродках, часткова па побыце Расея — эўрапейская, вядома, з адбіткамі ўсіх уварваньняў — і татараў, і полаўцаў, — з рэшткамі паганства і г.д. Хрысьціянства пранікала на розных этапах. На Русі адразу ж зьявіліся першыя хрысьціянскія мучанікі, а ў паганскай Літве — значна пазьней. Эўропа складаная па сваёй натуры. Інакшай быць яна ня можа і ніколі ня будзе. Яна існуе тым, што мінулае — складанае, цяпершчына — складаная, будучыня — складаная. І мне здаецца, што вырашэньне праблемы беларускай складанасьці, расейскай складанасьці — ну, можа быць, праз адно пакаленьне, — калі самі захочаце — беларусы і расейцы — зьвязацца з Эўропай. Няма такога палітычнага рашэньня. Менавіта геапалітычныя разьлікі, г.зн. рэшткі імпэрства, імпэрскіх настрояў, адштурхоўваюць Эўропу ад Расеі. Эўропа складаецца зь вялікіх краін і малых краін. Гэтыя малыя краіны адыгрываюць вельмі вялікую маральную ролю ў Эўропе, яны ніколі не захочуць прыняць у Эўропе сілу, якая пажадае ў Эўропе панаваць. Вядзецца, вядома, складаная гульня, але Нямеччына ня хоча захапіць Францыі, Францыя ня хоча захапіць Нямеччыны. Гэта выключана. У Францыі ці Нямеччыне нельга пабудаваць палітычную кар'еру на агрэсіўнасьці да іншай краіны. Гэта нельга таму, што правалішся на выбарах, таму што ніхто цябе слухаць ня будзе.

— Сярод заходніх інтэлектуалаў, настроеных да Расеі крытычна, гучыць такі аргумэнт: Беларусь і Ўкраіна — гэта больш ці менш нацыянальныя дзяржавы, унітарныя дзяржавы. Яны больш ці менш адаптаваныя да Эўропы, якая зьяўляецца Эўропай нацый, больш ці менш монанацыянальных дзяржаў. У той жа час Расея мае вялізныя праблемы з фармаваньнем цяперашняй расейскай ідэнтычнасьці і заўсёдна незагойную рану ў выглядзе мясцовых сэпаратызмаў, якія таксама спрабуюць сфармаваць свае нацыі. Татары, башкіры, чачэнцы. Гэта

разрывае гэтае дзяржаўнае ўтварэньне знутры.
— Наконт монанацыянальнасьці і шматнацыянальнасьці я вам скажу так. Па-першае, Беларусь ніякая ня монанацыянальная. Тут мінімум паўмільёна палякаў, і я чуў скаргі, што яны ня маюць сваіх школаў. Этнічныя чысткі — слова стала модным пасьля сумнавядомых падзеяў на Балканах — былі па ўсёй Эўропе. Дзе старыя нямецкія жыхары Прусіі? Дзе палякі, якія жылі ў Нямеччыне, і немцы — якія ў Польшчы? Так што правялі аграмадную этнічную чыстку пад выглядам вызваленьня і ўсяго, што хочаце. Гэта факт. Нельга паправіць гэтага, таму што наша мапа створана заваёвамі і нейкімі нацыянальнымі пачуцьцямі. Гэта сумесь усяго.
Возьмем Швайцарыю. Гэтая краіна налічвае 700 зь нечым год існаваньня. Ніякай маналітнасьці няма. Вялізныя адрозьненьні. 25 канстытуцый для ўсіх кантонаў, розныя мовы, розныя рэлігіі. На чым трымаецца? На прысязе. Мы дапамагаем адно аднаму. І гэтая прысяга, якую на папасе Р'ютлі склалі сяляне, саюзьнікі ў барацьбе супраць Габсбургаў, — гэтая прысяга абавязвае дагэтуль. Так што няма аднаго азначэньня эўрапейскай нацыі. Ёсьць азначэньне, што ў цяперашняй, маральнай Эўропе, якая зь цяжкасьцю, але існуе, ніякая меншыня не павінна сябе адчуваць уцісканай. І скажу, што на Расейскую імпэрыю — з гісторыі, якую я няблага ведаю, — можна глядзець як на Вялікую Швайцарыю ці маленькую Эўропу, ці на другую Эўропу, з тымі ж праблемамі, якія вырашаюцца таксама, уключна з чачэнскай праблемай. Яна здаецца драматычным тупіком, а можа быць праз адно пакаленьне неяк усё ж вырашана. І Грузія, і Арменія, напэўна, таксама павінны ўвайсьці ў Эўропу.
Цяпер — яшчэ што мяне зьдзіўляе тут, у Беларусі. Я сустракаўся зь лібэраламі, якія па сваім характары нацыяналісты і тым самым *ipso facto* русафобы і *ipso facto* не разумеюць, што адбываецца ў Расеі, дзе яны маглі б абапірацца на куды большы стан лібэралаў, чым тут, у краіне. А прыхільнікі саюзу з Расеяй — наадварот, нэасталіністы, нэасавецкія людзі. Гэты парадокс мяне вельмі дзівіць. Здавалася, што тыя павінны быць саюзьнікамі з тымі, але — не.

— Як пераадолець ізаляцыю Беларусі, якая нарастае і будзе нарастаць у сувязі з умацаваньнем межаў

Эўрапейскага Зьвязу на ўсходзе?
— Візавы рэжым — гэта сымбаль нашай будучыні. Трэба скасаваць гэты сымбаль. Багатая Эўропа ня хоча наплыву бедных імігрантаў з Усходняй Эўропы. Вугорцы аб'ектыўна жывуць бядней, чым швайцарцы, але задаволеныя, што яны вугорцы. З кожнай краінай па-рознаму. З Румыніі можа нахлынуць яшчэ больш цыган, чымся цяпер. Расея сама прымае ўцекачоў з Цэнтральнай Азіі.
Візавы рэжым паміж Беластокам і Берасьцем або паміж Чарнігавым і Варонежам — гэта, натуральна, дурасьць. Гэтая недарэчнасьць даводзіць, што трэба ісьці да Эўропы, якая ня можа быць прыватызаваная Напалеонам, Гітлерам, Сталіным і нават Карлам Лібкнэхтам.
— Наколькі інфармацыя пра Беларусь, якая трансьлюецца праз заходнія СМІ, кагерэнтная з тым, што вы бачыце?
— На Захадзе вельмі мала інфармацыі пра Беларусь. Так, натуральна, вы можаце сказаць, што BBC, "Radio France International" перадае нейкія навіны, але наагул у тэлевізійных навінах зь іх мільённай аўдыторыяй пра Беларусь ніякай інфармацыі не праходзіць. Ну, зрэдчасу прамільгне нешта пра прэзыдэнта Беларусі. Журналіст бязь веданьня мовы, які прыехаў сюды на двое сутак, што ён зразумее?
Гутарыў Валер Булгакаў

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/02/18**
[image]

Мікола Рабчук

Імпэрыя як дыскурс

Тэкст друкуецца з ласкавай згоды аўтара.

Myroslav Shkandrij. Russia and Ukraine. Literature and the Discourse of Empire from Napoleonic to Postcolonial Times. — Montreal: McGill-Queen's University Press, 2001.

Прыгадваю, як колькі гадоў таму Аляксандар Грыцэнка, рэцэнзуючы таўшчэзную анталёгію Ральфа Ліндгайма і Джорджа Луцкага "Towards an Intellectual History of Ukraine", зьедліва зазначыў, што ўкладальнікі замест абяцанай інтэлектуальнай гісторыі Ўкраіны прапанавалі ангельскамоўнаму чытачу, па сутнасьці, зборнік матэрыялаў да гісторыі ўкраінскага нацыяналізму. Пры ўсёй наўмыснай правакацыйнасьці гэтай заўвагі трэба прызнаць, што збольшага крытык меў рацыю.

Міжволі адзначаная ім кур'ёзнасьць украінскай сытуацыі палягае ў тым, што пра што б ні пісаў украінскі інтэлектуал — ад філязофскіх да культуралягічных трактатаў ці ад гісторыі літаратуры да палявых дасьледаваньняў украінскага сэксу — ён немінуча зьбіваецца на *нацыянальную* праблематыку, якая

МІКОЛА РАБЧУК – (нар. 1953, Луцк) — культурны і палітычны аналітык, гісторык культуры, дасьледчык украінскага нацыяналізму. Ягоныя апошнія кнігі — Від Малоросії до України: парадокси запізнілого націєтворення" (2000) і "Дилеми українського фауста: громадянське суспільство і "розбудова держави"? (2000). У "ARCHE"

стараньяму, незаангажаванаму ў гэтую праблематыку чытачу заканамерна будзе здавацца *нацыяналістычнаю*. Адказ ўкраінцаў што да сваёй тоеснасьці, мовы, культуры, самаго свайго нацыянальнага існаваньня знаходзіць пра тлумачэньне ў гістарычных акалічнасьцях, якія, як вядома, не былі спрыяльнымі для безьдзяржаўнай нацыі. А ягачаў большай ступені — ува ўкраінскай цяпершчыне, хаця не спрыяе лячэньню гістарычных нэўрозаў, бо фармальна незалежная ўкраінская дзяржава хутчэй закансэрвавала каляніяльны статус-кво, нават не распачаўшы пасьлядоўнай і ўсебаковай праграмы дэкалянізацыі.

ятоншу
перакладзь
ypo, самаго
“Эмансыпацыя
якоявядома,
“пачаўыдаў”
сучасны
“дзяржвыдаву””
(Yekelchyk 2002).

У гэтым кантэксьце ня так ужо й дзіўна, што кніга канадзкага прафэсара зь Вініпэгу Міраслава Шкандрыя пад назваю “Расея ды Ўкраіна: літаратура і дыскурс імпэрыі ад напалеонаўскіх да посткаляніяльных часоў” цалкам падпадае пад апісаную тэндэнцыю. У ёй ідзецца ня так пра Расею, як пра Ўкраіну, ня так пра імпэрскі дыскурс, як пра антыімпэрскі, ці, каму як даспадобы, украінска-нацыяналістычны. Але ўвадначас кніга гэтая шмат у чым піянэрская: па сутнасьці, гэта першая спроба канцэптуальна, на вялікім літаратурным матэрыяле разгледзець расейска-ўкраінскія ўзаемíны як барацьбу двух дыскурсаў, прыстасаваць мэтадалёгію папулярных на Захадзе посткаляніяльных студыяў да аналізу больш або менш вядомых нам айчынных тэкстаў. З гэтага гледзішча праца заслугоўвае самай пільнай увагі, бо ейныя здабыткі й недалікі могуць істотна паўплываць на разьвіцьцё пэрспэктыўнага кірунку ўва ўкраінскай гуманістыцы.

1

У прадмове да кнігі Міраслаў Шкандрый вызначае ейную галоўную мэту: паказаць, як *“дыскурс імпэрыі зьяўляецца ў расейскай літаратуры XIX стагодзьдзя, даючы штуршок адпаведнаму контрадыскурсу ў літаратуры ўкраінскай”*.

У шырэйшым пляне ідзецца пра пашырэньне рамак посткаляніяльных студыяў, вывядзеньне іх за традыцыйныя межы, у якіх гэтыя студыі сфармаваліся, — за межы ўзаемінаў найбуйнейшых заходнеэўрапейскіх мэтраполіяў (перадусім Ангельшчыны ды Францыі) з сваімі калёніямі ў Азіі, Афрыцы ды Лацінскай Амэрыцы. З гэтага гледзішча кніга Шкандрыя палемічная што да пашыранай сярод ягоных калегаў думкі,

нібы панятак “імпэрыялізму” трэба выкарыстоўваць адно ў дачыненьні да дзяржаваў з заморскімі ўладаньнямі. *“Стасункі паміж калянізатарамі й калянізаванымі, тымі, хто пануе, і тымі, над кім пануюць,* — сьцьвярджае ён, — *ёсьць адпаведнай прызмай для погляду на ўсходнеэўрапейскія літаратуры, адчувальна адзначаныя гісторыяй заваяваньняў і бунтаў, нацыянальнага самасьцьверджаньня і культурных змаганьняў”.* Аб’ектам імпэрскага дыскурсу, піша Шкандрый, могуць быць ня толькі заморскія калёніі, але й імпэрскае памежжа ды прылеглыя тэрыторыі. Насуперак істотным адрозьненьням паміж гэтымі аб’ектамі ды іхнымі апісаньнямі, канструяваньне “літаратурнай Украіны” ў расейскім пісьменстве мае шмат супольнага з дыскурсійным засваеньнем (апанаваньнем) іншых “нованабытых” імпэрыяй земляў — Сібіры, Каўказу, Сярэдняй Азіі, Польшчы. Расейская літаратура пачатку XIX стагодзьдзя — Бястужаў-Марлінскі, Лермантаў, Хамякоў — разгарнула наратыўныя мадэлі, вобразы, тропы для (рэ)канструяваньня ўсіх гэтых разнастайных і своеасаблівых краёў, народаў, культураў як імпэрскага памежжа, пэрыфэрыі, пазбаўленай паза імпэрскім Цэнтрам, сэнсатворным і ўнівэрсальна-рэпрэзэнтацыйным, самастойнае існасьці, вартасьці, прызначэньня, мінуўшчыны і будучыні. Калянізаваныя землі — гэта, як правіла, землі “нецывілізаваныя” або й увогуле дзікія, заселеныя прымітыўнымі сялянамі ці яшчэ больш прымітыўнымі качэўнікамі. А тым часам мэтрапольная цывілізацыя — нязьменна вытанчаная, вышэйшая, прэстыжнейшая, сучасьнейшая, пэрспэктыўнейшая. Яна ўвасабляе мужчынскі пачатак, сутнасьць якога — панаваць, валодаць, апладняць, абуджаць да гістарычнага быцьця недалужных абарыгенаў, чые цывілізацыі ў імпэрскім дыскурсе пасьлядоўна “фэмінізуюцца”.

Міраслаў Шкандрый, на жаль, пакідае па-за межамі далейшага разгляду шэраг цікавых праблемаў, акрэсьленых у прадмове. Асабліва гэта датычыць дыскусійнага (і ў самой Украіне, і па-за ейнымі межамі) пытаньня пра тое, ці можна, і ў якой ступені, разглядаць Украіну як расейскую калёнію. Бо адсутнасьць расавай ды этнічнай дыскрымінацыі што да ляяльных “маларосаў” у Расейскай Імпэрыі робіць іхнае становішча сутнасна адрозным ад, скажам, становішча афрыканцаў (або індыйцаў) у імпэрыі Брытанскай. Пра ўкраінскую “спэцыфіку”

досыць добра напісаў Андрэас Капэлер у артыкуле “Мазэпаўцы, маларосы, хахлы: украінцы ў этнічнай гіерархіі Расейскай імпэрыі”, на якую спасылаецца Міраслаў Шкандрый. Галоўная тэза нямецкага вучонага: украінцы ў згаданай гіерархіі займалі досыць высокае становішча, амаль такое самае, як і расейцы-велікаросы. Гэтае становішча, аднак, тлумачылася не якоюсь асабліваю талерантнасьцю імпэрыі да ўкраінцаў, а толькі тым простым фактам, што імпэрыя не ўважала іх за “іншых”. Украінцы не дыскрымінаваліся паводле этнічнай прыкметы, бо ў вачох імпэрыі іхная этнічнасьць была прыкметаю выключна рэгіянальнаю. Талерантнасьць з боку імпэрыі была, так бы мовіць, своеасаблівай платай ім за ляяльнасьць: іх цярпелі як неадукаваных хахлоў ці адукаваных маларосаў толькі ў той ступені, у якой яны самі былі згодныя прызнаваць сябе хахламі ці маларосамі. Але тыя, хто такога азначэньня не прымаў і настойваў на сваёй адрознасьці, траплялі ў лік “мазэпаўцаў”, ці, кажучы найноўшымі тэрмінамі, “заходнікаў”, “бандэраўцаў”, “рухаўцаў”, “шчырых” і “национально-озабоченных” — словам, у паталягічную разнавіднасьць хахлоў, заражаных нейкім небясьпечным вірусам яўна імпартнага паходжаньня. Украінцы, паводле Капэлера, не дыскрымінаваліся як індывіды, аднак безумоўна дыскрымінаваліся як група, што прэтэндуе на пэўныя калектыўныя — моўна-культурныя — правы.

Шкандрый слушна заўважыў, што Капэлерава канцэпцыя дае мажлівасьць спасьцігнуць важныя нюансы ў імпэрскім стаўленьні да ўкраінцаў — у прыватнасьці, парадаксальнае спалучэньне ў гэтым стаўленьні трох, здавалася б, несумяшчальных пазыцыяў: “братэрскай” прыхільнасьці да ляяльных маларосаў, якія інтэгруюцца ў імпэрскую цывілізацыю; зьняважлівасьці да хахлоў як да сялянскага быдла; і глыбокай нянавісьці да “мазэпаўцаў”, якія не прымаюць навязаных ім імпэрыяй хахляцка-маларасійскіх роляў.
Пытаньне пра правамернасьць выкарыстаньня посткаляніяльнай мэтадалёгіі (і тэрміналёгіі) для аналізу расейска-ўкраінскіх узаемінаў вырашаецца, на думку аўтара, аўтаматычна, калі толькі ўважліва прыгледзецца да той рэальнасьці, якая апісваецца тэрмінамі “каляніялізм” ды

“імпэрыялізм”. У прыватнасьці, тэрмін “каляніялізм”, зазначае Шкандрый, *“ужываюць збольшага дзеля пазначэньня ўварваньня і расьсяленьня прадстаўнікоў адной краіны ў другой, пры ўвядзеньні ў ёй сваёй сыстэмы кіраваньня, права ды інстытуцыяў. А “імпэрыялізмам” называюць шырэйшы спэктар нераўнапраўных (эксплюататарскіх) узаемінаў — палітычных, эканамічных, культурных, — якія, аднак, не зьнітаваныя з масавым перасяленьнем цывільнага насельніцтва… Дамінаваньне Расеі над Украінай,* — піша Шкандрый, — *зьдзяйсьнялася як па імпэрыяльнай мадэлі (асабліва ў XVII—XVIII стагодзьдзях, калі мясцовыя правы, інстытуцыі, судаводзтва істотна абмежаваліся ажно да поўнай іх ліквідацыі), так і па мадэлі каляніяльнай (раздача земляў расейскім уласьнікам ды масавыя перасяленьні людзей)”.*

Праўда, аўтар дае гэтае тлумачэньне ў заўвагах, тым часам як у прадмове толькі бегма паказвае падабенства расейска-імпэрскага дыскурсу да экспансіянісцкага дыскурсу “клясычных” каляніяльных імпэрыяў, а таксама згадвае пра пасьпяховае пашырэньне “тэрыторыі” посткаляніяльных студыяў за межы афра-азіяцка-карыбскага сьвету, асабліва пра іхнае перанясеньне на ірляндзкі, шатляндзкі, паўночнаамэрыканскі матэрыял. (Хаця, зазначым, гэтых сапраўды важных для ўкраінскага досьведу “шатляндзка-ірляндзкіх” ці, скажам, каталёнскіх паралеляў у кнізе, на жаль, няма; няма нават бібліяграфічнай згадкі пра клясычную працу Майкла Гехтэра “Ўнутраны каляніялізм: кельцкія ўскраіны ў брытанскім нацыянальным разьвіцьці, 1536—1966”.)

Зрэшты, пры ўсёй важкасьці прыведзеных аўтарам аналёгіяў ды прэцэдэнтаў, галоўным аргумэнтам на карысьць посткаляніяльнай мэтадалёгіі ў кнізе пра імпэрскі дыскурс застаецца аргумэнт культурны — прыблізна ў тым пляне, у якім яго выкарыстаў Марка Паўлышын у артыкуле пра “Рэкрэацыі” Андруховіча: *“Культурныя зьявы (мастацкія творы, культурныя ўстановы, працэсы ў культурным жыцьці грамадзтва) можна ўважаць за каляніяльныя, калі яны спрыяюць сьцьверджаньню ці разьвіцьцю імпэрскай улады: пазбаўляюць прэстыжу, звужаюць поле актыўнасьці, абмяжоўваюць бачнасьць, а то й нішчаць тое, што ёсьць мясцовым, аўтахтонным — словам, каляніяльным, узамен падкрэсьліваючы годнасьць, сусьветную маштабнасьць,*

сучаснасьць, неабходнасьць і натуральнасьць сталічнага, цэнтральнага”.

Такі погляд дае мажлівасьць пакінуць па-за рамкамі разгляду ўсе іншыя аспэкты каляніялізму, якія ў выпадку расейска-ўкраінскіх узаемінаў могуць быць менш відавочнымі, чым, скажам, у выпадку франка-альжырскім ці ангельска-індыйскім (палітычная дыскрымінацыя, эканамічная эксплюатацыя). *“Ужываньне тэрмінаў “каляніяльны” ды “посткаляніяльны, —* слушна піша Шкандрый, *— дзеля пазначэньня сытуацыі культурна-палітычнага паняволеньня, у якой людзі знаходзяцца або зь якой толькі што выйшлі, ёсьць цалкам правамерным што да ўкраінскай гісторыі ды сучаснасьці”.*

Зразумела, што “палітычнае паняволеньне” тут нас (і аўтара) цікавіць толькі ў той ступені, у якой робіць магчымым, падтрымлівае, замацоўвае паняволеньне культурнае. Акадэмік Вярнадзкі называў такую зьяву гадоў сто таму “умственной подчинённостью”. Яна палягае ня ў тым, што пэўныя народы ўсьведамляюць сваю культуру як “меншую” — ніводзін эстонец або славенец, відавочна, не ўважае сваёй культуры “большай” за французскую або расейскую, аднак такое прызнаньне ўласнае “меншасьці”, “ніжэйшасьці” мае хутчэй колькасны, чым якасны характар, яно ня ёсьць (як правіла) ні для эстонца, ні для славенца падставаю адмаўляцца ад сваёй “меншай” культуры на карысьць чужой “большай”. Умоўна кажучы, баксёр лёгкай вагі ня прагне біцца зь цяжкавагавіком або цюлень ня можа змагацца зь ягуарам у бегу на сто мэтраў. Кожная культура (як і мова) па-свойму дасканалая і мае нешта такое, чаго ня мае ніякая іншая, хай сабе й “найбольшая” і наймагутнейшая. Культурнае паняволеньне пачынаецца тады, калі пэўны народ усьведамляе сваю “меншую” культуру як “менш вартасную”, “другарадную”, “беспэрспэктыўную”. То бок стаецца гэтакім сабе “цюленем”, які пагаджаецца змагацца зь ягуарам на сушы, дзе, зразумела, асуджаны на паразу і на прызнаньне сваёй анталягічнай непаўнавартасьці — у катэгорыях і ў агульнай сыстэме вартасьцяў ягуара. На мове псыхааналізу такі пакорлівы (ці, хутчэй, вымушаны) пераход на чужы пункт гледжаньня, накладаньне на сябе чужых крытэраў і стэрэатыпаў, запазычаньне чужога (як правіла, нэгатыўнага, перадузятага) уяўленьня пра сябе і сваіх аднапляменьнікаў як уяўленьня ўласнага называецца інтэрналізацыяй,

“абунутраньнем” чужога “калектыўнага” ценю. Паняволеная нацыя пераймае зьняважлівасьць і зьверхнасьць калянізатараў да сябе як сваю ўнутраную якасьць, чужая нэгатыўная ацэнка робіцца самаацэнкаю, немачная нянавісьць да прыгнятальнікаў абяртаецца нянавісьцю да самога сябе і сваіх вартых жалю супляменьнікаў.

Зразумела, што такая інтэрналізацыя нэгатыўнага ўяўленьня пра сябе не адбываецца імгненна і ня ёсьць вынікам звычайнага ўплыву “мацнейшай” культуры на “слабейшую”. Культурнае паняволеньне нязьменна суправаджаецца й абумоўліваецца паняволеньнем палітычным — разнастайнымі формамі прымусу, уціску, простага і ўскоснага гвалту. Уласна, сама сытуацыя, калі звычайная і для ўсіх відавочная *адрознасьць* культураў пачынае ўспрымацца ў ацэначных катэгорыях, то бок калі, перафразуючы Саіда, адна культура ўспрымае *адрознасьць* іншай як *слабасьць*, а тая, у сваю чаргу, пераймае і сама засвойвае такі пункт гледжаньня як “аб’ектыўны”, — такая сытуацыя найвыразьней сьведчыць пра нераўнапраўныя стасункі між гэтымі культурамі, пра яўныя або прыхаваныя мэханізмы палітычнага ці палітычна-эканамічнага дамінаваньня аднае культурнае групы над іншай. Комплекс непаўнавартасьці што да мэтрапольнай расейскай культуры, які цяжэ над украінцамі, абумоўлены зусім ня “беднасьцю”, “слабасьцю” ці “другараднасьцю” іхнай уласнай культуры (аб’ектыўна кажучы, дзясяткі паўнавартых культураў — ад эстонскай да альбанскай і ад славацкай да каталёнскай — ані “багацейшыя”, ані “першараднейшыя” за культуру ўкраінскую). Украінскі комплекс непаўнавартасьці насамрэч абумоўлены *самім фактам параўноўваньня*, то бок сытуацыяй, у якую ўкраінцы былі гвалтам пастаўленыя на шмат дзесяцігодзьдзяў — у адрозьненьне ад каталёнцаў, славакаў, эстонцаў або й заходніх украінцаў, якія ніякіх комплексаў што да “вялікай расейскай культуры” ня маюць, хай сабе яна будзе хоць сто разоў “вялікаю”. Украінцаў *змусілі* глядзець на сябе чужымі вачыма, бачыць сябе ў чужым люстэрку, ацэньваць сябе паводле чужых крытэраў. Лішне казаць, што ані гэтыя крытэры не былі аб’ектыўнымі, ані погляд ня быў неперадузятым. Культурная адрознасьць пад чужым ацэначным поглядам ператваралася ў слабасьць, інакшасьць — ува ўбогасьць.

Прыняўшы чужыя правілы гульні, цюлень прайграе ягуару. Уся сям'я кашэчых мае мажлівасьць пераканацца, якія з гэтых ластаногіх нікчэмныя, бяздарныя, "адстойныя" бегуны. Не цюлені, а нейкая выродлівая, дэградаваная разнавіднасьць ягуараў. І галоўнае — у саміх цюленяў не павінна заставацца ў гэтым ніякага сумневу.

Міраслаў Шкандрый хоць і згадвае пра саманянавісьць калянізаванага народу як вынік інтэрналізацыі клясавых, культурных ды нацыянальных стэрэатыпаў і нават паказвае на прыкладзе раману Анатолія Сьвідніцкага "Любарацкія", як імпэрыя гадуе ў сваіх дэнацыяналізаваных падданых садамазахісцкія комплексы, мэтадалягічна ён застаецца па-за межамі псыхааналітычнага кірунку ў посткаляніяльных студыях і нават у бібліяграфіі не адводзіць асобнага радка ані Францу Фэнану, ані Ўладзімеру Адайніку, ані, урэшце, Аксане Грабовіч, спавешчаньне якой на львоўскім кангрэсе Міжнароднай асацыяцыі ўкраіністаў пра спадчыну камунізму й каляніялізму ў сучаснай Украіне заслугоўвае згадкі прынамсі як адна зь першых спробаў посткаляніяльнага прачытаньня ўкраінскай рэчаіснасьці. Да праблемы культурнага паняволеньня Міраслаў Шкандрый падыходзіць з крыху іншым мэтадалягічным ключом: для яго такое паняволеньне зьдзяйсьняецца праз паноўны (у дадзеным выпадку расейска-імпэрскі) дыскурс.

Для кнігі, якая зьмяшчае гэтае слова ў сваёй назьве, магчыма, прыдалося б даць шырэйшае тлумачэньне ключавога тэрміну, чым тое, якое аўтар робіць у прадмове з спасылкай на Мішэля Фуко, — *"сукупнасьць зьяваў і тэкстаў, якія аказваюцца рэгуляванымі, якім уласьцівая ўнутраная зьвязанасьць і якія дзейнічаюць як адзіная сіла"*. У любым выпадку, для тых чытачоў, што ня змогуць або й ня схочуць чытаць мудрагелістых тэарэтызаваньняў Мішэля Фуко, варта зазначыць, што: а) для французскага філёзафа ўсякі акт маўленьня ёсьць актам зьдзяйсьненьня ўлады, накіданьня волі, сьцьверджаньня дамінаваньня (ці, наадварот, актам супраціву); б) усякае маўленьне, ці, па-французску, дыскурс, укарэненае ў наяўных уладных стасунках, простым і ўскосным чынам іх адлюстроўвае і падтрымлівае (або, наадварот, руйнуе), абапіраючыся на адпаведныя грамадзкія інстытуцыі; в) усякае маўленьне, г.зн. дыскурс, ёсьць канвэнцыйным, то бок

прывязаным да пэўнай традыцыі, да пэўных рытарычных прыёмаў, формулаў, вобразаў, адкрытых і прыхаваных спасылак, намёкаў, да пэўнага кантэксту й падтэксту — як слоўна-вобразнага, так і рэчыўна-падзейнага; словам, гэта не аднаразовы і, вядома ж, не індывідуальны акт, а пэўны працэс, разгорнуты ў прасторы і часе, у тэкставай і грамадзкай рэчаіснасьці, з сваімі законамі, сваёй інэрцыяй і, так сказаць, сваёй энэргетыкай.

Галоўная выснова з гэтых схематычных тлумачэньняў для патэнцыйных чытачоў Шкандрыевай кнігі палягае ў тым, што ўсякі публічны дыскурс ня толькі адлюстроўвае рэчаіснасьць і ня проста ўплывае на яе і на нашае да яе стаўленьне, але й замяняе яе, “рэпрэзэнтуе”, стварае, робіцца сам своеасаблівай парарэчаіснасьцю, значна больш рэальнай, пераканаўчай і ўплывовай, чым уся тая рэчаіснасьць, якую ён нібыта апісвае. Менавіта такое разуменьне дыскурсу лягло ў аснову бліскучай працы Эдварда Саіда “Арыенталізм” (1985). Працы, якая, паводле прызнаньня самога Міраслава Шкандрыя, паслужыла для яго своеасаблівым узорам і крыніцай натхненьня, — насуперак сутнаснай, а часам і прынцыповай адрознасьці ў аб’екце дасьледаваньня.

2

Перачытаўшы Саіда, мы можам ня толькі лепей зразумець ключавы для Шкандрыевай працы панятак “дыскурсу”, але й спэцыфіку словазлучэньня “дыскурс імпэрыі”, вынесенага ў загаловак, аднак нідзе ў кнізе не растлумачанага. Ідзецца, як мы можам дапусьціць, пра пэўную сыстэму апавядальных, ці, як іх яшчэ называюць, наратыўных прыёмаў, якія адлюстроўваюць наяўную сытуацыю імпэрскага дамінаваньня, легітымізуюць яе і сьцьвярджаюць як “аб’ектыўна” немінучую і неабходную. Імпэрская ідэалёгія ўсяго толькі забясьпечвае імпэрскі гегеманізм ды экспансію неабходнымі аргумэнтамі, лягічным, так бы мовіць, каркасам. А таму дыскурс імпэрыі робіцца вобразна-сымбалічным напаўненьнем гэтага каркасу, ягонай шматлікаю, шматколернаю, шматгалосаю рэпрэзэнтацыяй. Ідэалёгія — гэта перадусім тое, *пра што* гаворыцца; дыскурс — гэта тое, *як* гаворыцца, якімі спосабамі, у якой сувязі зь іншымі аповедамі; дыскурс — гэта яшчэ й пэўны пункт гледжаньня, падбор матэрыялу, падкрэсьленьне і памякчэньне,

замоўчваньне; гэта, зрэшты, ня толькі тэксты, але й усякія іншыя формы сымбалічнай рэпрэзэнтацыі — ад помнікаў да паштовых марак, ад вайсковых парадаў ды нацыянальных сьвятаў да ілюстрацыяў у школьных падручніках.
Міраслаў Шкандрый пачынае кнігу з кароткага апісаньня асноўных элемэнтаў імпэрскага дыскурсу што да Ўкраіны — гэтакіх стандартных міталягемаў, з дапамогаю якіх абгрунтоўвалася выключна палітычнае, а паводле сваёй ідэалёгіі, безумоўна, імпэрскае заданьне — падпарадкаваньне і паглынаньне Ўкраіны Расеяй. Гэтыя міталягемы знаёмыя большасьці ўкраінцаў яшчэ з школьнае лавы, і шмат для каго яны захоўваюць аўтарытэт аб'ектыўнае ісьціны — гэткай віртуальнай рэальнасьці, створанай магутным паноўным дыскурсам. Сярод ягоных асноўных матываў — ідэя "трыадзінай" рускай нацыі ды ідэя ўкраінска-расейскае роднасьці, амаль тоеснасьці, ідэя выключнай велічы і магутнасьці Расейскай імпэрыі, бясспрэчна прывабнай для суседніх народаў — гэтакай прывабнай, што яны самі, без усякага прымусу, прагнуць зь ёй зьліцца (Шкандрый цытуе характэрнае выказваньне сучаснага расейскага нацыяналіста Станіслава Куняева: *"Нацыяналізм — гэта для малых народаў, якія баяцца зьнікненьня. Расейцы — вялікі народ… Расея — як Хрыстос, які кажа ўсім: прыйдзеце й далучэцеся да майго духу"*).
А адсюль і асаблівая місія расейцаў, упаўнаважаных ці то Богам, ці то Гісторыяй аб'яднаць славянаў, сьцьвердзіць сапраўднае хрысьціянства, адратаваць сьвет і, вядома, навесьці парадак на сваіх блізкіх і далёкіх ускраінах, зьдзяйсьняючы клясычную для ўсякага імпэрыялізму цывілізатарскую місію.
Разгортваньне гэтых асноўных матываў імпэрскага дыскурсу ў расейскай літаратуры Міраслаў Шкандрый прасочвае ад XIX стагодзьдзя, то бок ад эпохі рамантызму, што супала з эпохаю напалеонаўскіх войнаў ды імклівага распаўсюджваньня па Эўропе ідэяў сучаснага нацыяналізму. Хоць аўтар выразна не абгрунтоўвае прычынаў свайго менавіта такога храналягічнага выбару (бо дыскурс Расейскай імпэрыі можна прасачыць ад самага яе ўзьнікненьня, прынамсі ад сымбалічных дзеяньняў Пятра I ды твораў Феафана Пракаповіча), прычынаў на тое, хутчэй за ўсё, было некалькі: брак сапраўды цікавага літаратурнага матэрыялу, агульная ўбогасьць, недаразьвітасьць імпэрскага дыскурсу, яшчэ не афарбаванага ў XVIII стагодзьдзі

мадэрным нацыяналізмам, і, вядома, адсутнасьць украінскага антыімпэрскага контрадыскурсу, які, уласна, і ёсьць галоўным аб'ектам Шкандрыевага дасьледаваньня.
На зьмену няўклюдным імпэрскім одам XVIII стагодзьдзя ды экзатычным апісаньням імпэрскіх ускраінаў у падарожных нататках мяжы стагодзьдзяў, сучасная эўрапейская літаратура, што зьяўляецца ў Расеі ў 20—30-х гадох XIX стагодзьдзя, прыносіць нашмат складанейшае, танчэйшае, шматграньнейшае бачаньне імпэрыі як *праблемы*, як крыніцы людзкіх і цывілізацыйных драмаў, канфліктаў, выпрабаваньняў. Фактычна толькі ад гэтага часу імпэрскі дыскурс робіцца ў расейскай літаратуры зьявай уласна мастацкай, а не выключна ідэалягічнай.
Захопніцкая вайна, распачатая імпэрыяй на Каўказе, спарадзіла значны масіў "арыентальнай" літаратуры досыць высокай мастацкай якасьці — літаратуры, у якой імпэрскія стэрэатыпы й вялікадзяржаўніцкія пачуцьці расейскіх пісьменьнікаў спрачаліся, а затым уступалі ў драматычнае змаганьне зь іхнымі вальналюбнымі ідэаламі, гуманістычнымі прынцыпамі, нарэшце, з самім матэрыялам ды неабходнасьцю яго ўласна мастацкага, а не выключна прапагандысцкага асэнсаваньня. Як правіла, гэтае змаганьне канчалася перамогаю імпэрскага погляду над агульналюдзкім, аднак, як паказвае Міраслаў Шкандрый на прыкладзе твораў Лермантава і Бястужава-Марлінскага, сама сытуацыя дыялёгу пэўным чынам абмяжоўвала моц імпэрскага дыскурсу, ставіла пад сумнеў ягоную абсалютную аўтарытэтнасьць, адкрывала патэнцыйную магчымасьць для контрадыскурсу, якую ўрэшце і рэалізаваў у пэўнай ступені Шаўчэнка ў "Каўказе" ды іншых творах.
Рэпрэзэнтацыя Ўкраіны ў расейскай імпэрскай літаратуры была шмат у чым падобнаю да рэпрэзэнтацыі "экзатычных" паўднёва-ўсходніх ускраінаў і, шырэй, рэпрэзэнтацыі ўсякіх "арыентальных" земляў у клясычных літаратурах Захаду. Характэрныя прыкметы такой рэпрэзэнтацыі — выява калянізаваных земляў як дзікіх ці напаўдзікіх, пазбаўленых унутранай структуры, архаічных і анархічных, заселеных нейкімі выключна біялягічнымі, чалавекападобнымі суполкамі, закансэрваванымі ў пазача́савасьці, па-за межамі сапраўднай, то бок імпэрскай, гісторыі. Найбольш выразна і пасьлядоўна такі вобраз Маларосіі стварaў Вісарыён Бялінскі, грунтуючыся

часткова на рэпрэзэнтацыях Украіны ў творах Гогаля, Пушкіна, Квіткі-Аснаўяненкі ды іншых сучасных яму літаратараў, а часткова на сваіх уласных уяўленьнях пра Дух Гісторыі ды асуджанасьць “негістарычных” народаў на падпарадкаваньне й зьліцьцё з гістарычна абранымі.

“Арыентальная” рэпрэзэнтацыя Ўкраіны натыкалася, аднак, на істотны супраціў фактычнага матэрыялу й патрабавала, такім чынам, сутнаснага карэктаваньня ў рамках імпэрскага дыскурсу. Па-першае, Украіна не была для Расеі “Ўсходам”, хутчэй наадварот — цягам колькіх стагодзьдзяў яна была для яе крыніцай заходніх уплываў, істотным чыньнікам эўрапеізацыі Маскоўскага царства й ператварэньня яго ў Расейскую імпэрыю. Па-другое, гэтая імпэрыя сама зазнала актыўную “арыенталізацыю” з боку заходнеэўрапейскага дыскурсу: досыць згадаць хоць бы знакамітыя падарожныя нататкі маркіза дэ Кюстына. А галоўнае, Украіна не магла быць нечым цалкам “чужым” для імпэрыі — і ня толькі праз сваю праваслаўную і славянскую роднасьць, але й праз кіеўска-рускую спадчыну, якая мусіла быць інкарпараваная ў імпэрскую гісторыю як цалкам “свая” й арганічная.
Такім чынам, рэпрэзэнтацыя Ўкраіны ў расейскім дыскурсе, як заўважае Міраслаў Шкандрый, была амбівалентнаю: гэта быў край увадначас варожы і сяброўскі, далёкі і блізкі, чужы і родны. Каб унікнуць лягічнае супярэчнасьці між гэтымі рэпрэзэнтацыямі, расейская гістарыяграфія распрацавала вытанчаную мадэль трыадзінай рускай нацыі, у якой украінцам адводзілася роля рэгіянальнай галіны, адсечанай ад адзінага дрэва неспрыяльнымі гістарычнымі акалічнасьцямі, аднак пасьпяхова прышчэпленай назад, дзе яна мае цяпер мажлівасьць па-сапраўднаму расьцьвісьці на дабро сабе і ўсяму дрэву. Украінскай амбівалентнасьці такім чынам было нададзена рацыянальнае і цалкам пераканаўчае тлумачэньне: усё, што ёсьць ува Ўкраіне і ўкраінцах добрага, паходзіць ад супольнай рускай спадчыны, адзінакроўнасьці, адзінавернасьці і, вядома, ад невынішчальнай прагі быць ляяльнымі да адзінага ўладара — гэткая сабе праваслаўна-імпэрская тэлеалёгія, удала паказаная Шкандрыем на прыкладзе другога варыянту “Тараса Бульбы”. А зь іншага боку, усё, што ёсьць ува Ўкраіне і ўкраінцах благога, паходзіць ад варожых уплываў — польска-

каталіцкіх, езуіцкіх, уніяцкіх, татарскіх і да т.п. Пры гэтым цікава, што польскія ўплывы ў гэтым дыскурсе паказаныя не як культурна-цывілізацыйныя, а выключна як дэструктыўныя, зьвязаныя з рэлігійным ды сацыяльным уціскам, грамадзкаю дэгенэрацыяй і маральным заняпадам. Калі ўкраінцы й запазычылі ад палякаў якіясь элемэнты цывілізацыі, дык хіба вельмі сумнеўную каталіцкую вучонасьць ды неэфэктыўныя прававыя і адміністрацыйныя інстытуцыі, якія давялі саму Польшчу да хаосу й неабходнасьці ўсталяваць над ёю суседзкую апеку. Ня менш характэрна й тое, што ўдзельная вага польскіх уплываў у расейскіх рэпрэзэнтацыях Украіны досыць абмежаваная: насуперак усёй сваёй амбітнай рыторыцы, Расейская імпэрыя пачувалася даволі няўтульна ў дачыненьні да Польшчы ў культурна-цывілізацыйным пляне. Таму ў імпэрскіх рэпрэзэнтацыях Украіны пераважаюць намёкі на “татарскія” і ўвогуле “азіяцкія” ўплывы. Шкандрый зьвяртае асаблівую ўвагу на адлюстраваньне Мазэпы ў “Палтаве” Пушкіна як апэрэткавай, напаўазіяцкай постаці (у процівагу “эўрапейцу” Пятру I); цытуе вядомыя пасажы Бялінскага пра запарожцаў як разнавіднасьць татараў і менш вядомыя, але ня менш забаўныя пасажы Паўла Сьвіньіна зь ягонай прадмовы да ўкраінскіх аповесьцяў Гогаля 1830 году: *“Маларосы больш падобныя (чым велікаросы) да раскошных жыхароў Азіі”*. Яны падобныя да азіятаў *“абліччам, формаю, стройнасьцю паставы, лянотнасьцю й бестурботнасьцю”*. Тым ня менш, у іх няма *“таго бурлівага неўтаймоўнага запалу, уласьцівага шанавальнікам ісламізму; флегматычная нядбаласьць, здаецца, служыць ім перашкодай і абаронай ад трывожных хваляваньняў, і часта з-пад іхных густых броваў праблісквае агонь, прабіваецца дзёрзкі эўрапейскі розум, а палкая любоў да айчыны й палымяныя пачуцьці, убраныя ў вонкавую прастату, хаваюцца ў іхных грудзёх”*.

Мэта гэтага дыскурсу дваістая: з аднаго боку, ён адпавядае мастацкай неабходнасьці прадставіць Украіну і ўкраінцаў як нешта экзатычнае, інакшае, адрознае, спэцыфічнае, зь іншага боку — адпавядае палітычнаму імпэратыву асыміляцыі краю, ягонай імпэрскай гамагенізацыі. Адрознасьць украінцаў ад расейцаў можа быць цікаваю з эстэтычнага пункту гледжаньня — на ўзроўні фальклёру, звычаяў, вонкавых праяваў. Але з палітычнага гледзішча яна не павінна быць празьмернаю, надта

істотнаю — такою, якая б зашкодзіла асвойваньню краю і ператварэньню яго ў край свойскі, яго інтэграцыі ў адзіны імпэрскі праект. Пры ўсёй сваёй інакшасьці ўкраінцы мусяць заставацца ў імпэрскім дыскурсе разнавіднасьцю расейцаў — то бок матэрыялам ня гэтулькі для літаратурных практыкаваньняў, колькі для эфэктыўнага імпэрскага будаўніцтва.

Своеасаблівы пэрл гэтага дыскурсу — нататкі князя Даўгарукага зь ягонага падарожжа ў Маларосію 1810 году: *“Хахол,* — тлумачыць сваім чытачам аўтар, — *падобна, створаны самою прыродаю, каб урабляць зямлю ў поце чала свайго… Ён не наракае на сваё паднявольнае становішча: ён ня ведае нічога лепшага… Ён ведае свой плуг, валы, гарэлку, і гэта складае ўвесь ягоны непераборлівы лексыкон… Ён ахвотна прымае ўсякую долю і ўсякую працу. І ўсё ж яго неабходна ўвесь час падганяць, бо ён надта лянівы: ён можа заснуць і прачнуцца пяць разоў за хвіліну разам з сваім валом… Наважуся дапусьціць, што калі б увесь гэты люд не заўдзячваў адукаваным земляўласьнікам сваю зычлівасьць і чалавечнасьць, хахла цяжка было б адрозьніць ад мурына зь якога-кольвек гледзішча: адзін вырошчвае ў поце чала цукровы трысьнёг, другі — збожжа. Хай Гасподзь даруе ім абодвум добрае здароўе!”*
Калі аўтару гэтага ўрыўку й можна прыпісаць пэўную павярхоўнасьць ды перадузятасьць, дык толькі станавую, але не этнічную. Князь Даўгарукі апісвае спэцыфічную рэгіянальную разнавіднасьць імпэрскага селяніна, якога называе “хахлом”. І бязь цяжкасьцяў можна дапусьціць, што з такой самай дакладнасьцю і адстароненасьцю ён апісваў бы і адрозьненьні паміж кастрамскім селянінам і, скажам, разанскім. На пачатку XIX стагодзьдзя расейскія арыстакраты (як і маларасійскія) ня мелі яшчэ звычкі залічваць сябе да адной нацыі ані зь вялікарасейскімі сялянамі, ані з маларасійскімі. Эстэтычны імпэратыў гэтага дыскурсу зразумелы: даць сваім чытачам штось цікавае, забаўнае, арыгінальнае: “дзікі” Каўказ і “поющая и пляшущая” Маларосія, безумоўна, забясьпечвалі рамантыкаў значна лепшым матэрыялам для іхных экзатычных патрэбаў, чым Разань або Кастрама. Ня менш відавочны тут і палітычны імпэратыў: забясьпечыць ня толькі палітычнае, але й эканамічнае дамінаваньне імпэрыі на новаздабытых

тэрыторыях, зрабіць “хахлоў” — сьпярша на ўзроўні рэпрэзэнтацыі, а затым і ў рэальнасьці — “сваімі”, свойскімі, бясьпечнымі, прыстасаванымі да патрэбаў імпэрыі (пра патрэбы саміх “хахлоў” тут, зразумела, мовы няма).
Тэкст Даўгарукага — досыць удалы прыклад амаль поўнага супадзеньня эстэтычнага імпэратыву з палітычным; спэцыфічныя асаблівасьці маларосаў тут паказаныя такім чынам і толькі ў такой ступені, у якой гэта неабходна для абгрунтаваньня іхнага імпэрскага запрыгоньваньня й эксплюатацыі. Па сутнасьці, хахлы — гэта такія самыя сяляне, толькі больш лянівыя, таму ім неабходны стражэйшы нагляд і прымус. У больш таленавітых аўтараў, аднак, супярэчнасьць між палітычным і эстэтычным заданьнямі выяўлялася часам даволі значнаю — як гэта паказвае Міраслаў Шкандрый на прыкладзе паэмы Кандрата Рылеева “Вайнароўскі” (дзе паэт дае, па сутнасьці, пазытыўны вобраз Мазэпы — ня “здрадніка”, згодна з паноўным імпэрскім дыскурсам, а вальналюбнага бунтара — адпаведна ўласнай мастацкай інтуіцыі). Ці на прыкладзе ўкраінскіх аповесьцяў Гогаля, цалкам ляяльных да імпэрыі, аднак патэнцыйна небясьпечных і падрыўных для яе — менавіта празь яскравае і таленавітае, аж надта захапляльнае адлюстраваньне аўтарам украінскай інакшасьці і адметнасьці. Шкандрый піша, што Гогаль зь ягонай падвойнаю маларасійска-імпэрскаю ідэнтычнасьцю, па сутнасьці, “манэўраваў між абодвума дыскурсамі” (каляніяльным ды антыкаляніяльным). Мусіць, дакладней было б сказаць, што Гогаль давёў супярэчнасьць між неабходнасьцю палітычнага падпарадкаваньня Ўкраіны (шляхам яе пажаданай гамагенізацыі) ды яе эстэтычным вызваленьнем (шляхам сьцьверджаньня яе культурнай унікальнасьці) да небясьпечнай мяжы, за якой самабытны край з слаўным мінулым пачынаў разьвівацца паводле ўласных законаў, насуперак гамагенізацыйным высілкам імпэрыі. Гогаль-імпэрыяліст закрываў гэтую магчымасьць, паўсюдна абвяшчаючы, што ягоная Маларосія — гэта своеасаблівы музэй, яскравае мінулае, якое згасла, скончылася, знайшло сваё лягічнае завершаньне ў агульнаімпэрскай цяпершчыне й будучыні. Патрэбны быў толькі пэўны штуршок, каб рэанімаваць, рэінтэрпрэтаваць гэты міт — міт слаўнай, аднак аджылай, памерлай Маларосіі.

Шаўчэнка стварыў новы міт, які палемічна грунтаваўся, як гэта пераканаўча давёў Грыгоры Грабовіч, на адмаўленьні гогалеўскага і ўвадначас — на ягоным творчым разьвіцьці. Гэта быў вобраз ня мёртвай Украіны, а прыснулай, жыўцом пахаванай, аднак гатовай да абуджэньня і ўваскрасеньня. Шаўчэнка аднавіў тую самую Ўкраіну, якую Гогаль неасьцярожна стварыў і яшчэ неасьцярожней (бо заўчасна) пахаваў. Але Шаўчэнка меў што аднаўляць менавіта дзякуючы Гогалю і шматлікім іншым ляяльным да імпэрыі, але, як неўзабаве высьветлілася, "занадта" заклапочаным маларасійскаю самабытнасьцю ўкраінафілам.

3

У чацьвертым разьдзеле ("Контранаратывы ўва ўкраінскай літаратуры") Міраслаў Шкандрый паказвае драматычную раздвоенасьць украінскіх пісьменьнікаў між імпэрскім ды рэгіянальным, якая цягам XIX стагодзьдзя рабілася ўсё больш востpай — у меру фармаваньня ўкраінскага мадэрнага нацыяналізму. Нават, здавалася б, гіпэрляяльны што да імпэрыі Квітка-Аснаўяненка мімахоць падрываў асыміляцыйную імпэрскую стратэгію, паказваючы *"жыцьцёвасьць мясцовай ідэнтычнасьці"* і мэтанакіравана пашыраючы кола чытачоў украінскай літаратуры — тых самых чытачоў, безь якіх посьпех, а можа, і зьяўленьне Шаўчэнкі былі б немагчымымі. Уласна, гэтую прыхаваную супярэчнасьць між палітычна імпэрскім і эстэтычна "нацыянальным" яшчэ ў 1985 годзе заўважыў Марка Паўлышын у артыкуле пра палітыку ды рыторыку ў "Энэідзе" Катлярэўскага. Тое, што ў Гогаля і Аснаўяненкі было хутчэй міжвольным, "пабочным" вынікам іхнага імпэрскага ўкраінафільства, праз пару дзесяцігодзьдзяў выявілася часткай сьвядомай рэдакцыйнай стратэгіі часопісу "Основа". Абвешчаньне адрознасьці, самабытнасьці Ўкраіны, піша Шкандрый, робіцца "аргумэнтам на карысьць яе самавызначэньня".

Украінская літаратура ў другой палове XIX стагодзьдзя паступова перастае быць часткаю "агульнарасейскай", фармуючы свой уласны канон, інстытуцыі (крытыку, выдавецтвы, часопісы), свайго чытача і, вядома, свой самастойны, эмансыпаваны ад імпэрскага, дыскурс. Шаўчэнкава творчасьць, безумоўна, у вялікай ступені

паспрыяла гэтаму працэсу. Аднак былі і іншыя чыньнікі, на якія зьвяртае ўвагу Міраслаў Шкандрый: жорсткі цэнзурны ды моўны ціск, перанясеньне выдавецкае дзейнасьці за мяжу (перадусім у Галіччыну), русіфікацыя ўкраінскіх гарадоў і згасаньне рамантычнай цікаўнасьці расейскае публікі да маларасійскай экзотыкі. Фактычна ажно да самае рэвалюцыі стаўленьне адукаваных расейцаў да ўкраінскай літаратуры і праблематыкі ўвогуле заставалася амаль такім самым, як і ў 1830—40 гадох, — на ўзроўні сумнавядомых водгукаў Бялінскага ды Хамякова, то бок на ўзроўні кансэрватыўнае парадыгмы, якая ўвогуле адмаўляла ўкраінскую літаратуру як небясьпечную дурасьць, або на ўзроўні парадыгмы лібэральнай, якая талеравала гэтую літаратуру — але выключна як дыялектную разнавіднасьць агульнарасейскай. *“Расейскія пісьменьнікі й чытачы,* — канстатуе Шкандрый, — *нібы й не заўважалі, што сам характар украінскай літаратуры й сьвядомасьці сутнасна зьмяніўся… Украінскую літаратуру й надалей разглядалі як эстэтычна непаўнавартасную, а ўкраінскую сьвядомасьць — як праяву правінцыялізму. Навуковы дыскурс пра Ўкраіну амаль не пранікаў у расейскую літаратуру, а наймагутнейшыя ўвасабленьні контрадыскурсу заставаліся збольшага незаўважанымі. Як вынік, расейскія інтэлектуалы маргіналізавалі ўкраінскае пытаньне. У мастацкіх творах украінскія характары амаль ніколі ня мелі нейкай псыхалягічнай глыбіні, а іхныя культурныя праблемы ніколі не трактаваліся ўсур’ёз. Украінцы калі і зьяўляюцца ў расейскай прозе другой паловы XIX стагодзьдзя (як, напрыклад, у творах Талстоя — усялякія конюхі, садоўнікі, жаўнеры), ад расейцаў яны адрозьніваюцца адно сваёй “гаворкаю”. Хоць Чэхаў і Бунін жартам называлі сябе “хахламі”, гэтае азначэньне ня мела для іх ніякага палітычнага сэнсу”.*

Гэтая надзвычайная глухата імпэрскай культуры да свайго найбліжэйшага й найбольшага суседа, да ўсё гучнейшага і разнастайнейшага шматгалосься, якое зьяўляецца ўва ўкраінскай літаратуры, ёсьць бліскучым прыкладам сілы і ўвадначас катастрафічнай інэрцыі імпэрскага дыскурсу, з гравітацыйнага поля якога не пад сілу вырвацца нават такім таленавітым пісьменьнікам, як Булгакаў, Набокаў ці Бродзкі. Дыскурс дамінаваньня, які сфармаваўся ў расейскай культуры

пачатку XIX стагодзьдзя і які “прыручаў”, “адамашніваў”, “прысвойваў” Украіну, усяляк яе прымітывізуючы, не зьмяніўся, па сутнасьці, і сёньня. Ад самага пачатку гэты дыскурс старанна адсейвае факты, падзеі і галасы, рэпрэзэнтуючы толькі тыя зь іх, якія яго аб’ектыўна ўзмацняюць. Усё, што можа зашкодзіць рэпрэзэнтацыі “літаратурнай Украіны” ў імпэрскім дыскурсе, замоўчваецца або маргіналізуецца — ад разьніны, учыненай Пятром I у Батурыне, да польскіх культурных уплываў і ўзроўню адукаванасьці ўва Ўкраіне XVI—XVII стагодзьдзяў. (Тарас Бульба, які прыхоўвае сваю вучонасьць, сваё веданьне лаціны, ёсьць з гэтага гледзішча постацьцю знакавай. Як, дарэчы, і тыя гогалеўскія запарожцы, якія *сьвядома* разыгрываюць у Пецярбурзе ролю прыдуркаватых хахлоў, бо *менавіта гэтага* ад іх чакаюць.) Імпэрскі дыскурс фактычна пазбаўляў украінцаў іхнага рэальнага голасу, гаворачы за іх і ад іхнага імя. Уласна, рэальныя патрэбы, думкі і пачуцьці тубыльцаў ня маюць ніякага значэньня, бо імпэрыя заўжды ведае гэта лепей за іх. Згадайма знакамітыя словы Бялінскага зь ліста да Аненкава пра тое, што ён сам не чытаў Шаўчэнкавага антыцарскага пасквілю і чытаць ня думае, бо ён і так ведае, што твор нікчэмны, — квінтэсэнцыя імпэрскага ўспрыманьня Ўкраіны расейскімі інтэлектуаламі.

Зь зьяўленьнем украінскага контрадыскурсу высьветлілася, аднак, што для ягонага замоўчваньня й маргіналізацыі недастаткова адных толькі дыскурсійных прыёмаў. Нягледзячы на татальны кантроль імпэрыі за адукацыяй, друкам, публічнымі выступамі, аказалася, што для нэўтралізацыі небясьпечнага канкурэнту патрэбныя яшчэ й дадатковыя цэнзурныя ды паліцэйскія захады. *“Барацьба дзьвюх культураў”*, справядлівасьць якой нястомна адстойваюць імпэрскія лібэралы, як заўжды, абярнулася барацьбою культуры, што мае войска і паліцыю, супраць культуры, якая ня мае нічога, нават магчымасьці друку. Погляды на Ўкраіну з боку левых і правых, лібэралаў і кансэрватараў, культурных і жандарскіх элітаў аказаліся ў Расеі, як заўжды, надзвычай падобнымі. *“Літаратары, журналісты, адміністратары,* — зь бесстароннасьцю патолягаанатама падсумоўвае Міраслаў Шкандрый двухсотгадовую гісторыю расейска-ўкраінскіх літаратурных узаемінаў, — *усе зрабілі свой унёсак у адзіны*

імпэрскі дыскурс ды пашырэньне гегеманісцкіх поглядаў”. Расплата за гэтую аднастайнасьць, за даравальную для паліцэйскіх, аднак недапушчальную для інтэлектуалаў глухату да голасу “іншага”, была цяжкай, хоць досыць яшчэ належным чынам не ўсьвядомленай. У бліскучым аналізе глыбокай, амаль гістэрычнай украінафобіі Міхаіла Булгакава Міраслаў Шкандрый піша пра трагедыю выдатнага пісьменьніка, чыё *“бачаньне гамагеннай і цэласнай расейскай культуры з усталяванымі нормамі было траўмавана зьяўленьнем нацыянальнага руху, пра існаваньне якога ён не падазраваў і таму працягваў яго адмаўляць. У ягоных тэкстах пра Ўкраіну можна ўгледзець намаганьні загнаць джына назад у бутэльку, рэінтэрпрэтуючы ўсе падзеі акрэсьленага пэрыяду адпаведна з паноўным і прынятым культурным узорам”*.
“Траўму дэкалянізацыі”, “траўму страты імпэрыі” Міраслаў Шкандрый згадвае таксама ў сувязі з Салжаніцыным ды шэрагам іншых расейскіх інтэлектуалаў. Аднак значнейшаю ў гэтым кантэксьце здаецца згадка аўтара пра агульнанацыянальную траўму, якую ўчынілі расейскай мэнтальнасьці стагодзьдзі каляніяльнага ўціску і, адпаведна, “інтэрналізацыі” імпэрскага гвалту што да іншых народаў. Пераадоленьне гэтае траўматычнае спадчыны ў расейскай культуры, як, дарэчы, і адпаведнай траўматычнай спадчыны ў культуры ўкраінскай, магчымае, на думку аўтара, на шляху засваеньня абедзьвюма культурамі посткаляніяльных мастацкіх прыёмаў ды падыходаў. Ён спачувальна цытуе Марка Паўлышына, які на прыкладзе твораў Юр’я Андруховіча паказвае прадуктыўнасьць і пэрспэктыўнасьць менавіта такога падыходу. (“Каляніяльнымі” Марка Паўлышын называе тыя мастацкія зьявы і прыёмы, якія ствараюць і падтрымліваюць структуры й міты каляніяльнага дамінаваньня; “антыкаляніяльнымі” — тыя, якія процістаяць каляніяльным структурам, адмаўляюць каляніяльныя міты, ствараючы свае ўласныя, нацыянальна-вызвольныя; а за “посткаляніяльны” ён уважае такі падыход да каляніяльнай спадчыны, які ўлічвае абмежаванасьць і частковасьць “каляніяльнага” і “антыкаляніяльнага” — становіцца, так сказаць, па-над двубоем і стварае ўласны дыскурс на аснове вольнай гульні з абодвума папярэднімі дыскурсамі як часткамі ўласнай гістарычнай спадчыны.)

На прыкладзе дзьвюх аповесьцяў Андруховіча Шкандрый паказвае, як “посткаляніяльны” празаік вольна дэканструюе ня толькі імпэрскія міты, але й нацыянальныя, асабліва традыцыйнае адлюстраваньне Ўкраіны як нявіннай ахвяры кепскіх суседзяў, перадусім дэманічнай Расеі. З гэтага пункту гледжаньня Шкандрый цалкам слушна паказвае на пэўныя элемэнты посткаляніяльнай іроніі (і самаіроніі), гібрыднасьці і пратэізму ў творчасьці Хвылёвага. Нават яшчэ раней — на прыкладзе ўкраінскага мадэрнізму. Ён кажа пра істотнае ўскладненьне ўкраінскага антыкаляніяльнага дыскурсу, узбагачэньне яго элемэнтамі самарэфлексіі, унутранай палемікі, асабліва палемікі з паноўнай народніцкай дактрынай, і зьяўленьне ў ягоных межах альтэрнатыўных дыскурсаў — фэмініcтычнага, эстэцкага, авангардысцкага.
Пры ўсёй прывабнасьці такой стратэгіі, што адстойваецца Мірaславам Шкандрыем ды Маркам Паўлышыным, варта, аднак, зазначыць, што ні расейская, ні ўкраінская літаратуры не здабылі пакуль што дастатковай унутранай свабоды для “посткаляніяльнага” вызваленьня з-пад сваіх паноўных дыскурсаў. Ува Ўкраіне, насуперак фармальнаму дасягненьню незалежнасьці, фактычна трывае ў пэўным сэнсе халодная грамадзянская вайна, асабліва на ўзроўні сумнавядомай “барацьбы дзьвюх культураў”, вынікі якой цяжка пакуль што прадбачыць. Гэта, зразумела, падтрымлівае антыімпэрскую мабілізацыю і адпаведны дыскурс ува ўкраінскай культуры, а зь іншага боку, сілкуе традыцыйны імпэрскі дыскурс, даючы яму пэўныя надзеі на далейшае дамінаваньне і адкрываючы ў ягоных прыхільнікаў другое (ці, хутчэй, ужо дваццаць другое) дыханьне. А таму Шкандрыевы словы пра Стуса можна ў вялікай ступені дастасаваць і да большасьці сёньняшніх украінскіх літаратараў: *“посткаляніяльны дзеля жаданьня, антыкаляніяльны дзеля патрэбы”*.

4

Падсумоўваючы, можна сказаць, што кніга Мірaслава Шкандрыя акрэсьлівае досыць цікавую тэрыторыю для літаратуразнаўчых дасьледаваньняў, прапаноўваючы агульнавядомыя, але, на жаль, мала ўжываныя на гэтай тэрыторыі інструмэнты аналізу. Памеры тэрыторыі ў пэўнай

ступені абумовілі фрагмэнтарнасьць кнігі: у другой сваёй палове яна страчвае цэласнасьць і ператвараецца ў збор больш-менш цікавых ды менш або больш зьвязаных міжсобку нарысаў. Так, скажам, у шостым разьдзеле (“Нацыянальны наратыў мадэрнізму”) вядзецца толькі пра дзьве п’есы Лэсі Ўкраінкі ды раман Пятра Карманскага “Колцы ружы” (1921). Апошні твор, аднак, мае дачыненьне хутчэй да польска-ўкраінскай, чым украінска-расейскай праблематыкі, а галоўнае — ён і дагэтуль застаецца неапублікаваным, дзеля чаго ягоны ўплыў на *публічны* дыскурс даволі сумнеўны. Замест гэтага куды больш дарэчным у згаданым кантэксьце быў бы разгляд твораў шырока публікаванага ўва Ўкраіне і Расеі Ўладзімера Віньнічэнкі. Гэтаксама і ў сёмым разьдзеле, прысьвечаным галоўным чынам літаратурнай барацьбе 1920-х гадоў (“Бой зь Левіятанам”), аўтар засяроджваецца, апроч Булгакава, на дзьвюх ключавых постацях — Хвылёвым і Дамантовічу, хоць роля апошняга ў кантэксьце дасьледаванай праблематыкі наўрад ці сувымерная з роляй Куліша-драматурга або Зерава-“нэаклясыка”. Па-за рамкамі аўтарскага дасьледаваньня застаецца практычна ўвесь масіў сэрвільнай літаратуры эпохі сацрэалізму, хоць ейная пэўная амбівалентнасьць што да імпэрскага праекту (на якую досыць пранікліва паказаў яшчэ ў 1954 годзе Юры Шэрах, рэцэнзуючы “Таўрыю” Ганчара) дае неблагія падставы для ейнага крытычнага супастаўленьня зь ляялісцкай літаратурай данацыяналістычнай эпохі — ад Катлярэўскага да Гогаля і Квіткі-Аснаўяненкі. Можна пашкадаваць і пра тое, што шасьцідзясятніцтва прадстаўлена адно постацьцю Стуса — безумоўна, значнаю, але надта ўжо спэцыфічнаю. А сучасная (“посткаляніяльная”) эпоха — толькі дзьвюма аповесьцямі Андруховіча (разьдзел восьмы, апошні — “Посткаляніяльная пэрспэктыва”).

Другі пралік кнігі — яе пэўная, так сказаць, тэматычная несфакусаванасьць. Абраўшы аб’ектам свайго дасьледаваньня “дыскурс імпэрыі”, аўтар больш-менш пасьлядоўна асьвятляе акрэсьленую тэму ў першых трох разьдзелах — “Літаратура і імпэрыя”, “Імпэрскае памежжа ў расейскай літаратуры” і “Ўкраіна ў расейскім імпэрскім дыскурсе” (хоць і тут, як ужо зазначалася, варта было надаць больш увагі ўва ўступе тлумачэньню сваёй мэтадалёгіі й тэрміналёгіі). У чацьвертым—пятым разьдзелах (“Контранаратывы ўва ўкраінскай

літаратуры” і “Сутыкненьне дыскурсаў”) аўтар паступова пераключаецца на антыімпэрскую тэматыку ўва ўкраінскіх творах, а ў трох заключных разьдзелах, падобна, дае ўжо поўную волю сваім прафэсійным схільнасьцям вучонага-ўкраініста, зьвяртаючыся да расейскіх тэкстаў (апроч Булгакава) толькі мімаходзь, без выразнай сыстэмы. Адчуваючы, пэўна, канцэптуальную ўразьлівасьць такога зьмяшчэньня, аўтар пры канцы кнігі, у “Высновах”, нагадвае, што “дыскурс імпэрыі” — гэта ня толькі дыскурс каляніяльны, але й антыкаляніяльны; зразумець іх адзін без аднаго немагчыма. *“Рэпрэзэнтацыі імпэрыі ў расейскай ды ўкраінскай літаратурах,* — піша Шкандрый, — *можна разглядаць як часткі шырэйшай рытарычнай супярэчнасьці, дыялектычнай працы ўявы, у якой адзін твор нярэдка ёсьць адказам на іншы. Дыскурс імпэрыі і яе контрадыскурс функцыянуюць у літаратуры, пісанай абедзьвюма мовамі… Высокая ступень дзьвюхмоўя ўва ўкраінскай супольнасьці давала ўкраінцам магчымасьць выкарыстоўваць расейска-ўкраінскую інтэртэкстуальнасьць пры ўжываньні як адной мовы, так і іншай. Аднак у другой палове XIX стагодзьдзя ўкраінская і расейская літаратуры ў значнай ступені разыходзяцца, ператвараючыся ў дзьве розныя сыстэмы з цалкам адрознай дынамікай. Наяўнасьць двух вызначальных і непрымірэнчых дыскурсаў (імпэрскага і нацыянальна-вызвольнага ў адпаведных літаратурах) ёсьць асноўнай прычынай іхнага разыходжаньня”.* Усё гэта, безумоўна, слушна, але ні ў якай ступені не апраўдвае кардынальнага зьмяшчэньня акцэнтаў у другой палове кнігі і ператварэньня яе, як сказаў бы Грыцэнка, у яшчэ адзін варыянт гісторыі ўкраінскага нацыяналізму. Дыскурс імпэрыі — гэта ўсё-такі ў першую чаргу дыскурс імпэрскі: па-першае, таму што ён значна магутнейшы, то бок мае значную “фізычную”, колькасную перавагу; па-другое, таму што ён мае перавагу псыхалягічную, бо рэпрэзэнтуе абсалютны аўтарытэт Цэнтру — культурны і палітычны, міжнародны і ўнутраны; і, нарэшце, патрэцяе, таму што ён валодае асноўнымі мэханізмамі рэпрэзэнтацыі — цэнзураваньнем, замоўчваньнем, маргіналізацыяй, тэндэнцыйным камэнтаваньнем, фальшаваньнем і да т.п. Уласна, гэтыя мэханізмы й мусілі б стацца аб’ектам дасьледаваньня, бо дыскурс імпэрыі ў XX стагодзьдзі вызначаўся ня толькі шавіністычнаю

публіцыстыкай Шульгіна й нэўратычнаю ўкраінафобіяй Булгакава (хаця на апошняй ужо сапраўды вырасьлі пакаленьні маскоўскіх дый кіеўскіх інтэлектуалаў — аж да Ўладзімера Малінковіча і, на найвялікшы жаль, Андрэя Куркова) і нават не аднымі толькі тэзамі ЦК КПСС “Да 300-годзьдзя ўзьяднаньня Ўкраіны з Расеяй”. Мэханізмы імпэрскага дыскурсу дзейнічалі і дагэтуль дзейнічаюць на безьлічы ўзроўняў — ад вульгарных падручнікаў зь іхнымі бессаромнымі расповедамі пра “дабрадзейны ўплыў” на Шаўчэнку з боку Бялінскага ды іншых “рэвалюцыйных дэмакратаў” да вытанчаных заменаў слова “ўкраінскі” на “айчынны”, словазлучэньня “Кіеўская Русь” на проста “Русь”; ад кур’ёзнага выдаленьня “зубоў” зь верша Маякоўскага “Доўг Украіне” (“товарищ москаль, на Украину зубы не скаль”) і замены іх на больш нявінныя жарты — да вялізнай галерэі хахлоў-нягоднікаў, паліцаяў і куркулёў у расейскай літаратуры й кінэматографе ды гамзатых хахляцкіх Пятніцаў пры вялікарасейскіх Рабінзонах Круза.

Дыскурс імпэрыі цяпер — гэта ня толькі Бродзкі зь ягоным пасквілем “На незалежнасьць Украіны”; гэта таксама прыніжальнае для кожнага ўкраінца (калі ён ня Кучма) сьвяткаваньне дня савецкай арміі, крывадушна перайменаванага ў “Дзень абаронцаў айчыны”; гэта тэлевізійны шал якога-небудзь Лявонцьева, які адкрытым тэкстам расказвае маларосам, што “сраць” ён на іх хацеў (даслоўна); гэта й шалёны сьцёб якога-небудзь “хахла” (як ён сам сябе называе) Зямлянага ў “Независимой газете” з нагоды аповесьці Аксаны Забужкі; гэта й клінічная пісаніна іншага хама (і таксама “хахла”) Бузіны пра Шаўчэнку; гэта, зрэшты, узорны паводле сваёй паранаідальнасьці тэкст доктаркі філялёгіі Лады Федароўскай у “Литературной газете” з нагоды Ірванцовай “Оды грыўні”: шаноўная філялягіня цытуе пародыю ўкраінскага аўтара як сур’ёзную патрыятычную (!) оду — насуперак літаратурнаму густу і цьвярозаму розуму, затое ў поўнай згодзе з стэрэатыпным імпэрскім уяўленьнем пра адурэлых ад нацыяналізму (“национально озабоченных”) хахлоў-самасьційнікаў.
Апошні прыклад, між іншым, ёсьць добрай ілюстрацыяй яшчэ й да таго, наколькі праблематычным застаецца ўва Ўкраіне чаканы трыюмф посткаляніяльнага дыскурсу, прадказаны

Міраславам Шкандрыем і Маркам Паўлышыным. Рэакцыя Федароўскай на Ірванца прынцыпова не адрозніваецца ад падобнай рэакцыі на ягоныя тэксты з процілеглага лягеру, антыімпэрскага, — досыць прыгадаць хаця б шчырае абурэньне ўкраінафілаў з нагоды іншай Ірванцовай пародыі “Любіце Аклахому”. Бясспрэчна, аналіз усіх гэтых дыскусіяў, падзеяў, кур’ёзаў запатрабаваў бы асобнага дасьледаваньня і асобнае кнігі — магчыма, ужо не пра імпэрскі дыскурс, а пра дыскурс “крэольскі” як ягоную аўтаномную і з часам усё выразьнейшую іпастась.

Пераклаў з украінскай Сяргей Сматрычэнка паводле аўтарскага арыгіналу

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/02/18
[image]

Андрэй Дынько

Беларускія СМІ ў 2002 годзе

2002 год стаў годам крызысу недзяржаўных СМІ. Разам з усім незалежным грамадствам пасьля паразы дэмакратычнага кандыдата на прэзыдэнцкіх выбарах яны трапілі ў дэпрэсію, што доўжыцца дагэтуль. Крызыс недзяржаўных СМІ пацягнуў за сабой закрыцьцё тузіну газэт, радыёстанцый “Рацыя” і “Балтыйскія хвалі”.

Дзяржаўныя СМІ, наадварот, у 2002 годзе нарошчвалі свой інфармацыйны ўплыў. Найбольшым посьпехам уладаў у сфэры СМІ ў 2002 годзе стала стварэньне тэлеканалу АНТ. Рэйтынгі навінаў АНТ дасягнулі высокага ўзроўню. А галоўнае, вызваленае ад падаткаў АНТ мела вялікі камэрцыйны посьпех. Гэта прыцягвае ў праект, апрача дзяржаўных, вялікія прыватныя інвэстыцыі. Наступным крокам у разьвіцьці гэтага праекту будзе вытворчасьць уласных забаўляльных праграмаў, магчыма на базе тэлекампаніі “ФІТ”.

БТ, СТВ і Першы канал дзяржаўнага радыё таксама істотна мадэрнізавалі свой фармат вяшчаньня.

Рэжым надаваў першачарговую ўвагу разьвіцьцю тэлебачаньня і радыё. Разьвіцьцё прэсы не было для яго прыярытэтным.

Праекты мадэрнізацыі Беларускага Дому друку або пабудовы новае буйное друкарні засталіся на паперы. Іх кошт — 15—20 млн. даляраў — аказаўся для ўраду непад'ёмным. У выніку сукупны тыраж усіх газэт Беларусі зьнізіўся недзе на 10%. Зьніжэньне абаротаў, магчыма, было яшчэ больш значным, калі ўлічыць адток рэклямы ў нацыянальныя электронныя СМІ.
У цэлым гэтае зьніжэньне аднолькава датычыла цэнтральных і рэгіянальных СМІ, дзяржаўнае і недзяржаўнае прэсы.

Тэлебачаньне руйнуе прэсу
Асабліва шмат страцілі газэты ад зьніжэньня падпіскі. Адпаведна, у найбольшым пройгрышы аказаліся тыя выданьні, сярод чытачоў якіх пераважаюць людзі старэйшага веку і жыхары рэгіёнаў. Гэта "Народная газета", "Рэспубліка", "Белорусская нива", "Звязда", "Народная воля". Але нават пры гэтых неспрыяльных тэндэнцыях утрымала свае пазыцыі "Советская Белоруссия", што атрымала новую назву "Беларусь сегодня". І павялічыла аб'ём.
Утрымалася на плаву дзяржаўная спэцыялізаваная прэса — "Медицинский вестник", "Настаўніцкая газета" etc. (Дарэчы, апошняя — адзінае пэрыядычнае выданьне, якое за мінулы год істотна павялічыла наклад.) Мэханізм выжываньня гэтых выданьняў просты. Дзяржаўныя ведамствы (міністэрствы адукацыі, унутраных справаў, аховы здароўя, чыгунка) выдзяляюць мэтавыя субсыдыі для работнікаў сваіх сфэраў на падпіску на ведамасныя выданьні, абавязваючы іх здаць падпісныя абанэмэнты. Або проста абавязваюць падпісвацца. Тым самым дабіваюцца ня толькі прафэсійнае субардынацыі, але і ідэалягічнага ўплыву. Незалежная прэса ня мае такіх рычагоў для заваёвы чытацкай аўдыторыі.
Верагодна, тэлебачаньне застанецца галоўным клопатам ураду і сёлета.
У Гомельскай вобласьці з 1 лютага рэгіянальны тэлеканал пераходзіць на цэладзённае вяшчаньне і перакрывае, у залежнасьці ад гораду, або РТР, або "Культуру".
Трэба меркаваць, гэта пілётны праект. Калі сацыялягічныя дасьледаваньні не пакажуць росту грамадзкае незадаволенасьці, гомельскі досьвед можа быць распаўсюджаны на ўсю краіну. У канчатковым выніку, відаць, улады мяркуюць да наступных прэзыдэнцкіх выбараў

перакрыць максымум расейскага вяшчаньня, асабліва інфармацыйнага.

На шляху да алігархіі

Далекасяжнай стратэгіяй лукашэнкаўцаў на ўнутраным інфармацыйным рынку, як можна меркаваць, ёсьць стварэньне холдынгаў. Гэтыя холдынгі аб'яднаюць тэлеканалы, газэты, радыёстанцыі і часопісы. Яны маюць стварацца пад крылом рэжыму, але пры ўдзеле прыватнага капіталу. Цяперашняя сыстэма дзяржаўных СМІ не да канца задавальняе лукашэнкаўцаў ці, прынамсі, іх капіталістычнае крыло сваёй нізкай эфэктыўнасьцю. Задуманыя "холдынгі", верагодна, маюць будавацца на ўзор украінскіх мэдыя-групаў, толькі пры большым удзеле дзяржавы (магчыма, не надоўга). Задача такой рэструктурызацыі — дабіцца таго, каб цяперашнія дзяржаўныя СМІ выконвалі свае ідэалягічныя функцыі пры адначасовым забесьпячэньні большае самаакупнасьці і лепшага рэагаваньня на зьмены каньюнктуры. Аднак мяркуючы па тым, што ніводзін холдынг, калі не лічыць апэрэткавага літаратурна-мастацкага, пакуль так і ня быў створаны, "ёсьць цяжкасьці". Гэта адсутнасьць у лукашыстаў належнае колькасьці падрыхтаваных мэнэджэраў, вольных грошай ці інвэстараў, бюракратычная цяганіна, слабасьць тэлеканалаў, якія мусяць стаць стрыжнямі холдынгаў, урэшце, адсутнасьць матывацыі ва ўмовах фактычна татальнага панаваньня дзяржаўнае прэсы пры выключнай слабасьці прэсы апазыцыйнай.

Холдынгі, у сваёй задуме, мусяць таксама мець дастатковую фінансавую і інфармацыйную вагу, каб канкураваць з расейскімі СМІ. Увогуле, выцясьненьне расейскіх СМІ стала ў 2002 годзе адной з цэнтральных задачаў дзяржапарату, нягледзячы на нэрвовую рэакцыю Масквы. Тыпалягічна сытуацыя ў сфэры СМІ можа зрабіцца падобнай да ўкраінскай. Напрыклад, у інтэрвію газэце "Звязда" намесьнік міністра інфармацыі С. Булацкі заявіў наступнае. Міністэрства мае ўвесьці норму, паводле якой расейская радыёстанцыя, каб магчы вяшчаць у Беларусі, павінна будзе мець 30—40 % беларускіх матэрыялаў. Гэта можна расцэньваць як рэакцыю лукашэнкаўцаў на ўзмацненьне канкурэнцыі на рынку FM-станцый.

Барацьба з Масквой

Вяртаючыся да тэмы выцісканьня расейскіх СМІ, хочацца адзначыць, што ўлады наўрад ці спыняцца на абмежаваньні вяшчаньня тэле- і радыёканалаў. Пэўны ціск можа чакаць і расейскую прэсу. Ёсьць зьвесткі, што пастаўлена задача абмежаваць ведамасную падпіску бібліятэк, прадпрыемстваў etc. на расейскія выданьні. Асаблівае раздражненьне ўладаў выклікае, можна меркаваць, "Комсомольская правда в Белоруссии" як адзіная газэта, якая сваім накладам канкуруе зь "Беларусью сегодня". Тыражы абедзьвюх перавышаюць 300 тысячаў асобнікаў, што нашмат больш, чым сукупны тыраж усяе незалежнае прэсы.

Расейская прэса ў краіне, магчыма, сутыкаецца і зь перанасычанасьцю рынку, і з кансэрватызмам беларускага спажыўца. Паказальным быў правал праекту "Московского комсомольца в Беларуси". Фактычна на сёньня толькі тры расейскія газэты маюць сваю аўдыторыю ў нашай краіне. Гэта "Комсомолка", "Аргументы и факты", што маюць вялікія наклады, і "Труд". Тыраж "Известий" у апошнія гады вагаўся між 4 і 6 тысячамі, нягледзячы на дэмпінгавую цану.

Затое расейскія мэдыі праявілі зацікаўленасьць да беларускага рынку інтэрнэт-выданьняў, робяць у яго першыя інвэстыцыі. Трэба сказаць, што былі ў гэтай сфэры і пэўныя здабыткі для незалежнага грамадзтва — аднаўленьне дзейнасьці сайту "Хартыі'97", стварэньне газэты naviny.by.

Перамога бруднай бялізны

Разам з стварэньнем АНТ, спыненьнем вяшчаньня расейскіх радыёстанцый і разьвіцьцём "Советской Белоруссии" двума іншымі вялікімі дасягненьнямі 2002 г. лукашэнкаўцы, напэўна, лічаць зьнішчэньне "Свободных новостей" і неаднаўленьне ліквідаванай летась "Пагоні".

Хацеў бы зьвярнуць увагу на спосаб, якім зачыняліся "Свободные новости". У выпадку "Пагоні" мы мелі справу з грубай забаронай. Тое, што газэта не аднавілася, мела дзьве прычыны: адміністрацыйная блякада і, на жаль, адсутнасьць у рэгіёне іншага мэнэджэра-матора, які б зьмяніў Міколу Маркевіча.

А вось "Свободные новости" напэўна сталі ахвярай тонкае інтрыгі спэцслужбаў. Слабым месцам быў юрыдычны статус, і

гэта было выкарыстана. Для таго каб зьнішчыць “Свободные новости”, была ўтворана газэта-trompe-l’oeil. Гэтая газэта называецца “Обозреватель”. Заснавальнік “Свободных новостей” ды “Обозревателя” цяпер можа разьлічваць і на посьпех свайго асноўнага бізнэсу, якім, як вядома, зьяўляецца ня прэса, а сподняя бялізна. Трусы etc.
Мне здаецца, падобную тактыку барацьбы зь недзяржаўнай прэсай лукашэнкаўцы будуць пашыраць. Падобныя ж хітрыя камбінацыі могуць распрацоўвацца і ў дачыненьні да некаторых рэгіянальных выданьняў, пачынаючы з “Новай газеты Смаргоні”. На карысьць лукашэнкаўцаў можа сьведчыць той факт, што рэдакцыі “Свободных новостей” пакуль не ўдалося рэанімаваць свайго выданьня.
Вяртаньне газэты “Обозреватель” з раздробных продажаў дасягала вельмі высокіх паказчыкаў. Гэта ня вельмі засмучае спонсараў праекту, і няма гарантыі, што маўр-“Обозреватель” ня зьнікне, зрабіўшы сваю справу.
За апошні год не закрылася ніводнае дзяржаўнае выданьне. Так што мэтадычнай падтрымкай самых безнадзейных брэндаў лукашэнкаўцы выгадна адрозьніваюцца ад незалежнага грамадзтва.

Холдынг праваліўся
У лукашэнкаўцаў нават літаратурныя часопісы захаваліся ўсе. Няглядзячы на тое што ў “Крыніцы” цяпер толькі 22 індывідуальныя падпісчыкі, “Маладосці” — 65, а ў “Нёману” і “Всемирной литературы” — аж 78. Гэтыя лічбы сьведчаць аб правале “холдынгавага” праекту. Літаратура і мастацтва застаюцца бастыёнам, дзе дэмакратычныя сілы могуць канкураваць з уладамі. Вось так у некалькіх словах можна характарызаваць спэцыфіку культурнага рынку, які, на жаль, у Беларусі працягвае існаваць ва ўмовах фінансаваньня па рэшткавым прынцыпе.
Ані прыватны беларускі, ані замежны капітал не ішоў у незалежную прэсу. Або калі ішоў, дык толькі каб адарваць выданьні ад незалежнага грамадзтва. Таму пакуль нельга гаварыць пра перавагу рынкавых асноваў у дзейнасьці незалежных СМІ. Палітычнае значэньне беларускіх мэдыяў паранейшаму цэніцца даражэй за эканамічную абгрунтаванасьць і культурны даробак.

[image]
[image]

№ 1 (24) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/02/18
[image]

Круглы стол

Чатыры новыя выданьні

8 лістапада ў рэдакцыі “Нашай Нівы” пры падтрымцы Беларускага ПЭН-цэнтру адбыўся “круглы стол”, нагодай для якога стаў выхад новых часопісаў — “Дамініка”, “Зямля N”, “Паміж” (№ 2) і зьяўленьне інтэрнэт-рэсурсу “Літара.net”. Абмеркаваць новыя выданьні сабраліся рэдактарка інтэрнэт-рэсурсу “Літара.net” Аліса Бізяева, рэдактар часопісу “Спадчына” Аляксей Хадыка, літаратар і выдавец Адам Глёбус, рэдактар часопісу “ARCHE” Валер Булгакаў, журналіст газэты “Навінкі” Андрусь Белавокі, рэдактар газэты “Наша Ніва” Андрэй Дынько, карэспандэнт гэтай жа газэты Зьміцер Дзядзенка і выканаўчая сакратарка Беларускага ПЭН-цэнтру Вольга Калацкая. Новыя выданьні прадстаўлялі аўтары і выдаўцы: рэдактарка “Дамінікі” Крысьціна Вітушка і мэнэджэрка выданьня Аліна Стэфановіч, рэдактаркі часопісу “Паміж” Аля Сідаровіч і Эла Кулеш, адказная рэдактарка “Зямлі N” Лія Кісялёва.

К. Вітушка: Калі будзе ваша ласка, першай прадстаўлю сваё выданьне я. Пачыналася ў нас усё з Задзіночаньня беларускіх студэнтаў. Мы заўважылі, што колькасьць маладых людзей у

арганізацыі рэзка зьмяншаецца. Яны ствараюць сем'і і пачынаюць адказваць за пэўных асобаў, а не за ўсё чалавецтва. Былыя сябры ня могуць даць ім парадаў, а старэйшыя раяць не спрачацца з усталяванай сыстэмай каштоўнасьцяў. Такім чынам, маладыя людзі, на якіх спадзяваліся як на апірышча для новых дэмакратычных каштоўнасьцяў, перастаюць быць іх носьбітамі…

А. Стэфановіч: Маладыя людзі ствараюць сем'і і губляюць падтрымку сяброў, сувязі зь людзьмі беларускай культуры. Яны чуюць толькі бацькоў-пэнсіянэраў, якія мручаць: "Навошта па-беларуску? Цяжка будзе жыць". Нам хацелася, каб часопіс стаў падтрымкай такім маладым людзям.

К. Вітушка: Нішу, на якую прэтэндуе наш часопіс, яшчэ ніхто не займаў. І мы мусім заняць яе першымі, пакуль гэтага не зрабіў хтосьці іншы. Тое, што выходзіць сёньня ў Беларусі на падобную тэматыку, — збольшага дайджэсты расейскіх выданьняў. Там няма кантактных адрасоў мясцовых спэцыялістаў, да якіх трэба зьвяртацца з сваімі праблемамі, там няма нашае спэцыфікі.

В. Булгакаў: Якога накладу вы спадзеяцеся дасягнуць?

К. Вітушка: Калі мы падлічылі, колькі трэба выпускаць асобнікаў, каб кожная сям'я чытала часопіс штомесяц, у нас выйшла 250 тысячаў. Наклад жа першага нумару — 299 асобнікаў, бо мы пакуль ня маем афіцыйнай рэгістрацыі.

А. Глёбус: Гэта пэрспэктыўны часопіс — ён закранае самую галоўную тэму. Самыя прадавальныя кніжкі — пра гадаваньне дзяцей. А наконт таго, што ў расейцаў якасная інфармацыя: я думаю, у палякаў ці швэдаў ня горшая.

А. Дынько: Нашая друкаваная прадукцыя такога кірунку пераважна арыентуецца на замежныя ўзоры. Тым часам у выданьні, прадстаўленым сёньня, ёсьць някідкія, але нацыянальныя традыцыі. Вы хочаце захаваць нейкі "клясычны" беларускі фармат?

К. Вітушка: Я чакала, што настаўнікі насьцярожана і варожа зрэагуюць на нумар, у якім дзеля ўзьняцьця настрою прапануюць займацца сэксам утраіх ці мастурбацыяй. Я чакала, што іх гэта шакуе. Але самыя натхнёныя водгукі чытачоў былі менавіта ад настаўнікаў.

В. Булгакаў: Тут прагучалі амбітныя заявы пра 250 тысяч

накладу. Але пытаньне выхаду па-беларуску не дыскутуецца. Як гэта спалучыць?
А. Стэфановіч: Мы зьбіраемся зьмяшчаць інфармацыю, карысную для людзей, якія жывуць тут. Тую, якой яны не прачытаюць ані ў маскоўскім, ані ў польскім “Касмаполітэне”. Мы будзем даваць канкрэтныя адрасы і тэлефоны цэнтраў, куды можна прыйсьці з праблемай алергіі, пра тое, якія сёньня сярэднія цэны ў цырульнях, дзе можна знайсьці разнастайныя паслугі ў Менску і буйных гарадох Беларусі і г.д. Гэтай інфармацыі нідзе больш ня знойдзеш.
В. Булгакаў: Культурніцкія выданьні, як правіла, існуюць на гранты. А выданьне кшталту вашага нідзе ў Эўропе немагчымае на ахвяраваньні, заўсёды — толькі на самаакупнасьці.
К. Вітушка: Людзі, якіх мы прасілі стаць рэклямадаўцамі, пагаджаліся вельмі ахвотна. І сёньня супрацоўніцтва зь імі замаруджваецца толькі праз адсутнасьць рэгістрацыі. На будучыню ў нас распрацаваная свая сыстэма, якім чынам кожная старонка будзе аплачвацца рэклямадаўцамі. Нам абяцаюць, што праз тры месяцы нас зарэгіструюць — тады можна будзе бачыць вынікі.
А. Хадыка: Калі існаваў выдавецкі цэнтар пры Гуманітарным ліцэі, тыражы выдадзеных ім казак Пэро, мадам дэ Сэгюр былі па 100 тысяч. І гэта ўсё акуплялася, выдаўцы былі сур’ёзнымі капіталістамі. На вашым месцы я б абавязкова даваў у кожным нумары казкі — хай нават ня ўласна беларускія.

К. Вітушка: Пакуль што ў нас будуць дзіцячыя старонкі зь беларускага фальклёру. З наступнага нумару будзе падавацца сьпіс беларускай дзіцячай літаратуры, якая ёсьць у менскіх кнігарнях: дзе, што, па якіх цэнах, якім накладам выдадзена. Будзем супрацоўнічаць з выдавецтвамі, каб мець іхныя пляны выданьня беларускай дзіцячай літаратуры.
А. Дынько: Досьвед апошніх дзесяці гадоў паказаў, што параўнальнага посьпеху дасягалі праекты, арыентаваныя на нейкія асяродкі ці пэўную аўдыторыю (“Спадчына” ў свой час, “ARCHE”). Курс на асяродкавасьць — слушная стратэгія для беларускага выданьня? Ці яна пакідае нас у стане гета?
К. Вітушка: Мы робім выданьне для беларускіх чытачоў. Ці будуць яны беларускамоўнымі? Мы ня ставім сабе такой задачы. Ледзь не палова лістоў, якія прыйшлі да нас, — па-

расейску.
Калі ў нас будзе эксклюзіўная інфармацыя, дык мы атрымаем безальтэрнатыўны прадукт. Маладыя сем'і — тыя, хто скончыў школу ці павучыўся хаця б нейкі час у часы незалежнасьці. Яны здольныя ўспрымаць беларускамоўную інфармацыю. І да таго часу, пакуль не зьявілася нечага такога кшталту расейскамоўнага, у нас будзе чытач: яму няма куды больш пайсьці.
В. Булгакаў: Вашае выданьне разьлічана на чытача, які будзе забаўляцца ад чытва, а не мацаваць сваю нацыянальную ідэнтычнасьць. Навошта такому чытачу напружваць свае "бедныя" мазгавыя зьвіліны, каб перапрацоўваць тэкст, напісаны на мове, якою ён штодня не карыстаецца? Не было за апошнія пяць гадоў ніводнага беларускамоўнага выданьня, якое б мела забаўляльны характар.
К. Вітушка: Мне не здаецца, што мы забаўляем людзей, калі прапануем ім паразважаць пра выбар паміж кар'ерай і сям'ёй. Наўрад ці можна забаўляцца, калі чытаеш пра дзіцячыя хваробы.
А. Стэфановіч: Аднак калі гэта праблема, якой ты жывеш, і на чытаньне часопісу даводзіцца забіраць час ад сям'і, наўрад ці будзеш чытаць нешта сумнае, зануднае, хай сабе і ідэальна правільнае.
І чаму мы так баімся нейкіх забаўляльных выданьняў, музыкі? Тое, што мы спрабуем аддзяліць беларускае ад забаўляльнага, — вельмі штучна, ненатуральна. Таму ў людзей і ствараецца ўражаньне, што беларускае — гэта лапці, а сэксу ўтраіх па-беларуску ня можа быць. Чаму ня можа быць? Можа!

А. Сідаровіч: У адрозьненьне ад "Дамінікі", наш часопіс — камэрны праект. Ён робіцца сёньняшнімі і былымі студэнтамі ды вольнымі слухачамі аддзяленьня філязофіі й літаратуры Беларускага Калегіюму, якое ачольвае Валянцін Акудовіч. Усе астатнія могуць зьявіцца выключна як героі інтэрвію, рэцэнзіяў.
З. Дзядзенка: "Дамініка" абвесьціла, што іхная мэта — наклад 250 000 асобнікаў. А ў вас якія мэты?
А. Сідаровіч: Мэта "Паміж" — пашырэньне інтэлектуальнай і літаратурнай прасторы і кола ейных герояў, новых аўтараў.
А. Глёбус: Гэта, выходзіць, часопіс-справаздача: усё найлепшае, што зроблена, напісана за год. Маўляў, мы зрабілі

ўсё, што змаглі, а ўжо будзеце вы нас чытаць ці не — гэта неістотна… Ці ёсьць у вас зваротная сувязь?
А. Сідаровіч: Зваротную сувязь мы ствараем самі. Калі “Паміж” мае наклад 200 асобнікаў і на першай старонцы паведамляе, што яго выдае аддзяленьне філязофіі й літаратуры, — для часопісу ўжо справа гонару рупіцца аб сваіх чытачах.
А. Дынько: Я б хацеў, каб на наступнае пытаньне адказаў прадстаўнік кожнага з выданьняў. Якім правапісам вы выходзіце і чаму? І як зьбіраецеся рабіць надалей?
А. Бізяева: Літара.net выходзіць тым правапісам, якім пішуць аўтары. Рэдакцыйны правапіс — тарашкевіца.
А. Хадыка: Я толькі прыйшоў у часопіс. Вячоркаўская традыцыя — тарашкевіца, хоць я ня ўпэўнены, што гэта правільна. Наступныя нумары, ужо сфармаваныя, — пераважна наркамаўкай, бо так зьбіраў Захар Шыбека. Але гэта не ідэалягічны падыход.
А. Белавокі: Мы выходзім клясычным правапісам з элемэнтамі наркамаўкі, жарганізмаў…
В. Булгакаў: У “ARCHE” рэдакцыйны правапіс — тарашкевіца. А агулам такі прынцып: хто як прынёс, такой правапіснай традыцыяй і друкуем (калі гэта добрая беларуская мова). Непісьменная беларуская мова выпраўляецца на тарашкевіцу. Некаторыя тэксты спачатку друкавалі па-расейску, бо так прыносілі аўтары. Потым мы ад гэтага адвярнуліся, бо гэта не давала ніякага практычнага выніку.
З. Дзядзенка: Чым выкліканае карыстаньне двума правапісамі?
В. Булгакаў: Практычнымі патрэбамі. Мы вельмі дынамічная фірма, нам трэба рабіць нумары хутка. Значна прасьцей зрабіць з наркамаўкі добрую наркамаўку, а з тарашкевіцы — добрую тарашкевіцу і выдаць усё гэта пад адной вокладкай. Калі ў нас будуць лепшыя магчымасьці, мы зладзім дыскусію што да будучыні правапісу нашага часопісу.

Л. Кісялёва: Аўтарскія матэрыялы ў “Зямлі N” ідуць тым правапісам, якім напісаў аўтар. А рэдакцыйныя матэрыялы — тарашкевіцай.
К. Вітушка: У нас падчас стварэньня канцэпцыі часопісу была асобная дыскусія, якім правапісам выходзіць. Мы спыніліся на

наркамаўцы — празь дзіцячую старонку, бо, на жаль, ня ведаем аніводнай школкі, дзе б дзяцей вучылі тарашкевіцы. У нас працягваецца дыскусія наконт таго, як пісаць назовы гарадоў. Рука не падымаецца пісаць “Мінск” пасьля таго, як мы ў ЗБС выйгралі суд за форму “Менск”. Менск для нас застаецца Менскам, але “Горадня” ці “Гародня” — гэта пытаньне. Пакуль што, праўда, не было ніводнага тэксту з гэтай назвай. Ня ведаю, што будзем рабіць…

З. Дзядзенка: А калі будзе магчымы пераход з наркамаўкі на тарашкевіцу?

А. Стэфановіч (сьмяецца): Калі падрастуць дзеці і будуць здольныя ўсьведамляць.

К. Вітушка: Калі пяройдзе хаця б адна школа, тады пяройдзем і мы. На жаль, такой пэрспэктывы пакуль не відаць.

А. Стэфановіч: Слова “сэкс” мы не напісалі празь “е”, як гэта мусіць быць у наркамаўцы. Мабыць, гэта ў нас адзінае слова, якое пішацца як у тарашкевіцы. Лексыка — так, як размаўляем, як сёньня гавораць па-беларуску.

А. Сідаровіч: Часопіс “Паміж” можа дазволіць сабе выдавацца клясычным правапісам.

В. Булгакаў: “Паміж” вельмі моцна прывязаны да Беларускага Калегіюму. Але рэдактарам яго выступае ня сталая асоба — В. Акудовіч, а студэнткі і студэнты. Ці не адбудзецца абрыў традыцыі з наборам іншых студэнтаў? Ці тая група, якая сёньня робіць часопіс, будзе яго рабіць і надалей?

Э. Кулеш: Для нас галоўнае — жаданьне ствараць часопіс, а ня сам часопіс. Першы нумар у нас рэдагаваў зусім іншы чалавек, другі нумар рабілі мы з Аляй. І мы ня ведаем, хто будзе рабіць трэці нумар. Тэксты зьбіраюцца ў нас, таму, напэўна, рабіць будзем мы. Але на потым мы не прагназуем. Вось такая псыхалягічная формула “жыць тут і цяпер”. Галоўнае, каб была ў тэкстах энэргетыка, каб было цікава. А калі прыйдуць студэнты, якія скажуць, што ім гэта не патрэбна і не цікава, дык і часопісу ня будзе.

А. Сідаровіч: Якая менавіта традыцыя? Вашае пытаньне, пераказаўшы, варта было б пераадрасаваць калі-небудзь дасьледнікам інтэлектуальнай гісторыі й літаратуры Беларусі. Хай яны вызначаць, чым быў “Паміж”. Мы ж зь нецярплівасьцю чакаем прыйсьця ў часопіс новых аўтараў, бо чым шырэйшае кола аўтараў, тым цікавейшы атрымліваецца ў выніку часопіс.

В. Калацкая: Мяне вельмі трывожыць, што “Паміж” робіць фактычна трэці курс Калегіюму, а першы і другі курсы Калегіюму — “у пралёце”. Ці зьбіраецеся вы далучыць іншых?
А. Сідаровіч: Супрацу ўсіх трох курсаў можна будзе ацаніць у наступным нумары...
А. Глёбус: Трэба зладзіць такую канструкцыю часопісу, каб адну частку выданьня рабілі студэнты першага курсу, іншую — другога…
В. Булгакаў: На мой пагляд, вялікая палёгка і самапатураньне з боку выдаўцоў і стваральнікаў часопісу “Паміж” палягаюць у тым, што выданьне ператвараецца ня ў орган гэтай навучальнай установы, а ў пляцоўку для друкаваньня ўласных вершаў, тэкстаў. А за гэтым усім не відно, што такое Беларускі Калегіюм і як там выкладаюцца філязофія і літаратура. Чаму б вам не друкаваць навуковых дасьледаваньняў? Беларускі Калегіюм — установа, прызначаная навучаць пісаць тэксты. Працягваецца традыцыя беларускага інтэлектуалізму, паводле якой інтэлектуалізм разумеецца як разважаньні, вершы і г.д. А фармальнага прадукту, фармальнай абалонкі няма.
А. Сідаровіч: Натуральна, бо мы абралі сабе долю часопіса, а не зборніка навуковых працаў...
А. Дынько: А чаму вы выбралі героем другога нумару Міхала Анемпадыстава?
А. Сідаровіч: Спадар Міхал падарыў Беларусі “Народны альбом”, які істотна зьмяніў успрыманьне нашай сучаснай і мінулай беларускай культуры. Папросту кажучы, Анемпадыстаў разьняволіў, навучыў нас сьмяяцца, неўпрыкмет пашырыў межы сьмешнага да падзеяў яшчэ нядаўняй міжваеннай гісторыі. У гэтай рамантычнай традыцыі ён нашчадак Уладзімера Караткевіча. Вы ніколі ня думалі, што ўсе героі ягонага “Альбому” — гэта самыя сапраўдныя “швейкі”, чароўныя эльфы, якія дакладна ведаюць сакрэт выжываньня нашай нацыянальнай культуры?.. Але пасьля шумнага посьпеху “Народнага Альбому” ў 1997 годзе на яго як на аўтара нібыта забыліся, што надта мяне засмучала, пакуль я не наважылася на гутарку сама.
А. Дынько: У часопісе “Паміж” мне падаецца вельмі каштоўным эстэтычны пошук — гэта адрозьнівае яго ад большасьці іншых цяперашніх нашых літаратурных часопісаў.

Бо 90 % беларускіх літаратурных выданьняў — як дзяржаўных, так і недзяржаўных — адмовіліся ад усялякіх эстэтычных пошукаў.
Аля сёньня згадвала пра гісторыю літаратуры. Значыць, часопіс “Паміж” бачыць сваю гістарычную ролю. Пераемнікам каго з папярэдніх пакаленьняў вы сябе бачыце? З кім вы адчуваеце блізкасьць?

А. Сідаровіч: Я ня думаю, што мы цяпер пераймаем кагосьці — нават Акудовіча. Наш часопіс почасту прыраўноўвалі да “Фрагмэнтаў” Бабкова. Але пра што павінен сьведчыць той факт, што ладная частка рэдакцыі часопісу “Паміж” чытала тыя “Фрагмэнты” і “ЗНО”, бавілася за “Калосьсем” і “ARCHE”? Праблема спадкаваньня традыцыі для нас менш цікавая і хвалявальная за пытаньне яе вывучэньня, у чым усе, між іншага, роўныя. Творчасьць дазваляе адшукаць згубленую традыцыю й праз тоўшчу часу, але перайманьне яе для нас не зьяўляецца самамэтаю.
Л. Кісялёва: Нашае выданьне “Зямля N” прызначаецца для “разбэшчанага” чытача — які ведае, што ёсьць 15—20 высокаарганізаваных асобаў, якія нешта пішуць, ствараюць. Наш чытач ужо азнаёміўся з шэдэўрамі сусьветнай літаратуры і думкі ў перакладзе на матчыну мову. І ён пачынае круціць носам: “Калі вы такія разумныя, чаму ў вас выданьні на газэтнай паперы? Чаму ў вас такая кепская склейка?” Так зьявілася ідэя зрабіць інтэлектуальны часопіс на высокім паліграфічным і дызайнэрскім узроўні. Хтосьці павінен наталяць прагу спажыўца здаровай рэгулярнай ежай, інтэлектуальнай “шкваркай і чаркай”. Але раз у год (у ідэале — два разы ў год) можа выходзіць і такі часопіс, як “Зямля N”, — кшталту далікатэсу.
З. Дзядзенка: Вашае выданьне яшчэ больш элітарнае, чым “Паміж”?
Л. Кісялёва: Наадварот, мы лічым яго дастаткова дэмакратычным — інтэлектуальным, але без снабізму. І паколькі яно прыгожае, яно можа прыцягнуць увагу часткі аўдыторыі, якая звычайна не чытае беларускіх выданьняў, бо тыя ня надта прывабна выглядаюць.
А. Дынько: Чаму тэмай нумару была абраная эміграцыя?
Л.Кісялёва: У нашым часопісе ёсьць такія словы: “Эміграцыя

— гэта сьмерць". Калі эміграцыя — гэта сьмерць, дык і сьмерць — гэта эміграцыя. Так выходзіць, што тэма ў пэўным сэнсе закранае ўсіх.
Наступны нумар будзе прысьвечаны габрэям. Нас часам пытаюць: "Калі ж вы нарэшце напішаце пра беларусаў?" Ствараецца ўражаньне, што беларус — гэта нейкі дзіўны, "нечалавечы" чалавек, з пшанічнымі вусамі, за якімі ён ужо нічога ня бачыць. Ты альбо чалавек, альбо не чалавек. А калі ты чалавек — ты і беларус, і габрэй, і эмігрант... А калі ты не чалавек, тады табе ня трэба чытаць часопіс "Зямля N".
З. Дзядзенка: Ці можа выйсьці нумар вашага часопісу, прысьвечаны "герою нашага часу"? Вось аўтары выданьня "Паміж" выбралі сабе М. Анемпадыстава…

Л. Кісялёва: Мы распрацоўвалі такі праект — прысьвяціць цэлы нумар нашаму куміру Сяргею Верацілу.
А. Глёбус: "Зямля N" — культурны часопіс. Не літаратурны! Гэты часопіс — твор мастацтва, самакаштоўная рэч.
Л. Кісялёва: Так, у нас не літаратурны часопіс. Калі мы вызначалі рэдакцыйную пазыцыю, мы вырашылі, што прыгожага пісьменства ня пусьцім на старонкі нашага выданьня.
А. Дынько: Вы ня бачыце для прыгожага пісьменства пэрспэктываў?
Л. Кісялёва: Мы мяркуем, што ў літаратараў ёсьць пэўная колькасьць выданьняў, і яны могуць друкавацца там. У нас могуць друкавацца ўсе астатнія. Праўда, кожны раз, калі бачыш нешта вартаснае, прыходзіцца рабіць выключэньне. Але гэтыя людзі выступаюць у нас ня ў якасьці літаратараў.
В. Булгакаў: Ці мае шанцы на разьвіцьцё часопіс, які выдаецца ў такім паліграфічным афармленьні і на выданьне аднаго нумару якога патрэбныя вялікія грошы?
Л. Кісялёва: Не такія ўжо і вялікія грошы… Мы хочам павялічыць наклад, для пачатку хаця б да 1000 асобнікаў. Хацелі б (ізноў жа — для пачатку) выходзіць два разы ў год.
З. Дзядзенка: Тут прадстаўлены інтэрнэт-праект "Літара.net". Праект, які доўжыцца ўжо колькі месяцаў, у якім удзельнічаюць сотні чалавек, і няясна, калі ён скончыцца. Чым адрозьніваецца "Літара" ад астатніх выданьняў?
А. Бізяева: Усім. Самае цікавае, што "Літара" існуе ўжо сама

сабою — дзякуючы тым людзям, якія да яе далучыліся. Я ўжо не магу кіраваць тымі падзеямі, якія на ёй здараюцца. Справамі на “Літары” кіруюць тыя, у каго больш цікавасьці да гэтага праекту, у каго больш часу і хто можа падтрымліваць гутарку на пэўным узроўні. Таму атрымліваецца, што гаспадары праекту — усе ягоныя ўдзельнікі.
А. Дынько: Ці праўда, што для таго, каб стварыць Ваш праект, не спатрэбілася ні капейкі?
А. Бізяева: Трэба плаціць за імя (litara.net) — 12 даляраў у год. Гостынг каштуе 5 даляраў у месяц. Некаторыя рэчы нешта каштуюць, але нам даліся бясплатна. Так, праграмаваньне і распрацоўку сайту нам зрабілі бясплатна.
А. Дынько: Дык “Літара.net”, якая выдае штотыдзень колькі соцень радкоў беларускай літаратуры, каштуе нам усяго 72 даляры ў год?
А. Бізяева: А калі людзі захочуць атрымліваць ганарары? Я ж не змагу плаціць ім грошы.
А. Дынько: У якіх з новых выданьняў аўтары атрымліваюць ганарары?

Л. Кісялёва: У нас атрымліваюць.
А. Бізяева: Папяроваму выданьню лягчэй зарабіць грошы. Сёньня зарабіць грошы сайтам амаль немагчыма. Гэта стан ня толькі беларускага Інтэрнэту — тое самае робіцца ва ўсім сьвеце. Таму такі праект, як наш, быў бы некамэрцыйным у любой краіне.
З. Дзядзенка: А колькі цяпер ходзіць наведнікаў на “Літару” штодня?
А. Бізяева: Каля васьмідзесяці чалавек. Але ў нас ёсьць шэсьцьдзесят сталых наведнікаў — яны некалькі разоў на тыдзень прыходзяць на “Літару”. Гэта пры тым, што мы не рабілі шырокай рэклямнай кампаніі, дый ня думаем рабіць. У нас рэсурс для вельмі вузкага кола людзей — для тых, хто ўмее пісаць. Нават не для чытачоў.
“Літара” — адкрыты праект. Тут ня трэба праходзіць праз рэдактуру і нават карэктуру. Тут няма абмежаваньня прасторы, якое ёсьць у часопісах. У часопісах мы бачым канчатковы варыянт, прадукт, а тут — сам працэс зьяўленьня твору, працэс думаньня аўтара. Такога яшчэ не было.
А. Дынько: Якой ідэалёгіі трымаюцца новыя выданьні,

прысутныя сёньня на сустрэчы?
К. Вітушка: У нас ёсьць два шляхі ў вызначэньні ідэалёгіі. Па-першае, мы думаем, што права на жыцьцё мае тая ідэалёгія, якая не замінае жыцьцю працягвацца. Калі ж абазначаць неяк канкрэтна, дык, відаць, “эгаізм” і “натуралізм”. Усё натуральнае — каштоўнае. А “эгаізм” азначае, што мы ствараем прастору, у якой будзе ўтульна жыць нам, нашым дзецям. Утульнай яна будзе, калі ўсе ейныя складнікі таксама будуць адчуваць сябе камфортна. Фэмінізм ня ёсьць нашай каштоўнасьцю і нашай ідэалёгіяй, хаця мы паважаем тых, хто змагаецца за нармальнае стаўленьне да жанчыны. Але мы ня лічым неабходнасьцю казаць, што жанчына — чалавек, і саркастычна глядзім на тых, хто ў гэтым сумняецца і ўсё жыцьцё даказвае.
Э. Кулеш: Для нашага часопісу ідэалёгія — нацыяналізм. Бо галоўнае для нас — прамаўленьне беларускай прасторы, выяўленьне і стварэньне беларускіх герояў. Прастора яшчэ не прамоўленая: ёсьць вельмі шмат цікавых людзей, цікавых самабытных твораў, міма якіх мы праходзім.
А. Белавокі: “Навінкі” — гэта газэта, для якой няма нічога сьвятога.
А. Хадыка: Што да філязофіі часопісу “Спадчына”, дык мы мяркуем, што надалей гэта будзе філязофія агульнаэўрапейскага пагадненьня, выхаду Беларусі ў агульны эўрапейскі дом. Мы хочам зрабіць з часопісу праект, у межах якога зьвяртаньне да мінулага вылечвала б тыя праблемы, якія ня мусяць быць дзялянкай літаратуры.

У нас бадай кожны малады аўтар імкнецца пачаць даказваць, што мы паўнавартасная нацыя. Мы ж будзем імкнуцца сьцьвярджаць гэтую паўнавартаснасьць на прыкладах нашай спадчыны. Таму найбліжэйшыя нумары будуць прысьвечаныя эўрапейскасьці, закладзенай у нашай культуры.
Другая задача, якая стаіць перад “Спадчынай”, — выйсьці на якасна іншы ўзровень. На пачатку 90-х, калі мы мелі наклад 10 000 асобнікаў, мы выдавалі часопіс на якаснай паперы зь якаснай паліграфіяй. Але тады была дзяржаўная падтрымка…
А. Дынько: А хто з новых часопісаў разьлічваў у будучыні на дзяржаўныя датацыі і спрабаваў ужо зьвярнуцца па іх?
В. Булгакаў: У часопісу “ARCHE” сёлета быў драматычны

досьвед звароту ў Міністэрства інфармацыі з просьбай выдзеліць фінансы на нумар, прысьвечаны беларускім дзеткам. Мы досыць апэратыўна атрымалі адказ, дзе было напісана, што дзяржава ня мае цяпер сродкаў, каб падтрымаць выданьне такога нумару. Але сам зварот выклікаў увагу. Я думаю, зьвяртацца трэба. У такой падтрымцы мы ня бачым нічога заганнага.

А. Стэфановіч: Мы ўжо неаднаразова казалі, што хочам стаць самаакупнымі. Калі прадукт патрэбны, то ён будзе купляцца. Досыць ужо прасіць…

К. Вітушка: Калі казаць пра *гэтую* дзяржаву… Калі яна прапануе нам сама, мы запытаемся ў нашых чытачоў і будзем абмяркоўваць. Але спэцыяльна прасіць у *гэтай* дзяржавы мы ня будзем.

В. Булгакаў: А іншая дзяржава — гэта якая? Беларусь пасьля Лукашэнкі?

К. Вітушка: Так, дзяржава, у якой мы хацелі б жыць.

А. Глёбус: Па-першае, ня трэба пэрсаніфікаваць дзяржаву. Па-другое, дзяржава мусіць падтрымліваць гуманітарныя праекты — гэта ейны абавязак. Літаратурныя часопісы заўсёды зьвярталіся не да адной, а да дзясятка дзяржаваў. Калі выдаецца, напрыклад, нумар, прысьвечаны французскай літаратуры, то спрычыняецца да гэтага французская дзяржава. Калі часопіс прапагандуе японскую, кітайскую, якую іншую літаратуру, то чаму тая дзяржава ня можа прапагандаваць сябе? Да дзяржавы трэба падыходзіць як да рэклямадаўцы.

К. Вітушка: Мы свой часопіс зьбіраемся ўсё ж прадаваць. Але я спадзяюся, што наступная ўлада будзе праводзіць палітыку падтрымкі розных слаёў насельніцтва. І калі яна будзе зацікаўленая ў тым, каб маламаёмасныя сем'і або маладыя студэнцкія сем'і маглі чытаць наш часопіс, мы пойдзем на супрацоўніцтва зь ёй, каб адмыслова зьнізіць кошт для такіх групаў насельніцтва, каб падпісаць школы, бібліятэкі, нейкія ўстановы. Ад сёньняшняй дзяржавы мы чакаем не дапамогі, а нармальных умоваў для працы: нармальнай падатковай сыстэмы, сыстэмы рэгістрацыі і ўмоваў для бізнэсу.

А. Хадыка: У такіх сытуацыях асабіста я атаясамліваю сябе зь беларускай дзяржавай. Калі я частка гэтай дзяржавы — значыць, я маю права зьвярнуцца па дапамогу ў пэўныя

інстытуцыі гэтай дзяржавы, калі ўмовы гэтай дапамогі не супярэчаць маім маральным перакананьням. “Спадчына” атрымлівае пэўную датацыю ад дзяржавы дагэтуль, хаця мы даўно разышліся зь Міністэрствам культуры, з Фондам культуры і засталіся незалежнай структурай, зарэгістраванай ад цэнтру “Супольнасьць”.
А. Дынько: У мяне яшчэ адно пытаньне да прадстаўнікоў усіх выданьняў. Хто зь беларускіх літаратараў варты Нобэлеўскай прэміі?
Э. Кулеш: Я магу згадаць хіба што Васіля Быкава.
А. Сідаровіч: Як супрацоўніцы часопісу “Паміж” мне абыякава, хто зь беларускіх пісьменьнікаў атрымае Нобэлеўскую прэмію і ці атрымае ўвогуле. Як грамадзянцы Беларусі мне было б усьцешна, каб ім стаў Алесь Разанаў. Калі ж нехта зь беларускіх пісьменьнікаў і стане ляўрэатам Нобэлеўскай прэміі, то ён ня стане героем нашага часопісу. Мы будзем выяўляць нявыяўленых герояў. Калі хтосьці стане ляўрэатам, яго выявяць і бяз нас.
А. Стэфановіч: Мы выданьне нелітаратурнае. Калі дадуць прэмію вынаходніку новых супэрэфэктыўных пампэрсаў — супэр!
В. Булгакаў: Беларуская літаратура яшчэ не стварыла такой постаці, пра якую загавораць эўрапейскія, швэдзкія інтэлектуалы. Жорж Ніва ў інтэрвію нашаму часопісу паўтарыў зьбітую ісьціну: на захадзе кантынэнту, у той самай Францыі, нават прафэсары славістыкі ведаюць двух беларускіх пісьменьнікаў — С.Алексіевіч і В.Быкава. Аднак Быкава недаацэньваюць, бо ён піша на традыцыйныя тэмы і не ў сучаснай эстэтычнай стылістыцы.
К. Вітушка: Што да літаратараў, дык мы далучаемся да агучаных кандыдатураў А.Разанава і В.Быкава — людзей, якія ўражваюць і як літаратары, і як асобы.
Занатаваў Зьміцер Дзядзенка

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/02/18**
[image]

Натальля Якавенка

Нічога ня мае быць дарожшага над вольнасьць

НАТАЛЬЛЯ ЯКАВЕНКА — украінскі гісторык, аўтарка кнігі “Нарис історії України з найдавніших часів до кінця XVIII ст” (Київ: Генеза, 1997), фрагмэнт зь якой быў перакладзены на беларускую мову. Сфэра асноўных навуковых зацікаўленьняў — княская і шляхецкая эліта ва Украіне XVI—XVII ст., гісторыя ідэяў і зьвязаных зь імі стратэгіяў паводзінаў людзей XVI—XVII ст.

Andrzej Sulima Kamiński. Historia Rzeczypospolitej wielu narodów 1505—1795. Obywatele, ich państwa, spoleczeństwo, kultura. — *Lublin: Instytut Europy Środkowo-Wschodniej, 2000.*
Henadź Sahanowicz. Historia Białorusi od czasów najdawniejszych do końca XVIII wieku. — *Lublin: Instytut Europy Środkowo-Wschodniej, 2001.*
Генадзь Сагановіч. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасьці да канца XVIII стагоддзя. — *Менск: “Энцыклапедыкa”, 2001.*
Абедзве кнігі, якія тут аглядаюцца (дзве кнігі Генадзя Сагановіча — гэта беларуская і польская версіі аднаго тэксту), — частка серыі, пачатак якой быў пакладзены ў 2000 годзе Інстытутам Цэнтральна-Ўсходняй Еўропы ў Любліне пад назвай “Dzieje krajów Europy Środkowo-Wschodniej”. Сама ж ініцыятыва скаардынаванай распрацоўкі сінтэтычных нарысаў

па гісторыі Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны (пасобна краін, чыя гісторыя ад XIV стагоддзя аж да нашых дзён публікацыя і — нярэдка драматычна пераплецена) нарадзілася яшчэ ў 1990 годзе ў Рыме, на першай сустрэчы гісторыкаў пасля падзення камуністычнага рэжыму і напярэдадні распаду Савецкага Саюзу. У 1993 годзе сфармавалася аўтарская група пяццю аўтарытэтнымі рэдактарамі — Анатолем Грыцэнкам (Менск), Ярославам Ісаевічам (Львоў), Анджэем Каідэнскім (Вашынгтон), Ежым Клачкоўскім (Люблін), Юозасам Юрашюнасам (Вільня). Беларусь, Літву і Украіну прадстаўлялі па чатыры аўтары — паводле падзелу навуковых інтарэсаў у галіне ранняга, і найноўшай гісторыі (імі, адпаведна, былі Генадзь Сагановіч і Захар Шыбека, Адамас Бутрымас і Антанас Кулакаўскас, а з Украіны гэты гонар выпаў Ярославу Грыцаку і мне). Ад Польшчы былі дэлегаваны тры гісторыкі — медыевіст Ежы Клачкоўскі, спецыяліст па раннім Новым часе Анджэй Камінскі і знаўца найноўшай гісторыі Ганна Дылянгова. Так распачыналася гэтая, дагэтуль невядомая нашым краінам, інтэлектуальная прыгода, з якой усе мы выйшлі, нібы з той Гераклітавай ракі, трохі іншымі.

Апошняя
публікацыя
мая ў гэтай
“Парадзенні
Даследаванні з
гісторыі ўяўленьняў
і ідэй
Украіны XVII–
XVIII ст.”
Київ: Критика,
2002.

У стратэгічным плане наша супрацоўніцтва не прадугледжвала ні ўзгаднення поглядаў, ні “прыціркі гісторыяў” для камфорту чытачоў, чыім продкам даводзілася сутыкацца ў барацьбе з “нашымі” продкамі. Апісанне такіх эпізодаў не стварала цяжкасцяў, бо менавіта на гэтых эпізодах, як вядома, зазвычай выбудоўваецца гістарыяграфічная традыцыя “нацыянальных гісторыяў”. Складаней было з пошукам таго, што яднала: звыклая для кожнага з нас гістарыяграфічная схема не прадугледжвала гэтага, а тым часам рассыпаныя па крыніцах дэталі сведчылі пра нейкае цяжкаўлоўнае адзінства — нават у манеры канфліктаваць ды ў змесце ўзаемных прэтэнзіяў, не кажучы ўжо пра культурныя і сямейныя “перацяканні” — непазбежны вынік шматвекавога суседства. Мабыць, менавіта ў гэтых сумненнях паступова зарадзілася жаданне развітацца з канонамі “нацыянальных гісторыяў”. Падчас рэгулярных (па два-тры разы ў год) дыскусіяў над ужо напісанымі фрагментамі рабілася ўсё больш відавочным, што, калі кіравацца звыклымі этнацэнтрычнымі схемамі, уласную мінуўшчыну не ўдасца ўбачыць больш аб’ёмна. Таму хочаш не хочаш, а трэба

выслухоўваць аргументы “гістарычнага працiўніка”. Кожны з аўтараў гэтую звышзадачу вырашаў па-свойму, засяроджваючы ўвагу на тых аспектах, якія сам лічыў формаўтваральнымі ў гісторыі свайго народу. Збліжае ж усе тэксты рашучая адмова ад патрыятычнай міфалогіі, схільнай спісваць усе нацыянальныя паражэнні і беды на каварства злога суседа, а таксама спроба як мага паслядоўней пазбавіцца праекцыі сучасных поглядаў, фобій і сантыментаў на бачанне мінулага. Як адзін з аўтараў серыі і ўдзельніца рабочых дыскусіяў, прызнаюся, што збліжэнне пазіцыяў адбывалася няхутка.
На сёння ў Любліне ўжо выйшлі з друку сем тамоў серыі: тры — польскіх аўтараў (усе ў 2000 годзе), два беларускія (Сагановічаў у 2001 годзе і Шыбекаў у 2002-м; абодва паралельна выйшлі па-беларуску ў Менску) і два ўкраінскія (абодва ў 2000 годзе; іх шырэйшыя ўкраінскамоўныя версіі апублікавала выдавецтва “Генеза” ў 1996 і 1997 годах: Яраслава Грыцака пад назвай “Нарыс гісторыі Ўкраіны: фармаванне сучаснай украінскай нацыі” і маю працу пад назваю “Нарыс гісторыі Ўкраіны з найдаўнейшых часоў да канца XVIII стагоддзя). Такім чынам, “у даўгу” застаюцца толькі літоўскія калегі, але неўзабаве свет убачаць і іхнія працы.
Ва ўступе ад рэдкалегіі, які, паўтараючыся, вандруе з кнігі ў кнігу, акрэслены найбольш агульныя, так бы мовіць, тэматычныя параметры, што яднаюць гэтыя працы: у цэнтр нашых зацікаўленняў мы стараліся змясціць грамадства, людзей, іхнія правы і досвед на ўсіх узроўнях грамадскага жыцця. Найбольш паслядоўна, на маю думку, гэты прынцып рэалізаваны ў працах, якія будуць разглядацца тут і якія можна лічыць той “ідэальнай мадэллю” (з усімі перавагамі і хібамі, на якія асуджана кожная “ідэальная”, ці наперад сканструяваная, мадэль), што бачылі перад сабой ініцыятары стварэння каардынаваных квінтэсенцый гісторыі краін-суседзяў.

Сіла і слабасць “павятовага рэспубліканізму”
Кніга Анджэя Камінскага, нягледзячы на тое што фармальна належыць да польскай часткі серыі, прысвечана не Польшчы, а супольнасці тых дзяржаваў, якімі ў XVI—XVIII стагоддзях ахоплівалася тэрыторыя польскага і суседніх — беларускага, літоўскага ды ўкраінскага — этнасаў: Кароны Польскай,

Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай. Усталяванае ў польскай гістарыяграфічнай традыцыі атаясамленне гэтых дзяржаваў з Польшчай аўтар акрэслівае сярдзітай дэфініцыяй *“гістарыяграфічны імперыялізм”* (сс. 11, 17); *“упіхванне”*, паводле ягоных калючых словаў, Чартарыйскіх і Радзівілаў, Вішнявецкіх і Хадкевічаў, Касцюшкаў і Пілсудскіх, Міцкевічаў, Сангушкаў ды іншых *“у пракрустава ложа нацыянальна-этнічнай гісторыі Польшчы” — “акт гістарыяграфічнага захопніцтва”*, бо сотні гэтых і да іх падобных людзей аднолькава належаць гісторыі як сваіх краін, так і Рэчы Паспалітай, якую яны разам стварылі (с. 14). (Дадам, што аўтар паслядоўна трымаўся абвешчанага ва ўступе *professio fidei*; гэты матыў, прынамсі ў дачыненні да Ўкраіны, праходзіць праз увесь тэкст, прычым нават у такіх дэталях, як арфаграфія імён: скажам, князь Ярэма Вішнявецкі завецца Jarema, а не Jeremi, як належала б па-польску; характэрна, што ўкладальнікі іменнага паказальніка паланізавалі-такі гэтае імя.)
Акрэсліўшы стрыжнем сваёй працы гісторыю *“грамадзянскай прасторы”* (гэта значыць формаў грамадзянскай супольнасці і яе палітычнай культуры, якія забяспечвалі адзінства “культурнага клімату” на этнічна стракатых абшарах Рэчы Паспалітай, с. 10), Анджэй Камінскі здае справу з таго, што ідэя супольных рэчпаспалітаўскіх каштоўнасцяў аб’ядноўвала перш за ўсё “паўнапраўных грамадзян”, гэта значыць шляхту. Аднак, на ягоную думку, вытворнае ад гэтай ідэі паняцце “залатой вольнасці”, што зрабілася своеасаблівай візітоўкай Рэчы Паспалітай, адгукалася і ў асяроддзі “грамадзян другой катэгорыі” — казакоў і мяшчан. За свае грамадзянскія правы змагаліся казакі, грамадзянская свядомасць пашыралася з вялікіх гарадоў, якія ўдзельнічалі ў палітычным жыцці (Кракаў, Гданьск, Вільня, Львоў і іншыя), на эліты маленькіх мястэчак. Гэта аб’ядноўвала разнастайныя сацыяльныя і этнічныя групы адзінай сістэмай каштоўнасцяў і інтэгравала іх больш, чым адзін кароль ці супольны шляхецкі сойм. З гэтага пункту гледжання аднолькава няслушныя, на думку аўтара, як распачатыя ў XIX стагоддзі польскія спробы “прыўлашчвання” спадчыны Рэчы Паспалітай, так і беларускія, літоўскія ды ўкраінскія намаганні “выкінуць” яе з мінуўшчыны сваіх народаў у ходзе стварэння ўласных — сучасных — нацыянальных ідэнтычнасцяў.

Пасля ўступу ідуць сем раздзелаў, у якіх аўтар прасочвае нараджэнне, росквіт і паступовы заняпад таго палітычнага арганізму, які ён кваліфікуе як “грамадзянскую дзяржаву” (*państwo obywatelskie*). Храналагічна межы гэтых трох фазаў падаюцца так:
раздзел I (сс. 23—58) — ад соймавай канстытуцыі Nihil novi 1505 году, з якой пачаўся ўдзел сойму ў кіраванні дзяржавай, да смерці ў 1572 годзе апошняга караля з дынастыі Ягайлавічаў, што адкрыла двухсотгадовы перыяд вольных выбараў манархаў; гэты перыяд Анджэй Камінскі вызначае як *“будаўніцтва мадэрнай грамадзянскай дзяржавы”*;
раздзел II (сс. 59—94) — ад першых выбараў да заканчэння грамадзянскай вайны 1607—1609 гадоў, або так званага рокашу Зебжыдоўскага, дзе сутыкнуліся праманархічныя і рэспубліканскія канцэпцыі палітычнага ўладкавання; гэты прамежак часу, паводле меркавання аўтара, стаў вырашальным для ўсталявання ў Рэчы Паспалітай раўнавагі паміж “галінамі ўлады” — каралём, арыстакратамі і “нацыяй-шляхтай” — праз мясцовае самакіраванне і сойм а таксама для канчатковага замацавання на тэрыторыі ўсёй Рэчы Паспалітай прынцыпаў грамадзянскай свабоды як ідэалу публічнага жыцця;
раздзел III (сс. 95—112): ад рокашу да пачатку казацкага паўстання 1648 году, калі на фоне як быццам бясхмарнага росквіту сістэмы раўнавагі ўлады і мясцовай дэмакратыі пачалі ўзнікаць яшчэ мала прыкметныя сімптомы крызісу — узмацненне пазіцый магнатаў праз канцэнтрацыю земляў і з’яўленне разгалінаваных кліентурных сетак з паслухмянай шляхты, гатовай служыць сваім панам шабляй і выбарчым голасам, што, па сутнасці, ператварала лозунгі “вольнасці і роўнасці” ў дэмагогію; паралельна тады ж пачынаюць фіксавацца адзнакі маніі велічы, то бок пачуцця вышэйшасці за астатнія краіны Еўропы, дзе грамадзянам не ўдалося ні дасягнуць “залатой вольнасці”, ні забяспечыць унутранага спакою, і гэтая дэталь дазволіла Анджэю Камінскаму метафарычна акрэсліць увесь згаданы перыяд як *“сармацкі сон пра магутнасць і мір”*;
раздзел IV (сс. 133—138): ад пачатку Хмяльніччыны да выбрання шляхтай у 1669 годзе — насуперак волі арыстакратаў — “уласнага” караля Міхала Вішнявецкага; гэтыя

драматычныя для Рэчы Паспалітай гады, напоўненыя вонкавымі і ўнутранымі войнамі ды паразамі ад казакаў, шведаў і расіян, паказалі, наколькі вялікай была бездань паміж уладай (каралём і арыстакратычнымі вярхамі) і шараговай шляхтай — апошняй удалося дасягнуць эфемернай перамогі; гэтае крывавае дзесяцігоддзе аўтар акрэслівае як час *“абароны свабоды і суверэннасці”*;
раздзел V (сс. 139—148), названы *“няўдалым выпрабаваннем нацыянальнай спеласці” (“sprawności”)*, ахоплівае падзеі да смерці другога па Вішнявецкім “шляхецкага караля” Яна Сабескага (1696); менавіта ў гэты час, згодна з аўтарам, з поўнай яснасцю акрэсліўся згубны для наступнага стагоддзя *“параліч улады”* (с. 145) — гэта праявілася ў аслабленні пазіцый караля і сойму з адначасовым узмацненнем алігархічных вярхоў; поруч з гэтым выросла свайго роду грамадская стомленасць і нявер’е ў магчымасць рэформы дзяржаўнага ладу: паводле выказвання Анджэя Камінскага, на месца гуманістычнага аптымізму папярэдніх пакаленняў прыйшлі *“маральны стаіцызм, скептыцызм або нават цынізм”* (с. 146);
раздзел VI (сс. 149—198) ахоплівае час ад 1697 да 1763 году; аўтар не дае яму “гучнай” назвы — раздзел мае нейтральны загаловак *“Польска-саксонская унія”*, і прысвечаны ён пераважна ходу палітычных падзей, у тым ліку зараджэнню разнавектарных арыентацыяў магнацкіх вярхоў на суседнія кіраўнічыя двары, што ўзмацняла ўнутраны разлад у без таго аслабленай дзяржаве; нарэшце, якраз у гэты час, паводле аўтара, бяссілле шляхты перад магнацкай усяўладнасцю стала відавочным, таму, ак адзначаецца ў кнізе, *“прынцыпы грамадзянскай супольнасці функцыянавалі хутчэй у выхаванні, традыцыях і марах, чым у практыцы грамадскага жыцця”*, хоць даўнейшы рэспубліканізм яшчэ намагаўся трымацца за сваю “апошнюю цытадэль” — соймавае самакіраванне (с. 186);

раздзел VII (сс. 199—238) — гэта 1764—1795 гады, ці апошні акт гістарычнай драмы Рэчы Паспалітай, які носіць слушную назву *“У арбіце Расіі”*; у гэтым раздзеле Анджэй Камінскі апавядае пра сутыкненні прарасійскіх і антырасійскіх арыентацыяў у чатырох канфедэрацыях канца 1760-х (у тым ліку ў найбольш жорсткай — Барскай, якая ўскосна прывяла да

Каліеўшчыны, а таксама паскорыла першае адарванне часткі Рэчы Паспалітай на карысць Аўстрыі, Прусіі і Расіі), ліхаманкавыя спробы рэфарматараў выратаваць сітуацыю, сляпое супраціўленне ўнутрыпалітычным зменам пад наіўнымі лозунгамі “абароны рэспубліканскіх вольнасцяў” (і гэта з дапамогай Кацярыны II!), а ў выніку — другі раздзел земляў, пасля якога пачалася адчайная барацьба з расійскай і прускай арміямі, што вылілася ў паўстанне на чале з Тадэвушам Касцюшкам, і нарэшце — апошні падзел паміж дзяржавамі-суседзямі таго, што засталося; легальнасць гэтага беспрэцэдэнтнага акту была санкцыянавана 25 кастрычніка 1795 году “добраахвотным” адрачэннем ад улады апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага, як падкрэслівае аўтар — падарункам на імяніны царыцы Кацярыны II.

Так прыпыніла сваё існаванне “грамадзянская дзяржава”, а яе жыхары ператварыліся ў падданых імперый асвечанага абсалютызму, дзе, як зазначае аўтар, *“не было месца дыскусіям не толькі ў дзяржаўных, але і ў чыста мясцовых, лакальных, земскіх справах”* і дзе *“ўсюды сягала ўлада дзяржаўнага кіраўніцтва і ўрадоўца, за якім стаяў цэнтральны ўрад і вайсковая сіла”* (с. 215).

Як відаць з гэтага сціслага рэферавання, Анджэю Камінскаму ўдалося на працягу ўсёй кнігі, нягледзячы на асобныя экскурсы ў палітычную гісторыю і партрэты-характарыстыкі каралёў ці найбольш прыметных дзеячоў эпохі, не выпусціць з поля зроку заяўленага ва ўступе галоўнага героя — “грамадзянскую прастору”. Дзіўна, але, не зважаючы на сваю бесцялесную абстрактнасць, гэты “герой” паўстае са старонак манаграфіі як стварэнне пластычнае і амаль што жывое (каторы раз пераконваюся: імпэт гісторыка ператварае мінуўшчыну ў мяккі пластылін, з якога можна ляпіць што хочаш). Магчыма, гэтаму спрыяе антрапаморфная дынаміка “жыцця героя”: нараджэнне — узмужненне — самаўпэўненая веліч — першыя сімптомы слабасці — канвульсіі згасання — смерць. Магчыма, вобраз набывае такую пластычнасць яшчэ і таму, што ўвесь час балансуе ў аўтаравым аповедзе — літаральна як чалавек — паміж уласнымі вартасцямі і слабасцямі: першымі гучна выхваляецца, а другія прыкрывае наіўнай дэмагогіяй. Але паспрабуем прасачыць гэтыя метамарфозы больш дэталёва.

“Нараджэнне героя” аўтар упісвае ў шырэйшы кантэкст. У XVI стагоддзі распачалася мадэрнізацыя еўрапейскіх дзяржаваў, якія ўваходзілі ў эпоху абсалютызму праз абмежаванне сярэдневяковай анархіі коштам узмацнення ўлады манарха і ягонага бюракратычнага апарату. І разам з тым дзяржаўная ўлада пранікала ў сферы мясцовага і прыватнага жыцця — закрытыя для яе раней. У канцы XVI стагоддзя “грамадзянскія дзяржавы”, дзе грамадству ўдалося захаваць пэўны ўплыў на рычагі кіравання, засталіся ў меншасці. Сярод іх была і Рэч Паспалітая. Падставы для гэтага стварыў так званы экзекуцыйны рух шляхты Кароны Польскай, што дзейнічаў цягам XVI стагоддзя і ў выніку здабыў пераканаўчую перамогу над праманархічнымі сіламі, зацвердзіўшы прынцыпы падкантрольнасці караля “нацыі-шляхце”, а таксама развітага мясцовага самакіравання, або, як называе гэты феномен Анджэй Камінскі, *“павятовага рэспубліканізму”*. Не апошнюю ролю ў гэтым, на думку аўтара, адыграла Рэфармацыя. Для польскіх інтэлектуалаў, якія фармулявалі новыя прынцыпы веры, эпоха Рэфармацыі сталася часам *“шукання шляхоў, якія б ядналі рэлігійны запал з палітычнай актыўнасцю і зменамі ў грамадскім жыцці”* (с. 41). З іншага боку, патрэба супольнага фронту супраць караля і ўсяўладных магнатаў навучыла павятовую шляхту “мясцовай салідарнасці” на практычным узроўні — праз аб’яднанне ў сваіх праграмах патрабаванняў розных груп (у тым ліку рознаканфесійных). Гэта зрабілася падставай для замацавання верацярпімасці — унікальнай з’явы для Еўропы эпохі рэлігійных войнаў. У адрозненне ад многіх даследнікаў, Анджэй Камінскі не ідэалізуе гэтага феномену і падкрэслівае перш за ўсё яго палітычны радавод: *“Шляхта, уцягнутая ў барацьбу за экзекуцыю правоў, абараняла перад каралём і сенатарамі (біскупамі) сваіх “братоў”-пратэстантаў. Абараняла не дзеля прынцыпаў талерантнасці, але для захавання салідарнасці шляхты, якая змагалася за кіраванне дзяржавай”* (с. 46).

Мадэрнізацыя палітычнага ладу, якая забяспечвала ўдзел “народу-шляхты” — праз соймікі і сойм — у прыняцці законаў, а значыць, у кіраванні дзяржавай і якая гарантавала жыццёвасць знакамітага лозунгу “Нічога пра нас без нас”, пратрымалася mutatis mutandis да падзення Рэчы Паспалітай.

Аднак, як слушна заўважае аўтар, *“кожная палітычная сістэма, нібыта кіруючыся інстынктам самазахавання, істотна абмяжоўвае магчымасці ўласнага рэфармавання”* (с. 61). Тым часам першае выпрабаванне на трываласць — у рокашы Зебжыдоўскага, ці грамадзянскай вайне 1607—1609 гадоў — сістэма “шляхецкай дэмакратыі” вытрымала яшчэ без стратаў. Толькі нязначна паступілася ідэаламі ды зацвердзілася ў так званай “мяшанай форме кіравання”. Апошняя ўяўляла сабой кампраміснае вырашэнне сутычкі *“дваровых манархістаў”* з *“павятовымі рэспубліканцамі”* (паводле азначэнняў аўтара), якія абвінавачвалі караля ў дзеяннях, што супярэчылі інтарэсам дзяржавы, сенатараў — у карумпаванасці, а сойм — у злачыннай пасіўнасці. Трэці ж асяродак, у якім, уласна, і зарадзілася ідэя мадыфікацыі, Камінскі называе *“канстытуцыяналістамі”* (с. 84), падкрэсліваючы ўмоўнасць паняцця. Гэтаму асяродку ён яўна сімпатызуе, і ў такой шляхетнай і мудрай ролі прыхільнікаў раўнавагі ўлады і выратавальных рэформаў канстытуцыяналісты застануцца да канца кнігі. У адрозненне ад дэмакратычных лозунгаў экзекуцыйнага руху XVI стагоддзя, канстытуцыяналісты сфармулявалі, паводле аўтара, *“арыстакратычную ідэалогію прызначэння Рэчы Паспалітай”*, якая бачыла свой ідэал не ў тым, каб забяспечыць непасрэдны ўдзел грамадзян у ажыццяўленні ўлады, а ў тым, каб дасягнуць *“раўнавагі паміж павятовымі супольнасцямі (дэмакратыя) і каралём (манархія) пры пасрэдніцтве сенатараў (арыстакратыя)”* (с. 84). Абсалютызм жа канстытуцыяналісты адкідалі з такой самай агідай, як і ўладу натоўпу, робячы галоўны акцэнт на патрэбе ў моцным урадзе і эфектыўных парламенцкіх і судовых інстытутах. Праз пэўны час у частых для Рэчы Паспалітай сутыкненнях “залатой вольнасці” і абсалютызму канстытуцыяналісты-арыстакраты не раз стануць па абодва бакі барыкад — паводле аўтара, з высокіх меркаванняў захавання ўсё той самай раўнавагі ўладаў. Мяркую, што паводзіны сяго-таго з канстытуцыяналістаў, асабліва ў часе, калі дзяржава стаяла на краі прорвы, можна растлумачыць куды больш прыземленымі прычынамі: чаго вартыя хаця б згаданыя аўтарам *“вялікія і бясслаўныя кар’еры”* членаў Сталай Рады (с. 216) ці *“злачынная наіўнасць”* жменькі арыстакратаў, якая ў 1792 годзе фармальна адкрыла расійскім войскам шлях

у краіну (сс. 226—227). Праўда, пантэон герояў Рэчы Паспалітай пасля лагічнай аперацыі пад назвай *“cui prodest”* павінен быў паменшаць. Але паколькі аўтар не меў за задачу вайну з персаналіямі, вернемся і мы да галоўнага героя кнігі — “грамадзянскай прасторы”.

Замацаванне “раўнавагі ўладаў” пасля рокашу Зебжыдоўскага спрыяла рэзкаму змяншэнню колькасці прыхільнікаў абсалютызму, а прынцыпы грамадзянскіх свабодаў былі ўзняты публіцыстамі на найвышэйшы п’едэстал грамадскага жыцця па ўсіх кутках Рэчы Паспалітай. *“Дзеля вольнасці,* — піша Анджэй Камінскі, — *працавалі соймікі, сойм, канфедэрацыі, вайсковыя групоўкі, а таксама каралеўскі двор. Пра вольнасць можна было пачуць у касцёле і пры банкетным стале. Чулася пра яе і падчас хрэсьбін, вяселляў ды пахаванняў. Былі ў яе свае паэты, аратары і палітычныя адвакаты. І чым далей, тым часцей прызнавалася, што найлепей яе абараняе дзейсная, заснаваная на народнай маралі, ураўнаважаная форма ўлады”* (с. 90). Ідэал, аднак, рэдка бывае ў згодзе з практыкай. На практыцы ж кампраміс паміж тымі сіламі, якія прадстаўлялі манархічны, арыстакратычны і дэмакратычны пласты ў дзяржаве, мог быць дасягнуты толькі пры захаванні прынцыпу роўнасці паміж “старэйшай” (магнатамі) і “малодшай” (то бок шараговай) шляхтай. Тым часам гучныя лозунгі роўнасці і братэрства, як іранічна заўважае аўтар, стваралі найлепшыя ўмовы напоўніцу карыстацца грамадзянскімі правамі тым, хто залічаў у свае кліенты цэлыя шляхецкія паветы (с. 98). Дадам: паветы **выбарчых галасоў**; паветы паслухмяных **крыкуноў панскай волі ў канфедэрацыях**; паветы **кіраваных з-за куліс натоўпаў** на выбарах і г.д. І менавіта дзякуючы гэтай акалічнасці, выразна не акрэсленай аўтарам, “павятовы рэспубліканізм” XVI стагоддзя павольна ператвараўся ў “рытарычны рэспубліканізм” XVII—XVIII стагоддзяў — гэта значыць у гучную фразеалогію, якая, цешачы самалюбства “нацыі-шляхты”, кампенсавала ёй ейную фактычную залежнасць ад купкі алігархаў. Прычым неістотна — ці то ўпадабаных аўтарам “канстытуцыяналістаў”, ці то агідных манархістаў: прызначэнне павятовага шляхецкага балагану ў вачах адных і другіх далей за функцыі хору антычнай трагедыі не ішло.

Анджэю Камінскаму не імпануе думка, якой сімпатызуе аўтарка гэтых радкоў, што “шляхецкая дэмакратыя” як такая па вялікім рахунку сканала яшчэ ў першай палове XVII стагоддзя — якраз тады, калі да яе фразеалогіі нарэшце прызвычаіліся арыстакраты, якія адной рукой аплачвалі літаратурныя паслугі трубадураў “залатой вольнасці”, а другой — утрымлівалі адукаваных за іхні ж кошт дэмагогаў-служкаў для цынічнага дырыгавання асяродкамі гэтай вольнасці — соймамі і соймікамі. Як на маю думку, у кнізе ўвесь час шукаецца апраўданне для вольналюбівай ды вось толькі трохі дэзарыентаванай і наіўнай павятовай шляхты. І свабоду яна любіла, і свае грамадзянскія правы гатова была абараняць коштам жыцця, і маральныя ідэалы мела “правільныя”, вальналюбныя — але чамусьці не склалася… Прычыны гэтага Анджэй Камінскі бачыць у тым, што павятовы рэспубліканізм, страціўшы ў пэўны момант энергію развіцця, не здолеў дамагчыся рэформаў, адэкватных запатрабаванням часу. Сакраментальны ж момант “страты энергіі” ён тлумачыць унутраным, так бы мовіць, маральным заняпадам, перамяшчэннем ідэалаў са сферы дзеяння ў сферу пасіўных летуценняў: такі рэспубліканізм яшчэ мог час ад часу выбухаць у папулісцкай канфедэрацыі або прыводзіць да выбрання “шляхецкага караля” на хвалі антымагнацкіх настрояў, але ўжо не мог выклікаць сістэмных карэнных зменаў праз архаічнасць і наіўнасць уяўленняў пра справядлівы лад (пар.: сс. 143, 146, 169, 186, 187 і інш.).

На маю ж думку, галоўная прычына крызісу рэспубліканізму хаваецца не ў сферы ўяўленняў, а ў сферы сацыяльных практык. Шляхецкая маса не магла ажыццявіць карэнных зменаў па азначэнні, паколькі выконвала ў дзяржаве ўсяго толькі ролю статыста, а не гаспадара. Дастаткова нагадаць, што “правадырамі народу” ў папулісцкіх канфедэрацыях выступалі магнаты, якія, зрэшты, самі іх і правакавалі, імкнучыся да перападзелу ўлады. А “шляхецкія каралі” паходзілі з тых самых магнатаў.

Але пяройдзем ад ідэалізаванай раўнавагі ўлад да цалкам рэальнай асіметрыі палітычных культур у розных рэгіёнах Рэчы Паспалітай. Аўтар быццам бы прызнае гэта, згадваючы то аб прынцыпова рознай структуры землеўладання ў Кароне Польскай і Вялікім Княстве Літоўскім (с. 31), то пра пыху

ўкраінскіх князёў (сс. 57, 108), то пра канцэнтрацыю мясцовых урадаў у руках аднаго і таго ж кола літоўскіх сем'яў (с. 158). Але гэтыя назіранні нібыта коўзаюцца па паверхні. Значна важнейшую ролю ў схеме аўтара адыгрывае ідэя яднання шляхты ў супольным імкненні да дэмакратыі, таму ў падагульненні лагічны націск робіцца не на адрознасць уладных структур, а на паступовую эмансіпацыю ўкраінскіх і літоўскіх шляхецкіх групаў ад сваіх былых гаспадароў. Паводле аўтара, тутэйшая павятовая шляхта, засвойваючы "ўрокі дэмакратыі", пасля Люблінскай уніі пачала памалу прыпадабняцца да сваіх "братоў" з Кароны Польскай. Так, валынцам і кіеўцам, згодна з аўтарскай аптымістычнай ацэнкай, хапіла быццам усяго двух пакаленняў, *"каб зрабіцца грамадзянамі не толькі па нараджэнні, але і з усвядомленага адчування сваіх чалавечых і палітычных правоў"* (с. 58). Мяркую, аднак, што адбылося якраз наадварот. Прыўнесенае з Вялікага Княства арыстакратычнае ўсяўладдзе атруціла, і даволі хутка, рэчпаспалітаўскі калодзеж дэмакратыі. На бытавым узроўні гэта ажыццяўлялася шляхам, так бы мовіць, "дэнацыяналізацыі" літоўска-рускіх алігархаў. Пасля Люблінскай уніі (і тут ужо сапраўды за два-тры пакаленні) яны захапілі, апрача сваіх звычайных зонаў кантролю, яшчэ і прастору Кароны, паступова стварыўшы разам з кароннымі магнатамі магутную надрэгіянальную структуру, якая мела ўплыў ува ўсёй Рэчы Паспалітай. Не магу сказаць, каб Анджэй Камінскі цалкам абышоў гэты феномен "магнацкага братання" (гл. сс. 72, 98, 108—109), але, як і ў папярэднім выпадку, ён не надае яму істотнага значэння. А тым часам, здаецца, менавіта гэты эпізод і даў штуршок мутацыі "шляхецкай дэмакратыі" ад высокіх узораў XVI стагоддзя да наступнага крызісу. Шляхта Кароны ў экзекуцыйным руху XVI стагоддзя змагалася супраць уласных магнатаў на адносна невялікай, знітаванай адзінаю мадэллю ўлады і звычаяў тэрыторыі. Да таго ж, каронныя магнаты, да якіх шляхта стаяла ў апазіцыі, паводле ўзроўню маёмаснай магутнасці і прэстыжу ў вачах падуладных не маглі цягацца з літоўска-рускімі алігархамі — гаспадарамі велізарных латыфундыяў, што нярэдка перасягалі тэрыторыі старажытных княстваў і надавалі сваім уладальнікам арэол харызматычнага права на першынство. Люблінская унія стварыла выдатныя магчымасці для пашырэння поля дзейнасці

гэтых людзей, а рокаш Зебжыдоўскага засведчыў, што яны на гэтым полі ўжо цалкам абжыліся, засвоіўшы сярод іншага і фразеалогію “залатых вольнасцяў”. Іншая рэч, што лозунгі рэспубліканізму і грамадзянскіх правоў служылі для іх не больш чым фігавым лістком, які прыкрываў перакананасць у выключным праве “людзей вялікіх” вяршыць уладу — зразумела, без “грыцаў”, як назаве сваіх валынскіх павятовых “братоў” князь Канстанцін Астрожскі ў даверным лісце да зяця Крыштафа Радзівіла “Перуна”.

Эканамічная магутнасць літоўскіх і рускіх арыстакратаў, узмоцненая ва ўкраінскім выпадку яшчэ і навыкамі, так бы мовіць, “ірацыяналізоўвання” ўлады, аказалася не па зубах маладой шляхецкай дэмакратыі Кароны Польскай. Шырэйшы доказам гэтага можа паслужыць, сярод іншага, і той красамоўны факт, што ўяўленне пра “святладайную” ролю украінскіх алігархічных Дамоў упершыню было створана ў творах іхніх новых кліентаў-палякаў. Менавіта гэтыя “разгерметызавалі” дасюль закрытую для чужых традыцыю пакорліва схіляцца перад мацнейшымі і яны атруцілі ёю “павятовы рэспубліканізм” свайго класнага, польскага ўзору [1] (звыклы рэфрэн фразеалогіі “волі шляхецкай” тут не павінен уводзіць у зман: князі Януш Астрожскі, Ежы Збаражскі, Аляксандр Заслаўскі ці Ярэма Вішняв(ецкі) былі гуляць у заявы пра роўнасць і братэрства, але шт важаць на фоне іхняй фанабэрыі ў дачыненнях сваімі “малодшымі братамі”).

Такім чынам, маё галоўнае пярэчанне Анджэю Каменскаму зводзіцца да таго, што, на маю думку, “грамадзянскі ўдзел” і прастору” Рэчы Паспалітай раз’ядаў з сярэдзіны не палітычны інфантылізм павятовай шляхты (якую ён вінаваціць у няўменні адрозніць патрэбы дзяржавы ад сваіх вольнасцяў на ўзроўні ўласнага сойміку, с. 169), колькі прынцыповая неадпаведнасць ідэалагічных лозунгаў сацыяльнай практыцы. Распачатая квазідэмакратызацыяй літоўска-рускіх алігархаў у канцы XVI — пачатку XVII стагоддзяў, гэтая неадпаведнасць вельмі хутка зрабілася невылечнай хваробай шляхецкай дэмакратыі і ўрэшце прывяла яе да гібелі.

Між іншым, сказанае ніколькі не ставіць пад сумненне

[1] Шырэйшы доказ гэтага гл.: **Яковенко Н.** Уявлення української еліти кінця XVI — середини XVII ст. про історію своєї землі і народу. К., 1993. — С. 37–38.

Островський Ю. Заславським бути // Пам’ятки України. — 1991. — № 1. — С. 3–4.

Паралельний світ. Дослідження з історії уявлень та ідей в Україні XVI—XVII ст. Київ, 2002. С. 232–269.

вонкавай прывабнасці згаданых лозунгаў. Менавіта яны, як пераканаўча паказаў Анджэй Камінскі, сфармавалі гладкую сістэму грамадзянскіх каштоўнасцяў, супольных для людзей розных канфесіяў, рознай этнічнай прыналежнасці і нават розных сацыяльных пластоў (мяркую, аўтар цалкам мае рацыю, пішучы, што барацьба "казацкага народу" за свае правы і свабоды адбывалася ў рамках якраз гэтай сістэмы каштоўнасцяў, прынесеных у войска Багдана Хмяльніцкага аказачанай шляхтай, с. 123). Урэшце, застаецца нагадаць, што выпеставаны ў Рэчы Паспалітай піетэт да паняцця свабоды зрабіўся штуршком да барацьбы за яе ў XIX стагоддзі, калі, паводле дасціпнага выразу Рамана Шпарлюка, муза свабоды ва Ўсходняй Еўропе гаварыла па-польску.
Такія думкі і ўражанні выклікае тэкст кнігі Анджэя Камінскага — кнігі, якая нібыта апавядае пра вядомыя рэчы, а тым часам застаецца вельмі "аўтарскай" і месцамі — нават востра палемічнай. Частку гэтай палемікі, адрасаваную польскай гістарыяграфіі, украінскі чытач не ўловіць; частка адно пункцірна акрэсленых палітычных калізіяў застанецца для яго не зусім яснай; тыя ці іншыя персанажы не выклічуць ніводнай асацыяцыі, нават калі гаворка будзе ісці пра людзей украінскага паходжання (украінская "нацыянальная гісторыя" іх даўно падарыла польскай, а на сёння далей за "рэстытуцыю" Ярэмы Вішнявецкага справа, наколькі мне вядома, не заходзіла). Разам з тым, кніжка гэтая была б для ўкраінскага чытача вельмі карыснай, бо яна паказвае, што ўсё ж можна любіць уласную мінуўшчыну, не паліваючы яе патакай, і можна цаніць у ёй вартасці, якія не вытрымалі праверкі на трываласць у сутыкненні з рэальным жыццём.

Рэабілітацыя Рэчы Паспалітай
У адрозненне ад кнігі Анджэя Камінскага, праца Генадзя Сагановіча больш традыцыйная з пункту гледжання "сінтэтычных гісторыяў". У цэнтры ўвагі аўтара — беларуская этнічная супольнасць, перадгісторыя і гісторыя якой прасочана з дапісьмовых часоў да канца XVIII стагоддзя — да ўсё той самай абдыкацыі Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Кніжка складаецца з кароткай прадмовы, уступу, 10 раздзелаў, пасляслоўя, бібліяграфіі, іменнага і геаграфічнага паказальнікаў і шэрагу дадаткаў — дыяграмаў, табліц,

графікаў, мапаў.
У прадмове (сс. 7—8: тут і далей я буду спасылацца на беларускі тэкст) Генадзь Сагановіч робіць сціслы агляд папярэдніх канцэпцыяў беларускай гісторыі. У адрозненне ад украінскіх, іх вельмі няшмат, і яны носяць або наіўна-папулярны — як першая кніжачка такога зместу Вацлава Ластоўскага 1910 году, або "савецкі" — гэта значыць русацэнтрычны характар. Дэмантаж савецкіх схемаў пасля распаду СССР, на думку аўтара, пакуль яшчэ не набыў пераканаўчага ўвасаблення. Не абяцаючы чытачу недасягальнай у працах гісторыка бесстароннасці, Сагановіч акрэслівае тыя перыяды і аспекты мінуўшчыны, якім збіраецца аддаваць перавагу. Храналагічна гэта, перш за ўсё, *"дзяржаўна-палітычнае і грамадскае жыццё краю ў XVI—XVII стагоддзях — у найважнейшыя часы старажытнай гісторыі Беларусі, з якімі звязана сама больш ідэалагічных міфалагізацый старой гістарыяграфіі"* (с. 7), а тэматычна — правы чалавека, феномен шляхецкай дэмакратыі, самакіраванне магдэбургскіх гарадоў, першыя формы грамадзянскай супольнасці, еўрапейскі кантэкст беларускай мінуўшчыны (с. 8).
Як бачым, аўтарская оптыка погляду на мінулае ў цэлым вельмі блізкая да таго, пра што ідзе гаворка ў кнізе Анджэя Камінскага. Там, аднак, яна хутчэй мадыфікуе і дапаўняе, чым адмаўляе думкі папярэднікаў. Тым больш што Анджэю Камінскаму не давялося самому запаўняць прагалы ў даўно і грунтоўна вывучаных раздзелах падзейнай, сацыяльнай і культурнай гісторыі. А перад беларускім аўтарам стаяла двайная задача: намаляваць уласную схему гісторыі беларусаў і знайсці ў ёй месца для запраграмаваных аўтарскім бачаннем сюжэтаў. Звычайна такая аперацыя для адной з дзвюх задачаў канчаецца дрэнна: або падзейная гісторыя ператвараецца ў даважак прыкладаў, або сума агучаных аўтарам ідэяў расплываецца ў хаосе людзей і гістарычных фактаў. Забягаючы наперад, скажу, што, на маю думку, Генадзю Сагановічу ўдалося прайсці паміж Сцылай і Харыбдай.
Ва ўступе (сс. 9—12) прасочана эвалюцыя этноніму "Белая Русь" пачынаючы з другой паловы XIII — часу першай фіксацыі ў крыніцах — да канца XVII стагоддзя, калі геаграфічны змест гэтага паняцця пачаў паступова пакрываць большую частку тэрыторыі рассялення беларускага этнасу. Тут жа пададзена

кароткая характарыстыка прыродных умоваў, клімату і ландшафту Беларусі — апошні, на думку аўтара, не зведаў істотных трансфармацыяў ад Сярэднявечча да сённяшняга дня (с. 120). Гэтае шматабяцальнае назіранне далей у кнізе не развіваецца, а шкада, бо, магчыма, якраз яно магло б стаць ключом для тлумачэння пэўнай замаруджанасці, "пасіўнасці" гісторыі Беларусі, дзе, карыстаючыся аўтаравым выказваннем, *"астравы жыхароў"* (с. 12), раскіданыя на прыдатных для гаспадарчага асваення землях паміж пушчаў і балот, заставаліся нязменнымі на працягу стагоддзяў і дзе масавыя ды хаатычныя міграцыі насельніцтва не прыводзілі — як, скажам, ва Ўкраіне — да ломкі патрыярхальнага грамадства. Праўда, Генадзь Сагановіч, апісваючы ў адным з раздзелаў дэмаграфічную сітуацыю ў Беларусі ў канцы XVI стагоддзя, кажа пра "пастаянны адток" сялян на поўдзень, ва ўкраінскія стэпы (сс. 222—223). Але гэты пасаж — хутчэй некрытычная даніна савецкім гістарыяграфічным захапленням такой "формай класавай барацьбы", як "сялянскія ўцёкі". Бо насамрэч крыніцы не фіксуюць беларускіх сялянскіх міграцыяў на стэпавае памежжа, дый наўрад ці яны былі рэальнымі з улікам "тэхнічнага" боку такіх перасяленняў, а таксама ў сувязі з кліматычнымі асаблівасцямі Стэпу, дзе людзі лясоў і балотаў адчувалі сябе сама меней няўтульна — найсвяжэйшым прыкладам можа паслужыць сталінская спроба перасялення ва ўкраінскія стэпы жыхароў Холмшчыны, якія так і не змаглі там прыжыцца.

У другім раздзеле ("Вытокі", сс. 13—24) галоўны акцэнт зроблены не столькі на факталогіі пра- і перадгісторыі беларусаў, колькі на вылучэнні для іх асобнай, не тоеснай са славянамі-суседзямі гістарыяграфічнай прасторы. У прыватнасці, настойліва падкрэсліваецца, што тэрыторыя будучай Беларусі — гэта частка супольнай прарадзімы балтаў і славянаў і што субстратам беларускага этнагенезу паслужылі балцкамоўныя племянныя групы, славянізаваныя ў ходзе міграцыі славянаў з поўдня. Абшары на поўнач ад Прыпяці славяне пачалі асвойваць толькі з VIII стагоддзя, поўнач і захад Беларусі — не раней за IX, а Панямонне — аж у X стагоддзі, прычым працэс асіміляцыі аўтахтонаў-балтаў цягнуўся яшчэ некалькі стагоддзяў, суправаджаючыся павольным перамешваннем мовы, абрадаў, матэрыяльнай культуры і г.д.

Каланізацыя тэрыторыяў, якія цягам двух тысячагоддзяў былі заселены балтамі, патрабавала моцнай вайсковай арганізацыі, і ў прыватнасці — узвядзення апорных адміністрацыйных гарадоў, якія ў спрыяльных умовах рабіліся цэнтрамі племянных княстваў. Такую ролю, паралельна з фармаваннем протадзяржаўных славянскіх цэнтраў у Кіеве і Ноўгарадзе, для крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў з IX стагоддзя пачынае адыгрываць Полацак. У канцы гэтага раздзелу Генадзь Сагановіч скептычна выказваецца не толькі з нагоды "адзінай старажытнарускай народнасці" як феномену, немагчымага па азначэнні, але і наконт пашырэння на ўсіх усходніх славянаў супольнай назвы "Руская зямля" (с. 23). Як бачым, аўтар не толькі адмаўляе існаванне "калыскі трох братніх народаў", але і рашуча сцвярджае, што гісторыя адразу паклала беларускае немаўля ў зусім іншую, прычым "не братнюю", калыску.

Раздзел II (*"Першыя дзяржавы Беларусі"*, сс. 25—58) развівае тую самую ідэю. Храналагічна тут ахоплена эпоха Кіеўскай Русі, але яе звыклы вобраз прыметна мадыфікуецца праз два моманты. Па-першае, падзеі, якія апісвае Генадзь Сагановіч, практычна не выходзяць за рамкі беларускай геаграфічнай прасторы, што стварае ўражанне яе самадастатковасці: тут набіраюць моц першыя княствы — Полацкае, Тураўскае і Смаленскае, тут яны перажываюць фазу росквіту і перыяд раздробленасці, тут адбываецца расцягнутая ў часе хрысціянізацыя, тут з'яўляюцца першыя парасткі хрысціянскай культуры і г.д, і да т.п. Па-другое, калі Кіеў згадваецца ў кнізе толькі эпізадычна — у кантэксце замахаў на незалежнасць Полацку, дык новым суседзям з захаду, дзвюм ордэнскім дзяржавам, прысвечаны адмысловы параграф (сс. 38—42), дзе аўтар даволі разгорнута прадстаўляе паступовае наладжванне стасункаў і ўзвышэнне супольных эканамічных інтарэсаў над мясцовымі канфліктамі. Урэшце, самадастатковасць беларускай гістарычнай прасторы дадаткова падкрэсліваецца тым, што яе абмінуў згубны для астатняй часткі Русі мангольскі ўдар. Такім чынам, паварот "на захад", як вынікае з кнігі, не азначаў разрыву з кіеўскай пупавінай хаця б таму, што такой пупавіны проста ніколі не існавала.
У раздзеле III (*"Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага"*, сс. 59—64) апавядаецца, як на змену аморфным дзяржавам-княствам

прыходзіць магутнае дзяржаўнае ўтварэнне, канчаткова сцэментаванае рукой Вітаўта. У агульнай ацэнцы гэтага працэсу Генадзь Сагановіч — прыхільнік вядомага тэзісу Аляксандра Праснякова, згодна з якім штуршок да ўтварэння ВКЛ далі энергічныя літоўскія князі, але рэалізоўвалася гэта *“на тэрытарыяльнай, этнаграфічнай і культурнай аснове беларускай”* (с. 72). Распачатае Міндоўгам аб’яднанне раздробленых і аслаблых земляў у адну дзяржаву, як падкрэслівае аўтар, *“па-першае, было выгадна не толькі літоўскім князям, але і суседнім усходнеславянскім гарадам і землям, а па-другое, абапіралася на набыты вопыт сумеснага існавання”* (с. 61). Мірны, дагаворны характар беларуска-літоўскага сімбіёзу ілюструецца ў кнізе многімі прыкладамі пераходу ўлады: у Чорнай Русі (*“хутчэй за ўсё, Міндоўг быў тут абвешчаны князем са згоды мясцовага насельніцтва”*, с. 61), на Полаччыне (*“літоўскага князя, найімаверней, запрасілі самі палачане”*, с. 61), у Віцебску (шляхам атрымання ў спадчыну, с. 66), у Менску і на Палессі (праз імаверную камендацыю мясцовых Рурыкавічаў пад пратэкцыю Гедыміна, с. 67). Аўтар падкрэслівае, што з моманту свайго з’яўлення новая дзяржава мела двухэтнічны, балта-славянскі характар, уяўляючы сабой своеасаблівы сінтэз раннесярэдневяковых уладных інстытутаў Літвы з больш развітай дзяржаўна-палітычнай сістэмай беларускіх княстваў. Сярод іншага, гэта добра ілюструецца вядомым фактам рутэнізацыі кіраўнічых літоўскіх вярхоў і зацверджаннем рускай мовы ў публічнай сферы.
Палітычныя абставіны часоў княжання Вітаўта (барацьба з Ягайлам, пагроза з боку Ордэну і інш.) прывялі да парушэння гэтай раўнавагі — расколу *“балта-славянскага супольнага саюзу на Русь і Літву”* (с. 92). Таму ў наступным, чацвёртым раздзеле (*“Шляхі кансалідацыі”*, сс. 95— 120) прасочваецца, як пераемнікі Вітаўта давалі сабе рады з унутраным разладам, а разам з тым і з першымі праявамі маскоўскай экспансіі, якая на некалькі стагоддзяў зробіцца для ВКЛ кашмарам. Завяршае гэты раздзел слушная думка пра тое, што менавіта вонкавая небяспека (я б дадала — і культавая перамога пад Оршай 1514 году) стала асновай для кансалідацыі літоўцаў і беларусаў у рамках супольнай прасторы Вялікага Княства.
Раздзел V (*“Дзяржава і грамадства”*, сс. 121—152) пачынаецца з добрага прафесійнага агляду тэрытарыяльнай структуры ВКЛ

як стракатага палітычнага ўтварэння, якое аб'ядноўвала ў сабе патрыманіяльныя ўладанні кіраўнічай дынастыі, шэраг удзельных княстваў (іх падпарадкаванне велікакняскаму пасаду расцягнулася ад сярэдзіны XV да пачатку XVII стагоддзя; аўтар, у адрозненне ад большасці даследнікаў, цалкам слушна, на маю думку, завяршае гэтую эпапею аж 1612 годам, калі Слуцкае княства, якое належала Алелькавічам, стала ўласнасцю Радзівілаў), а таксама так званыя землі-анексы — тэрытарыяльна цэльныя анклавы, якія жылі па ўласным праве на падставе пагаднення ("раду") з вялікім князем, хоць і кіраваліся ягонымі намеснікамі. На тэрыторыі Беларусі такімі, у прыватнасці, былі Полацкая, Віцебская і Смаленская землі. Характарызуючы палітычную сістэму ВКЛ, Генадзь Сагановіч акрэслівае прэрагатывы вялікага князя і падначаленых яму ўрадоўцаў, паказвае фармаванне інстытуту сталай рады пры ўладару, прасочвае генезіс шляхецкага прадстаўнічага органу — сойму, фіксуе сацыяльны статус і правы ды абавязкі розных групаў рыцарскай эліты, гараджанаў (тут — на фоне "магдэбургізацыі"), сялянаў. Завяршаецца раздзел кароткім, але змястоўным нарысам пра Першы літоўскі статут 1529 году (сс. 149—152), які паклаў пачатак кадыфікацыі руска-літоўскага права.

Праўда, захапіўшыся "правамі на валоданне" Статутам, аўтар дапускае традыцыйнае для гістарыяграфіі скажэнне ў ацэнцы моўнай (а адсюль — і юрыдычнай) асновы помніка. Слоўнікавы склад статутнага тэксту, як чытаем у кнізе, быў "**[2]** **Яскевіч А. Беларускіх і** ўкаханы **старамоскоўскага** юрыдычнай тэрміналогіяй, створанай на аснове **права на право** ўкраінскіх і лацінскай, польскай і нямецкай моў" (с. 152). Тэза, **украінскага** пераканаўча паказаў яшчэ ў 1920-я гады аўтарытэтны **літоўскай** знаўца права Андрэй Якаўлеў, мова канцылярыі ВКЛ (а **доби XV—XVI** мыслення) фармавалася пад магутным чэшскім **стагоддзяў. Прага,** калькуючы паняцці, фразеалагічныя штампы і г. д. **1929.** Іх, у сваю чаргу, былі пазычаны чэшскімі правазнаўцамі з лаціны або нямецкай.

Раздзел VI (*"Рэлігія і культура"*, сс. 153—182) падагульняе той перыяд у гісторыі Беларусі, што быў звязаны толькі з Вялікім Княствам Літоўскім. Абмяркоўваючы пытанні веры, аўтар, у

прыватнасці, ацэньвае канфесійную палітыку вялікіх князёў як “рэалістычную” і ў цэлым верацярпімую; адмысловая ўвага аддаецца водгуку Фларэнційскай уніі ў беларускім праваслаўным грамадстве. Больш дэталёва ў кнізе прасочаны першыя прыкметы своеасаблівай вестэрнізацыі беларускай культуры: выправы па адукацыю ў заходнія ўніверсітэты, з’яўленне лацінскіх школ і прыватных бібліятэк, зараджэнне літоўска-беларускага летапісання, “еўрапеізацыя” аблічча гарадской забудовы, раптоўны росквіт неалацінскай паэзіі, нарэшце — зараджэнне полілінгвізму ў культуры, дзе ўпершыню пачынаюць суіснаваць чатыры моўныя стыхіі — царкоўнаславянская, старабеларуская, лацінская і польская. Агульнае павышэнне культурных запатрабаванняў грамадства знайшло лагічнае завяршэнне, паводле словаў аўтара, *“у якасна новай з’яве культурнага жыцця — кнігадрукаванні”* (с. 171). Прыведзеная далей характарыстыка феномену Францішка Скарыны выглядае яскравай і пераканаўчай. Падагульняючы свае назіранні, Генадзь Сагановіч яшчэ раз падкрэслівае культурную спецыфіку старажытнай Беларусі як *“рэгіёну грэка-лацінскага культурнага сінтэзу”* (с. 176), хоць, здаецца, у намаляваным ім вобразе “грэцкі складнік” хутчэй апрыёрна пастулюецца, чым фіксуецца.

Два наступныя раздзелы прысвечаны ўваходу і першым дзесяцігоддзям знаходжання Вялікага Княства, а значыць — і Беларусі, у склад Рэчы Паспалітай. Апісанню ўнійнага сойму 1569 году папярэднічаюць два параграфы, якія далі назву першаму са згаданых раздзелаў (раздз. VII *“Шляхецкая дэмакратыя”*, сс. 183—204). Тут аўтар паказвае ўнутраны расклад сілаў у ВКЛ напярэдадні Люблінскай уніі і акцэнтуе ўвагу на “засіллі алігархаў”, гэта значыць на традыцыйнай канцэнтрацыі ўлады ў руках купкі магнацкіх сем’яў. На ягоную думку, актывізацыя родавай шляхты, узорам якой з’яўляўся экзекуцыйны рух суседняй Кароны Польскай, падштурхнула да радыкальнага рэфармавання (“дэмакратызацыі”) ХІУ ст. ранейшага ладу ВКЛ у 1564—1566 гадах — праз стварэнне сеймавых інстытутаў мясцовага самакіравання, соймікавай сістэмы, ліквідацыю судовага імунітэту арыстакратыі. Паводле аптымістычнай высновы Генадзя Сагановіча, *“зраўнаваўшыся ў правах з рыцарствам, арыстакратыя [...] на*

Зайцев І. М. Українська шляхта з кінця XIV до середини XVII ст. (Волинь і Центральна Україна). Київ, 1998. С. 104.

былыя магчымасці кантраляваць палітычнае жыццё дзяржавы” (с. 197). Мне ўжо даводзілася выказваць скепсіс з нагоды цудадзейных магчымасцяў адным махам знішчыць тое, што складала ядро і сутнасць уладнай структуры ВКЛ як дзяржавы арыстакратаў [3]. Нагадаю і тое, што, на думку літоўскіх гісторыкаў, аўтараў найноўшай канцэпцыі гісторыі ВКЛ, магнаты не прайгралі на рэформах, больш за тое — як усяўладная дамінанта палітычнага жыцця яны захоўвалі моц аж да канца XVIII стагоддзя: “Гэта магнаты, а не шляхта, кантралявалі соймікі, дзе вызначалася пазіцыя ВКЛ у пытаннях, што датычылі існавання дзяржавы. Вышэйшы дзяржавай шляхты, але шляхтаю гэтай кіравалі Сапегі, Пацы і Чартарыйскія” [4]. Зрэшты, сам Генадзь Сагановіч менавіта з такога пункту гледжання апісвае ход і вынікі Люблінскага сойму 1569 году, дзе групай паслоў ВКЛ дырыгавала *“партыя Радзівілаў”* (с. 201). Затое ў заключным акордзе, нібы згадаўшы пра “ролю масаў” — ім жа пастуляваную, Генадзь Сагановіч вымушаны аддаць даніну і ім: *“Супольная дзяржава, створаная прадстаўнікамі беларускага, літоўскага, польскага і ўкраінскага народаў у Любліне, перш за ўсё намаганнямі шляхты ў яе барацьбе за дэмакратыю…”* (с. 204).

[4] **Kiaupa Z., Kiaupienė J., Kuncevičius A.** ***The History of Lithuania before 1795.*** **Vilnius, 2000. С. 262—268.**

Раздзел VIII (*“У дзяржаве двух народаў”*, сс. 205—254) складаецца з пяці параграфаў розных тэматычных кірункаў. У першым, названым досыць інтрыгоўна *“Плюсы і мінусы аб’яднання з Каронай”*, справа зводзіцца-такі да плюсоў: аўтар пераканаўча даводзіць, што, насуперак унійным планам польскага боку, зліцця дзяржаваў не адбылося. Вялікае Княства захавала сваю судовую сістэму, асобнае парламенцкае прадстаўніцтва, тэрытарыяльную цэласнасць, войска, фіскальную і грашовую сістэму, дзяржаўную канцылярыю і нават такія сімвалічныя рэчы, як асобную прысягу новаабранага караля і асобнае пацверджанне ім прывілеяў. Менавіта на першы пасляўнійны перыяд прыпала і новая кадыфікацыя Літоўскага статуту (1588 год), якая адыграла першарадную ролю ў фіксацыі згаданых асаблівасцяў. Апроч таго, дзве прадмовы да Статута, адрасаваныя падканцлерам Львом Сапегам (першая — да кардынальскага, другая — “усім вобец станам”), пераканаўча паказваюць, што

[5] **Гл. разам з тым: Яўмантас Янкявічус. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Тэксты. Даведнік. Каментарыі.**

рэспубліканізму і “залатых вольнасцяў” знайшлі шлях у
літоўска-рускага грамадства ў той самай форме, у якой
сцвердзіліся ў Кароне. Генадзь Сагановіч, на жаль, не спыніўся
на больш дэталёвым прадстаўленні першай з прадмоваў, якая
абвяшчала вяршэнства закону над уладарамі, бо ў іншым
выпадку “людзі, брыдзячыся іх панаваннем і звірхнасцю,
уважалі б іх не гаспадармі, але тыранамі” [5]. Затое ў кнізе
каментуецца і цытуецца другая прадмова — з яскравым гімнам
свабоды: *“Абачывалі то ўсіх вякоў людзі мудрыя, і кажу ім: дай
рэчы паспалітай чалавеку пачсціваму нічога не можа быць
дарожшага над вольнасць. А няволяю так се мае ганіць, не
толькі скарбамі, але і смерцю яе ад сябе адганяці”* (с.
209).

Наступныя параграфы гэтага раздзелу даюць чытачу
цэльнае ўяўленне пра поліэтнічнасць, дэмаграфію і
эканамічнае развіццё беларускіх земляў ВКЛ. Праблемы
Рэфармацыі праз распаўсюджаны тут з сярэдзіны XVI ст. ў
кальвінізм; пра першае з’яўленне вестуноў Каталіцкай
Рэформы — езуітаў і іхнія школы; пра першыя праваслаўныя
пераклады Святога Пісання, выдадзеныя кальвінскімі
арыянскімі друкарнямі; пра з’яўленне праваслаўных брацтваў
(аўтар лічыць іх *“увасабленнем рэфармацыйных ідэяў
праваслаўі”*, с. 231); нарэшце, пра Берасцейскую унію і спробу
вывесці Рускую Царкву з крызісу і пра раскол грамадства, які
яна за сабой пацягнула, даўшы штуршок да рэлігійнага, ды не
нацыянальнага самавызначэння. Апошняму аспекту
прысвечаны спецыяльны параграф пад красамоўнай назвай
“Дзве культуры аднаго народу” (сс. 246—254), у якім Генадзь
Сагановіч аддае традыцыйную даніну нараканням
каталіцызацыю і, адпаведна, паланізацыю шляхты ды
прэстыжу “рускай” мовы. Зандажныя спробы правесці
правамернасць аналагічнага стэрэатыпу на ўкраінскай
эмпірычным матэрыяле (Генрыка Літвіна [6] і мая [7]) паказалі,
што гэта — адзін з міфаў гістарыяграфіі XIX стагоддзя, што ў
пытаннях веры рэальнасць была нашмат больш
Тое самае датычыць і моўнай праблемы: структура
моўных іерархіяў, як пераканаўча паказаў Ігар
закранала хутчэй функцыянальныя абсягі ўжытку
мовы, а не яе сацыяльны прэстыж.

Так ці інакш, але драматычная танальнасць згадкі

Мінск, 1989. С. 44—45.

[6] Litwin H. *Catholicization among the Ruthenian Nobility and Assimilation Processes in the Ukraine during the Years 1569—1648* // Acta Poloniae Historica. 1987. Т. 55. P. 76—77 (пераклад на англ. мову: Litwin H. *Triumfy i porażki. Studia z dziejów Kościoła katolickiego na Rusi Koronnej w XVII—XVIII w.* / Pod red. M. Pawlaka, A. Rachuby, H. Litwina. Warszawa, 2000. S. 7—8).

параграфу авалодвае аўтарам, і два наступныя, значна большыя, раздзелы ягонай працы афарбаваны ў шэрыя тоны. Мяркуючы і стылістыка назваў: як і ў выпадку з *“Дзвюма культурамі…”*, яны набываюць алегарычнае гучанне. Так, раздзел IX носіць назву *“Ад велічы да заняпаду”* (храналагічна ён ахоплівае перыяд ад Дзімітрыяды да канца XVII стагоддзя), а апошні, дзесяты раздзел перагукаецца назвай (*“Цень расійскай гегемоніі”*) з аналагічным раздзелам кніжкі Анджэя Камінскага. Падзагаловак параграфаў гэтага раздзелу мае адценне трагізму: “Ад дэмакратыі

Зрэшты, мала вясёлага маюць і самі падзеі XVII–XVIII стагоддзяў, якія тут апісваюцца: войны, спусташэнні, людскія і матэрыяльныя страты, эпідэміі, голад, хаос разбурэнняў і бязладдзя, нашэсці чужых арміяў і ўласных рабаўніцкіх хеўраў, татальная дэструкцыя грамадства, нарастанне фанабэрыі і, нарэшце — паступовае раскладанне тых прынцыпаў “шляхецкай дэмакратыі”, якія здаваліся беларускім шляхцічам такімі непарушнымі ў момант аб’яднання Вялікага княства Літоўскага з Каронай Польскай. У апошнім пункце Саганович больш рэзкі ў ацэнках, чым Анджэй Камінскі. Паводле ягоных словаў (на маю думку, справядлівых), “*вольналюбівы шляхціч Рэчы Паспалітай, які яшчэ нядаўна з гордасцю лічыў сябе найсвабаднейшым грамадзянінам Еўропы, ператварыўся ў баязлівага фаната старых парадкаў*” (с. 302). На гэтым фоне лагічна нарастаў і крызіс шляхецкага парламентарызму: *“Грубым ціскам і тэрорам алігархаў супраціваліся падпарадкаванне соймікаў уласным мэтам, перапынены галасы шляхты ў зброю для барацьбы за гегемонію ў краіне”* (с. 316). Хто ў выніку выйграў — вядома.

Вынікі нядрэнна пачатага, а на пэўным этапе, здаецца, нават даволі паспяховага праекту беларускай гісторыі маюць у апошняй фразе сваёй кніжкі падводзіць так: *“Пра Беларусь і кроў магутныя суседзі перагарнулі апошнюю старонку гісторыі Рэчы Паспалітай. З яе канцом перастала існаваць і Вялікае Княства Літоўскае, а Беларусь была на доўгі час падпарадкавана частку Расійскай імперыі”* (с. 346).

У пасляслоўі Генадзь Саганович яшчэ раз звяртаецца да патрэбы

7. **Яковенко Н.** Нарис історії середньовічної України. Київ, 1997. С. 72–73.

8. **Шевченко І.** Багатоликий кордон. Україна між Сходом і Заходом. Нариси з історії Європи, кінець XVI — початок XVIII ст. Львів, 2001. С. 175—196.

9. **Максюта І.** Автограф Марії Габлевич. Львів, 2001. С. 175—196.

“гістарыяграфічна рэабілітаваць” Рэч Паспалітую, настойваючы на тым, што для беларусаў яна была такой жа сваёй, як і для палякаў, аб’ядноўваючы ўсіх грамадзянаў паняццямі айчыны і свабоды. І ў гэтых “уроках свабоды”, на думку аўтара, хаваюцца тыя галоўныя каштоўнасці, якія беларусы маюць вынесці са сваёй гісторыі. Працу, як і належыць дыдактычнай манаграфіі, завяршае апеляцыя да функцыяў гісторыі як *magistra vitae*. Гэта гучыць па-старамоднаму наіўна, але ў гэтым выпадку не раздражняе. Бо кожны гісторык на свой лад ідэалізуе прадмет апісання — ужо самім фактам яго вычлянення з неабсяжнай плыні мінуўшчыны. І ў гэтым сэнсе ідэалізацыя “свабоды” нічым не горшая (і, прынамсі, больш шляхетная) за любы іншы фантом уяўлення. Таму пагодзімся мы з такой пазіцыяй ці не, але ж мусім прызнаць, што Генадзь Сагановіч, аўтар кніжкі пра “невядомую вайну” [9], прапанаваў нам чарговую “невядомую” гісторыю — Беларусі.

Пераклад з украінскай мовы Сяргея Петрыкевіча

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (24) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/02/18**
[image]

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (24) – 2003**
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
[image]
[image]

незанятую нішу. Хоць жа спробы падобных аглядаў, безумоўна, ёсьць. У незалежных выданьнях гэта найперш працы Валянціна Акудовіча (“Уводзіны ў Новую літаратурную сытуацыю. Лекцыі да Беларускага Калегіюму” [1]) і Юрася Барысевіча (“Цела і тэкст”, “Кароткая гісторыя Бум-Бам-Літу” [2]). Гэты раз і тэкст шаноўныя людзі напісалі прыгожыя, нават захапляючыя кнігі ды артыкулы пра сучасны беларускі авангард, і пры гэтым ніхто стварылі ці ня самыя яркія авангардныя творы. Асабіста я не знаходзіў у літаратараў і ў творах, дасьледаваных імі, тых глыбокіх сэнсаў і тых повязяў з самымі сучаснымі сусьветнымі мастацкімі плынямі, якія былі раскрытыя і паказаныя спадарамі В. Акудовічам і Ю. Барысевічам. Але гэта, мабыць, мой недахоп, пра што — крыху пазьней.

Спадар Барысевіч разглядае творчасьць сяброў Таварыства вольных літаратараў як прыклад шызапісьма ў літаратуры (с. 21) ці, часам, як сыравіну для літаратурнай “машыны жаданьня”. Што “шызааналіз”, што “машына жаданьня” — тэрміны філёзафаў-постмадэрністаў Ж. Дэлёза і Ф. Гватары, якімі яны карысталіся дзеля крытыкі структуралізму, фрайдызму, тэорыі капіталістычнае вытворчасьці К. Маркса. Разглядаючы свабодную (найперш ад абцугоў розуму, як таго патрабуе шызапісьмо) творчасьць беларускіх літаратараў як праяву рэвалюцыйнае дзейнасьці (у тым сэнсе, які ўкладалі згаданыя Дэлёз і Гватары), сп. Ю. Барысевіч, як мне здаецца, робіць неаспрэчна актуальны ўчынак. Ён арганічна злучае разуменьне сучаснае беларускае літаратурнае сытуацыі з паняцьцем постмадэрну. Постмадэрн сёньня ці ня самы спрэчны і цьмяны філязофскі і культуралягічны панятак, што мае неймаверную колькасьць розных азначэньняў (стан ведаў у найбольш разьвітых сучасных грамадзтвах, інтэлектуальнае стыхійнае бедзтва на тле поўнага разбурэньня рацыяналізму, чарговы філязофскі міт і інш.). Прычым гэта досыць “модны” панятак, які выкарыстоўваюць дзе трэба й дзе ня трэба. Не займаючыся разборам тонкасьцяў гэтае культурнае зьявы (на гэта ёсьць спэцыяльная літаратура), маем зазначыць, што якраз у працах Ю. Барысевіча постмадэрнісцкі кірунак шызааналізу, які ён абраў для дасьледаваньня, прасочваецца дастаткова пасьлядоўна. Што не заўсёды можна сказаць пра іншых крытыкаў беларускай літаратуры, якія бяруцца выкарыстоўваць панятак постмадэрну. Напрыклад, С. Балахонаў у артыкуле

[1] **2000. № 3—4.**

[2] **Барысевіч Ю. Цела і тэкст. Менск: БГАКЦ, 1998; Крыніца. 2001. № 10. С. 4—40.**

[3] **ARCHIV. №1. 2002. С. 180—182.**

“Зноў пра кляты постмадэрнізм” [3] не шкадуе месца для пералічэньня мадэрністаў-постмадэрністаў (не праводзячы між імі, дарэчы, мяжы) і пакідае пры гэтым само азначэньне постмадэрну адкрытым і нявызначаным, выкарыстоўваючы агульныя і, праўда, патрыятычныя фразы (*“мала проста назвацца постмадэрністам, трэба ім быць”*, *“сапраўды, постмадэрнісцкія творы ў Беларусі, безумоўна, ёсьць…”* — далей ідзе пералік твораў і *“імёнаў, прыведзеных наўскідак”*). Прытым што вычарпальнае і кароткае азначэньне постмадэрну практычна немагчымае, а таксама пры тым, што ўзровень філязофскай адукацыі пэўнае часткі нашае творчае эліты выклікае некаторы сумнеў (з прычынаў, ніяк не залежных ад самой эліты: добра, калі дзесяць гадоў мінула, як выкладчыкі, якія іх вучылі, самі зразумелі, што такое постмадэрн), падобнае лёгкае абыходжаньне з тэрмінамі, не падмацаванае тэорыяй, выклікае пэўную трывогу. Нават калі артыкул накіраваны на справу высакародную і годную кожнага беларускага літаратара — на крытыку Данілы Жукоўскага. Бо для шараговага чытача, нават аматара крытычных артыкулаў, можа застацца нявыснай мэтодыка выбару наўскідак.

Што да спадара Акудовіча, то ён якраз вельмі прыстойна тлумачыць чытачу, што такое гэты постмадэрн (згаданыя “Ўводзіны…”, с. 222—226). Першыя ж старонкі пераконваюць чытача ў тым, што постмадэрн — гэта сытуацыя, якая ўзьнікла на тле разьвязваньня ўнівэрсальных “вузлоў” і адсутнасьці нейкага стрыжня [4] — у мастацтве, напрыклад. Але потым, зьвяртаючыся да аналізу постмадэрну ў Беларусі, аўтар міжволі пачынае шукаць праяваў постмадэрну ў беларускай культуры, абапіраючыся на блізкую стылістыку разгляданых ім твораў, ствараючы тым самым з постмадэрну нейкі стрыжань, пэўны “вузел”, да якога падыходзяць/не падыходзяць тыя ці іншыя творы (с. 226—227: *“Што да “літаратуры”, то эстэтыка постмадэрну спачатку “выгукнулася” праз тэксты рок-кампазыцый; праўда, па-за “тэхнічнымі прыёмамі” гэтыя тэксты наўрад ці можна лічыць постмадэрновымі…”*; с. 227: *“Але, бадай, толькі Ігар Сідарук… дэманстраваў тады сваю натуральную прыналежнасьць да дыскурсу постмадэрну”*). Прыклад, як пісаць постмадэрновыя тэксты, вызначаны сп. Акудовічам без далейшых удакладненьняў (с. 233:

“Традыцыйны тэкст — гэта калі кажуць пра нешта ўсур’ёз, постмадэрновы — калі гэтую сур’ёзнасьць перадражніваюць.”). А адсутнасьць разьмежаваньня постмадэрновых і мадэрновых твораў паказвае пэўную павярхоўнасьць ягонага выбару постмадэрновых тэкстаў.
Такі падыход, выяўлены спадарамі С. Балахонавым і В. Акудовічам, на маю думку, навязвае нейкі стэрэатып. Постмадэрн выступае як нешта акрэсьленае і моднае, усім зразумелае і што ўжо тым-гэтым выкарыстоўваецца напоўніцу альбо часткова, у той час як застаецца адкрытым пытаньне, па якім крытэры да ліку постмадэрновых можна **не** далучаць пэўных тэкстаў. В. Акудовіч ушчыльную падыходзіць да высновы, што асаблівасьць постмадэрновага тэксту — гэта спалучэньне арыентаванасьці на масавага спажыўца на першым узроўні (лёгкасьці ўспрыманьня для чытача) са складанымі сымбалямі і “кодамі” на другім узроўні тэксту, дабрацца да якога чытач можа толькі праз пэўныя інтэлектуальныя намаганьні. Але вышукі постмадэрновае мовы ў творах бум-бам-літаўскіх аўтараў асабіста мне, прабачце, падаліся прыцягнутымі за вушы. Я не знайшоў менавіта першага — простай, арыентаванай на масавага чытача формы твору (але, магчыма, я памыляюся і мяне абвергне вось гэтае аўтарскае сьведчаньне: *“У 1999 годзе ў рамках акцыі “Час. Прастора. Асоба” я выставіў пяць вялізных прац, аздобленых уласнай крывёй. Усе былі перапалоханыя. Людзі падыходзілі да карцінаў і падалі трупікамі. Зь іх рознакаляровых вачэй тырчалі пікі. Я адчуваў сябе дыктатарам з Чылі, які залівае ў рот сьвінца юпень. Ша!”*— Вішнёў З. Трап для сусьліка... // Крыніца. 2001. № 10. С. 114). Іхная літаратурная творчасьць якраз найбольш падыходзіць пад азначэньне “мадэрн” у тым яшчэ сэнсе — пачатку мінулага стагодзьдзя, калі літаратары імкнуліся вызваліцца ад звыклых формаў і ці не павальна бавіліся практыкамі, блізкімі да вар’яцтва (мусіць жа, заблізка прымаючы моднае тады меркаваньне аб пэўнай роднасьці геніяльнасьці і вар’яцтва і імкнучыся праз вар’яцтва падкрасьціся да геніяльнасьці — што модна і ў нашыя дні).

Постмадэрн, безумоўна, у эўрапейскай культуры стаўся прамым нашчадкам мадэрну пачатку XX стагодзьдзя, аднак ён якраз канстатаваў крызыс і канец авангардысцкіх

экспэрымэнтаў, паколькі яны на зьмену ўнівэрсаліям папярэдніх эпох прапаноўвалі свае, няхай вычвараныя перавернутыя старыя, але таксама ўнівэрсаліі. У постмадэрн за галоўны творчы прынцып бярэ *“рамонтны плюралізм стыляў і мастацкіх праграм, сьветапоглядаў і мадэляў і моваў культуры”* [5], а значыць, і канец унівэрсаліяў. Таму менавіта рух Бум-Бам-Літ, як сьв арыентаваны на стварэньне ўласнае ўнівэрсаліі і які сам сябе зьмяшчаў у рэчышча авангарду, натуральным чынам застаецца па-за межамі постмадэрновае стылістыкі. Безумоўна, гэтай выснове пярэчыць Ю. Барысевіч, бо, пішучы пра Бум-Бам-Літ, ён заўсёды выдзяляе той самы радыкальны плюралізм у эстэтычных арыенцірах творцаў руху. На жаль, гэты плюралізм знаходзіць сябе выключна ў крытычна-мэмуарных тэкстах сп. Барысевіча, бо з усяго, што асабіста мне трапляла на вочы з бум-элаўскага, я не сустракаў нічога, што мела хоць бы дачыненьне да эклектызму, да масавай культуры, да кітчу ці кольвек абазнанай традыцыі, апроч традыцыяў эўрапейскага авангарду. Хоць, вядома, не магу не згадаць раман-трылёгіі Вішнёва “Прогулка среди звёзд” [6], дзе Злучаныя Штаты кіруе нашчадак расейскіх манархаў Пётра XXII, а нармальныя амэрыканскія героі змагаюцца з дыктатурай, раз нават сеўшы ў касьмічны карабель. Тут Вішнёў безумоўна арыентаваўся на масавага чытача, аматара фантастыкі, і, пэўна, ня быў супраць таго, каб у гэтай кніжцы адшукаўся які-небудзь таемны сэнс, але тады яшчэ не існавала руху Бум-Бам-Літ.

Апроч ББЛ, В. Акудовіч зьвяртаецца і да аналізу астатніх хоць крыху вядомых літаратурных рухаў і суполак, у тым ліку ўтвораных газэтамі і часопісамі. Такая шырыня ахопу цалкам апраўданая — у тлумачэньні да публікацыі ягоных лекцыяў у “Фрагмэнтах” аўтар сьцьвярджае, што *“асноўным аргумэнтам на карысьць публікацыі”* сталася адсутнасьць грунтоўных прац прафэсійных літаратуразнаўцаў пра стан сучаснай беларускай літаратуры. Пра характар сёньняшняе крытычнае дзейнасьці гэтых прафэсіяналаў мы паспрабуем сказаць колькі словаў, наколькі магчыма разглядаць яе абагульнена і сьцісла. Тут адразу заўважу, што аўтар апынаецца ў даволі складанай сытуацыі, бо зь першага погляду можа здацца, што па нашай тэме напісана і надрукавана даволі шмат, але гэтае “шмат” калі і друкуецца, то найчасьцей у малатыражных выданьнях

[5] **Современная западная философия. Минск: Выдавецкая школа, 2000. С. 282—283.**

[6] **Вишнёв Д. Прогулка среди звёзд: Пасьвяшчэньне: Раман-трылёгія. “Чытанка”, 1993.**

універсытэтаў, не дасягальных для жыхара правінцыі; а агульнарэспубліканскія акадэмічныя зборнікі “Сучасная беларуская літаратура” і “Сучасная беларуская літаратурная мова” перасталі існаваць яшчэ ў 80-я.

У першую чаргу, нельга абмінуць дастаткова фундамэнтальнай працы М. Тычыны “На павароце. Беларуская літаратура канца XX ст.” [7], якая можа бачыцца альтэрнатыўнай Акудовічавым лекцыям і якая выйшла пасьля іх. Спадар Тычына прапануе разгляд літаратуры канца XX стагодзьдзя чамусьці пасьляваенных гадоў, але паступова пераходзіць да авангардысцка-экспэрымэнтальных тэндэнцыяў у беларускай культуры 90-х. Тут аўтар зьвяртае ўвагу на *“пераклічку творчых пошукаў Алеся Разанава са школай сюррэалізму”*, В. Быкава і А. Адамовіча з экзыстэнцыялізмам. Разважаючы ж пра *“эпоху беларускага постмадэрнізму”,* сп. Тычына прыходзіць да парадаксальных высноваў. Пішучы, што постмадэрн уяўляе сабой трансфармацыю клясыкі, ён знаходзіць *“асобныя прыкметы постмадэрнісцкай сьвядомасьці”* ў... Францішка Скарыны і Міколы Гусоўскага (№ 9, с. 17). Галоўная ж хіба беларускага сучаснага постмадэрнізму — *“складанае перапляценьне розных творчых мэтадаў і стыляў”* і адсутнасьць *“акрэсьленага самастойнага вымярэньня”*. Гэта значыць, якраз тое, што сьведчыць пра неабходныя жыцьцёвыя ўмовы для постмадэрну. Што да прывязаньня да постмадэрнізму Скарыны й Гусоўскага, то застаецца толькі ўзрадавацца таму, што нашая паўтысячагодзьдзя апярэдзілі свой час.

Што да іншых характарыстык акадэмічнае крытыкі, можна заўважыць яшчэ адну акалічнасьць, за якую часам гарою стаяць крытыкі-прафэсіяналы. Калі чытаеш некаторыя навуковыя творы, часам складаецца ўражаньне, што агульнаэўрапейская рэвалюцыйная плынь у гуманітарных навуках канца XIX — пачатку XX стагодзьдзя абмінула беларускіх дасьледнікаў (тут я маю на ўвазе тую плынь, што ўзьнялася супраць пазытывісцкіх тэндэнцыяў у гуманітарных ведах). Яны (крытыкі) нярэдка дагэтуль карыстаюцца мовай і мэтадамі, характэрнымі для прыродазнаўчых ці матэматычных навук. Праз гэта літаратурны твор выглядае як труп, які трэба разгледзець, абмераць і пра які трэба пісаць выключна навукова, безэмацыйна, рацыянальна. Атрымліваецца нейкае

[7] **Родная слова. 2001. № 4, 6, 9.**

[8] **Беларуская літаратура. 2001. № 1. С. 95—100.**

абезжыцьцёўленьне твору, у той час як відавочна, што літаратура мае жыцьцёвую, экзыстэнцыйную аснову. Безумоўна, разглядаючы нейкі твор, крытык імкнецца знайсьці ў ім пэўную структуру, як нам гэта радзіць, напрыклад, І. Кухарава ў артыкуле “Схема аналізу мастацкага твору” [8]. Пляны разбору лірычнага верша, характарыстыкі мастацкага вобраза-пэрсанажа і інш. тут складаюцца з шэрагу выразна акрэсьленых пунктаў, чым вельмі нагадваюць адну вядомую ўсім наведнікам мясных крамак карцінку з тушай сьвіньні, падзеленай на пранумараваныя часткі.

Яшчэ адна ўласьцівасьць некаторых прафэсійных літаратуразнаўчых артыкулаў у тым, што беларускія літаратурныя плыні і здабыткі прывязваюцца да нейкіх працэсаў у літаратуры іншых рэгіёнаў, вызначаных як паралельныя. Гэта даўняя традыцыя. Сучасным жанрам аднаго з апатэозаў такіх прывязак, думаю, можна назваць артыкул спадарыні С. Ганчаровай-Грабоўскай “Тэндэнцыі развития русской и белорусской драматургии конца XX века” [9]. Памылковаю будзе думка, што дасьледніца імкнецца знайсьці супольныя для беларускай і расейскай драматургіі XX стагодзьдзя тэндэнцыі. Не. Яна спачатку называе хрэстаматыйную тэндэнцыю, а потым ілюструе яе матэрыялам з расейскай і беларускай літаратураў (ледзь ня частая фраза: *“как в русской, так и в белорусской драматургии”*). Складаецца ўражаньне, што альбо беларуская драматургія шчыльна прывязаная да расейскай і ня можа існаваць асобна, альбо яны абедзьве знаходзяцца ў адной сацыякультурнай сытуацыі, чаму не перашкодай ані сувэрэнітэт дзьвюх гэтых краінаў, ані ўнікальнасьць нацыянальных традыцыяў, ані розьніца сацыяльна-палітычнага ладу.

Каб усё ж пры канцы дадаць гэтаму крытычнаму артыкулу адценьне аб’ектыўнасьці і аптымізму, пагодзімся з доктарам філялёгіі зь філфаку БДУ спадарыняй Л. Сіньковай, што збольшага *“канцэптуальнае асэнсаваньне сучаснай беларускай літаратуры дазволіла навукоўцам выявіць асноўныя тэндэнцыі і заканамернасьці…”*, каб прызнаць, што *“вынікі даследаванняў надзвычай важныя для стварэньня агульнай гісторыі беларускай літаратуры”*, і каб узрадавацца іхнаму спрыту, *“…”* [10].

---

[9] **Грабоўская С.** **Тэндэнцыі развития русской и белорусской драматургии конца XX века** // **Веснік БДУ. 2002. Сер. 4. № 1.**

[10] **Сінькова Л.** **Беларуская літаратура** // **Веснік БДУ.**

2001 годзе яны зрэшты “*актыўна* ***пачалі*** (выдзелена мною — **А.Б.**) *распрацоўку тэм, зьвязаных з вывучэньнем нацыянальнай літаратуры ў агульнаславянскім, агульнаэўрапейскім і сусьветным кантэкстах”* [10]. Нам жа, літаратарам і аматарам крытычных артыкулаў, застаецца чакаць зьяўленьня яшчэ больш фундамэнтальных і глыбокіх прац у новых незалежных і абноўленых дзяржаўных часопісах, каб іх прачытаць і раскрытыкаваць.

2001. Сэр. 4. № 2. С. 26–28.

---

[4] Відавочна, тут неабходна патлумачыць, што гэта такое, праз сам тэкст сп. Акудовіча: “Увесь папярэдні досьвед цывілізацыйнага чалавека, незалежна ад таго, на каштоўнасьці якога кшталту ён абапіраўся (гуманістычнага ці негуманістычнага), фармаваўся вакол нейкай адной цэнтрапалеглай унівэрсаліі. Гэта значыць, што ўсё рэальнае і памысьленае чалавекам завязвалася на адзін нейкі вузел, які і забясьпечваў цэласнасьць уяўленай сьветабудовы і адпаведна пэўнасьць чалавека ў гэтай цэласнасьці. І хаця раз-пораз гэтыя вузлы “перавязваліся”, але прынцып заставаўся тым самым, незалежна ад таго, якой лёгацэнтрычнай унівэрсаліяй сашчэплівалася ў нешта адзінае ўся множнасьць бытнага (татэмам, Богам, эвалюцыяй, звышчалавекам, гістарычным матэрыялізмам ці камунізмам). Гэты прынцып унармаванасьці бытнага ў той ці іншы “глябальны цэнтар” сыстэмна распаўсюджваўся і на кожны лякальны фрагмэнт быцьця, які гэтаксама структураваўся шматлікімі цэнтрапалеглымі інстытуцыямі: дзяржава, сям’я, іншыя грамадзкія, ідэалягемныя, рэлігійныя супольнасьці і г.д., і да т. п. Адным словам, увесь папярэдні вобраз мысьленьня, як і вобраз практыкі чалавека, быў лёгацэнтрычным, трымаўся і мацаваўся ў цэласнасьці мноствам унівэрсальных вузлоў і вузельчыкаў, якімі, згодна канвэнцыйным дамоўленасьцям, зьвязваліся ў адно цэлае хаатычна разбэрсаныя фэномэны бытнага”. (Акудовіч В. Уводзіны ў Новую літаратурную сытуацыю. Лекцыі да Беларускага Калегіюму // Фрагмэнты. 2000. № 3—4.) С. 222—223.Назад

[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/02/18
[image]

Наталка Бабіна

Словы, якіх я чакаю Берасьцейскія апавяданьні

Наталка Бабіна — літаратарка. Нарадзілася ў Заказанцы (Берасьцейшчына). Жыве ў Менску. Піша па-беларуску і ўкраінску. Сталая аўтарка газэты “Наша Ніва”. Апошняя яе публікацыя ў часопісе “ARCHE” — эсэ “Тут была Ўкраіна” (“Украінскі нумар”).

1. Дзе тут Руская вуліца?

Усё чымсьці вяртаецца. Ты жывеш — і жыцьцё вяртаецца сьмерцю. Права валодаць вяртаецца абавязкам слухаць бясконцыя скаргі.

У мяне дзьве вёскі — Страдчэ ды Кастамалоты, і кожны раз, кожны раз трэба разьбіраць скаргі.

Цёмна ў лістападзе. Цёмна раніцай, цёмна ўдзень, а як ужо цёмна ноччу… Такой самай парой памёр бацька. Колькі ж часу прайшло? Ну так, тры гады. Ён так і не прыйшоў у змыслы: у бяспамяцтве сарваў з раны павязку, і кроў, што ўжо была запяклася, ізноў пабегла цурком. А брат памёр яшчэ раней. Нечакана для ўсіх. Я зрабілася спадкаемніцай.

Я атрымала спадчыну — мне пашанцавала. Але ж я і падвоіла яе. Так, я скнара. У мяне няма такіх боцікаў, карункаў і футраў, як у Копцевых дзяўчат, я не замаўляю дарагіх кніг ды іконаў, як войтава пані. Я нават пашкадавала грошай на мілоснае

зельле, калі хацела прывярнуць да сябе Бартлуша. Ну і што? Нашу свае сукні і чобаты па пятнаццаць гадоў, ня трачу грошай на хну і ружовае масла — але ж і Бартлуш мой.
“Вы, пані, уваходзіце ў пару росквіту і сьпеласьці”, — казаў мне пазаўчора вялебны айцец Васіль аксамітным голасам, але ятку на рынку я яму не аддала. Хай Госпад Бог выбачае, грошы мне патрэбныя ня менш, чым яму.
Дый хітраваў бацюшка. Які тут росквіт! Часам адчуваю сябе зусім зьнясіленай і старой. Зубы хістаюцца ў дзяснах, а пазаўчора выпалі два кутнія. Што дзень, то мацней пячэ ў грудзёх... Дый ніколі не была я прыгажуняй: бацька лічыў, што я “не ў пароду” — беласкурая, з тонкімі губамі, носам з гарбінкай і сівымі вачыма.
У кутняй вежы на самым версе засьвяціўся агеньчык. Так дамоўлена. Бартлуш — афіцэр, вартуе замак, а для мяне запальвае паходню. І праз акно я бачу са сваёй пасьцелі агеньчык — адзіны агеньчык у сьвеце аж да раніцы, пакуль не прыкоціцца ў горад досьвітак, пакуль не заваладарыць над Бугам гейнал, пакуль не паўцякаюць у свае цёмныя норы чарты, пакуль не зашамаціць сухая асака на балотах пад сьветлым ветрам раніцы, пакуль новы дзень ня прыйдзе ў славе, у зьзяньні халоднай зары… А пакуль ноч, і ў пакойчыку на самым версе вежы цёплы агонь асьвятляе аблічча Бартлуша: белыя валасы, карункавы каўнер, чорныя буфы рукавоў...

Як ён там дае рады з вартавымі, Бог ведае: “Іх бін, дас іст…” Я яго калі разумею, калі не. Знайшоў сабе кватэру не сярод сваіх на Нямецкай, не ў трывалых камяніцах на Замкавай або Прыёрскай, не сярод прасторных новых садоў на Налозках або Пясках, а на ўскраіне, на далёкай Рускай вуліцы. Але, праўда, там таньней. Там мы і сустрэліся. Бо я таксама хаджу на Рускую — купляю імберац ды перац без нацэнкі магістрату. Гандляры з Рускай бяруць і швайдніцкія паўгрошы, абы ніхто ня бачыў. У Бартлуша швайдніца ёсьць. Наагул, такіх дзіўных манэт, як у яго, у Берасьці няма, мусіць, ні ў кога. Папаезьдзіў па сьвеце, няма што й казаць. Калі ён упершыню прыйшоў у нашу ятку ды выклаў сваё срэбра, мой Начко нават ня здолеў выбраць ніводнай манэты — усе яны былі яму незнаёмыя. Выправіў немца на Гнілую да жыдоў, каб каторы памяняў яму грошы...

Звычайна Бартлуш сыходзіць, калі яшчэ цёмна.
Ля люстра гарыць каганец, Бартлуш стаіць у белай кашулі. Колькі разоў так было? З маёй пасьцелі відаць, як ён бярэ ў руку шаблю, спрабуе вастрыню. Каменная падлога халодная, але ён на гэта не зважае, спакойна стаіць босы, як на цёплай зямлі.
Кашуля кароткая, і я бачу, як стройныя моцныя ногі пакрываюцца гусінай скурай. Стройныя моцныя ногі. Нешта сьціскае мне горла. Шабля. Цёплыя моцныя ногі, валаскі стаюць стырма ад холаду. Ён не памрэ сваёй сьмерцю. Бацька не памёр сваёй сьмерцю. І муж мой таксама. Ніхто ў нашых краёх не памірае сваёй сьмерцю, толькі наглай... Я заўсёды сама праводжу Бартлуша і засоўваю дзьверы.
І сёньня ў доме халодна. Холад залазіць пад пярыну, я падціскаю яе пад сына, які сьпіць побач. Адразу пасьля гейналу Раіна прыходзіць распальваць грубку. Яна асьцярожна, каб не пабудзіць нас, апускае на падлогу бярэмя дроў. Але я ня сплю. Разгараецца агеньчык, сьвятлее за замерзлым акном, я ўжо бачу пару ад свайго дыханьня. Пачынаецца бразгат на кухні. Зараз трошкі пацяплее — і я ўстану, падыму і апрану сына, мы сыдзем уніз.
Нітачкі на зрэбным каптанчыку Ляўка, да панчошак прыстала гліна... Такія дні, як сёньня, не канчаюцца дабром — дні, калі я бачу ўсё настолькі падрабязна, што ня бачу нічога цэлым. Трэска на падлозе, камяк бруду, вышчарбленая цагліна, крыжык, выпалены сьвечкай над акном, — сьвет распадаецца ў вачох... Трэба выпіць сьвячонай вады з Пачаева, трэба мацней абняць сына. Нельга гэтаму паддавацца, у мяне многа спраў. Ляўко варушыцца і расплюшчвае ясныя вочкі.
На сьняданак, як звычайна, — ячная каша і невялічкі сом. Рыба паруе на дошцы. Бяру сабе і сыну найлепшы кавалак, і Раіна адносіць дошку на другі стол, дзе сьнедае прыслуга. Сабе яна налівае юшкі. У Берасьці самоў любяць, але мне гэтая рыбіна тхне балотам, і дзеля мяне Раіна ноч вымочвае яе ў воцаце. Я кармлю Ляўка рыбай, вымаю костачкі. А кашу ён вельмі прыгожа есьць сам — трымае лыжку жменяй.

Сёньня мне трэба дзе-куды праехацца. Для ўсіх — у вёскі. Адна толькі Раіна ведае, куды, і чаму я паеду адна, без фурмана. Раіна наагул шмат пра мяне ведае — як і я пра яе. Вялебны

айцец Васіль, калі зразумеў, што грошай я яму ня дам, пачаў быў: “У вашым доме жыве гэтая распусьніца, з пазашлюбным — гэта ні для кога не таямніца — дзіцем. Як вы можаце такое трываць?..” — “Глядзіце лепш за сваімі папамі, ойча! А то каторы зь іх не адну жану мае, але і дзьве, і тры. Вось што сапраўды ні для кога не таямніца!” Айцец Васіль надзьмуўся, як рапуха, і хутка сышоў. Цяпер вораг. Знайшоўся мне — вораг! Я апранаюся, сядаю ў вазок і бяру лейцы. Раіна хрысьціць мяне ў дарогу. Ляўко зь ейнай Пяланькай б’юць лёд на калюжах. Ён нават не аглядаецца, калі мама выяжджае за вароты.
А што адна, дык нічога, ня страшна. Гэта пазьней, бліжэй да Калядаў, пацягнуцца па дарогах галодныя, з апухлымі дзецьмі, з памарожанымі тварамі, са скаргамі і енкамі... Тады без фурмана нікуды. А пакуль на дарогах пуста. Але ж весела будзе, калі сёньня выпадзе сьнег. Як я тады дабяруся назад? Маразы добра высушылі зямлю, на вуліцах і нават на рынкавым пляцы няма бруду. У месьце віруе гандаль. І людзі, і чарты сьпяшаюцца сюды па зыск, нават калі ёсьць рызыка замест зыску атрымаць сьмерць.
Ля ратушы перад маім вазком вуліцу пераходзіць войтава. Ледзьве хітае галавой у адказ на мой паклон. Старая галагузая курыца! Я ведаю, што яна пра мяне кажа за вочы. Ня знаю яшчэ як і калі, але ж я ёй аддзячу.
Праз рынак, куды толькі сыходзяцца купцы, паўзь Мікалаеўскую царкву, пад Замкам я выяжджаю зь места. Трохі затрымалася на мосьце, дзе бяруць мыта з вазоў, што рыпяць у горад. За мостам ізноў давялося тпрукнуць — насустрач ішлі хаўтуры. Хаваюць пана Копця. З Валынкі яго вязуць у Сімяонаўскі манастыр. Немалыя грошы ахвяраваў ён манахам на шпіталь за тое, каб яго і ягоных нашчадкаў хавалі ў сутарэньнях царквы. За таўшчэзнымі непарушнымі сьценамі ў каменных трунах пад вечныя малітвы дачакаюцца памерлыя Копці сурмаў страшнага Суду. Раіна кажа, што сустрэць хаўтуры — добрая прыкмета, а маці заўсёды баіла: гэта дрэнна, асабліва калі выпраўляешся ў дарогу. Каму верыць?
Скончыўся горад, за Валынкай дарога матлянулася да Буга і пабегла абалоньню. Хоць я і цёпла апранутая, але ўсё адно прабірае холадам, асабліва па нагах. Пальцы наагул зьмерзьлі, я варушу імі, пастукваю чобатам у чобат.
Можа, не найлепшы дзень я выбрала, але ехаць мусова. Справа

ў тым, што я гандлюю півам. Не я сама, вядома, а стары Начко ў маёй ятцы на рынку прадае піва, якое варыць Раіна. Дазволу рады на гэта ня маю. Калі паны радцы мяне прыловяць, дадуць штрафу. Але пакуль не прылавілі, і гаршчок зь пенязьмі, паўграшамі, шэлегамі і грашамі, поўны, як вока, стаіць пад нагамі. Ёсьць у ім трохі і буйной манэты. Накрыўка ягоная шчыльна абмазаная воскам, каб не зацякла вада. Пакуль шафары не пацягліся ад дзьвярэй да дзьвярэй па падаткі, я хачу адвезьці ды закапаць “піўныя” грошы пад адной такой прыкметнай хваінай. Яна расьце на пагорку, куды не даходзіць вада ў паводку, не пры дарозе, але й ня ў лесе, і, самае галоўнае, пад яе каранямі ўтварылася нара, куды лёгка можна схаваць гаршчок. Калі закрыць гальлём ды ігліцай — і знаку не застанецца. Хай ляжыць тут, гэта надзейней, чым трымаць у доме. Увесну забяру.

Ружовы межавы камень Вуцявага лесу. Тут. Я прывязваю коней да вольхі. Нідзе нікога. Толькі хвоі шумяць над галавой. На ўстылай зямлі, на моху не застаецца сьлядоў. Раптам сэрца маё абмірае: з-за альшыны выглядае белая жанчына ў высокай намітцы, а на плячы ў яе каса... Але не, гэта толькі гульня халоднага сонца і ценю. Яшчэ раз пільна агледзеўшыся, хаваю гаршчок у нару, закладаю яе гальлём і вяртаюся да коней. Усё, справа зробленая.
Ці не заехаць цяпер у Страдчэ? Паўдарогі ж ужо праехала. Пабачу, што там і як, — лішні раз не зашкодзіць. Ці абмалацілі, як загадала, маё жыта?
Ля страдэцкай царквы — натоўп людзей. Няўжо зноў?!
А, халера! От ужо колькі гадоў няма мне спакою, бо ў Кастамалотах служыць дзейны і разумны ўніят Ігнат Гогаль, а ў страдэцкай царкве — такі ж разумны і дзейны схізматык Восіп Балабан. А вёскі — цераз Буг гадзіна хады. І б’юцца, б’юцца бясконца, навяртаюць адзін аднаго ў правільную веру. На тамтыя Гогаты кастамалоцкія так пабілі страдэцкіх, што адзін памёр (а быў здатны работнік). А страдэцкія на Івана загналі кастамалоцкіх у млын і падсеклі палі. Дык сьцены паваліліся, і млынарскі струмант пабіўся. Усё на мяне, на мае грошы растрата. Колькі разоў папярэджвала, каб сьціхлі ўжо, — але зноў за сваё! Ну ж, чакайце!
Мяне заўважылі: мужыкі, якія з кіямі ў руках стаялі дзьвюма

чорнымі кучамі, паздымалі шапкі і ўкленчылі, а папы засьпяшаліся насустрач.
— Міласьцівая пані, — завёў Балабан, — абарані верных ад напасьці і гвалту...
Кароткай сваёй пугай сьцебанула я, саскокваючы з фурманкі, і Балабана, і Гогаля. Гэта ў мяне ад бацькі — калі што не па-мойму, я шалею ўмомант.
— Я цябе абараню! Я ня буду глядзець, хто тут уваскрослы Налівайка, а хто па паводзінах купец!
Пуга лётала ўва ўсе бакі. Папы кінуліся прэч, а за імі і мужыкі.
— Вы ў мяне навучыцеся маліцца, я вам дам і сымбаль, і догматы!
Мужыкі беглі хавацца. Гогаль пырснуў у кусты, а Балабан, не азіраючыся, подбегам — за плот. Страдэцкі стараста Яраш, добра ведаючы, што я хутка супакойваюся, туляўся воддаль, не ўцякаючы, але й не падыходзячы бліжэй. Ягоныя босыя ногі пачырванелі, а валасы, пастрыжаныя ў скобку, раскудлаціліся. Нос ён падціраў шапкай.
— Яраш, гад халерны! Цэрквы дзеліце? А жыта, што на тым тыдні трэ везьці будзе, змалацілі?
— Усё, пані, змалацілі, заўтра павязём. Жыта ўсё ў сьвірне, як сьляза, чыстае! Не сварыся!

— Ня вартыя міласьцівай пані такія паводзіны! Недаравальна падымаць руку на слугу Божага, у прысутнасьці паствы тым больш. Я буду скардзіцца ў суд! — вылез з-за плоту Балабан, бачачы, што справа суцішылася.
— Хоць каралю! А калі яшчэ раз збунтуеш сяло, прыеду з вартай, зьдзяру зь цябе порткі і такіх кіёў дам, што дупа запухне! Помні гэта!

* * *

Забавілася я ў Страдчы. Задурылі галаву вучоныя папы. Калі сядала ў фурманку, сонца ўжо стаяла над самым лесам. Яраш насылаўся быў ехаць са мной, але я адмовілася. І неўзабаве пашкадавала. Чырвоны пас за Бугам згасаў. Цемра падымалася ад зямлі да сіне-зялёнага неба хутчэй, чым беглі стомленыя за дзень коні, белы месяц наліўся золатам, а холад упаў такі, што я ўжо не адчувала пальцаў ні на руках, ні на нагах. Вострыя зоркі замільгалі над сьветам. Зьнямелымі рукамі я ледзь

трымала лейцы.
Месяцовае сьвятло заліло дарогу, цень, густы, як пустата, хаваўся пад дрэвамі. Калі да Валынкі было зусім блізка, коні раптам сталі. Не выпускаючы лейцаў з рук, я прыўзьнялася. На ўзбочыне ляжаў чалавек. Здаецца, наш шафар Марцін. Здаецца, мёртвы. Мне падалося, што на шэрым паўкаптане Марціна я бачу чорныя плямы крыві. Зьлезьці паглядзець, мо жывы яшчэ? Але коні неспакойныя, хрыпяць, ірвуцца.
Марцін нібыта варухнуўся... Мы зь ім страшна пацапаліся летась: я не хацела плаціць падатку. Занятак у шафараў такі, што сварацца яны з усімі і ўсе зь імі... Дазьбіраўся. Пэўна, вяртаўся з падаткамі з Жукоў. Цяпер, у галодныя гады, ні за шэлег зарэжуць... А мо забойца не пасьпеў уцячы і цікуе мяне? Сэрца маё захаланула. І тут раптам ля дарогі, па левую руку, завыў воўк.
Коні рвануліся так, што я павалілася на лаву. Жах сьмерці гнаў іх. Выцьцё пачулася яшчэ і справа, і трохі наперадзе, і зьлева. Здавалася, ваўкі вылі па ўсім лесе пад кожным дрэвам. Раптам усё змоўкла. Я ведала, што гэта азначае: зараз зграя нападзе. Шэрыя камякі з вогненнымі вачыма і вострымі іклямі аблепяць коней... З маёй пугай ды сякеркай мне зь імі ня справіцца. Памерці, адчуваючы, як іклы рвуць тваё мяса!.. Загінуць, так і не пасьпеўшы дазнацца, навошта жыла і грашыла, так і не зразумеўшы, для чаго Бог дае жыцьцё і чаму яго забірае! Страх спляжыў мой розум, і сіла пакінула мяне.
— Там, там для вас пажыва! Там ляжыць чалавек! — закрычала я, тыцкаючы рукой назад. — Туды бяжыце, не чапайце нас! Туды, там ежа!..
Крык прапаў у цемрадзі. Выратаваць мяне мог толькі цуд. Коні ляцелі. Я зноў закрычала. Грукат капытоў, мой крык, маё рыданьне ды ваўкі на залітай начным сьвятлом дарозе.

2. Дождж у маі

Гэта мы. Сьветка Харчанка, Ленка Храмчанка і я, Жэнька Каршалюк, — неразводная тройца з 11-й “А”. Білеты мы купілі загадзя. А маглі б не купляць, Алег правёў бы нас і так. Але ж ён ня ведаў, што будзе тут дзяжурыць. І вось, за дваццаць хвілінаў да канцэрту, мы дысцыплінавана селі на свае месцы. Ленка, вядома, пасярэдзіне — яна ў нас лідэрка, усё самае лепшае — ёй. Алег, стоячы ў праходзе, незаўважна для астатніх

пасьміхаецца Ленцы. Яна прыгожая. На ейным тле губляецца нават вельмі сымпатычненькая Сьветка, а што ўжо пра мяне казаць з маім гарбатым носам і вуснамі, бы шчыліна ў паштовай скрыні.
Андрэй Каршалюк, які сёньня выступае, мой далёкі сваяк. Дзяды нашыя спалі на адным запечку, бацькі гулялі ў бэрыка на адной вуліцы, а я толькі зрэдку бачыла стрыечнага брата па тэлевізары. Але я лепш заб'юся, чым распавяду сяброўкам пра гэтае сваяцтва. Ленка пачне распытваць, зьдзіўляцца, пацягне за кулісы знаёміцца, запросіць яго да нас у школу...
— Добры дзень, дарагія землякі, — сьпявак старанна вымаўляў загадзя вывучаныя беларускія словы, падкрэсьліваючы сваю асаблівую блізкасьць да публікі ў залі. — Я вельмі рады сьпяваць сёньня для вас у сваім родным горадзе...
Ён ужо сярэдняга веку. Калі быў маладзейшы, казаў: "Не спрашивайте меня о Бресте. Родным городом для меня стал Ленинград, и я считаю себя ленинградцем. С Брестом меня ничего не связывает".
Сьпявак працаваў. Ён перайшоў на звыклую расейскую, жартаваў, расказаў колькі гісторыяў са свайго жыцьця ў Пяцербургу і Стакгольме, сьпяваў сваім і не сваім голасам, граў на піяніне. Пот ліўся зь яго ручаямі. Заля раз-пораз выбухала аплядысмэнтамі. Зрабілася душна.
Час ад часу ён не трапляў на верхнія ноты, але гэта яму даравалі:
Оглянуться нельзя, чтоб увидеть свой след…
И зовет меня город, которого нет…
Артыст — праваднік магічных гукаў. Вось чаму нават у нехлямяжых музыкаў натоўпы закаханых прыхільніц. Любяць не артыстаў, а магічныя гукі ў іх... Сьпявак закахаў у сябе залю. Але мне нешта перашкаджала паддацца гэтай магіі. Можа, голас крыві?
Сьціхлі авацыі, мы выйшлі на ганак. На захадзе гадавалася (цьфу-цьфу, каб не сурочыць) доўгачаканая хмара. Алег павёз нас дадому на патрульнай машыне. На новым мосьце мы павярнулі за Мухавец. Шырокая дарога бяжыць тут між пустак, гораў намытага з ракі пяску і хмызоў, дзе бегаюць фазаны; агні гораду адбіваюцца ў люстры ракі. Да мытні стаіць чарга. "Двое сутак стаяць", — сказаў Алег. Ён разьбіраецца, бо часам там дзяжурыць. Ужо каля самай Валынкі Алег рэзка тармазнуў, і я

далася лбом аб пярэдняе сядзеньне. Проста на шашы ляжала жанчына. П'яная. Брудная куртка, падрваныя чорныя панчохі. Яна спрабавала ўстаць, але з карачак ізноў валілася.
— Найлепшае, што для яе можна зрабіць, — пераехаць машынай, — сказала Ленка.

Мы прамаўчалі. Алег праз рацыю выклікаў патруль. Трэ было дачакаць, пакуль яны прыедуць.
Жанчына аціхла і не варушылася. Алег падняў торбачку, дастаў адтуль грошы, пералічыў і, памарудзіўшы, паклаў назад.
Да майго дому адтуль дзесяць хвілінаў хады, я разьвіталася і пайшла. Каб не трапляць у непрыемнае сьвятло фараў, спусьцілася з шашы на сьцяжынку ў дол. Над Валынкай плыў пах бэзу, але для вясновай ідыліі не ставала дажджу. Дажджы апошнім часам робяцца праблемай.
Бабуля чакала мяне, каб разам павячэраць. Калі бацькоў няма, мы не абцяжарваем сябе сэрвіроўкай. Патэльня са смалюхамі, міска капусты, дзьве лыжкі. Ямо з аднае патэльні, з аднае міскі. Калі я расказвала пра канцэрт, на вуліцы пачуўся ціхі шоргат, потым закапала са страхі.
— Дождж у маі? — спытала я. Бабуля ўсьміхнулася.
"Як дождж у маю, то агранома пах…ю", — звычайная бабіна вясновая прымаўка. Маці заўсёды злуе, калі чуе. Маці выкладае расейскую літаратуру ў школе і лічыць, што сьвякроўка яе дыскрэдытуе. Апатэозам гэтай дыскрэдытацыі быў выпадак зь песенькай.
Піянэры мусілі запісваць успаміны вэтэранаў пра баявыя і працоўныя подзьвігі, дзеля чаго цягаліся па хатах. Хрумстаючы грушамі, яны з захапленьнем выслухалі бабіну гісторыю пра аканома з Жукоў. Замалада бабуля разам зь сяброўкамі наймалася туды палоць гуркі. Малады аканом раз пажартаваў быў зь дзяўчат, прапанаваўшы засьпяваць разам новую модную песеньку.
"Навучу вас, — казаў. — Вам тшэба толькі рэпэтоваць:
"Я первша, я первша", а сьпеваць буду я...
— Дэшчык пада, покрапуе... — павольна, напеўна зацягнуў ён.
— Я первша, я первша... — туравалі дурныя дзяўчаты.
— Хто мне в дупу поцалуе? — хутка скончыў падступны аканом.
— Я первша, я первша..."

Песенька мела посьпех, дарма што з часу яе стварэньня мінула шэсьцьдзесят гадоў. Дні са тры ў школе толькі і чулася: “Дэшчык пада, покрапуе...” — і маці казала, што адчувае сябе вельмі няёмка, бо ўсе, канечне, ведалі, адкуль пошасьць.
Маці вельмі пакутуе, што вымушаная жыць разам з бабуляй, такой неадукаванай і цынічнай. На свой дом грошай у бацькоў няма, мусіць, таму маці вырашыла ўзяць хоць бы дачу, каб быць там гаспадыняй... Цяпер яна з энтузіязмам рыецца на дзялцы, пад самым Вуцявым лесам.
Бабуля пагнала мяне спаць. Сама яна сьпіць не распранаючыся, і, як бы рана я ні прачнулася, у печы будзе ўжо выпалена, сьняданак звараны, а яе я засьпею з матыкай на гародзе.

Зрэдку зь іншага краю Валынкі да бабулі прыходзіць дзед Міхал. Да апошняга ён хадзіў зімой і летам у кірзавых чобатах, але цяпер перайшоў на паношаныя красоўкі ўнука. Мяне ён шчыра не заўважае, а да бабулі заляцаецца — намагаецца то абняць, то ўшчыкнуць. Стоячы пад яблыняй, бабуля сьмяецца і адводзіць яго руку локцем. Яшчэ нядаўна да іхных сходак далучалася Волька Лёндан, або *Золота Мова*, якая даносіла да нас навіны Бі-Бі-Сі, але летась яна памерла. Красоўкі дзеду дасталіся ад унука, які служыў па кантракце ў Чачэніі дый загінуў там. Але пахавалі яго не ў Расеі, дзе ён жыў, а тут, у нас. Дзед Міхал не зьмяняецца, колькі я яго памятаю. Адно што красоўкі зьявіліся...
Сёлета мы сканчаем школу. Што мне рабіць далей — хвалюе нават бабу. Яна раіць пайсьці туды, дзе вырабляюць кілбасу або тарты. Бацькі бачаць мяне ў нашым пэдунівэрсытэце імя Пушкіна або ў тэхнічным унівэрсытэце на факультэце водазабесьпячэньня й каналізацыі, бо туды лягчэй паступіць. Ленка паедзе ў Менск, а Сьветка хоча ў мэдвучэльню.
Чаго хачу я — ня ведаю. Зрэшты, таго самага хоча і Бог. Дык вось, з гэтай дачай была прыгода. Маці знайшла там скарб. Хоць які там скарб — ня золата, не дыямэнты, нічога каштоўнага. Гаршчок ляжаў проста ў зямлі, і, капаючы грады, маці растаўкла яго рыдлёўкай. Там былі старыя срэбныя манэты, некаторыя ўшчэнт сьцёртыя, на іншых добра бачныя вастраносыя профілі каралёў, крыжы, віньеткі, вершнікі. Маці здала скарб дзяржаве. Ёй заплацілі нешта, і яна пахвалілася ў інтэрвію “Вячэрняму Брэсту”, што патраціла гэтыя грошы на

кнігі, патрэбныя ёй для заняткаў. Так і было. На дачы прыслалі мо роту салдатаў, якія пад кіраўніцтвам цывільнага тыпа ў акулярах зьдзерлі дзірван і перакапалі ўсё чыста, але нічога больш не знайшлі. Таму я была вельмі радая, што мне ўдалося своечасова схаваць ад усіх адзіную залатую манэту з гаршка. На ёй адціснуты ў поўны рост уладны чалавек з шабляй і ў кароне. Вельмі асьцярожна, каб ня даць ніякіх падставаў для падазрэньняў, па нумізматычным каталёзе ў бібліятэцы я спраўдзіла, што манэта мая завецца дукат, а рыцар з шабляй — кароль Жыгімонт III Ваза. Цяпер час ад часу я дастаю яе і разглядаю караля ды надпіс: 1592. Пра манэту ніхто ня ведае, нават Ленка са Сьветкай. Ня тое каб я ім не давярала, але... Сьветка, мусіць, яе не ацаніла б, а Ленка, наадварот, падняла б непатрэбны лямант, нарабіла б розгаласу, і, так ці інакш, урэшце манэту ў мяне адабралі б. А дукат і кароль — гэта толькі маё. Калі я ўглядаюся ў залаты, што трапіў да мяне зь зямлі, мне часам здаецца, што нехта хоча мне нешта сказаць, я амаль чую нібыта шэпт, нібыта крык... Часам я нават разьбіраю словы, але тут ці за акном гагаюць гусі, або заглядае маці і кажа, што ў мяне ў пакоі засьмечана, або прыходзіць баба, совае мне ў рукі кошык з расадай капусты і загадвае зараз жа аднесьці Міхалу. І я, схаваўшы манэту, махаю на гусей, або пачынаю зьбіраць з падлогі паперкі, або прымаю з заўсёды перапэцканых зямлёй бабуліных рук кошык і паслухмяна брыду па Валынцы. Садзіць капусту самы час. Сьвет пасьля дажджу круціцца вакол мяне і, памахваючы кошыкам, я думаю, што напарадзе ляжыць цэлае жыцьцё, якое б яно ні было.
У каталёгу пазначаны і актуальны кошт манэтаў. Згодна зь ім, мой дукат каштуе дастаткова, каб аплаціць навучаньне ў адной з тых шматлікіх шарашкіных канцтораў, якія даюць студыёзам “дыплём эўрапейскага ўзору”. Але я не прадам сваёй манэты. Я нашарую яе да яснага бліску, і, калі сонечныя — або, можа, месяцовыя — зайчыкі заскачуць па сьценах майго пакоя, кароль на рэвэрсе ажыве і павядзе доўгім носам, сто семдзесят сем камяніц гораду вытчуцца з паветра на месцы руін крэпасьці-героя і я нарэшце выразна пачую словы, што дагэтуль не магла разабраць. Словы, якіх я чакаю.

[image]
[image]

№ 1 (24) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/02/18
[image]

Леанід Маракоў

Мініятуры

Ня тое чытаў
Здаецца, добра вучыўся, ня быў хуліганам, маркі зьбіраў, фатасправай захапляўся, шайбу на двары да ночы ганяў, вершы прысьвячаў дзяўчынкам, процьму ўсяго перачытаў, асабліва фантастыкі, а ў піянэры прымалі адным з апошніх…
Можа, ня тое чытаў?

“І сарака пяці гадоў уга як хопіць…”
У любай маёй бабулі было пяцёра дзяцей: дзьве дзяўчынкі і трое хлопчыкаў.
Прыгожыя — як і сама бабуля — дачушкі памерлі ў маленстве ад дызэнтэрыі.
Сыны…
Старэйшага расстралялі ў дваццаць восем.
Сярэдняга забілі з-за рога ў сьпіну ў дваццаць дзевяць.
Малодшы загінуў у сорак чатыры.
Калі я ў свае юначыя гады чакаў сьмерці ў Гомельскім тубдыспансэры, выпадкова пачуў прысуд галоўнага доктара:
— А пункцыю ўсё ж дарэмна ўзялі, цяпер пасьля сарака пяці ён

— не жылец…
Між іншым, пісьменьнік Міхаіл Велер у сваім аповедзе “Туру” прыйшоў да высновы, што некаторым “і сарака пяці гадоў уга як хопіць…”.
У мяне засталося блізу двух гадоў. У прынцыпе, гэта нямала. Галоўнае, каб не арыштавалі, як дзеда ў трыццаць пятым. Каб не расстралялі, як ягонага старэйшага сына, майго дзядзьку, паэта Валер’я Маракова ў трыццаць сёмым. Каб не забілі, як ягонага сярэдняга сына, майго другога дзядзьку, настаўніка Леаніда Маракова ў сорак трэцім. Каб не заліло мазгоў крывёю ад бязьлітаснага біцьця, як у ягонага малодшага сына, майго бацькі…
Божа, дай мне два гады!

Дробязі
Сто марак. Роўна столькі пры канцы васьмідзясятых — на пачатку дзевяностых трэ было аддаць у Менску за “гасьцявое” запрашэньне ў Нямеччыну (тады з гонарам дадавалася: Заходнюю), спакойна браць білет на хуткі “Масква—Бэрлін” і махаць краіне ручкаю: “Да няхуткай сустрэчы!”.
— Мы пойдзем іншым шляхам, — па-ленінску настаўляў мяне старэйшы таварыш, які пасьпеў раней “пабамжавацца” ў буржуяў-капіталістаў. — У два разы таньнейшым. Для пачатку едзем у Згажэлец (гэта трошкі на поўнач ад “трохкутніка” — сутыку межаў Польшчы, Чэхіі і Германіі), а там…
“Там” усё атрымалася як найлепш. Настолькі “найлепш”, што да гэтага часу паджылкі трасуцца.
Знаёмага паляка, “спэцыяліста па бязьвізавым перасячэньні межаў”, таварыш не засьпеў — паехаў пан у мясьціны, як той казаў, ня вельмі аддаленыя, а ягоны дурань-сусед і сябра па “эмігранцкім” бізнэсе таксу падвоіў:
— Часы цяжкія, небясьпечныя, хапаць пачалі нашага брата. Дзьвесьце “дойчаў”, ня меней, каштуе цяпер тая ж паслуга, — сказаў як зарэзаў.
Ужо вечарэла, а там, бач, і ноч насунецца. Паўздыхаўшы, мы падахвоціліся на гэтую ідыёцкую авантуру. (Заплацілі столькі ж, колькі каштуе віза, а ідзём безь яе.)
Мяжа — рака. Перасёк, пераплыў яе — і ты там, за Кардонам. Але-але, зь вялікай літары. З малой — калі б гаворка ішла пра Польшчу.

Плыўма, як Чапаеў, мы ў рэчку ня кінуліся — палічылі за найлепшае караскацца, быццам малпы, па ржавай арматуры ці то недабудаванага, ці то напаўразбуранага моста.
Як ні дзіўна, атрымалася.
Ціха, з замiраньнем сэрцаў, мы пратупалі і палову Гёрліца (той жа Згажэлец, але зь нямецкага боку). Ня ўбачылі нас “паліцаі” і на мясцовым вакзальчыку, скрозь размаляваным свастыкамі.
І рушылі мы ў цэнтар Эўропы бяз штампікаў-візаў у пашпартах, хоць за іх быццам і было заплачана.
Зэканомілі…
А наперадзе мяне чакала сытуацыя, калі на ўсходзе Галяндыі, у ціхім Арнхеме, я застануся адзін з двума куплеными напярэдадні аўтамабілямі (таварыш заляціць у турму за вулічны гандаль цыгарэтамі) з грашыма, якіх ледзь хапала на запраўку аднаго.
А потым берасьцейскі мытнік вылезе з будкі паглядзець на клоўна, які адзін спрабуе прасунуць цераз мяжу дзьве тачкі.
І зьлітуецца. За сымбалічную плату — блёк “Мальбара”, апошняе, што засталося з рэчаў таварыша, бо свае два (дазвалялася правозіць толькі два) я выменяў у старшыны з групы савецкіх войскаў у Нямеччыне на паліва. Ды яшчэ дасьць наказ на дарогу:
— Едзь, артыст, але не сьпяшайся, дачакай раніцы: начамі “пацаны” на дарогах дзяжураць, крыўдна будзе заляцець на фінішы…
Але я ня стаў чакаць ранку. Пагнаў ноччу “Форд”, а на сьвітаньні вярнуўся па “Опэль”…
І таварыш, які прыехаў з Германіі праз два месяцы, пасьвяжэлы, быццам з санаторыі, але з пустымі кішэнямі і з штампікам — забаронай на ўезд — у пашпарце, забіраючы ў мяне ключы ад адной з машын, скажа:
— Шкада, не прысутнічаў. Я за паўблёка праскочыў бы. Ну, ды тае бяды, наступным разам будзем разумнейшыя. Дарэчы, пакуль у каталажцы сядзеў, надзейныя людзі каштоўнай інфармацыяй падзяліліся: цяпер выгадней машыны купляць на Блізкім Усходзе, у Эміратах… Галоўнае, каб пры перагонцы на тэрыторыі Ірану не падстрэлілі, а далей — дробязі…

Уладзівасток
Ці ведае паважанае спадарства горад, у якім вам, калі

спытаецеся дзяўчыну “Колькі?”, не адкажуць “Чаго?”, не пачнуць удакладняць, ці доўга вы мяркуеце карыстацца яе паслугамі, і ўжо пагатоў ня плюнуць вам у твар і не ўзнагародзяць поўхай, а толькі млява пасьміхнуцца і назавуць цану. Нават дзьве: за гадзіну і за ноч. Лічбы будуць прымальныя, не напалохаюць: скажам, трыццаць і пяцьдзясят тых самых умоўных адзінак. Але галоўнае, што абслужаць вас па найвышэйшым разрадзе. Вы не пачуеце: “Так — не хачу!” або “За гэта асобная плата!”. Вас абслужаць з задавальненьнем, выціснуць з вас усе сокі — нават тыя, пра наяўнасьць якіх вы і не здагадваліся.

Пасьля такога якаснага абслугоўваньня вам застанецца толькі вохкаць і войкаць: дзе гэта раней, на якой такой адсталай плянэце вы жылі, у якім такім каменным веку ашываліся? Як жа далёка да гэтай плянэты вашым жонцы і палюбоўніцы! Вы зразумееце, што так часта азмрочвала вашае жыцьцё. Зразумееце ўсё. Але — галоўнае — вы даведаецеся, што такое Ўладзівасток. Самы бандыцкі горад былога Савецкага Саюзу. Дзяржава ў дзяржаве. Бандыцкая дзяржава. Бо, як па найвышэйшым разрадзе вас абслужаць мясцовыя гейшы (а гэта ў той ці іншай ступені, лічы, усё тутэйшае жаночае насельніцтва), гэтаксама па найвышэйшым разрадзе вас “вычысьцяць” мясцовыя бандыты…

З аэрапорту, пасьля марнай спробы вылецець, мы вырваліся цудам, ледзь жывыя. Да чыгуначнага вакзалу дабраліся на грузавічку “Хлеб”. З закупленым у мясцовым ГУМе дэфіцытным японскім таварам пад’ехалі з тылу, і таму дзяжурныя бандыты, “ахова”, як яны сябе называлі, нас заўважылі не адразу, і мы сёе-тое пасьпелі.

— Мы ўдвух супраць васьмі. Не найгоршыя суадносіны, — прашаптаў мне Жэнька Бэндэраў, калі пералічыў каўказцаў, што перакрылі нам падыход да чыгуначнай плятформы.

Я быў згодны:

— Першая спроба не ўдалася. Купіў не купіў, а патаргавацца можна. Паўторым. Каб вырвацца з лапаў гаспадароў Уладзівастоку, нельга апускаць рукі.

— Прабівацца да вагонаў прапаную перабежкамі, як нядаўна ў Ніжнім Тагіле, — успомніў Жэнька нашую апошнюю вандроўку.

— Ага, перабежкамі, — кіўнуў я, не перастаючы сачыць за перамяшчэньнямі маленькіх вузкалобых чарнявых спрытнюгаў.

І ня карлікі, і не нармальныя “браткі”. Сумесь пацука і сабакі. Носяцца па плятформе, як ашалелыя, шукаюць… Нас, вядома. Тут мы ў адной зьвязцы, дакладней — у адным жыцьцёвым кінафільме, але ў розных ролях. Яны — паляўнічыя, мы — здабыча. Мы ўсё жыцьцё для кагосьці здабыча: справа — мянты, зьлева — гэбэшнікі, наперадзе — мытнікі і падатковая паліцыя, ззаду — бандыты. Хоць — не: цяпер бандыты сьпераду.
Як я стаміўся! Узяць бы дый перастраляць зграю ненажэрную. Пісталет жа купілі. Аднак перастраляць — значыць, пайсьці па банку, значыць — ня вытрымалі нэрвы. Значыць — напляваць на сям’ю, значыць — не вярнуцца дахаты, ніколі ня ўбачыць сына, Наташу…
— Ну, што — другая спроба? — вярнуў мяне да рэчаіснасьці Жэнька. — Скачам?
І мы саскочылі на рэйкі, пабеглі, панесьліся, паляцелі. Чорная зграя сарвалася за намі. Але цяжка ім будзе нас дастаць. Яны ж хочуць толькі грошай, а мы цяпер марым пра большае — выжыць! Таварчык жа, дзякуй Богу, у паштовым вагоне пакаціў-паехаў…

Tax free

Англійскае “tax free” можна перакласьці як “вольны ад падатку”. Аднак жа не сакрэт, што слова “воля” і вытворныя ад яго ў паўсядзённым і, тым больш, дзелавым жыцьці часта набываюць самы нечаканы зьмест. Акурат пра гэта і пойдзе гаворка. Прапаную, каб ня быць галаслоўным, знаёмы мне нямецкі выпадак.
Значыць, так. Вы за рулём уласнага аўтамабіля апынуліся ў багатай — дастатак проста лезе ў вочы — Германіі. Ня будучы дурнем, прыкупілі сёе-тое з тэхнікі: магнітолу, кухонны камбайн і яшчэ штосьці з дробязяў. Не прайшлі міма недарагога, але моднага і, галоўнае, добра пашытага адзеньня, як і міма якасных прадуктаў: нармальнай тлустасьці малако, “тэтрапакаўская” ўпакоўка соку там таньнейшыя за нашыя. Зьведалі, нарэшце, некалькі прыемных хвілін, упісваючы сваё прозьвішча ў чэкі “tax free” — па іх, як запэўніў вас у “шопе” надзвычай паслужлівы прадавец, на выезьдзе з краіны вам абавязкова вернуць шаснаццаць працэнтаў кошту тавару.
Але не сьпяшайцеся радавацца. Ёсьць такія зьмены на

цэнтральнай нямецка-польскай мытні ў Франкфурце-на-Одэры, у часе дзяжурства якіх будзе вельмі праблематычна атрымаць, а правільней, выбіць належныя вам грошы. Пакуль прастаіце ў кілямэтровай чарзе, дасьведчаныя шоп-падарожнікі папулярна растлумачаць (у чым пераканаецеся крыху пазьней і самі), што чэкі з купленага адзеньня пажадана пазрываць, але не выкідаць, а магнітолу і іншую электроніку старанна, як мага далей схаваць, бо могуць быць праблемы з польскай мытняю. Прыслухаўшыся да гэтых парадаў, вы, скажам, так і зробіце. Дапусьцім таксама, што вам пашанцавала праскочыць строгага пана мытніка, адкупіўшыся трыццацьцю-пяцьцюдзесяцьцю маркамі. Усьцешыўшыся, вы нарэшце выдыхнулі: “Ху-у, адчапіліся!” — і пашыбавалі да запаветнага акенца “Tax free” па законныя шаснаццаць працэнтаў. Ох, не сьпяшайцеся казаць “гоц”. Агледзіць вашыя чэкі фраў няпэўнага веку з шэра-жоўтым тварам, зірне на вас і… Вы адразу схопіцеся ўспамінаць, што такое жахлівае за ня надта яшчэ доўгае сваё жыцьцё ўчынілі…
Гэтак было са мною. Ужо вядомая вам фраў з шэра-жоўтым тварам, ня даўшы мне перадыхнуць, секанула:
— Ідзём твой машына!
На “агляднай пляцоўцы” яшчэ раз прайшлася вачыма-фарамі па чэках, вычытала там назву “salat” і запатрабавала:
— Пак’язывай!
Вядома ж, салата, прадукт не для працяглага захоўваньня, купленая тры дні таму, была даўно зьедзеная, забытая, і паказаць яе “жалезнай лэдзі” я ня змог…
— Ja, ja, — забегала сюды-туды яе квадратная сківіца, — ja, ja. О-о, кефір?

Гэты малочны прадукт купляўся, зноў жа, не дзеля марынаваньня на зіму, і, разьвёўшы рукамі, я шчыра прызнаўся, што выпіў кефірчык, не ўцярпеў…
— Ja, ja, — усьмешкаю дзетазабойцы асьвяціліся ейныя вочы.
— Чэк “ежа” ануляваць! Паказвай адзеньне!
Разборка трантаў таксама не дадала мне дадатных эмоцыяў. Калі паказаў ёй новенькае дэмісэзоннае паліто (купіў жонцы тое, што яна называла “марай усяго жыцьця”: суконное, а лёгкае, як пушынка), далучыў да яго такія ж новыя штаны, чаравікі, кашулю, мяне асьцюдзіла рэзкае:

— Цэтлікаў няма? Гэта ня новая вопратка! Гэта купіў на рынку!
“Ды вы з глузду зьехалі!” — пачынаю абурацца пакуль яшчэ самому сабе. Уголас спрабую растлумачыць словамі маіх дабрадзеяў з чаргі:
— Калі б ня зьняў цэтлікі, былі б праблемы з палякамі…
— Ja, ja, — адкрыліся вострыя зубы, — але гэта ваш проблем… Карацей, пагарэў я і з чэкамі на адзеньне. (От бы цяпер напаткаць бывалых “шопнікаў”!) Але, ня кідаючыся ў роспач (як у любога “саўка”, мая псыхіка гадамі прызвычайвалася да пераадольваньня цяжкасьцяў), успамінаю пра магнітолу, цуда-камбайн і нават зь нейкім выклікам падаю ёй адпаведныя чэкі. І тут сапраўды пачынаюцца, як сказаў бы адзін мой даўні знаёмы — цяпер жыве, “падлюка”, у Сан-Францыска, — дробныя дзівосы.
— О’кей! — чамусьці безь ніякага зларадзтва ўсьміхаецца фраў.
— Пак’язывай…
Я за краёк прыпадымаю розныя лахманы, пад якімі схавана “кантрабанда”.
— Вышэй, вышэй, bitte! Якая мадэль, нумар? — Убачыўшы і прачытаўшы, нарэшце, усё, што хацела, фраў вымаўляе словы, якія я ўжо не спадзяваўся пачуць. — Чэк іст гут!
Атрымаўшы запаветныя марачкі (яны якраз і кампэнсавалі адабранае мытнікам-палякам), я ўздыхаю працяжна “Та-ак!” і, хаваючы грошы, вяртаюся да машыны: “Усё…”
Усё? Дзе там! Напарнік польскага мытніка ўжо дзяжурыць каля майго “кара”.
— Ага, пан “tax free” атрымаў? А за што? Маўчым? Трэба твой самаход яшчэ раз агледзець…
І вядома, знаходзіць тую самую электроніку.
— О, гэта ж кантрабанда! — абураецца пан мытнік. — Штраф, канфіскацыя!
“Так, — думаю я, — тут мажлівыя два варыянты: або першы пан сьвядома мяне прапусьціў, каб разам зь іншым “беларускамоўным” пагрэць рукі, або — што менш верагодна — нейкім чынам умяшалася фраў. А можа, чорт зь ёю, з магнітолаю! Дый без камбайну жонка раней неяк абыходзілася. Галоўнае — паліто і курткі дзецям давезьці…”
Пацьвярджаецца першая здагадка: пан нумар два раптам шкадуе мяне і шэпча ратаўнічае:
— Добжэ, добжэ, давай сто марак і — з Богам…

Задаволены такой “велікадушнасьцю”, прыкідваю, што на бэнзын у мяне прыхаваны НЗ — злотыя і да польска-беларускай мяжы даехаць змагу, нават калі аддам апошнія дзевяноста плюс тры (дробязьзю) маркі (медзякі ён мне “высакародна” вяртае)…
“Што ж, — супакойваю сябе, сядаючы ў машыну, — магнітола, вядома, залатою абярнулася, затое паліто… Дома такога не купіў бы: за яго ўсё жыцьцё давялося б разьлічвацца. Хоць тут ня ў збытку…”
Разабраўшыся з чарговым крывасмокам, я ў пераносным і літаральным сэнсе ўздыхнуў з палёгкаю. А то ж думаў, што фраў здасьць мяне палякам з трыбухамі, ляпнуўшы пра электроніку. Цяпер жа яны і бязь ейнай падказкі ўсё ведаюць і нават атрымалі сваю “капусту”. Больш анічым не рызыкую — няма чым, і ўвачавідкі сьмялею: прыходзіць жаданьне высьветліць чэкавыя адносіны з мадам.
Нахіліўшыся да знаёмага акенца, даводжу да ведама, што я, між іншым, журналіст, але гэта няважна, галоўнае — хацелася б пачуць ейнае імя і прозьвішча, каб па заслугах ухваліць абароньніцу фінансавых інтарэсаў Германіі (недаатрыманыя мною “tax free” ня зьніклі, яны засталіся ў краіне) у друку. Шэры твар фраў робіцца барвовым, яна ўжо не вяшчае, а ляпеча:
— Усё п-паводле закону…

— Паводле якога закону я ня маю права зьесьці купленую салату, пакуль не пабачу ваш мілы тварык? — пытаюся, шкадуючы, што вывучаў у школе ангельскую, а не нямецкую мову. — What is your name? You must tell me your name! [1] Ja, ja, — намагаюся падрабіць ейную інтанацыю, — ja, ja. Дзвечы, у Бэрліне якраз перакладаюць маю кнігу. Пастараюся ўставіць у яе і рэклямную замалёўку пра вашамосьць. Народ павінен ведаць сваіх герояў…

[1] **Як вас зваць? Вы абавязаны назваць сваё імя! (Анг.).**

Згледзеўшы, што фраў хапае паветра і вось-вось страціць прытомнасьць, вырашаю: зь яе досыць, пара адчальваць. Але перад адыходам не стрымаўся, ціха дадаў, сам не разумеючы, як язык павярнуўся:
— Каб цябе ніхто ніколі ня трахаў!
— Ja, ja, — заблішчалі сьлёзы ў яе вачах…
“Вось табе й на, — падумаў зьбянтэжана, вяртаючыся да

“самохаду”, — пацэліў, аказваецца, у яблычак”.
Бадай, і ўсё. От гэтакі “tax free”. Адным словам, калі вы апыняцеся на аўтамашыне ў Германіі, не сьпяшайцеся радавацца…
P.S. Сусед, які езьдзіць у Германію кожныя два тыдні, расказаў, што неаднойчы нарываўся на шэрую фраў і цярпеў ад яе тое ж, што і я. Апошнім жа разам адчуў вынік ці не майго выхаваньня: яна ня кінулася, як раней, шукаць у ягоных сумках кефіры і салаты…

Пра гэта лепш маўчаць…
Верыце вы ў Бога ці не — пра гэта лепш маўчаць. Але лекавацца пажадана ў доктара-атэіста. Ён ня стане спасылацца на Ўсявышняга, не разьвядзе ў нейкі момант рукамі: “Цяпер надзея толькі на Бога…”, а будзе змагацца за вашае жыцьцё да канца.
Але верыце вы ў Бога ці не — пра гэта лепш маўчаць.

Рэдактар аддзелу прозы
За дзень да ад’езду ў Нямеччыну ў вядомай кнігарні, што насупраць будынку КДБ у Менску, купіў зборнік “Тартак” Івана Пташнікава. Кніга толькі што выйшла ў выдавецтве “Мастацкая літаратура” ў сэрыі “Беларуская проза ХХ стагодзьдзя”. У яе аўтар уключыў тое, што палічыў найлепшым з напісанага за амаль 50 гадоў творчасьці. Гэта “хатынская” аповесьць “Тартак” і 14 апавяданьняў (практычна ўсе з раней публікаваных).
Прачытаў кнігу за дзень.
Аказалася, што апавяданьні, галоўным чынам, ён напісаў з 1959 па 1962 і з 1996 па 1999 гады (“пасьляваенна-вытворчыя” “Агні” (1965), надрукаваныя ў васьмідзясятыя гады “чарнобыльскія” “Львы”, дзіцяча-партызанская “Эфка” падаліся рэчамі “заказнымі”, а “мядзьведжая” гісторыя пра “Арчыбала” — выключэньнем).
Што ж гэта за прамежак такі цягам 35 (1962—1996) гадоў? Адказ атрымаў зь “Біяграфічнай даведкі”, зьмешчанай у канцы кнігі:
Пташнікаў Іван Мікалаевіч нарадзіўся 7.10.1932 г. у вёсцы

Задроздзе Плешчаніцкага раёна Мінскай вобласці <…> Друкавацца пачаў з 1952 г. <…> Працаваў у рэдакцыі плешчаніцкай раённай газеты “Ленінец” <…> ***З 1962 г. па 1995 г. — рэдактар аддзела прозы часопіса “Полымя”…***
Выснова: праца ў рэдакцыі забірае львіную долю пісьменьніцкага часу. Замінае рэалізацыі творчых задумаў, увасабленьню іх у жыцьцё. Праца ў рэдакцыях забірае жыцьцё…
Другое. Дзякаваць Богу, што практычна не працавалі (прынамсі, не цягнулі дзесяцігодзьдзямі ярэмца, як І. Пташнікаў) у рэдакцыях і іншых установах “прымусовай працы” Якуб Колас, Максім Багдановіч, Уладзімер Караткевіч…
І яшчэ адна заўвага. І. Пташнікаў амаль 50 гадоў пражыў у Менску, але пра горад не напісаў ніводнага апавяданьня. І ён такі — не адзін…

На хворую галовачку…
Чытаю ў “ЛіМе” чарговы опус знаёмага, вясковага па жыцьці празаіка з вышэйшай “філ-адукацыяй”, але з пачатковым “філ-талентам” і дзіўлюся: няўжо аўтар сапраўды думае, што чытачу цікава, як ён хадзіў па куратніку (хляве, двары, гародзе), як стаяў на прыпынку аўтобуса (электрычкі) на Менск, раздумваў пра жыцьцё сваё цяжкае. Як сустрэў на пэроне сяброўку дзяцінства, зь якою гадоў сто таму ў лес у грыбы-ягады бегаў, і засмуціўся, якая яна цяпер тоўстая і непрыгожая. Як, не дачакаўшыся аўтобуса (электрычкі), набраўся з гора самагонкі (нават тоўстая і непрыгожая не захацела ўспомніць зь ім гады маладыя і вясёлыя — паўтарыць шпацыр па лесе), а раніцой зь цяжкай галавою ўсё ж адбыў у сталіцу запісваць-увекавечваць “трагічныя” ўражаньні мінулага дня…
Зрэшты, што ж іншае напішацца на хворую галовачку?

Адзіны ў гісторыі
Яго — і не аднойчы! — як беларускага прапагандыста яшчэ да вайны арыштоўвала польская паліцыя, у сорак чацьвертым расстрэльвала фашысцкае СД (быў паранены, але прыкінуўся мёртвым, што і выратавала), прысуджалі да дзесяці гадоў зьняволеньня бальшавікі ў пераможным для іх сорак пятым (адбыў на Калыме — трынаццаць), а ён, вярнуўшыся на Радзіму амаль пэнсіянэрам, здолеў захаваць у душы дабрыню,

сантымэнтальнасьць і нават нейкую дзіцячую наіўнасьць: выразаў з пэрыёдыкі свае творы або рэцэнзіі на іх, проста ўспаміны пра сябе і зьбіраў-наклейваў іх у сшытку — калекцыянаваў.
Не сумаваў ён, і калі яго, паэта з даваенным стажам, на чые вершы былі напісаны папулярныя песьні, доўга не прымалі ў Саюз пісьменьнікаў. Сябрам Саюзу ён стаў толькі за некалькі гадоў да сьмерці.
Ён ледзь не дацягнуў да дзевяноста (які генэтычны запас трываласьці быў у арганізьме гэтага чалавека!), але так і ня ўведаў, што менавіта ён, Сяргей Новік-Пяюн, зьяўляецца адзіным у гісторыі Беларусі літаратарам, якога арыштоўвалі тры рэжымы, што ненавідзелі адзін аднаго.

Пахаваньне
Чытаў ува ўспамінах паэта і добрага, сумленнага, не зламанага жахлівым лёсам чалавека, былога вязьня сталінскіх канцлягераў Паўла Пруднікава:
“На пахаваньні Ўладзімера Дубоўкі нас было ўсяго толькі пяць чалавек. Саюз пісьменьнікаў СССР прадстаўляла Валянціна Шчадрына — кансультант па беларускай літаратуры, Мікола Гамолка і я — ад беларускай пісьменьніцкай арганізацыі, пляменьнік нябожчыка Валодзя і дачка яго даўняга сябра Адама Бабарэкі — Алеся. Вось і ўсё…”
Не, ня ўсё. Нядаўна, Павал Іванавіч, мы хавалі вас. Былі Сяргей Законьнікаў ад “Полымя”, Алесь Пісьмянкоў ад “ЛіМу”, Навум Гальпяровіч ад Саюзу пісьменьнікаў, ад “Маладосьці”, іншых выданьняў — усіх не пералічыць.
Памяраць дома, на сваёй зямлі, — лацьвей. Цябе праводзяць у апошні шлях сябры, таварышы, чытачы, землякі. А каму патрэбныя беларусы на чужыне?
Але Дубоўка выбраў чужыну. Ён баяўся сваіх…

Пытаньне
Восеньню далёкага “нэпаўскага” 1927 году ў менскі Белпэдтэхнікум, які ў розныя гады называлі то “царскасельскім ліцэем”, то “кублом і рассаднікам нацдэмаў”, паступіў выпускнік Лагойскай сямігодкі, “хлопец з мглёўскага балота” (так пра яго скажуць пазьней, увекавечыўшы вёску з адметнай назваю Мглё), па-свойму даволі разумны габрэйскі хлопчык з

гучным імем Айзік. Праўда, першая спроба паступіць, здаючы нароўні з усімі экзамены або нават пасылаючы на іх замест сябе сяброў, правалілася. Рашэньне паплакацца ў райкаме камсамолу нечакана сталася выратавальным. Айзік быў залічаны на першы курс. Неўзабаве "падазронае" імя было зьменена на "народнае" — Алесь, а яшчэ празь некалькі гадоў Айзік-Алесь стаў літаратурным кансультантам НКВД, склаўшы вартую кампанію вядомаму Лукашу Бэндэ, Міхасю Клімковічу і некаторым іншым "байцам нябачнага фронту".
Пытаньне: каму жаліцца Алесь Кучар у пекле, калі чарговы нашчадак падведзеных ім пад расстрэл аднакашнікаў, сяброў-паэтаў плюе на ягоную магілу?

Рукапісы гараць!
Гады тры таму, калі шукаў матэрыялы для збору твораў Валер'я Маракова (быў падрыхтаваны, нават зьвярстаны, але дасюль ляжыць-пыліцца ў выдавецтве "Мастацкая літаратура") і кнігі пра жыцьцёвы і творчы шлях паэта (выйшла ў 1999 годзе), у разьдзеле "Хроніка" часопісу "Полымя" (1928, № 10) прачытаў наступныя радкі: "В. Маракоў піша новую паэму "Рабінавая ноч". Праз паўгоду "Полымя" (1929, № 3) удакладніла: "Новая паэма будзе друкавацца ў нашым часопісе". Пацьвердзіў гэта і "Маладняк" (1929, № 3): "У "Полымі" рыхтуецца да друку паэма "Рабінавая ноч", там жа друкуецца "Мая паэма" (паводле словаў аднаго крытыка, які набудзе пазьней шырокую вядомасьць, — *"глыбока-пэсымістычная"* і накіраваная *"супраць пралетарыята"*). Урэшце паэма "Рабінавая ноч" з прычыны "нацдэмаўскага ўхілу" надрукаваная не была.
У шасьцітомным выданьні "Беларускія пісьменьнікі. Бібліяграфічны слоўнік" пад рэдакцыяй А. Мальдзіса ёсьць зьвесткі (Т. 4, С. 209), што 25 лістапада 1928 году "Чырвоная змена" надрукавала ўступ да паэмы. Пасьля доўгіх пошукаў высьветлілася: у Беларусі гэты нумар газэты не захаваўся… Праз колькі месяцаў мне патэлефанавалі з Нацыянальнай бібліятэкі. Загадчыца Беларускага аддзелу Людміла Рабок паведаміла, што яе калега з Расейскай нацыянальнай бібліятэкі Мікалай Нікалаеў прыслаў з Санкт-Пецярбургу ўступ да "Рабінавай ночы"… На жаль, толькі ўступ. Сама паэма ня знойдзена дагэтуль…
1 жніўня 1937 году на вялікім вогнішчы ў "амэрыканцы" сярод

тысяч рукапісаў беларускіх пісьменьнікаў разам зь невядомымі, спыненымі цэнзурай або напісанымі “ў стол” і арыштаванымі творамі М. Багуна, С. Баранавых, А. Вольнага, П. Галавача, У. Галубка, Ц. Гартнага, М. Гваздова, С. Дарожнага, А. Дудара, М. Зарэцкага, С. Знаёмага, В. Каваля, Т. Кляшторнага, Д. Курдзіна, Ю. Лявоннага, Я. Нёманскага, З. Піваварава, С. Ракіты, А. Розны, В. Сташэўскага, Б. Тарашкевіча, У. Хадыкі, І. Харыка, М. Чарота, В. Шашалевіча і многіх іншых гарэў і адзіны экзэмпляр паэмы Валер’я Маракова “Рабінавая ноч”… Выслоўю “рукапісы не гараць” я цяпер ня веру…

[image]
[image]

№ 1 (24) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/02/18
[image]

Рэпіёнкае пытаньне
аналізыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі
Аддзел Літаратуры

Усевалад Гарачка

Паэты і паэзія

УСЕВАЛАД ГАРАЧКА (нар. 1968) — інжынэр-тэхноляг, працуе на заводзе “Інтэграл” у Менску. Жыве ў Фаніпалі. Паэт. Ягоныя вершы апошніх гадоў друкаваліся ў газэтах “Літаратура і мастацтва”, “Наша Ніва”, часопісе “Крыніца”. Ягоная апошняя публікацыя ў ARCHE — у №1-2002

* * *

Для многіх з майго пакалення Арлоў быў не толькі пісьменнікам. Нават, я б сказаў, не столькі пісьменнікам… Ведаеце, заўжды ёсць нечым прыцягальныя для людзей дрэвы, паркі, статуі, масты, да якіх прыходзяць, дзе збіраюцца. І хто яго ведае, што да іх прыцягвае? Метраў пяцьдзесят убок стаіць такое ж дрэва ці ляжыць нават большая камлыга. Але ўсе ідуць сюды.

Так і мы хадзілі на вечары Разанава, Арлова, іншых…

На сцэне гучаць вершы ці проза. А мы шукаем у зале знаёмыя твары, нешта адзін аднаму паказваем на мігі. Мы ўжо думаем, куды пайсці пасля, як толькі вечарына скончыцца. Ды што сябры і знаёмыя — сюды можа часам завітаць і тая, каго ты кахаеш. А вершы, проза, што гучаць са сцэны, — яны як ненавязлівая музыка, суправаджэнне нечага большага…

“Мой радавод да пятага калена”, “Падарожныя нататкі”, іншая проза Арлова таго часу — усё гэта ўкладаецца ў схему “Я — і небеларускі Сусвет” (хаця і там часам можна сустрэць

беларуса). Нягледзячы на сваю аднавектарнасць, на яе глебе (і не толькі на ёй) мы стварылі сапраўды беларускі свет, дзе адбывалася ўсё, што толькі можа адбывацца ў рэальным жыцці. Свет шматвектарны. Толькі і пісаць з яго. Але гэты свет не нарадзіў творцаў, па велічыні роўных Арлову… Пакуль што не нарадзіў.

* * *

Гадоў 10 таму на літаб'яднанне, якім кіруе Алесь Масарэнка, прыходзіла беларускамоўная публіка. Калі і з'яўляўся хто з расійскамоўных, яго адразу ж апрацоўвалі (і Масарэнка, і іншыя прысутныя): "Ты ж беларус, навошта табе пісаць па-расійску, расійцы і самі напішуць лепш за цябе!" Часам у некага з расійскамоўных узнікаў верш па-беларуску, і тады ён узносіўся (нягледзячы на якасць), супрацьпастаўляўся "горшай" расійскамоўнай творчасці (але не згадаю, каб хто з расійскамоўных аўтараў у выніку такой апрацоўкі пачаў пісаць па-беларуску). А самі беларускамоўныя літаратары былі вельмі моцна палітызаваныя: хадзілі на мітынгі, былі сябрамі розных партыяў. Іх беларускасць не абмяжоўвалася сценамі памяшкання, дзе праходзілі літаб'яднанні (як стала пазней), — яны былі такімі паўсюль. Гэта потым узнікла мода быць беларусамі з Масарэнкам ды іншымі такімі ж, а на вуліцы пераходзіць на расійскую. З'явіліся дзвюхмоўныя, якія пісалі і на адной, і на другой. Расійскамоўных, як раней, ужо не агітавалі: "Яны хай сабе пішуць, а нам трэба трымацца свайго". Гэта былі саступкі. І не людзі, якія рабілі іх, змяніліся — змяніўся націск з боку часу, абставінаў. Не, ніхто не пагражаў, не тэлефанаваў, не даваў загадаў — на іх ціснуў дух новага часу. Урэшце дайшло да таго, што цяпер да Масарэнкі прыходзяць расійскамоўныя "кавээншчыкі", "дэтэктыўнікі", спекулянты на афганскай тэме ды іншы народ такога кшталту. Так, на літаб'яднанні цяпер дзьмуць піцерска-багемныя, "афганскія" ды іншыя вятры, характэрныя для сярэдняй Расіі. З беларускамоўных — покуль што Масарэнка ды яшчэ некалькі чалавек (пераважна старэйшага веку). Вось такую нібыта сумную карціну я намаляваў. Але ўсё крыху не так. Проста вакол Масарэнкі гуртаваліся пераважна не па прынцыпе моўнай прыналежнасці, а па прынцыпе прыхільнасці да класічнай савецкай школы. Усе гэтыя "яркие девочки", што

пішуць пра тое, як упіваюцца зубамі ў шыі сваіх каханых, як расцякаецца чорная кроў… Усе яны не перастаюць, нягледзячы на такую тэматыку, быць прыхільніцамі класічнай школы. Калгасніца і ў аранжавай спадніцы застаецца калгасніцай. Так, яны абіраюць зло, але ў іх не разбураны той стрыжань, які дабро і зло падзяляе, — у іх няма яшчэ плюралізму адносна гэтых паняццяў.
А беларускамоўныя творцы не зніклі — яны проста не ідуць да Масарэнкі, а ідуць у розныя калегіумы, спрабуюць арганізоўваць свае літаратурныя часопісы, выпрацоўваюць літаратурныя канцэпцыі.
Тое, што беларуская літаратура мае сваё маладое пакаленне, — радуе. Хвалюе тое, што яна можа цалкам адысці ад класічнай школы з усімі вынікаючымі адсюль наступствамі. І каб не павярнуўся гэты адыход супраць самой беларускасці.

Шлях

Адаму Глобусу

Койданава. Туманная летняя раніца. Мне трэба “забіць” час, і я няспешна прагульваюся па адной з вуліц прыватнага сектару. Абапал дарогі старыя ясені, клёны. Дамы падступаюць да самых тратуараў. А наперадзе — бела, нічога не відаць. І чым далей я адыходжу ад цэнтру гораду, тым больш свабодна стаяць дамы. Яны ўжо не падыходзяць да самай дарогі, а месцяцца ў глыбіні двароў. Прытым неяк уроскід: адзін бліжэй, другі далей, адзін да вуліцы франтонам, іншы — скатам даху. А наперадзе — туман. Адно адчуваеш, як дарога злёгку ідзе ўгору. І мая свядомасць малюе працяг гэтай карціны. Ужо не дамы стаяць ля дарогі, а нейкія хацінкі. Нават плотам не абнесеныя. І не дрэвы ля іх растуць, а так, кусцікі. А далей і дарога знікае, і хацінкі. Толькі сям-там валун ляжыць ці тырчыць купка хмызоў. “Дарога на неба, — вымавілася мне. — Вось, аказваецца, як проста туды трапіць”. Але неба — бязлюднае, пустое. Дзе нават і Бога няма.

* * *

Некалі па тэлевізары я бачыў такую карціну: рэфрыжэратар, а ў ім —падвешаныя тушы. Машына едзе, тушы ўвесь час б’юцца адна аб адну, целяпаюцца, пакручваюцца. Так і ў многіх і многіх мастацкіх фільмах — тое ж мяса: бойкі, блуд… Але галоўная ўласцівасць мяса — гнісці.

Віктар Слінко. Дзве кнігі

1 (Стол паэта)

Дзіўна, але працоўны стол Віктара я заўжды нейкім чынам параўноўваў з вокладкамі ягоных кніг.

Памятаеце першую кнігу “Апошні снег”? Усяго тры колеры: чорны, белы, жоўты. Акно, і за ім — снег… Тады стол стаяў у куце пакою, якраз каля акна. Засланы жоўтым абрусам. На ім была лямпа. На рагу ляжаў стос паперы з акуратна надрукаванымі вершамі. Усё строга, графічна, як на вокладцы. Новая Віцева кніга (“Штольні вясны”) мае вокладку ў залаціста-карычневых тонах, з дадаткам фіялетавага і малінавага. Там таксама ёсць акно, але не такое строгае, як у выпадку першай кнігі. Хутчэй нават не акно, а закіданы друзам стары калодзеж. Калодзеж — і адначасова рама карціны. А на дне — фіялетавая вада — раёк вока. Пасярэдзіне — зрэнка: малінавая, з упісаным у яе не зусім зразумелым мне сімвалам.

Так і стол. Шмат там чаго: і заручальны пярсцёнак у сподачку, і фотаздымак іншай… Гэты стол зусім не падобны на той, ранейшы, дзе ўсё было складзена, нібыта падрыхтавана на той выпадак, калі раптам гаспадар не вернецца. Цяпер праз сваю незавершанасць стол мае перспектыву, прадчувае заўтра.

Але не апошняе ва ўсіх гэтых аналогіях тое, што я ўпершыню пабываў у Віцевым пакоі пасля выхаду кнігі “Апошні снег” зімой. А пасля выхаду другой кнігі, у новым ягоным пакоі, — летам. І за акном замест трывожнай зімовай раніцы быў куды больш спакойны летні прыцемак.

2 (Дрэва паэзіі)

Дрэва паэзіі Віктара Слінко. Ягоныя карані жывяцца з тых жа падземных водаў, што жывілі і дрэва паэзіі Паглазава (быў такі расійскамоўны паэт-самагубца): надзвычай актуальная, прадвызначальная тэма Віцевай паэзіі — смерць (лепш яна праяўляецца ў першай кнізе). Да гэтай дзічкі прышчэплена галіна разанаўскага гатунку. Ён жа, Разанаў, і даглядаў шчэпу, паліваў (падземнай жылы — мала), угнойваў, падразаў. Толькі аднойчы сюды ўбіўся пасадоўнічаць Бродскі (глядзіце некаторыя раздзелы другой кнігі). І да ўсяго гэтага — нашы прыродныя ўмовы, наш беларускі клімат, традыцыя.

У некага можа скласціся ўражанне, што Віцеву творчасць

можна вытлумачыць праз іншых. Але я не казаў яшчэ пра зерне, пра тую жыццёвую сілу, што дала пачатак гэтаму дрэву. І, можа, маё ўказанне на прысутнасць у Віцевай творчасці згаданых імёнаў дазволіць толькі выразней пабачыць яго самога…

* * *

Арлекіну патрэбен П'еро, П'еро патрэбен Арлекін… Насмешліва-іранічны, часам павярхоўны я і трагічна-песімістычны Слінко. Узаемны ўплыў у творчасці быў мінімальны — кожны ішоў сваім шляхам: жыў, пісаў. Але, жывучы, пішучы, ідучы, мы міжволі рабілі супольную справу. Літаратура згадзілася прыняць нас з Віктарам у свой цэх, але яна паставіла нас на пэўныя месцы — дала нам нейкія ролі. І няхай нам здаецца, што мы — паэты цалкам незалежныя, вольныя.

* * *

Графаманія. Гэтым словам звычайна абазначаюць хваравітую цягу да пісання, шматслоўнага і часта пустога. Але прырода гэтага хацення бывае розная. Адным хочацца, бо здабываюць праз гэта (працэс напісання) нейкую паўнату. Іншым — каб мець славу, пашану (камусьці будзе дастаткова пабачыць самому і паказаць сябрам свой здымак і вершы ў нейкім там часопісе ці газеце). І ці лічыць графаманамі тых, каму хочацца пісаць дзеля славы і пашаны, але хто пры гэтым больш-менш валодае словам (рытмікай, рыфмай і да т. п.), хто ўмее стварыць нейкі верш-абалонку: нешта такое праўдападобна-паэтычнае, але ў чым няма паэзіі. Напэўна, многія з іх і ў чужых вершах не бачаць нічога, акрамя гэтай самай абалонкі. Першыя пішуць нібы па натхненні. Верш нараджаецца нібы сам сабой. На іхніх вачах — слёзы радасці стварэння… Але атрымоўваецца нявартае. Здаецца, словы самі вядуць цябе, і тое, што адкрываецца наперадзе, не адкрывалася яшчэ нікому. Але выходзіць банал. У найлепшым выпадку — ненаўмыснае перайманне.

Слёзы натхнення… Яны нешта адкрываюць, але і нешта засцяць (за імі не ўбачыш, што атрымаецца пасля). Калі ты адрозны ад большасці па прыродзе сваёй ці жывеш іншым ад іх жыццём, напісанае табой, як мінімум, будзе арыгінальным, цікавым. Калі ж ты такі, як усе… Таму многія з тых, хто як усе (хочацца

ж пісаць!), спрабуюць жыць іншым жыццём: “Творца не павінен прывязвацца ні да чога зямнога. Ён — па-над дабром і злом”. Але ў рэальнасці выбар іншага жыцця ў іх не багаты, нават аднастайны: гарэлка, жанчыны, вакзалы… Ніхто не хоча ісці пад гару. Лягчэй — з гары.
Ёсць яшчэ варыянт “штучнага натхнення” — медытацыйны спосаб напісання вершаў. Ты штучна, пры дапамозе канцэнтрацыі (хаця дакладней было б сказаць — расканцэнтрацыі) волі, пачуццяў, думкі выклікаеш стан натхнення. Уваходзіш у розныя “сусветы”, “шнарыш” па іх, як па Інтэрнэце (гэта можа мець дрэнныя наступствы для псіхікі). Вершы прыносіш адтуль нібы і неблагія (можа, крыху халаднаватыя). Але што цябе павяло на гэты шлях? Можа, таксама жаданне быць іншым, пісаць інакш і праз гэта — вылучыцца? Ці ёсць у такой практыцы элемент графаманіі?
Я перабраў далёка не ўсе варыянты і іх камбінацыі. Як па мне — у кожным з нас ёсць жылка графаманская і жылка творчая. Іншая справа — у якіх яны стасунках паміж сабою, з якімі каэфіцыентамі прысутнічаюць у сваёй “лінейнай камбінацыі”. Прытым самі каэфіцыенты — функцыі часу: сёння ў табе пераважае творчае, заўтра, можа стацца, наадварот…

* * *

1
Апошнім часам мне многія паэты ўяўляліся ледзь не жывёламі, якія дазваляюць сабе ўсё, што захоча іх левая нага. І ў мяне нават быў аргумент на карысць гэтага: я таксама пісаў, але ў мяне хапала сілы душыць розныя вычварэнствы. Яны проста не хочуць. Так лягчэй. Але цяпер пераканаўся: яны — проста не могуць. Каб магчы, трэба на нешта абаперціся, за нешта “трымацца” па-за плынню паэзіі. Так, як у іх, бывае, калі ў цябе няма берагу і ты аддадзены гэтай плыні.
2
Памятаеце алхімічны сімвал золата: дракон, які кусае сябе за хвост? Так і многія паэты: самі сябе кусаюць за нешта і выюць… вершамі.
3
Іншыя вершы: з пункту гледжання эстэтыкі — прыгожа, але калі паглядзець з іншага боку… Можна з асалодай сузіраць, як каштоўная ваза ляціць з акна нейкага высокага паверху — і

разбіваецца. Можа, і вершы, іх прачытанне — тое ж сузіранне падзення, а ваза…
4
Чамусьці фразу “паэту можна ўсё” амаль заўжды тлумачаць аднабакова: “можна ўсё” не азначае ісці ўгору — толькі скакаць уніз.

* * *

1
Ён яшчэ не нарадзіўся. Таму нічога не ведае. Не ведае, у прыватнасці, таго, што праз 240 гадоў яго прыраўнуюць да ветэранаў вялікай айчыннай.
2
Няўжо мы і праз сто, і праз дзвесце гадоў, як юдэі сыход з Егіпту, будзем адзначаць Дзень Перамогі? Але на змену юдэйскай пассе прыйшла Пасха хрысціянская. І няўжо над ёй мы ўстановім новае свята святаў — “пасху” савецкую?
3
Напэўна, і праўда было б блюзнерствам праз сорак-пяцьдзесят гадоў пасля дня перамогі ў другой сусветнай, калі многія з яе удзельнікаў — жывыя, казаць пра адмену ўсенароднага свята. Але праз гадоў 70 блюзнерствам будзе ўжо іншае — святкаваць. У адносінах да тых, хто стаў ахвярамі іншых, не менш крывавых войнаў, што былі на нашай зямлі.

* * *

Да нейкага часу я помніў ледзь не ўсё сваё жыццё: з дня ў дзень. Прынамсі, мне цяпер здаецца, што было менавіта так. А потым усё гэта абрынулася. Засталіся нейкія астраўкі… Вось я, трох-чатырохгадовы, іду з мамай па напаўзанесенай пяском асфальтаванай дарозе ў бок магазіну. На мне чорныя штаны і белая кашуля з чорным гальштукам і бліскучымі гузікамі… Колькі разоў я так хадзіў, а ўсё злілося ў адно і так запомнілася. Колькі выпетрылася, адны выспачкі-ўспаміны засталіся. Збярэш іх разам — тыдня будзе шмат. А астатняе — як і не жыў.
* * *
Пра практыку ўваходжання ў розныя “сусветы”. Я нават не хачу разглядаць, для чаго гэта робіцца (для творчасці ці для чаго

іншага) і якім спосабам (праз наркотыкі ці шляхам настройкі на пэўную хвалю, што, напэўна, блізка да акультных практык). Многім літаратарам, у першую чаргу маладым, хочацца нечага новага, яркага, выбітнага і разам з тым — хуткага. Я разумею іх нелюбоў да творчасці тых беларускіх паэтаў, той паэтычнай школы, дзе пісаць вершы — нібы вязаць снапы лёну: адзін за адным. А поле — бясконцае. І так усё жыццё. Хоць шлях не пад гару, а праца — сізіфава. Можа, пошукі маладых і падштурхоўвае гэта самая нелюбоў.
Але ўсе гэтыя пошукі, усе гэтыя практыкі разбураюць асобу. Ёсць звычайныя чалавечыя “паралелі” і “мерыдыяны” (ці “вектары”), якія ўтвараюць “каардынатную сетку” (ці “базіс”) нашага душэўнага (духоўнага) жыцця. Пра што я кажу: гэта — любоў і нянавісць, шчырасць і крывадушнасць, гультайства і працавітасць… А памянёныя практыкі выводзяць чалавека ў свет, перпендыкулярны ўсяму гэтаму. З часам ты станеш ужо няздольны да звычайных чалавечых пачуццяў. І, калі будзеш паслядоўным, урэшце ператворышся ў жывога мерцвяка.
* * *
Паэты ўмеюць кахаць, але не ўмеюць любіць.

Знешняе і сутнасць
Калі гэта трэба “дзеля справы” — нячысты нячыстаму можа хвост накруціць. Анёл жа анёлу крылаў ніколі не зламае.
* * *
Гэта было ў Караткевічавым “Чорным замку Альшанскім”. Прадавец тытуню пытаў у галоўнага героя: “А кітаец кітайца ў твар адрозніць?” Так і я не магу “адрозніць у твар” сталых аўтараў некаторых новых літаратурных часопісаў. Нібыта ўвесь часопіс пісаў адзін чалавек, толькі падпісваўся рознымі імёнамі. Тое, што там друкуецца, прынята лічыць “разумным”, “актуальным”. Але ўсё гэта — нібы нейкі пясочак перасыпаецца, гульня. Базіс іхніх каштоўнасцяў — штучны. Але, з іншага боку, маё меркаванне суб’ектыўнае: трэба быць кітайцам, каб адрозніваць кітайцаў у твар.
* * *
Кожны з нас належыць да нейкага кола — працоўнага, літаратурнага, кола сям’і. Мы чытаем пэўныя газеты, слухаем тых самых людзей. І здаецца, што свет — такі разнастайны — абмяжоўваецца тымі двума-трыма коламі, да якіх ты належыш

(кнігі, кампутар, тэлевізар — усё гэта нібыта пашырае “светапогляд”, але не выводзіць з кола, да якога ты належыш, з яго сталай адваротнай сувяззю). Таму мне заўжды цікава было пачуць чалавека (слова) іншага кола (хоць варта заўважыць, што кожнае кола замкнёнае).

* * *

Не па жанрах і родах, а па тых крыніцах, адкуль чэрпалі нашы літаратары, сучасную беларускую літаратуру можна класіфікаваць наступным чынам:

1) крыніца — адыходзячая беларуская вёска (блізка стаяць творы, для якіх крыніцай былі творы пачатку — сярэдзіны мінулага стагоддзя пра жыццё вёскі);

2) крыніца — беларус у расійскамоўным асяроддзі; гэты напрамак, як мне здаецца, мае перспектыву, але нельга не заўважаць яго абмежаванасці, “лінейнасці”;

3) крыніца — далёкае мінулае (князі, зброя…); гэтыя князі ў кнігах пачуваюць сябе беларусамі ў цяперашнім сэнсе слова, змагаюцца з ворагамі за Радзіму, але хто ведае, якімі былі насамрэч гэтыя самыя князі і кім яны сябе пачувалі; усё гэта для мяне фантастычна, сумніўна;

4) крыніца — расійскамоўны свет з яго менталітэтам, што па волі аўтара загаварыў па-беларуску.

* * *

Неяк праз часопіс “Крыніца” Раіса Баравікова дзялілася сваёй паэтычнай кухняй і гаварыла прыблізна такое: каб пісаць вершы — трэба закахацца. Трэба стварыць для сябе нейкі вобраз. Не абавязкова нават быць знаёмым з аб’ектам свайго кахання. Гэта можа быць і каханне “ў наглядку”, якое рэалізуецца як нейкае ўнутранае пачуццёвае развіццё ў самім сабе. І яно дае вершы. Вычарпана адна крыніца — шукай другую і гэтак далей. Але ці не сізіфава праца — такі бясконцы паўтор, бясконцае вяртанне? І не важна, што міфічнаму Сізіфу было цяжка штурхаць угору свой камень, а ў нашым выпадку чалавек атрымоўвае нібыта асалоду: і рамантыка кахання, і радасць стварэння верша. Сізіфава праца не столькі цяжкая, колькі бессэнсоўная. (Успамінаецца разанаўскае: кожны сапраўдны верш павінен нешта мяняць, выводзіць цябе на нешта іншае.) Для чалавека, можа, такі занятак і не бессэнсоўны: як-ніяк атрымоўваеш асалоду. А вось для паэта…

* * *

“Яны пісалі ў еўрапейскім літаратурным кантэксце…”, “яны былі першымі з нашых пісьменнікаў, хто наладзіў літаратурны дыялог з Еўропай…” — што значаць гэтыя словы? Увогуле, што такое — гэты самы “кантэкст”? Часта хочацца параўнаць яго з нямытым посудам. Нядрэнна ведаць, дзе і хто на гіпербалоідзе талеркі пакінуў недаедзеную шкварку ці агурок, умець знаходзіць сцежкі паміж гэтага “святарнага” смецця. Але найвялікшае шчасце — самому нешта пакінуць на талерцы з недаедкамі!

* * *

Мне смешна чуць: “Што там у нас?… Вось у Еўропе!” Я ў Заходняй Еўропе, на жаль, не быў, але ведаю: Еўропа — гэта і я, гэта і мой менталітэт, свядомасць. Пра тых, хто кажа, што нашае — архаічнае, нееўрапейскае, хачу заўважыць: яны проста не ў стане ахапіць сваім позіркам цэлае, успрыняць усю Еўропу як адзінае.

* * *

Два літаб’яднанні. Старое, беларускамоўнае, узору 1992—1996 гадоў — “Крыніцы”, — што некалі ўтварылася пры газеце “Чырвоная змена”, і новае — “Літаратар” — узору 2000—2001 гадоў. Што іх аб’ядноўвае?

Нібыта другое вырасла з першага. Не змяніўся таксама “галоўны рэдактар” — Алесь Масарэнка…

Час ад часу на новае наведваюцца старыя, ужо з бародамі, такія, як Чаропка ці я. Але хочацца пагаварыць не столькі пра старых, колькі пра новых і сказаць не пра супольнае паміж першымі і другімі, а пра адрозненні.

Старыя. Іх творчасць развівалася разам з беларускім адраджэннем, многія з іх хадзілі на мітынгі. Часам іх беларускасць набывала дзіўнаваты характар: “Вось я паехаў у вёску да дзеда: касіў сена, еў сала, піў самагон…” — і гэта гучала як далучэнне да свету, па-за якім няма беларускасці. У іх было самалюбства: у каго здаровае, у каго хваравітае. Усе імкнуліся да творчага росту, да самарэалізацыі. Я не хачу ідэалізаваць той час: было ўсё. Але гэты свет трымаўся на дрэве беларускай літаратурнай традыцыі.

Новыя — зусім іншыя. Тое, што літаб’яднанне перайшло на расійскую мову і маладыя беларускамоўныя — беларускамоўныя толькі міжсобку, далёка не галоўнае.

Галоўнае — падмурак, на якім яны стаяць: папса (у тым ліку і літаратурная)… Не буду далей пералічаць. У двух словах — яны ўсе костка ад косткі нашага часу…
Яны нібыта прагматыкі: іншыя мараць пра вялізныя наклады ўласных кніг, кажуць пра тое, як зацікавіць, захапіць чытача, пра чытацкія звычкі, псіхалогію (як пра звяра якога, а мэта — шкура?). Ці не ад таго гэта, што яны згубілі здольнасць адчуваць у сабе нешта неўмяшчальнае ў рамкі псіхалагічных і фізіялагічных мадэляў?
Яны будуць пісаць вершы, што чытаюцца як знізу ўверх, так і зверху ўніз, яны будуць пісаць раманы, кожная частка якіх складаецца з таго самага набору словаў, толькі ператасаваных. Яны будуць знаходзіць усё новыя і новыя заканамернасці і сіметрыі гукаў, словаў, фразаў. Вы бачылі зімой, колькі сіметрый мае звычайны крышталік вады — сняжынка? Але прыходзіць вясна, і пашарэлы снег ператвараецца ў ваду, плынь — непрадказальную, жывую.

* * *

Хто такі паэт? За рэдкім выключэннем — істота негарманічная (гэтай негарманічнасці нават апраўданне прыдумалі: нібыта барацьба супярэчнасцей нараджае рух наперад, развіццё), няўстойлівая (сёння ён думае адно, заўтра — другое). Больш таго, наш сённяшні паэт не здольны любіць: ён — Кай з казкі Андэрсена “Снежная каралева”, які знаходзіць задавальненне ў складанні бліскучых кавалачкаў лёду. Успамінаюцца радкі верша Віктара Слінко “Лядзяш я…”:

Там, дзе ёсць, і жыві, і зрабі сябе недатыкальным.
Хай марудна цярушыцца снег у позняй сяўбе.
І адно не забудзь: толькі холад ступае
З кожным крокам
Далей за цябе.
А беларусы ад гэтых самых паэтаў па старой звычцы чакаюць нейкага збавення, прароцтва. Якую беларускасць могуць зберагчы людзі, якія няздольныя зберагчы ўласныя сем’і ці не жадаюць гэтых сем’яў ствараць? Таму я на паэтаў даўно не спадзяюся.

* * *

Беларуская класічная літаратура, літаратурная традыцыя нясе тое ж пытанне выбару паміж дабром і злом, толькі ў нацыянальным вымеры. Апошнім часам яна стала падмяняцца зусім іншым, несапраўдным, агідным: пра культуру і мову, як і творы на ёй, сталі пісаць прафесійныя “плакальшчыкі на памінках” — тыя ж валодзькі ды іншыя. Плакальшчык павядзе адзінай знаёмаю яму дарогай — на могілкі. Для плакальшчыка плач — прафесія, ёю ён зарабляе на хлеб. Я не кажу, што плакальшчыкі ад літаратуры пішуць дзеля ганарараў, уступлення ў Саюз, славы, часта нават не дзеля таго, каб іх бачылі іншыя на п’едэстале — дастаткова самім сябе там бачыць.

* * *

Як было раней? Кожны літаратар быў адначасова ўключаны ў два ланцужкі. Першы — духоўная пераемнасць пакаленняў: моўная, культурная (часта сам творца быў ягоным апошнім звяном). Другі — пераемнасць літаратурнай традыцыі. Так, ад Багушэвіча да Сыса нешта мянялася, але кожны з творцаў (звёнаў ланцужка) захоўваў нейкі як бы “першавобраз”, ён толькі выяўляў яго па-свойму. І захоўваў менавіта дзякуючы духоўнай (культурнай, моўнай) пераемнасці — заўжды было з чым спраўдзіць.

Што маем цяпер? Як мы, маладыя літаратары, імкнуліся “зламаць хрыбет” розным песнярам “вёсачкі” і “роднай старонкі”, не бачачы, што ён ужо зламаны. Усе гэтыя прызнанні ў любові да “вёсачкі”, “старонкі” былі толькі стылізацыямі, нейкай прымітыўнай гульнёй. Гэта як цыганя, што ходзіць па вагонах, прамаўляючы завучаныя словы, і яму кідаюць грошы. Я не ведаю, якія “грошы” былі патрэбны нашым стылізатарам-плакальшчыкам — гэта іх праблемы. Помню, прачытаўшы кнігу Станіслава Валодзькі, моцна абураўся: хопіць ліць слёзы! Падумалася: няўжо ён мог так напісаць, не крывячы душой, шчыра? Адказ я атрымаў, сустрэўшы ягоную ж кнігу для дзяцей на расійскай мове. Вось яна ў мяне сумненняў у няшчырасці аўтара не выклікала — вершы былі жывыя.

Так, ёсць старэйшае пакаленне, ёсць часопісы “Полымя”, “Маладосць”, ёсць газета “ЛіМ”. Але дзе тое пакаленне, якім ад трыццаці да сарака? Ёсць адзінкі, і тое рэдка хто з іх вядзе актыўнае літаратурнае жыццё. Ёсць некалькі чалавек з маладзейшых: той жа Янка Лайкоў. Але надзвычай тонкаю

стала нітачка традыцыі.

[image]
[image]

№ 1 (24) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/02/18**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (24) – 2003**

[image]

[image]

[image]

[illegible]2003
аналізыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

Максім Шчур

Наконт фашызму

1

Доўгі час мы лічылі фашызм ідэалёгіяй. Нашае традыцыйнае разуменьне (ці, хутчэй, неразуменьне) фашызму зьвязанае перадусім з вайной гітлераўскай Нямеччыны супраць Савецкага Саюзу й бальшавізму, з жорсткім падпарадкаваньнем акупаваных “барбарскіх” тэрыторыяў, з абыякавасьцю да чалавечых пакутаў, з мэтадычным вынішчэньнем мільёнаў людзей. То бок, фашызм традыцыйна бачыцца намі як штосьці “ўнікальнае”, “непаўторнае”, “адзінае ў сваім родзе”. Фашызм стаўся для нас сынонімам нялюдзкасьці, бесчалавечнасьці — чагосьці, што нам, людзям, чые продкі мелі няшчасьце быць ахвярамі распачатай фашыстамі вайны, прынцыпова неўласьцівае. Калі мы хочам кагосьці абвінаваціць у нялюдзкасьці — паставіць яго па-за чалавечай маральлю, — мы называем яго фашыстам. Думаючы так, мы забываемся, што найгоршае зло мае найбольш чалавечы твар, што ў вайны, насамрэч, — *жаночае аблічча*, аблічча жанчыны, якая “хоча мець дзіця ад фюрэра”. Мы забываемся, што фашызм пачынаўся як рух ніжэйшых сацыяльных слаёў і адпавядаў

МАКСІМ ШЧУР – пісьменьнік і перакладчык. Жыве й працуе ў Празе чэскай. У “ARCHE-Нашы дзеткі” быў апублікаваны яго пераклад “Алесі ў дзівоснай краіне” Люіса Керала. Яшчэ раней у “ARCHE” публікаваліся Шчуровы пераклады з Багуміла Грабала і верш “Альшанскія могліцы”. У № 10 “Фрагмэнтаў”, даступным толькі ў Інтэрнэце пад адрасам http://

fulhumanty.knihi.com, зыходна
апублікаванае
якуюсьці пэўнай
Сучаснае
заходняе
грамадствазнае
маштабнай
ягоны зарадам
(спробам
тэарэтызацыі)”,
№ 11
— “Росквіт
і заняпад
беларускага
мастацтва
ачмана”.

патрабаваньням большасьці людзей — патрабаваньням прымітыўным, імгненным, “*занадта* чалавечым”, быць сказаць — “*занадта* рацыянальным”.

З гісторыі фашызму вынікае, што той быў і ёсьць больш пэўнай *мэтадал*ёгіяй, чым *ідэал*ёгіяй. Гэтая мэтадалёгія, у гістарычных абставінах нязьменна прапануецца прыхільнікамі ў якасьці ўнівэрсальных “лекаў” ад хваробаў заходняй цывілізацыі. Расавая тэорыя, нацысцкія ідэалёгія й містыка ды іншыя ідэалягічныя ўзьніклі нашмат пазьней за сам фашыстоўскі рух узьніклі з патрэбы надаць фашызму, як самай момант палітычнай плыні, прынамсі нейкае тэарэтычнае абгрунтаваньне. Тэорыя адпачатна была слабым месцам фашызму, бо тэарэтызаваць не было каму: фашыстоўскі рух быў рухам *народным* (рухам ніжэйшых сацыяльных пагарджаў інтэлектуаламі, а сваю дактрыну фармулявалі — калісьці — вырасьлі з клюбаў вэтэранаў першай сусьветнай вайны, і ідэалёгіі ў іх было ня больш, чым у спартовым клюбе альбо ў асяродзьдзі клясычных вулічных гопнікаў. Тыя, хто спрабаваў неяк тую ідэалёгію сфармуляваць, ужо належалі да самых розных палітычных і культурніцкіх плыняў — былі там футурысты, анархісты, сацыялісты, — аднак супольнае ўва ўсіх іх было адно: яны ўсе былі “загартаваныя” вайной і трызьнілі гераізмам. Тыя з гэтай кампаніі, хто быў разумнейшы, вельмі хутка засумавалі й сышлі. Засталіся *дэмагогі* (“правадыры люду”). Іх бальшыня — неадукаваныя былыя ваякі зь ніжэйшых слаёў грамадзтва — не разумела, а таму і лічыла вельмі разумнымі. Тыя гэта адразу адчулі і ўпадабалі. Такім чынам, фашыстоўская тэорыя на пачатку існаваньня руху нічым не адрозьнівалася ад дэмагогіі, галоўным заклікам якой было змагацца супраць абстрактных “ворагаў Італіі”. Ніякай тэорыі тут не было: яна ўзьнікла пазьней у адпаведнасьці з ужо існай практыкай.

2

У пачатку “Ста дваццаці дзён Садому” маркіза дэ Сада чатыры заможныя вычварэнцы ўсталёўваюць у непрыступным замку своеасаблівую “дзяржаву ў дзяржаве”, якая нагадвае вайсковае паселішча. Далёка ад сьвету, пры зачыненых дзьвярах, згодна з

усталяваным раскладам, парушэньне якога бязьлітасна караецца, цягам чатырох месяцаў зьдзяйсьняюцца розныя злачынствы, выканаўцы якіх упэўненыя ў сваёй беспакаранасьці. Невыпадкова, што менавіта гэты сюжэт выкарыстаў для ілюстрацыі сутнасьці фашызму Пазаліні. Апісаньне зьдзейсьненых вычварэньняў і катаваньняў гучыць жудасна — гэтаксама, як і апісаньне злачынстваў фашызму. Аднак, калі высьвятляць, што за ўсім гэтым стаіць, дык аказваецца, што ў ненатуральных схільнасьцях чатырох вылюдкаў няма, так бы мовіць, нічога ненатуральнага. Па-першае, усе чатыры паходзяць з шляхты, але атрымалі багацьце "нешляхетным" шляхам, што дэ Сад прыпісвае разбэшчанасьці кожнага з чатырох. Па крыві гэта шляхцічы, аднак паводле маралі — тыповыя буржуа, галоўнай жыцьцёвай мэтай якіх ёсьць багацьце. Менавіта грошы разбэшчваюць іх і даюць ім магчымасьць бэсьціць іншых. Хаця сам дэ Сад тлумачыць іхную схільнасьць да злачынстваў прыроднай схільнасьцю да кровазьмяшэньня, чым імкнецца падкрэсьліць заняпад іхнага шляхецтва. Па-другое, ува ўсіх чатырох атрыманьне сэксуальнае асалоды зьвязанае зь яе адтэрміноўкай, а сама гэтая адтэрміноўка — маўляў, адмысловы пост — мае строгую часавую структуру, расклад, няўхільнае датрыманьне якога ёсьць для ўсіх чатырох датэрміновым спосабам замяшчэньня сэксуальнае асалоды. Па-трэцяе, усе чатыры настойваюць на як мага больш адкрытым выяўленьні распусты ў як мага больш закрытай прасторы. Таксама яны патрабуюць ад удзельніц сваіх оргіяў дэталёвых споведзяў пра найбольш ганебныя моманты іхнага асабістага жыцьця, атрымліваючы асалоду з вэрбалізацыі таемнага, прычым фармулююць гэты дыскурс і кіруюць ім яны самі. Яшчэ адна цікавая рыса, якая ў фільме Пазаліні затушаваная, праз што драматычнасьць сытуацыі шмат у чым страцілася: у дэ Сада "ахвяры" распусьнікаў ахвотна супрацоўнічаюць з свайміі гаспадарамі, іхны статус — спалучэньне статусу раба й госьця.

Усе вышэйзгаданыя рысы характэрныя для фашыстоўскага руху ад самага пачатку: фінансавая падтрымка вялікага капіталу, асалода падпарадкаваньня й падпарадкоўваньня, сублімацыя жывёльных інстынктаў — перадусім статкавага, барацьба з асабістымі комплексамі шляхам іхнага падпарадкаваньня аднаму вялікаму агульнанацыянальнаму Комплексу,

стварэньне новага, “карнавальнага” дыскурсу, што разбурае старыя табу, для якога няма забаронаў і які ўсім зразумелы менавіта праз сваю вульгарнасьць, а таксама зацікаўленасьць “ахвяраў” у сваім падпарадкаваным становішчы. Нездарма, відаць, кніга дэ Сада была спаленая нямецкімі фашыстамі ў ліку першых, дарма што мела ўсе шанцы стацца падручнікам для фашыстоўскіх катаў.

Акрамя вышэй згаданых рысаў, у Садавых вычварэнцаў з фашыстамі супольнае яшчэ й тое, што і першыя, і другія жывуць паводле сваёй “маралі” (насамрэч “антымаралі”). Гэта азначае, што практыка іхнага жыцьця абсалютна адпавядае “тэорыі”, у чым, як ні парадаксальна, можна бачыць пэўную “надвышэйшую маральнасьць” як у адных, так і ў другіх. *“У герцага не было патрэбы хаваць свае густы, бо ён быў бязбожнік і чыніў супраціў усяму, што несла дабро... Хаця супраць яго стаялі законы грамадзтва, ён даваў ім рады сваім золатам, сваім багацьцем і маёмасьцю, бо тыя законы датычылі адно беднякоў. Калі б яму нехта запярэчыў, што сярод людзей існуе ідэя справядлівасьці, якая ёсьць плёнам прыроды, ён бы з гэтым хоць і пагадзіўся, але сказаў бы, што справядлівасьць — панятак вельмі адносны, бо мацнейшая асоба заўжды пераможа слабейшую, нават калі справядлівасьць будзе на баку слабейшай”.* У адрозьненьне ад Ніцшэ, дэ Сад тлумачыць “права сілы” не прыродай, а людзкой “бязбожнасьцю” з аднога боку, а зь іншага — тым, што справядлівасьць ёсьць у грамадзтве паняткам адносным, а законы грамадзтва не датычаць моцных гэтага сьвету, бо яны могуць дзейнічаць паводле ўласнага ўяўленьня аб справядлівасьці і ўсталёўваць для сябе свае законы. З гэтага гледзішча паводле “маралі моцных” будуць маральнымі тыя дзеяньні, якія ёй адпавядаюць. А што можа быць больш маральным, чым жыць паводле той маралі, якую спавядаеш? Выходзіць, што мараль — рэч “для ўбогіх”, бо моцны чалавек, у адрозьненьне ад бедняка, можа сам быць генэратарам уласнай маралі, якую бядняк (раб, ахвяра) вымушаны прымаць як “грамадзкую”, агульнапрынятую. Дэ Сад, такім чынам, паказвае не “немаральнасьць грамадзтва”, а наадварот, “неграмадзкасьць маралі”, ейную фальшывасьць і рэпрэсіўную ў дачыненьні да большасьці грамадзтва сутнасьць.

3

Амаралізм фашызму ёсьць амаралізмам моцы і ўлады наагул, які ўзьнікае зь ейнага шчырага памкненьня быць як мага больш маральнай. Менавіта таму, пакуль фашызм моцы ня меў, ніякай “маралі”, ці то тэорыі, у яго не было. Была толькі “бязбожнасьць”, альбо прага дасягнуць улады любым коштам, падобная да жаданьняў пэрсанажаў дэ Сада. “Бязбожнасьць” гэтая, як паказвае дэ Сад, узьнікла з пэўнай *практыкі* і ўсталявалася разам зь ёй: *“Ягоны* (герцага — *М.Ш.*) *бацька памёр вельмі малады, а ў сваім запавеце пакінуў пункт, паводле якога сын павінен быў значную частку маёмасьці даць у карыстаньне матцы, пакуль тая будзе жыць. Гэтая ўмова хутка прыйшлася герцагу недаспадобы. Ягоная разбэшчаная натура знайшла спосаб усьмерціць маці з дапамогай атруты, і ён адразу ж вырашыў яго скарыстаць… Нікога нішто так не ўзбуджае, як першае непакаранае злачынства”.* Схільнасьці астатніх нягоднікаў дэ Сад тлумачыць тым самым чынам — апісвае іхныя злачынствы ў мінулым. Іншага тлумачэньня знайсьці немагчыма: толькі злачынная *практыка*, а ня нейкая тэорыя здольная зрабіць злачынцу злачынцам. Практыка гэтая абумоўленая сыстэматычнай беспакаранасьцю злачынцаў: *“…А што да злачынстваў, якія былі з усім гэтым зьвязаныя, дык тады людзі жылі ў стагодзьдзі, калі злачынствы збольшага заставаліся нераскрытымі й беспакаранымі. Таму нашым вычварэнцам усё сыходзіла з рук і яны ня мелі найменшага страху перад наступствамі сваіх учынкаў, бо ім ня трэба было баяцца нічога, акрамя толькі павярхоўнага сьледзтва”.* Карэньне ўсялякай злачыннай практыкі палягае ў недастатковай сацыялізацыі. Прасьцей кажучы, выхаваньне асобы плюс экзыстэнцыйная неабходнасьць зьдзяйсьненьня злачынства — матэрыяльная незабясьпечанасьць. Калі мы зірнём на асобы заснавальнікаў фашыстоўскага руху, дык заўважым, што іх яднае неадукаванасьць і непрывілеяванае сацыяльнае становішча іхных сем’яў. Што да матэрыяльнай незаможнасьці, дык у пасьляваеннай Эўропе, натуральна, існавала экзыстэнцыйная неабходнасьць зь ёю змагацца. Аднак змаганьне *зь* ёю вачыма вэтэранаў першай сусьветнай бачыцца як змаганьне *супраць* тых, хто стаўся яе прычынай, — супраць *ворагаў народу*. Каб ня гэтыя ворагі, фашызм ніколі б не адыграў у гісторыі якой-небудзь значнай ролі — Кастрычніцкая

рэвалюцыя й магутны сацыялістычны рух у Эўропе, што напужалі да сьмерці прамысловую буржуазію й мяшчанства, ускосна спрычыніліся да ўзьнікненьня фашыстоўскіх рэжымаў. Калі б не было левага руху, “барацьбітам” не было б супраць каго весьці сваю барацьбу.

Паводле свайго бачаньня ворагаў, пасьляваеннае грамадзтва падзялілася напалам: частка грамадзтва пад уплывам сацыялістычных ідэяў верыла ў тое, што ворагі насамрэч — ня вонкавыя, а *ўнутраныя*; што сапраўдныя ворагі — ня хто іншы, як прамысловыя магнаты, якія зарабілі на вайне мільёны. Гісторыя распарадкавала так, што значная частка гэтых людзей па паходжаньні габрэі. Што парадаксальна, габрэйскага ў гэтых габрэях было надзвычай мала, хіба толькі выгляд. Бадай, менавіта таму фашыстоўская “расавая тэорыя” павінна была абапірацца на зьвесткі так званай “фрэналёгіі”, якая тэндэнцыйна інтэрпрэтавала некаторыя антрапамэтрычныя паказьнікі. То ж бо габрэі, якія дасягнулі ў грамадзтве больш-менш высокага становішча, імкнуліся як мага хутчэй інтэгравацца ў гэтае грамадзтва й успрыняць ягоную культуру й мараль. Прыкладам гэтаму можа быць той самы Франц Кафка, стасункі якога зь юдаізмам і традыцыйнай габрэйскай культурай былі даволі павярхоўнымі, хаця ягоная сям’я належала да багацейшай часткі габрэйскай грамады. “Сьвядомымі” ж габрэямі былі якраз бяднейшыя прадстаўнікі габрэйскага народу, пераважна — дробныя гандляры, рамесьнікі й работнікі, якія адначасова былі найбольш адукаванай часткай пралетарыяту, бо ў габрэйскім асяродзьдзі традыцыйна ўсе дзеці ад малых гадоў умелі чытаць і пісаць. Гэтым, мажліва, тлумачыцца сымпатыя габрэйскага пралетарыяту да марксізму, якая таксама была выкарыстаная фашыстамі для распальваньня варожасьці да габрэяў наагул. Супольнае паміж габрэем-банкірам і габрэем-марксістам адно: абодва абавязаныя сваім становішчам адукаванасьці. Як марксісцкія пераканаьні адной часткі габрэяў, так і заможнасьць другой адыгралі злавесную ролю ў далейшым лёсе ўсяго габрэйскага народу, якому хрысьціяне-немцы не даравалі ягонае здатнасьці.

Заходняе грамадзтва перажывала сацыяльны раскол, выкліканы сацыялістычнымі ідэямі, таму галоўнай мэтай і жаданьнем буйных прамыслоўцаў і фінансістаў было запабегчы гэтаму

расколу і ўтаймаваць сацыяльныя жарсьці. Гэтак у процівагу расколу сацыяльнаму (пры якім вінаватымі ўжо не ў ваеннай паразе, а ў самой вайне застаюцца моцныя гэтага сьвету) буйны капітал правакуе раскол *нацыянальны*. Тады як нямецкі пралетарыят (які паводле сваёй адукацыі заслугоўвае хутчэй найменьня люмпэн-пралетарыяту) бачыць у фашыстах змагароў супраць вялікага капіталу (перадусім габрэйскага) — мяшчане й дробная буржуазія бачаць у фашыстах змагароў з габрэямі-камуністамі.

Дзіўна, як вокамгненна абедзьве вышэйзгаданыя часткі грамадзтва аб'ядноўваюцца пад крылом фашысцкага руху ў палітычна адзіную структуру, да таго ж змацаваную нацыянальным фактарам. Адпачатна адны змагаюцца за сацыяльныя пераўтварэньні, другія — супраць хаосу. Тое, што адным бачыцца як прагрэс, другія ўспрымаюць як руйнаваньне традыцыйных асноваў грамадзтва. Але, нягледзячы на гэта, іх аб'ядноўвае сама "ідэалёгія змаганьня" й нацыянальнае самаўсьведамленьне. Як бачым, фашыстоўская ідэалёгія — адпачатна дзівацкі гібрыд люмпэн-сацыялізму, антыкамунізму і ўра-патрыятызму.

Такое вырашэньне сацыяльнага падзелу з дапамогай падзелу нацыянальнага, калі роля "ахвярных казлоў" была ўскладзеная на габрэяў і камуністаў, магчыма, было вынайдзенае фашыстамі, аднак зьдзейсьненае было *выключна* ў інтарэсах буйнога капіталу. Менавіта буйны капітал выкарыстаў фашыстоўскі рух (складзены пераважна з прадстаўнікоў сярэдняй клясы, сялянаў і люмпэн-пралетарыяту) дзеля таго, каб захаваць уладу. Менавіта добрыя стасункі паміж дзяржавай і фашызмам паспрыялі прыходу фашыстаў да ўлады. Але, тым ня менш, фашысты не схацелі заставацца толькі інструмэнтам у руках капіталу, а, наадварот, самі ператварылі яго ўва ўласны інструмэнт.

4

Чаму "амаралісты", здавалася б, так лёгка здабылі дзяржаўную ўладу? Таму што "моцныя сьвету" выракліся "агульнаграмадзкай" маралі, маралі "для ўбогіх", і ўсталявалі мараль уласную, мараль/права моцы. Фашыстам прапанавалі грошы за шэраг неафіцыйных захадаў з мэтай навесьці жах на сацыялістычны рух, каб запабегчы ягонаму шыраньню.

Найбольш эфэктыўным сродкам стаўся тэрор — у гэтым сэнсе “чорнакашульнікі” былі дакладнай копіяй расійскіх “чарнасоценцаў”. Фашысты не спрачаліся, не крычалі пра сябе (да пары) — яны дзейнічалі. Забівалі на замову прадстаўнікоў сацыялістычнага руху, левых дэпутатаў парлямэнту, грамілі рэдакцыі сацыялістычных газэтаў, зьнішчалі тых, хто быў западозраны ў сымпатыях да камуністаў, — карацей, праводзілі ў жыцьцё клясычную “культурную рэвалюцыю”, рабілі чысткі. Рукамі фашыстаў (раз выкарыстаць войска ці іншыя сродкі ўладзе не дазваляла “мараль”) сацыялістычны рух быў паступова задушаны. Галоўнай зброяй “чорнакашульнікаў” быў фізычны гвалт, але галоўнай сілай — боязь большасьці насельніцтва.

Пасьля перамогі фашыстаў над шырокім сацыялістычным рухам фінансавая буржуазія была амаль гатовая іх ліквідаваць з дапамогай войска, паколькі яны былі ёй больш не патрэбныя. Але як толькі ўлада вырашыла “немаральна” абысьціся з фашыстамі, з амаралістаў яны раптоўна сталі “маралістамі” й залямантавалі на ўвесь сьвет, што ўлада вырашыла “разьлічыцца” (прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці) з змагарамі за Італію. Як бачым, паняткі таго часу мяняюцца месцамі: фізычны гвалт стаецца сродкам зьдзяйсьненьня справядлівасьці, а рэалізацыя права — сродкам помсты.

Ад каго заўгодна, але не ад фашыстаў улада чакала такога абвінавачаньня. Таму, не пачуваючы на сваім баку “маральнага права”, яна мусіла саступіць іхнаму шантажу.

Заўважым, што менавіта *беспакаранасьць* фашыстоўскіх злачынстваў і поўная *дэмаралізацыя* буржуазна-дэмакратычнай улады сталіся двума галоўнымі стымуламі для фашыстаў у іхным змаганьні за ўладу. Уся папярэдняя *практыка* фашыстоўскага руху з гледзішча “грамадзкай маралі” — амаральная. Гэтак гартавалася фашыстоўская ідэя аб тым, што права й права сілы — гэта тое самае.

Гэткае імклівае ўзыходжаньне фашызму на вяршыню дзяржаўнай улады бадай кожным успрымалася як нейкі цуд. Тыя, хто дагэтуль лічыў, што фашысты змагаюцца за справядлівасьць, раптам убачылі, што справядлівасьць перамагла! Тыя, хто так не лічыў, з часам альбо пачалі так лічыць, альбо былі фізычна зьнішчаны. Першымі ахвярамі фашыстоўскіх канцлягераў у Нямеччыне (упершыню

прыдуманых, дарэчы, не бальшавікамі, а ангельцамі падчас англа-бурскай вайны; некаторыя немцы былі вялікімі прыхільнікамі ангельскага каляніялізму) сталі сябры й сымпатызанты сацыялістычнай і камуністычнай партыяў, сярод якіх было шмат габрэяў. Парадаксальным чынам фашыстоўскі тэрор супраць сацыялістычнага руху, а пазьней — усталяваньне фашыстоўскай дыктатуры ў Італіі й Нямеччыне паспрыялі ўзмацненьню сталінскага рэжыму ня меней, чымся Кастрычніцкая рэвалюцыя паспрыяла ўзьнікненьню самога фашызму: на зьнішчэньне левых актывістаў і мілітарызацыю фашыстоўскіх дзяржаваў Сталін адказаў зьнішчэньнем "клясавых ворагаў", калектывізацыяй, выкрыцьцём "фашыстоўскіх шпіёнаў". Як бачым, фашызм пачаў шкодзіць нам задоўга да акупацыі нашай тэрыторыі рукамі свайго "хаўрусьніка" — сталінізму.

5

Яшчэ да ўзяцьця ўлады Мусаліні прадказваў: *"Няма сумневу, што фашызму й дзяржаве наканавана — магчыма, у досыць блізкім часе — стацца адным і тым жа".* Пасьля свайго абраньня прэм'ерам ён абвяшчае: *"Наша жорсткая татальная воля будзе суправаджацца яшчэ большай цьвёрдасьцю... Усе міністры й дзяржаўныя кіраўнікі — жаўнеры: як жаўнеры, яны павінны рушыць туды, куды ім загадвае камандзір, і спыніцца, калі я ім загадаю... Дысцыпліна зьнізу даверху павінна быць не фармальнай, а сапраўднай і тыпова рэлігійнай, што азначае — абсалютнай... Падпарадкаваньне павінна быць абсалютным і сьляпым".*

Наступным крокам фашызацыі грамадзтва ёсьць патрабаваньне ад усіх грамадзянаў падпарадкаваньня "найвышэйшай маралі", якое наперад закладае вырачэньне маралі асабістай, альбо традыцыйнай. Пасьля такога вырачэньня якім яшчэ можа быць падпарадкаваньне, калі не сьляпым? Калі жаўнер дае прысягу, ён клянецца падпарадкавацца менавіта гэтай найвышэйшай маралі, прапанаванай яму зьверху. Зразумела, пры гэтым ён не ўсьведамляе, што тым самым адмаўляецца ад маралі іншай — пакуль яна ў яго, безумоўна, ёсьць. Людзі-вернікі, прыкладам, не ідуць у войска менавіта з той прычыны, што ня могуць адмовіцца ад сваіх асабістых маральных ідэалаў. Менавіта акт прысягі робіць з чалавека жаўнера. Невыпадкова, што менавіта

войска — традыцыйна найбольш фашызаваная частка грамадзтва. Варта сьцьвердзіць, што мілітарызацыя грамадзтва й ягоная фашызацыя — гэта аднародныя працэсы, якія ідуць крок у крок. Варта згадаць, што апошнім часам у Расіі вялікая ўвага аддаецца так званаму патрыятычнаму выхаваньню, у якое ўваходзіць і традыцыйная “страявая падрыхтоўка”.

Як і ў войску, неабходным момантам усталяваньня фашыстоўскага грамадзтва ёсьць барацьба зь *іншадумствам*. Іншадумцы могуць быць двух кшталтаў: ворагі (тыя, хто цалкам адкідае “найвышэйшую мараль”) і несьвядомыя (тыя, хто ляяльна ставіцца да існага ладу, але парушае заведзеную ім дысцыпліну). Ворагаў фашыстоўскае грамадзтва імкнецца выштурхнуць за свае межы, ізаляваць альбо зьнішчыць; несьвядомых — наадварот, уцягнуць у сваю арбіту і ўпісаць ува ўсталяваныя рамкі. Часткай барацьбы зь іншадумствам ёсьць завядзеньне цэнзуры ў адных і закрыцьцё іншых сродкаў масавай інфармацыі. Прыгледзеўшыся да сучаснай Расіі, можна сказаць, што тая памалу ідзе сьцяжынай “татальнага й сьляпога падпарадкаваньня” дзяржаве, якая ў жыцьці расійскага чалавека, маўляў, заўжды адыгрывала значную ролю. Тут варта адзначыць, што чэскі філёзаф Эган Бонды называе фашызм *“толькі прэлюдыяй татальнага маніпулятарскага этатызму”* (ад франц. *état*, “дзяржава”). А таксама нагадаць, што зьяўленьне “найвышэйшай маралі” абавязанае перадусім крызысу маралі традыцыйнай (у выпадку постсавецкіх дзяржаваў — сацыялістычнай) і зьяўляецца адной з адзнакаў пераходнага пэрыяду.

Гэтаксама калі беларускі прэзыдэнт прамаўляе аб сваіх сымпатыях да ўсталяванага Гілерам “парадку”, ён, вядома, не ўхваляе нацысцкай *ідэалёгіі*, але абедзьвюма рукамі галасуе “за” ейную мэтадалёгію, за сам спосаб усталяваньня гэтага парадку. Сьвядомае й рашучае адмежаваньне Лукашэнкі ад нацыянальнай культуры мае яшчэ й тую прычыну, што гэта дае яму магчымасьць разглядаць носьбітаў беларускай культуры як нацыянальна чужы элемэнт, каб магчы абвінаваціць іх ува ўнутранай нестабільнасьці дзяржавы. Такім чынам, беларускія нацыяналісты для Лукашэнкі — аналяг габрэяў і камуністаў у фашыстоўскай Нямеччыне.

Параўнаць палітыку Лукашэнкі з палітыкай фашызму дазваляе менавіта мэтадалёгія яе рэалізацыі: насаджэньне ўсюдыіснага

дзяржаўнага кантролю як вынік памкненьня правадыра ўзяць на сябе асабістую адказнасьць за ўсе палітычныя крокі ўлады й гарантаваць ім падтрымку сваёй папулярнасьцю, паступовая легалізацыя дыктатуры пры дапамозе “пад сябе” напісаных законаў і рэфэрэндумаў, маніпуляцыя масамі праз дэмагогію й папулісцкія захады, дзяржаўнае кіраваньне курсам валют, стварэньне масавых “добраахвотных арганізацыяў”, патаемнае зьнішчэньне нязгодных зь ягонай палітыкай дзяржаўных функцыянэраў — усё гэта ёсьць чыстай вады фашызмам! *“Мы ўтаймавалі парлямэнтарызм”,* — мог пахваліцца ўжо на другі год свайго ўладараньня “ўсенародна абраны” італьянскі прэм’ер Мусаліні. — *“Выканаўчая ўлада прысутнічае ў жыцьці народу паўсюдна. Яна ёсьць сілай, што дзейнічае кожную хвіліну... Гэты рэжым ільга скінуць толькі гвалтам”.*

6

Узьнікае пытаньне: ці толькі боязь прымушала людзей падтрымліваць фашызм? Аднак падтрымлівалі не фашызм — падтрымлівалі ўсталяваны фашыстамі *“парадак”*, які, паводле трапнага азначэньня беларускага прэзыдэнта, “формировался веками” й цяпер дасягнуў свайго сапраўднага росквіту ў выглядзе таталітарнай дзяржавы. Гэта быў той самы рацыяналістычны парадак, які ад XVII стагодзьдзя пачаў стварацца ў абсалютысцкай Эўропе й падпарадкаваў сабе ўсё — ад казармаў і астрогаў да шпіталяў разумова хворых. *“Якое заўгодна парушэньне занатоўвалася ў карную кнігу. Экзэкуцыі праводзіліся ў суботы — падчас сьвяточных оргіяў. Правіны дзяцей караліся нашмат стражэй, чым грахі дарослых. Караліся няўважлівасьць, непавага й недастатковае абагаўленьне гаспадароў, сьмех у неадпаведным месцы. Калі хтосьці з дарослых падданых быў засьпеты за суложжам, на якое ня меў дазволу гаспадароў, яму адсякалі палец”* (дэ Сад, “Сто дваццаць дзён Садому”).

Варта сказаць, што дэ Сад быў своеасаблівым папярэднікам Мішэля Фуко й ягонай крытыкі рацыяналістычнага грамадзтва, якое ў XX стагодзьдзі ператварылася ў грамадзтва тэхнакратычнае. Зьдзек з прыроды, зь цела дзеля іх “удасканаленьня”, паступовае ператварэньне чалавечага цела ў машыну й далейшае ягонае зьнішчэньне з дапамогай машыны, абыходжаньне зь ім як з рэччу, безуважнае стаўленьне да

чалавечых пакутаў — усё тое, што яднае абсалютызм і тэхнакратызм з садызмам, і ёсьць сутнасьцю мэтадычных фашыстоўскіх “экспэрымэнтаў” над чалавечымі целамі, якімі фашызм заслужыў вечную нянавісьць чалавецтва. Дэ Сад паказвае, што ад ілжы, крывадушнасьці, блюзьнерства, ад зьдзеку з душы да зьдзеку з цела — адзін крок. Прычым гэты крок заўсёды робіцца дзеля “навядзеньня канчатковага парадку”, а ягоны зьдзяйсьняльнік стаецца ахвярай уласнай хваравітай прагі датрыманьня пасьлядоўнасьці ў сваіх дзеяньнях любым коштам.
Само сабою жаданьне парадку ня ёсьць злом з гледзішча традыцыйнай маралі. Абагаўляльным прыкладам для Гітлера доўгі час была Брытанская імпэрыя: у фюрэра выклікала захапленьне, як гэтая краіна пры дапамозе толькі вайсковай сілы здольная трымаць у падпарадкаваньні большае ў некалькі разоў насельніцтва Індыі. Калі б ня гэты прыклад, Гітлер ніколі б не пачаў вайны на ўсходзе: ён лічыў, што для Нямеччыны сваёй Індыяй павінна быць Расія. Як бачым, Гітлер ня меў ніякіх іншых памкненьняў, акрамя ператварэньня Нямеччыны ў каляніяльную імпэрыялістычную дзяржаву на клясычны эўрапейскі ўзор.
Таму можна сказаць, што нічога асабліва арыгінальнага для гісторыі чалавецтва фашызм не прынёс. Усе ягоныя адметныя рысы былі ўжо часткова ўласьцівыя заходняй цывілізацыі. Больш за тое, яны ўласьцівыя ёй і сёньня. У выніку сваёй прыроднай амаральнасьці фашызм выдатна спалучальны як зь нямецкім нацызмам, так і з расійскім шавінізмам, як з амэрыканскім імпэрыялізмам, так і з савецкім патрыятызмам.

7

Нарадзіўшыся з “паўстаньня масаў”, фашызм ператварыўся ў найбольш дасканалую прыладу іхнай эксплюатацыі: мабыць, усялякай ідэалёгіі, закладзенай на *“памылковай ідэі аб роўнасьці людзей”*, як пісаў Артэга-й-Гасэт, — то бок на ідэі падабенства, аднолькавасьці людзей міжсобку, якая ёсьць перадумовай усялякай “масавасьці” і дысцыпліны, — з часам наканавана ператварыцца ў тыранію. Менавіта прыхільнікам тыраніі фашызм здаецца найлепшай мадэллю кіраваньня дзяржавай — толькі што ажыцьцяўленьне такой мадэлі патрабуе поўнай беспадкантрольнасьці дзяржаўнага апарату —

а значыць, патрабуе таго, каб насельніцтва поўнасцю выраклася сваіх грамадзянскіх свабодаў і чалавечых правоў. Паводле дэ Сада, правы чалавека ёсьць “правамі бедняка”, між тым як правы багатыра далёка перасягаюць межы правоў чалавечых — і боскіх. *“Хутка вы пераканаецеся, што ў існаваньне Бога, якое ёсьць спарудай хворых мазгоў, сёньня ў сьвеце мала хто верыць… Мяркуйце самі: калі б Бог існаваў і быў усёмагутны, ці дазволіў бы ён, каб цнота, якая, маўляў, ёсьць акрасай і якую вы спавядаеце, мусіла адступіць перад паскудзтвам? Калі ён такі ўсёмагутны, як тады магчыма, што такое дробнае стварэньне, як я, можа бясьпечна блюзьнерыць і абражаць яго, як я гэта штодзённа раблю?”* (Дэ Сад, “Сто дваццаць дзён Садому”). Менавіта беспадкантрольнасьць і амаралізм дзяржавы, абгрунтаваныя фальшывымі вартасьцямі традыцыйнай маралі “для беднякоў” (на чым бы тая ні грунтавалася: хрысьціянстве, ісламе альбо юдаізьме), і варта сёньня называць фашызмам.

Фашызм выдае сябе ўжо сваім дыскурсам, да якога належыць ня толькі зразумелая ўсім мова гвалту, якая хутка набывае статус дзяржаўнай, але й вульгарнасьць, якая ёсьць зарукай “зразумеласьці” фашыстоўскай дэмагогіі для шырокіх мас. Фашысту ўласьцівыя шырокія жэсты й гучныя словы, заклікі й праклямацыі. Аднак звычайна за імі няма ніякіх канкрэтных ідэяў, ніякай ідэалёгіі. Таму найлепшым сродкам барацьбы з фашызмам ёсьць вывучэньне фашызму, ягоных тэхнік і грамадзкіх вытокаў, што дапамагае выкрыць ягоную ідэалягічную пустэчу. Для пачатку трэба навучыцца не давяраць тым, хто абяцае заўтра ж навесьці “парадак”, зьнішчыць карупцыю, вырашыць усе праблемы, калі толькі сёньня вы яго аберацё, а ўзамен за гэта патрабуе поўнага даверу й падпарадкаваньня. Змагацца за свабоду — азначае змагацца за абмежаваньне ўсёмагутнасьці дзяржавы, змагацца за дэмакратыю — азначае змагацца з фашызмам, у тым ліку (і, мажліва, перадусім) — дзяржаўным.

P. S.: Ідэалёгія вялікарасійскага фашызму

У апошні час у Расіі распаўсюдзіўся вульгарны, так бы мовіць, “народны” фашызм, які зьяўляецца ня толькі звычайнай часткай штодзённага жыцьця, але й часткова падтрымліваецца дзяржавай у якасьці новай “нацыянальнай ідэі”. Галоўным

складнікам гэтай ідэалёгіі зьяўляецца, натуральна, савецкі патрыятызм, ці, дакладней кажучы — *рэваншызм*, як і ў міжваеннай Нямеччыне, толькі постсавецкі. Носьбіты гэтай ідэалёгіі — перадусім вышэйшыя вайсковыя кадры, якімі нанава ствараецца міт аб непераможнай гіпэрдзяржаве, якая паўстала з попелу пасьля таго, як была "здраджаная" дэмакратамі й аддадзеная на паняволеньне Захаду. Тое, што сталася *прычынай* распаду СССР, а менавіта эканамічны заняпад краіны, выстаўляецца імі як *вынік* гэтага распаду. Другім складнікам, ці адваротным бокам мэдаля гэтай ідэалёгіі, зьяўляецца традыцыйны вялікарасійскі *шавінізм* — хаця ў сучасных варунках лепей было б сказаць *расізм* — у адносінах да нерасійскіх народаў. Пасьля добраахвотнага зьнікненьня са сцэны традыцыйнага "ворага" расійцаў — габрэйскай меншасьці ейнае месца занялі прадстаўнікі каўкаскіх і іншых нацыянальнасьцяў былога СССР. У чым прычына пашырэньня такога расізму? Безумоўна, каляніяльная савецкая сыстэма, якая ставіла расійцаў у прывілеяванае становішча й таму выклікала да іх нянавісьць з боку прадстаўнікоў іншых, перадусім неславянскіх нацыянальнасьцяў. Усьведамляючы, што найлепшай абаронай ёсьць напад, расійцы ўсюды імкнуліся дадаткова ўціскаць неславянаў, каб замацаваць сваё вышэйшае становішча — напрыклад, у войску. Пасьля распаду Савецкага Саюзу ўсё гэта паўплывала на стаўленьне да расійцаў у незалежных неславянскіх рэспубліках, асабліва ў рэспубліках, якія не атрымалі незалежнасьці й засталіся суб'ектамі Расійскай Фэдэрацыі (Ічкерыя).

Акрамя таго, прычынай можа быць таксама высокая эканамічная актыўнасьць перадусім каўкасцаў, якая распачалася шчэ за часоў і ў межах СССР — варта сказаць, што каўкасцы былі першай самастойна ўзьніклай "зьнізу" эканамічна эмансыпаванай групай савецкага насельніцтва. Акрамя іх былі толькі дзьве эканамічна перадавыя групы, якім яны ствараліканкурэнцыю: арганізаваная злачыннасьць і савецкая бюракратыя. Абедзьве яны складаліся пераважна з расійцаў. Сёньня, калі яны, фактычна аб'яднаўшыся, прыйшлі да ўлады ў Расіі, у іх зьявілася магчымасьць выціснуць з зоны свайго эканамічнага панаваньня каўкасцаў.

Спытайма: што ў новай вялікарасійскай нацыянальнай ідэі

ўласна нацыянальна расійскага? Лічыць гэтую “новую расійскую” ідэалёгію менавіта расійскай папросту немагчыма, бо ейным падмуркам ёсьць, па сутнасьці, не расійскі, а савецкі патрыятызм. Якім чынам сталася, што Расія прэтэндуе цяпер на ролю спадкаемцы ня толькі Савецкага Саюзу, але й Расійскай Імпэрыі? На якой глебе, акрамя вялікарасійскага шавінізму, магчымае спалучэньне дзьвюх неспалучальных дзяржаўных ідэяў? Сапраўдныя гісторыя й культура колішняй дасавецкай Расіі застаюцца сёньня атрыбутамі, якія, хоць і не зусім пасуюць постсавецкай дзяржаве, тым ня менш, злоўжываюцца ёю менавіта з мэтай умацаваньня міту аб “Вялікай Расіі”. Новая расійская эліта трактуе дасавецкую гісторыю паводле ўласнай патрэбы — пры гэтым яна робіць выгляд, што быццам не заўважае розьніцы паміж сваёй і традыцыйнай савецкай трактоўкамі дакастрычніцкай гісторыі Расіі, з аднога боку, а зь іншага — як быццам не ўсьведамляе патрэбы прызнаньня памылак савецкага часу, ані прызнаньня ўнёску іншых народаў у дасягненьні савецкіх часоў. Таму эліта ўвесь час імкнецца затушаваць розьніцу паміж дасавецкім і савецкім пэрыядамі расійскай гісторыі, ствараючы ілюзію простай (наўмысна спрошчанай) пераемнасьці паміж царскай і бальшавіцкай Расіяй.

Але ўсё адно трэба адзначыць, што “расійская ідэя” так ці іначай нарэшце ператвараецца з ідэі патрыятычнай, унівэрсальнай, вялікарасійскай, у ідэю нацыянальную, дзяржаўную, расійскую. Аднак пры гэтым ня толькі сьвядомасьць расійскага чалавека робіцца “дзяржаўнай” (чаго, відавочна, імкнецца дасягнуць Пуцін), але й ідэалёгія дзяржавы пераймае некаторыя элемэнты народнай сьвядомасьці — таго ж шавінізму. Ці будзе расійская нацыянальная (“дзяржаўная”) сьвядомасьць дэмакратычнай, залежыць ад ступені дэмакратычнасьці расійскай дзяржавы.

Цікава, што і ў Беларусі, як і ў іншых постсавецкіх рэспубліках, хоць і марудна, але ж адбываецца фармаваньне нацыянальнай сьвядомасьці новага ўзору. На жаль, у ёй пакуль што мала традыцыйных, самастойна беларускіх элемэнтаў, бо дзяржава імкнецца скарыстаць увесь свой уплыў, каб ачысьціць ад іх грамадзкую сьвядомасьць і зрабіць беларускую нацыянальную ідэю як мага больш стэрыльнай і прыстасавальнай да нацыянальнай ідэі расійскай. На сёньняшні дзень Лукашэнка

застаецца адным з носьбітаў “вялікарасійскай” ідэі, якая па сваёй сутнасьці ёсьць фашыстоўскай. Ува ўсякім разе, спалучальнасьць такой беларускай нацыянальнай ідэі з расійскай нацыянальнай ідэяй новага ўзору наўпрост залежыць ад долі шавінізму, утрыманага ў апошняй, — якая, у сваю чаргу, залежыць ад уплыву сілавых структураў на расійскае грамадзтва і кіраўніцтва. Да якой бы сэрвільнасьці ў дачыненьні да Расіі ні імкнуліся прывучыць беларусаў, паступовае ператварэньне Расіі ў пазбытую імпэрскіх амбіцыяў дэмакратычную дзяржаву пазбаўляе прарасійскую нацыянальную палітыку сёньняшняй беларускай дзяржавы ўсялякага сэнсу. У такіх умовах падмуркам афіцыёзнай беларускай нацыянальнай ідэі пэрыяду дыктатуры стаецца асабістая вернасьць “бацьку”, ляяльнасьць да рэжыму Лукашэнкі ці, як мінімум, — маўклівае прызнаньне ягонай легітымнасьці.

[image]
[image]

№ 1 (24) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/02/18
[image]

Алесь Макрацоў

---

* * *

Ваўкі —
па сьведчаньні дрэў —
бяскрыўдныя істоты,
якія бароняць лес:
ад грызуноў-ласёў,
ад грызуноў-аленяў,
ад грызуноў-казуль,
ад грызуноў-зайцоў…

Здараецца —
ад чалавека.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/02/18**
[image]

Віталь Стахіевіч

Парнаграфія

I

Мікрадуэль у задушным трамваі,
Сонца морыць на сон.
Тонкія ногі, дзяўчына ў спадніцы
Думкі мае чытае.
“Хоча”, — мільгоча. — Ня хоча… Хоча…”
“Так. — Або не. — Або так? — Або не…”
Вочы ў зьдзіўленьні глядзяць на мяне
І ледзьве чутна рагочуць.
“Хоча. — Ня хоча. — Ці хоча? — Ці не…”
Думкі мае паглынаюць мяне.

Столькі глынуць немагчыма адразу —
Кашаль з ванітамі б’е.
Горла прастылае шэпча нязвыкла,
Голас знаёмы гучыць бессаромна,
І паскараюцца рухі дрыготка,
Кідае ўбок на крутым павароце,

Ён прытуляецца, пальцам праводзіць,
Рубам далоні песьціць мяне…

Перадапошні далёкі прыпынак,
Ногі прастуюць прэч.
У расчараваных вачах застаецца
Бледна-ружовы задушны салён
З пахам парфумы і спэрмы.

II

Цёмная справа… Цёмная зьлева —
Побач мяне дзьве дзяўчыны-брунэткі,
Ноч за акном залатога трамвая,
Соладка пахнуць іх потныя целы,
Мокрыя майкі іх станы мілуюць,
Пухкія вусны адной прыадкрыты,
Штосьці праз пэйджэр чытае другая.

Вечны трамвай сваім вечным матывам:
Музыка, кніга і сэкс на прыпынку.
Вокны дамоў, дзе чакаюць жанчыны,
Пахне нарцызамі, парыцца кава.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/02/18**

Мікола Нікановіч

Журавіны (паэма)

Дорога назад — дорога к смерти, она закрыта…
Максім Горкі

I

Вось з чаго пачалося:
— былі самыя прыкрыя размовы з самымі прыкрымі таварышамі. (Зразумела, “таварышы”, як азначэньне ў самым вузкім сэнсе.) Былі дарэмныя блуканьні па розных рэдакцыях, каб атрымаць не аванс (як гэта некаторым думаецца), але атрымаць свае ўжо даўно запрацаваныя рублі. Вось пасьля такіх прыкрых сутычак, я, зусім разьбіты і сьцёрты ў лепшых жаданьнях, ледзь-ледзь дацягнуўся на сваю кватэру.
А ўсе часы перад гэтым днём, калі бываў самы добры настрой, я ламаў галаву над распрацоўкаю аднаго сюжэту. Ён мяне, праўда, увесь час вельмі захапляў. Я аддаваў дзеля яго ўсё, што толькі было ў мяне самае найлепшае. Бо ў такія разы я нават забываўся і на ежу; толькі ўначы, калі ўжо клаўся адпачываць і браў, па прывычцы, прачытаць кніжку — нешта такое давала

ведаць, што я… Ну, але гэта няважна!..
Важна тое: сёньня была глухая пустата. Сапраўдная і жудасная пустата. Бываюць жа такія дні!..
Я, ад зморанасьці і шэрагу непрыемнасьцяй, як прыйшоў дык і ўваліўся ў крэсла ды ўтаропіўся вачыма ў адну кропку. Была тады ў мяне нейкая ціхая, павольная, забросьненая плынь думак.
Ды што я кажу?! — ніякіх не было думак. Бо расплыліся яны шэрым і цяжкім восеньскім туманам.
А супроць майго акна, на шырокім і брудным пасялковым двары, ужо прагна цягнулася да сонца маладая, жоўта-зялёная шчаціна сакавітай травы.
Тут жа чарнелі брудныя плямы. Гэта ж вось за зіму рупныя гаспадыні назьлівалі пасярод двара цэлыя кучы рознага сьмяцьця і памыяў. Яны густа прэлі пад сонцам і ад гэтага цягнула смуродам. Тады ў маёй памяці, як жывое, паўстала суседняе ля маёй вёскі сяло, дзе ні ўвесну, ні ўлетку ніколі не прасыхала.
Пад акном сакаталі куры. На кучах сьметніку біліся і крычалі галкі. Малінавымі званочкамі ліліся жаваранкі. Было зусім падобна на вёску. І тады ўсплыла напаверх сьвядомасьці нейкая іншая, ужо здаецца, зусім чужая сёньня для мяне, плынь.

Вёска.
У гэты вось час возяць гаспадары гной і ягоны аміячны пах блытаецца з вастрынёю сьвежай тлустай ральлі і з прыемнасьцю казыча ў носе.
Паскрыпвае ад цяжкасьці і тарахціць па калдабаінах цяжкі воз. Намагаецца цягнуць яго пузаты і касматы зь зімы конь і ў тахт хады матае галавою. Ад гэтага бразгаюць цуглі. Ён пахрапвае раздутымі ноздрамі.
На ноздрах аж да воч раздуліся жылы. Вельмі ж яно цяжка, на ліха яму!
Кірылка — шчупленькі, каравенькі дзядок дробненька, па-старыкоўскі, перабірае за возам босымі нагамі. На нагах “хоць рэпу сей”, а падэшвы рэзка блішчаць на сонцы. Гэта ад твані. У хлявох мокра. Не было подсьцілу.
Дзед шлёгае растрапанаю пугаю, разводзіць рукамі, нешта некаму гаворыць, ухмыляецца і, потым лезе з усёй заскарузлаю

пяцярнёю пад аблезлую шапку. Скрабае ён доўга, смачна і, зажмурыўшы свае падсьлепаватыя, з чырвонымі павекамі (сьляды трахомы) вочы, ускідае галаву ўгору і доўга перабірае нешта пад барадою.
Гэтым часам конь, адным чорным і вільготным вокам касавурыцца на дзеда, верне назад вуха і нерашуча спыняецца.
— Ны-э-э-э-а! Ваўккарэзіна… — прахапляецца Кірылка, энэргічна торгае лейцамі і ўжо цішэй цмокнуў, шлёгнуў пугаю і кінуў: — Даруй ты мне, госпадзі…
За ім бяжыць, перасыпае тоўсьценькімі ножкамі маленькі, у адной зрэбнай да пят кашулі, унучак Ванька. Трусіць і на хаду раскідае:
— Дзя-а-ду-а-алька-а-а, па-а-двя-а-зі-і-й!..
Ля дарогі зьляжаліся і пажоўклі леташнія травы і лісьцё. Цяжка, але вольна і радасна ўздыхае зямля і — сьмяецца тлустасьцю, трэльлю, маравам. Сьмяецца прагнасьцю да работы рук чалавецкіх…
Высока ўздымаюцца старыя Кірылавы грудзі; нешта шэпча ён сам сабе і на вуснах расплываецца, як кругі па вадзе, слаўная й добрая старыкоўская ўсьмешка.
Успамінае… успамінае:
— Маладосьць. Дні вясковыя ў жыцьці, калі яшчэ маладым хлопцам ішлі яны за блізенькі сьвет вось такім днём, са Ксеняю на ўсяношную, і тады яна…
Конь стаў і дзед уперся рукамі ў гной.
— Ны-э-э… А-а-а?.. Свалата-а, дохлы на цябе няма, — а прасьці госпадзі! — шлёгнуў дзед пугаю па касматых конскіх бакох… Бачыш ты яго, ваўкарэзіна, прыслухоўваецца, каб цябе воўк еў…
Потым старанна паправіў на сьпіне вераўчаныя падгузы, борзьдзенька забег наперад, выбраў грыву з-пад хамута, шлёгнуў яшчэ раз пугаю і зноў распачаў сам з сабою гутарку.
Ад дарогі разьбегліся загоны. На загонах тлустая ральля. Пабліскваючы голымі лыткамі, садзяць бабы бульбу.
— Га-а-а-а!
— А-я-я-яй-і!
— Гыр-гыр-р-р!..
Дружна залапаталі пад маім акном басаногія дзеці. Гэта за імі пагнаўся сабака. Ён стары і бяззубы, аднак вельмі ж раззлаваўся, і дадзелі яму дзеці.

Ураз адляцелі ўсе мае мары.
Гэтым часам, да дзіцячага плачу дамешваюцца густыя і танклявыя жаночыя галасы. Вышлі мацяркі на двор, каб пасварыцца на дзяцей і адначасна спагнаць злосьць і на сабаку і на гаспадару.
Да абрыдласьці апрыкла мне ўсё гэта, бо так кожны дзень, кожны дзень!
А за акном, за брудным дваром, за папарамі, у лагчыне жменька прыгарадных хат, налева — хваёвы бор. Пацягнула выйсьці хоць раз у поле.

II

Падыхнула сьвежым ветрам ад вольных грудзей крамянай маладой вясны. На шырокім поле пашырэлі, згубілі свае вузкія межы і думкі, і грудзі.
Хваёвы смалісты лес нагадаў мне мае дзіцячыя гады, мае першыя крокі ў жыцьцё… Было шмат вастраты ў адчуваньнях.
Заходзіла сонца. Абліўся барвовасьцю лес. Паружавела паветра.

III

Змрок.
Пацягнула сырасьцю і прэльлю ад перагніўшых за зіму травы і лісьця.
На пераезьдзе павольна прайшоў будачнік, махаючы чырвона-сінім ліхтаром. Трэба зьняць шлагбаум. Фігура ягоная ўжо няясная, ахутаная змрокам. Добра відаць толькі ў фантастычна-ненатуральным асьвятленьні ягоныя ногі. У руках паварочваецца ліхтар. Гледзячы якім бокам павернецца, і ногі набываюць то сіні, то чырвоны колер.
У аўто, за шлагбаумам, стрымана гудзіць і тоўхае ягонае гарачае сэрца. Дальш — шэраг падвод. Нехта ззаду смачна лаецца і заклікае ў сьведкі: і бога, і сэрца, і багародзіцу…
На пасёлку, у задніх дамох, ціснуць хлопцы гармонік. Енчыць, просіцца гармонік, і здаецца, за яго заліхвацкім сьмехам просіцца дзяўчына.
Моцна грукаючы аб утоптаную зямлю сьпяшаюцца туды некалькі міліцыянэраў. Нешта радаснае з хваляваньнем адзін аднаму расказваюць і заліваюцца рогатам.

IV

На кватэры — у пакоіку — душна. Не запальваю лямпы і пазіраю ў сінюю ноч.

Хочацца думаць. Думкі ж спрэс радасныя, сьвежыя, слаўныя. Хочацца марыць. Праплываюць у памяці розныя вобразы: вось толькі ўчора прыехала да мяне…

— Стук-стук-стук!..

— Так!

— Вам ліст. Паклалі на стол. Атрымалі ўранку, але вечным правам забыліся…

— Дзякую, дзякую!.. — а рукі калоцяцца і бегаюць па бювару. Палю лямпу. Доўга ня хоча загарэцца, тухнуць сярнічкі. Зь нейкім незнаёмым мне хваляваньнем я разрываю канвэрт і ўжо наперад хочацца адгадаць ад каго ён, што там напісана, ці радаснае, ці мо…

Хочацца, каб усё было добра, навошта тыя прыкрасьці, упінкі?

V

Нязграбнаю рукою, каравым і скупым почыркам пісала маці.

.....

.....

Ліст ад маці

Здароў, дарагі сынок!

Ну, голубе ты мой, як жывеш? Як жа ты там у сваім Менску гадуешся, дзе ты харчуешся і ці хапае табе хаця з твайго такога заработку на пражыцьцё? Мо галадуеш часамі? — дык я скажу табе, сынку, як маці.

Ты мо і няўзьлюбіш, але што ж?!. Павер, што твая маці табе ня вораг. Я табе, дарагі мой, толькі дабра хачу... Дабра, аднаго дабра!..

Анэгды казалі мне — я ня веру ім, не! — але перадавалі, што з табою нешта дрэнна... Дрэнна і зусім дрэнна. Веру, дарагі сынок мой, што ты не прападзеш, не загінеш, — так адчувае маё сэрца, — але ж усё можа быць.

І не такія людзі, як ты, гінулі ад гэтай заразы. Хто ня мог устаяць перад ёю — гінуў, як сьліна. Але ці ж мне табе аб гэтым казаць? Ты вельмі й сам добра ведаеш.

Я думаю над гэтым: няўжо доля твая такая, сокале мой?.. Чым ты... ды якую ты, сынку, правіннасьць зрабіў, што цябе бацька

твой так жорстка пакараў у жыцьці?!. Бо ад яго гэта, ад яго!..
Разумны чалавек быў, а вось без пары загінуў і як яшчэ жудасна загінуў! Асіраціў нас, асіраціў усю сям'ю. Дзеці пагінулі, і сама я набыла такія вось цяжкія незьлічоныя хваробы. А за што, за што?!..
Я, здаецца, каб прымела, вам, дзеці, душу ўсю аддала б, сэрца, бы толькі вы жылі як людзі, каб не сьмяяліся з вас той хто мо няварты і падмёткі вашай.
Як ад макаўкі тэй, расьсеяліся ўсе мае дзеці. Ужо амаль усе параць зямельку. Вы ўдвох, як вочы мае, асталіся ў мяне. Двох маю сыноў, а ніводнага пры мне!
Цяжка мне, голубе!
Агорк ужо мне жабрацкі хлеб.
Мо выношваю, — хто яго ведае, — грэх я свой перад вамі, дзеці?
Сынок мой, а я ночанькі не дасыпала, сну ня ведала, зморы, абы толькі вас узгадаваць. Думала: сама ўжо абы-як, дармо, абыдуся ў сьвята бяз новай спадніцы, кохты, абы вы былі так, як людзкія дзеці. Яблычак, бывала, кавалачак хлеба несла сваім дзецям, каб так сквапна не зазіралі на чужыя раты.
Рукі мае цяпер адбалелі. Выплакала я начамі (гэта каб вы ня бачылі й ня чулі), выплакала свае вочы.
Не таланіць нешта табе ў жыцьці, сынку! Нешта ня трапіш ты, як гэта трэба, на пуцявіну.
А я думаю: плюнь на ўсё, вазьміся за работу, як раней гэта, выкінь усё чорнае з галавы — і, пройдзе! Вот убачыш — само пройдзе. І замоўкнуць людзі, ня будуць брахаць на цябе ўсяк, зарве ім горла...
А то й так: калі ўжо цяперся ты ходзіш і аніяк ня знойдзеш сваей сьцежкі, дык кідай усё і прыходзь да мяне. Трохі хлеба і бульбы ёсьць, а рэшту заробіш. Вось будзем і жыць!
У нас ёсьць і калгас. Дык вось і падасіся ў той калгас і не прападзеш. Граматны чалавек ня можа прапасьці. Гэта ж вось у нас людзкія мацяркі толькі цешацца са сваіх сыноў, выхваляюцца, а я як вычураная якая, што адбілася ад статку. Жыву толькі чуткамі пра цябе. Розныя ж бываюць чуткі.
А даходзяць да мяне толькі больш дрэнныя, сам жа добра ведаеш!
А ці ведаеш, сынок мой любенькі, вельмі ж росы кожным ранкам бываюць такія буйныя ды сьцюдзёныя. І мыюць яны

кожным ранкам ногі мае балючыя.
А што росы буйныя, — я кажу, — ну дык будуць сёлята і журавіны буйныя ды ўмалотныя. А памятаеш, яшчэ мо не забыўся, як любіў ты хадзіць увосень на балота зьбіраць журавіны. Восень такая ўдалая, лёгкая ды цёплая, а ты іх тады прыгаршчамі з купіны, прыгаршчамі.
Дык як жа табе забыцца, сынок? Не забыўся, мусіць, як мы толькі й жылі з таго, што ў лесе назьбіраем. А нас, аднойчы, вазьмі і аб'ездчык злаві. Адабраў, злодзей, каробкі.
Ты тады яшчэ такі мізэрны, нягеглы быў, а памятаю, як усё ж ты на дыбкі стаў зь ім! Я й тады ўжо заўважыла, што зь цябе будзе скандаліст вялікі! Відаць ужо было.
А тады ж я хадзіла да таго гада жыта жаць, каб хаця добра ўсё абышлося. Пагражаў у суд перадаць. Сам ведаеш: дзе грошы — там і справядлівасьць. Адрабляла, а дамоў позьнім вечарам нават скарынкі хлеба не прыносіла... Было гэта, — што ж ты зробіш! Усё было. Як успамінаю цяпер, дык аж дзіву даюся, як перажыла я гэта...
А ты, сынку, разгубіў сябе па ўсім сьвеце, і шкада мне ня толькі аднэй тваей маладосьці...
Мусіць і аблічча ты зьмяніў зусім. А мо й не спазнала б цябе, каб убачыла сярод людзей... Адылі ж, не! Спазнаю! Ня вочы мае спазнаюць цябе, а сэрца, любы мой голубе, спазнае сэрца маці!..
Спазнае сэрца. А сэрца — што скрыпка.
Яшчэ хачу табе сказаць... Ды ня ведаю толькі, ці казаць?!. Ну, але мо цябе так ужо й не зарупіць...
...зусім хворая я, сынку. Старасьць прыйшла. І сьмерць ідзе. Чую. Можа й ня ўбачымся мы, сынок, з табою?!.
А так паміраць ня хочацца, так ня хочацца, што страх проста й падумаць... Легчы ў сырую зямліцу навек... навек... на-а-а-век!..
Як ня быў на сьвеце, і ніхто нават словам не ўспамяне... Акропна!
А каб ты ведаў, вот ці дасі веры, як гэта яшчэ жыць хочацца, хочацца пажыць, паглядзець на сьвет... Я хацела б прыкласьці да работы й свае рукі — ды няма ўжо сілухны... Галава пачала ўжо калаціцца...
Лягла мая сіла ў потнай працы на памешчыцкіх загонах... Эх-х!..
Як ты жыць будзеш, што зь меншым будзе?! Ты хоць раз

прыедзь да мяне. Пойдзеш на балота, журавіны зьбіраць будзеш, а я гэтым часам буду ўспамінаць тваё маленства і мне лягчэй на сэрцы будзе, што я ня кнігаўка.
А пакуль што — бывай, сыночак! Цалую, даражэнькі ты мой, моцна, моцна!..
Твая маці.
4-V-32 г.

VI

.....
.....
.....Я маўчаў.
Маўчаў, скованы вялікімі, для мяне мо такімі вострымі думамі. Маўчаў не затым, што няма чаго гаварыць, — не! У гэты момант у душы — цэлая бура, мяцеліца пачуццяў.
..... Я ведаю — бледныя мае словы перад дарагімі пачуццямі. Потым. А потым бязвольна ўзяў аркуш чыстай паперы і зусім у беспарадку і без сыстэмы (бо не было той сыстэмы ў маіх думках, нельга іх было сканцэнтраваць), падсеў да стала і накідаў:
.....
.....Ліст да маці

VII

Матуля мая любая!
Няма слоў...
Ну паверыш — вось няма яшчэ на сьвеце тых гукаў, такіх адценьняў голасу, каб зь іх скласьці такія словы, якія б перадалі, сказалі, паказалі; ну, як бы гэта лепш сказаць?! Ці бо вось так павольна-павольна, альбо не! — раптам так, нібы гэта гром зь неба: вывернулі перад чалавечымі зьдзіўленымі цудам вачыма боль душы, глыбокі і востры, што брытва па горле, чалавецкі боль, паклалі на далоні сьвежае, жывое сэрца, жывое, матуля, жывое... якое б ды сачылася па кроплі... і... гэтыя кроплі, каб гаварылі, каб загаварылі простымі словамі, словамі аб гэтых перажываньнях!
Ці то каб старанна падабраць, як для тонкай мазаікі такія словы, зьліць іх у цудоўныя сказы ды ўпрыгожыць ня менш

дзівоснымі вобразамі ды імі выказаць тое, аб чым гавораць і моўчкі плачуць вочы?!
— Не!.. Не!..
Любая й родная матуля, няма такіх слоў! Няма, няма...
Ах, праўда! Боль сэрца і рыданьне вачэй можна выказаць, можна! Іх выкажа толькі музыка! Вось сродак, які валодае ўсімі пачуццямі чалавека. Музыка, толькі адна музыка!
І ты, матуля, вось што:
— У вас там у калгасе радыё ёсьць. Дык ты ў вольную хвіліну сядзь ля яго (ля рэпрадуктара) і паслухай. Слухай, любая, уважліва.
І заграюць адну рэч (а яе граюць часта) — гэта “Сьмерць Азы”. Паслухай гэту рэч і потым скажаш мне сваё ўражаньне.

.....
.....ты адчуеш боль. Гэты ж боль будзе не сьмяротны, але затое востры і прыемна-салодкі... Ён перамяшаецца зь сьветаценямі тваіх перажываньняў.
Вось такі ж боль я адчуў, калі атрымаў твой ліст.
Мо, дарэчы, ты запытаеш у мяне:
— Чаму, менавіта, “Сьмерць Азы”, а ня што-небудзь іншае?! Я і так баюся сьмерці, бо ўжо яна ў мяне за плячыма. Чаму пра сьмерць?
— Матуленька!
У гэту рэч укладзены ўсе сьлёзы чалавецтва, усе пакуты, увесь боль... (і як ні дзіўна) пяшчота і бязьмежнае каханьне.
Сэрца тваё, маці, вялікае, поўнае трагічнае такое любві да сына. Ня думай, родная, што я ўжо прапашчы чалавек. Не! Калі цяпер стаю ў нізіне чалавечага шчасьця і дабрабыту — дык гэта зусім толькі на адзін нязначны момант. Толькі на момант!
Я стаю зараз і разглядаю ды вывучаю гэта перада мною ўзвышша, каб захапіцца хараством жыцьцёвай барацьбы, каб пазнаць ноч і смурод і потым высока цаніць усё тое, што мяне сустрэне там заўтра. Укусіў горкага, каб не вярнуцца да яго ўжо ніколі.
Я шукаю і ўпэўнена намацваю сьцежку да вяршынь, каб ужо ніколі не сысьці зь яе.
Лепш памерці, чым пайсьці назад!
...Я шмат думаў над сваёй бацькаўскай спадчынаю. Але я (мо ты пацісьнеш плячыма), я шаную і паважаю свайго бацьку. Гэта

быў чалавек высока эмацыйны, вельмі таленавіты і разумны.
З гарачым сэрцам і з халодным розумам.
Гэта — мой жыццёвы ідэал.
Памяць аб ім — вечна.
Не расказаць табе, матуля, словамі, не перадаць, колькі я перажыў за гэтыя гады!
Ды ці ж трэба ўсё расказваць?.. — ты ж будзеш рыдаць сьлязьмі маці над пакутамі твайго сына.
...Няўдачы ішлі адна за аднэй восеньскімі хмарамі. Змучыла, скатавала гэта жыццё. Я з усіх маіх сіл хапаўся за жыццёвы хрыбёт гэтага быстраногага каня, але не было ўжо больш сіл і...
сарваўся!
.....
.....
.....бяссонныя ночы.....пакуты і боль перажываньняў у часы зруйнаваньня сям'і.....потым ну,.....
.....
..вынік — адставаньне ад работы. (Ах, як гэта жудасна!!!), бо ня мог, як сьлед, узяць сябе ў рукі і ад гэтага — эканоміка.
Ніякіх пэрспэктыў у далейшым.
Я хадзіў па вуліцы з апушчанаю галавою. Гэта не ад нуды. Не! Гэта я хадзіў і думаў так:
— А мо так здарыцца (ды гэта ж бывае вельмі і вельмі часта!), што вось хто-небудзь вазьмі ды згубі чырвонец... Ну хаця б чырвонец!.. Што ж гэта значыць чырвонец, альбо, нават калі на тое пайшло, і для дзяржавы?! Што гэта значыць? — плюнуць і расьцерці!..
А вось тады твой сын, маці, будзе шчасьлівы! Хоць на некалькі дзён скончацца для мяне такія жорсткія мучэньні неабумоўленай злосьці.
Я меркаваў ужо зараней, што можна будзе на яго купіць.
Я выходзіў на вуліцу, калі яшчэ дворнікі не прачыналіся і, нічога!
А да таго яшчэ: жудасныя да басяцкасьці кватэрныя ўмовы.
Вуліца. Ніякага прытулку. І міжвольна... Павер, матуля, міжвольна я пайшоў, проста сказаць, у басяцкі прытон.....

.....гэта ня дзіва: тры гады ня вытрымаеш, будзь ты хоць каменны, хоць сталь...
Скажы, маці, можна працаваць пад плотам, калі кватэра для мяне — фабрыка?! А вось жа сказаў адзін з “адказных”, што можна! Што было рабіць?! Плюнуць у морду ці далікатна пагладзіць яе — пападзеш у міліцыю. Вось ты кажаш, маці, што я скандаліст, — няпраўда! — Памыямі лей таму ў вочы!
Вось такія бясчуласьць ды нэрвовасьць, якая разьбівае ўвесь арганізм — вось што штурхае на нястрыманасьць у выразах. Ды пачакай, пачакай... Забыўся самае галоўнае. Раскажу, а як жа, раскажу, падзялюся з табою, родная мая...
Так. Усё гэта дробязі, але бачыш, што балючыя яны, атрутныя. А прыйшлі яны тады да мяне і забралі цалкам у палон, калі я зрабіў найвялікшы праступак: калі я аддаліўся, адышоў ад нашае клясы і патануў у густым і едкім тумане ўсяго чужога пралетарыяту...
А скандалістам? — я яшчэ ніколі ня быў скандалістам, хоць і данімалі мяне ў жыцьці.
Ты мне, я думаю, паверыш!
Значыць, аб чым гэта я гаварыў?.. Ага!
І вось у гэты ж момант з дна душы паднялася сама сабою вось гэта чорная хмара, што перайшла да мяне ад бацькі. Я гэтым, праўда, на зусім нязначны час затуманьваў боль сэрца і вострыя перажываньні, каб пасьля праясьненьня яшчэ больш былі яны вастрэйшыя, бо да гэтага яшчэ спавівала маю сьвядомасьць маральная прыгнечанасьць.
Я з усіх сіл вырываўся з гэтых цэпкіх абнімкаў, ірваў на сабе валасы, скрыгаў ад злосьці і сораму зубамі і... багна засмоктвала...
Жыцьцё так кідала мяне, што не было часу ня толькі падумаць пра цябе, родная, але і пра столькі ж дарагое, — пра творчасьць...
Мама!
Ты не дасі веры, колькі ў мяне ў той час было думак, разнастайных пачуцьцяў, жаданьняў! Гэта быў кіпучы вадаспад і адначасова нейкі першабытны хаос... Бурболіла, пенілася, востра і жорстка балела, сачылася крывёю і... як ні дзіўна, — я губляўся.
Я траціў сябе, я гарэў, выходзіў з рамак, заліваў горкай гаркату сэрца і бушаваньне думак і...

(сёньня для мяне ўжо жудасна!)
зьявілася
думка
аб
самагу...

.....
.....
Ах, ды што я?!. Што я, што я сказаў?!. Не, матуля родная, ня вер, ня вер!.. Зусім ня думай. Ты, бачу я, зжахнулася, ад жудасьці пачутае ад сына, у цябе так шырака расплюшчыліся вочы і наліліся чыстым дыямэнтам сьлязы...
Абнімаю цябе, дарагая... Гэта толькі атрутнай гадзюкай так сабе пранеслася нейкая чорная ў мазгох думка... Нічога — ужо сьвеціць сонца...
Сонца, сонца, ах, як шмат гэтага сонца...
Яно жытнёвым морам сагрэла мяне...
.....
Так. Я хачу ўсё ж такі даказаць.
А гэтым часам: кпінкі, насьмешкі, пагрозы, ігнараваньні, адпіхаваньні ўзад, байкоты... і самае галоўнае, — штодзённае маё адыходжаньне, нейкімі вар'яцкімі штуршкамі назад ад жыцьця, ад клясы... Вось так: нібы ты ідзеш па краі прадоньня, а яно ўсё схіляецца крута ўніз, схіляецца. Ты адчуваеш, ведаеш, што яшчэ некалькі крокаў і... назад вярнуцца будзе немагчыма, нават і думаць ня варта — аднак нейкая сьляпая сіла цягне цябе ўніз, уніз, уніз... жуды ў чорнае горла сьмерці... І ты ўжо, як вар'ят ці лунацік, ідзеш, паралізаваўшы свае волевыя цэнтры мазгоў і нават зусім згубіўшы дар мысьліць.
Так і я!..
Але ёсьць у жыцьці і добрыя, чулыя людзі.
Хоць адно добрае слова, хоць трошкі спагады і чуласьці і... ад такой цеплаты брудны лёд лопае і сплывае ветрагонам.
Ёсьць такія людзі.
.....
.....
Сёньня колькі сонца!.. Мора сонечнай цеплаты
і...
"Памяць мінулага — з дымам", як сказаў Міхась Чарот.
.....

— Мама... матуля... матуленька!..
Я сёньня —
другі...
Такі, якім ты хочаш мяне сустрэць. За ноч, за адну толькі ноч у мяне перавярнулася ў думках усё маё жыцьцё. Я цалютку ноч не самкнуў вачэй. Я сілком сьціскаў павекі і думаў, думаў, думаў... Альбо, вярней — думалася само, вось так, як б'ецца міжвольна сэрца, уздымаюцца грудзі. Ня хочаш, каб білася, а яно тоўхае... б'ецца, дыхаюць грудзі.
І так перавярнулася перад вачыма — усё жыцьцё, усё жыцьцё!..
І таксама міжвольна, да болі сьціскаў зубы, калі ўзыходзіў мне на памяць дрэнны мой учынак...
Дармо, мама, што мы далёка ад цябе, але ты ведай — сыны твае ніколі не пакінуць цябе.
.....
А вось учора ўранку я ішоў па справах у горад і бачыў людзей на рабоце. Голыя, без сарочак, запацелыя, аблітыя мутнаю паліваю загару — гэтыя людзі выконвалі датэрмінова прамфінплян. Ты не дасі веры, што гэта была за карціна і якая захапляючая па свайму характару і энтузіязму ды энэргіі!
Я спыніўся, доўга стаяў і думаў. Я нават і цяпер не прыпомню, колькі стаяў часу — аднак ніводзін чалавек ня толькі не загаварыў са мною, а нават і не зірнуў!
Прачнуўся толькі тады, калі васьмёх чалавек з крэктам паднялі рэйку, і блытаючыся ў нагах, панесьлі ля мяне. Бачыў я, што задняя пара ня можа справіцца са сваёй ношкаю. Худы, вяснушчаты хлапчук, здавалася, вось-вось упусьціць з рук канец лому і рэйка зьедзе на ногі. Проста інстынктыўна я падбег да хлапчука і хапіўся за лом, каб дапамагчы. Той у момант зьдзіўлена кінуў на мяне сваімі шэрымі вачыма і з натугі выцадзіў:
— Таварыш-ш, не перашкаджай...
Я апусьціў галаву. Разам з крывёю сораму на твары, — на вачох паслаўся мокры туман.
Альбо надоечы быў я на заводзе "Камунар". У ліцейным цаху... Ды што я выказваю табе словамі?
— Маці! — мы сёньня абганяем Амэрыку.
Гэта наш гонар!
— Маці! У мяне цяпер столькі творчага запалу, столькі энэргіі ды новай, сьвежай маладой сілы, што я зрабіўся зусім

маладым.
Сёньня мне адышло назад дзесяць гадоў!
Я — юнак.
Я ўвайшоў у вясну, жыву вясною. Я — сам вясна!
.....
.....
...Ведаю, маці, што цяпер росы буйныя ды халодныя! Гэта трэба табе чаравікі дастаць. Я вось скора і куплю іх табе.
А журавіны, мама, мо ня ў гэтым годзе, а што налецьцем дык і гаварыць няма чаго, што зьбіраць ня будзем, дзе колісь-то з табою зьбіралі. Ня трэба яны нам з табою, даволі ўжо зьбіралі іх! На тым мейсцы, маці, зьбярэм хлеб зь зернем, як журавіны. Ня верыш? Сьмяешся?!
Ды не, бачу я, што ты ня можаш сьмяяцца з праўды!
Ты толькі зірні, як высыхае балота, гіне мох, кладуцца, як струны ўздоўж і ўпоперак стромкія і сінявокія равы, магістралі, загрыміць трактар і зашуміць імшарына буйным ды ўмалотным коласам.
Не прыеду я, мама, зьбіраць журавіны!
— Матуля!
А пра сьмерць і ня думай! Не каштуй таго яблыка чорнага ды атрутнага з дрэва сьмерці!..
Любая, родная мая!
Зямля сырая ды стопудовая. Закідаюць тваю дамавіну з дошкамі тонкімі, падгніўшымі. І калі будуць утоптываць тваю магілу — ня вытрымаюць яны такога цяжару...
...гэта ж дошкі ўломяцца, уломяцца дошкі. Любая... мая мілая! Дошкі грудзі твае белыя раздушаць... Спрацаваныя рукі твае паломяць... Тыя рукі, што мяне песьцілі, абнімалі ды абаранялі, тыя грудзі, што ўскармілі мяне...
Матуленька!..

Ня думай, ня мысьлі, не пішы мне пра свае чорныя думкі...
А ў адзнаку шчасьлівай хвіліны сёньняшняй — я пакланюся ў ногі табе!
— Маці!
Гэта я пакланюся ўсёй чалавечай праўдзе. Ты ведаеш праўду і ня будзеш сьмяяцца над ёю, бо ой, як многа зазнала ты палынавае крыўды!!!
А ты, родная, ня плач кнігаўкаю над доляй сыноўскаю.

Кнігаўка плача над дзецьмі мо таму, што вось сёньня, узаўтра пакінуць яе дзеці і потым нават не спазнаюць яе.
І так кожны год, кожны год... Вось таму і плача-рыдае яна бурамі свайго пакрыўджанага мацярынскага сэрца.
А ты, матуля, не рыдай!
Я вярнуся да цябе і пакладу ля тваіх ног самыя буйныя і адборныя журавіны сваёй радасьці, глыбокага пачуцьця...
Я назьбіраў іх за гэты час, як мы разышліся з табою, усюды. І на балоце, і на палёх калгасных, і на заводах, і сярод басяцтва і сярод разумных людзей і дурняў (бо і дурні калі-нікалі кідаюць афарызмамі...)
Я...я... Ды я пацалую сьляды тваіх хворых ног... Я вазьму пясок і захаваю яго, як талісман. Я ў песьнях сваіх апяю цябе, любая і вялікая жанчына. Упляту ў вянок сваіх песень твае горкія дні, твае сьлёзы, твае думы, твае пачуцьці... І тады скажы, хто знойдзе цану гэтаму вянку? Хто? Хто, пытаю знойдзе ці прыдумае чым заплаціць мне за яго?!.
Але што я?!. Ды ці ж магу я прадаць яго?!. Не, не! Нізавошта! Ні за золата, ні за самацьветы, ні за якія грошы!..
Я панясу яго і пакажу ўсей грамадзе. Я пастаўлю яго над сваей галавою і прайдуся сярод натоўпу. І, натоўп зьнямее і зжахнецца. Зьнямее ад дзіва і зжахнее ад жудасьці...
— Што за прыгожыя дыямэнты?.. — Не спазнаюць яны тваіх сьлёз.
— Што гэта за цудоўныя кветкі?.. — Таксама не спазнаюць тваіх пачуцьцяў.
— Што гэта за сонечныя сяміцьветы?.. — Думы твае абернуцца ў сонца.
Цямней ад ночы зіхацяць агаты, і колькі ж іх назьбірана! Крыўды, крыўды людзкой, цяжкай, горкай чалавечай крыўды не адрозьняць людзі ад звычайных каменьняў!..
Да тваіх ног я пакладу гэтыя скарбы, пакладу за тое найвялікшае здарэньне, якое адбылося ў мяне сёньня...
Я раз і назаўсёды выкінуў з сваіх грудзей таго чарвяка, што чарніў маё аблічча і думкі, выпіваў без пары ўсю маю кроў...
Я — новы чалавек! Я — вясна!
З гэтымі новымі пачуцьцямі, вясною, з радасьцю жыцьцёваю новы чалавек бярэцца за новую работу. Я ўліваюся зноў у кіпучы і бурны творчы калектыў, я пачынаю вялікую радасную і слаўную творчую працу!..

Вось цяпер я, матуленька, пайду ўсюды, пайду ў жыццё і назьбіраю поўных, зусім сьпелых, адборных і буйных журавін маей творчасьці і прынясу іх да цябе...
Ты паглядзіш на іх і забудзешся на балотныя журавіны, ды толькі не забудзешся на свайго сына, які ўжо знайшоў і сваю сьцежку, і сваё шчасьце.
Жыві, матуленька, родная мая. А я прыйду да цябе, чакай!..
Чакай новага чалавека...
Твой сын.
5-V-32 г.

VII

.....
Больш хацелася пісаць. Ды толькі ведаю я, што маці сына адчуе, зразумее бяз слоў, а па-другое: вельмі шмат пачуццяў — вельмі мала слоў.
.....
Ах. Вось граюць “Сьмерць Азы”...
Гэта ня гукі вялікай песьні найвялікшага майстра музыкі. Гэта разьліваецца растопленае золата маей радасьці, скарбы маіх дарагіх для мяне думак, маіх пачуццяў, майго лепшага “я”, гэта — зоры маіх перажыванняў душы.
Я ўжо зьліўся з гэтай цудоўнай мэлёдыяй.
Слухай жа, маці мая, родная!..
12-V-32 г.
Менск
Публікацыя Віталя Скалабана
паводле асобніка часопісу “Беларусь Калгасная” (№ 8, 1932), які захаваўся ў асабістым архіве Лукаша Бэндэ.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (24) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса

Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/02/18
[image]

[image]
A R C H E П а ч а т а к № 1 (24) – 2003
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
[image]
[image]

Вайтовіч-Камілеры, адна зь любімых матчыных вучаніц, асела ў Таронта (Канада), здабыла некалькі першых узнагародаў на міжнародных конкурсах і выкладае ў тамтэйшай кансэрваторыі. Ляўрэатка міжнародных конкурсаў Ганна Шыбаева жыве ў Нідэрляндах і з посьпехам канцэртуе па ўсёй Эўропе. Дыплямантка нацыянальных конкурсаў Сьвятлана Арлова — адна зь першых матчыных студэнтак — працуе канцэртмайстаркай Вугорскага опэрнага тэатру. У 2000 годзе яна была ўзнагароджана Ганаровай граматай і Залатым мэдалём Міністэрства культуры Вугоршчыны.
І гэта далёка ня поўны пералік вучняў, якімі мая маці ганарылася. Калі глядач захапляецца элегантнай дакладнасьцю рухаў балетных танцоўшчыкаў, ён наўрад ці ўсьведамляе, што за гэтым стаіць цяжкая праца балетных канцэртмайстраў. Галоўная іхная задача — акампаніяваць падчас штодзённых балетных практыкаваньняў. Кожнае такое практыкаваньне патрабуе спэцыяльнай музыкі і спэцыяльнага спосабу ігры. А ў опэры канцэртмайстар дзейнічае як пэдагог, ці, лепей сказаць, як шліфавальнік дыямэнтаў. Ён працуе са сьпеваком над опэрнай партыяй, дабіваючыся максымальнае выразнасьці й дакладнасьці. Пры падрыхтоўцы апошніх опэрных прэм'ераў — "Трубадура" і "Багемы" — зь сьпевакамі працавала Галіна Аляшкевіч, таксама матчына вучаніца, якая раней была канцэртмайстаркай у Акадэміі музыкі. Аднойчы ёй давялося паўдзельнічаць у праслухоўваньні маладых вакалістаў, якія прэтэндавалі на месцы ў опэрнай трупе. У залі прысутнічалі Аляксандар Анісімаў, Сяргей Картэс. Галіна акампаніявала амбітнай маладой сьпявачцы. Аднак пасьля выступу тая засталася стаяць у адзіноце, а Галіну з усіх бакоў абступілі опэрныя славутасьці. "У каго вы вучыліся?" — запытаў Анісімаў. "У Людмілы Андрэевай", — адказала Галіна. "Калі так, у нашай трупе заўжды ёсьць для вас месца", — усьміхнуўся галоўны дырыжор.

Маці валодала сакрэтам, як за тры-чатыры гады ператварыць студэнта ў высакакляснага прафэсіянала. Яна ніколі не ўзьнімала голасу, ніколі не абражала, ня крыўдзіла сьвядома. Ужо пад канец матчынага жыцьця студэнты прызналіся, якая ейная фраза найбольш іх бянтэжыла. "Ну, гэта ані чорта ня вартае!" — з усьмешкай казала яна, праслухаўшы няўдалую

ігру. Пасьля сама сядала за раяль і паказвала, як трэба. Яна цудоўна валодала інструмэнтам. Тыя нямногія запісы, якія захаваліся ў фондах радыё, адрозьніваюцца надзвычайнай пранікнёнасьцю і прыгажосьцю. Яшчэ студэнткаю яна перамагла на Першым нацыянальным конкурсе піяністаў. Але выбрала для сябе кар'еру пэдагога і толькі зрэдку выступала з канцэртамі. Пры канцы 1970-х гадоў Людміла Андрэева і Соф'я Вокалава стварылі фартэпіянны дуэт, які праіснаваў цэлых дзесяць гадоў. У іхным рэпэртуары былі ледзь ня ўсе творы, напісаныя для двух раяляў. На маю думку, гэта быў унікальны дуэт — ня толькі таму, што нават найскладанейшыя творы выконваліся на памяць. На жаль, у тыя часы немагчыма было вывесьці гэты дуэт на ўсесаюзны і тым больш на міжнародны ўзровень. Беларускія музыкі, за выключэньнем "Песьняроў" і "Верасоў", былі асуджаныя на гібеньне. Скончылася тым, што ў спадарыні Вокалавай захварэлі бацькі і дуэт распаўся. Пазьней маці найахвотней акампаніявала вакалістам. Асабліва плённым быў творчы саюз з народнай артысткай Беларусі Натальляй Рудневай. Яны выконвалі надзвычай складаныя творы: "Песьні і танцы сьмерці" Мадэста Мусарскага, "Дванаццаць апрацовак расейскіх народных песень" Сяргея Пракоф'ева, "Нактурны" Эдысона Дзянісава на вершы кітайскага клясыка Бо Цзюі, "Вершы каралевы Марыі Ст'юарт" Робэрта Шумана... У апошні год жыцьця маці рыхтавала канцэрт з твораў Ліста. Яна марыла сыграць ягоную Санату сі-мінор — агромністы віртуозны твор з глыбокім філязофскім зьместам. А таксама, разам з Натальляй Рудневай, прадставіць публіцы ягоныя песьні. Але не хапіла часу. Яна ўжо зь цяжкасьцю рухалася па кватэры, але раяль усё яшчэ адгукаўся на дотык ейных рук. У яе былі дзіўныя рукі — моцныя і надзвычай элястычныя. Для яе не існавала тэхнічных цяжкасьцяў, і раяль пад ейнымі пальцамі гучаў усімі тэмбрамі сымфанічнага аркестру.

Студэнты вельмі яе любілі і не давалі ёй загрузнуць у хваробе. Маці ведала, як нецярпліва яны чакаюць ейных урокаў, і гэта надавала ёй моцы. Тэлефон у хаце званіў увесь час, і ледзь ня кожны дзень хтосьці з студэнтаў — цяперашніх ці даўніх — прыходзіў яе наведаць. Дзеля таго каб яшчэ раз адчуць ейную цеплыню, падзяліцца сваімі маркотамі і радасьцямі, параіцца ці

проста падурэць і пасьмяяцца. Зь ёй было прыемна бавіць час — нават тады, калі яна была ўжо сьмяротна хворая і нядужая, і не пякла ўжо сваіх славутых пірагоў з капустай, і не рабіла фаршаванай рыбы.

Яна ўмела бачыць чалавека наскрозь — чаго ён варты, што яму насамрэч патрэбна і на што яго хопіць ды ў якой галіне жыцьця ён здольны дасягнуць сапраўдных вышыняў. Прыкладам, параіла яна Алегу Лесуну (які ў той час намагаўся рабіць кар'еру канцэртнага піяніста) заняцца дырыгаваньнем… Цяперака Алег Лясун — дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага тэатру опэры і балету. Яго называюць найбольш пэрспэктыўным з маладых беларускіх дырыжораў. Натальлі Цыганковай яна параіла напісаць дысэртацыю па музычнай пэдагогіцы. Яна падтрымлівала сваіх студэнтаў і верыла ў іх нават тады, калі ўсе вакол толькі сьмяяліся зь іхных амбіцый. Так было з Тацянай Вайтовіч, а пазьней з Канстанцінам Красьніцкім, які на першых курсах кансэрваторыі атрымліваў па спэцыяльнасьці пераважна чацьвёркі, але ўпарта практыкаваўся. Сёньня Красьніцкі — адзін з найлепшых беларускіх піяністаў, ляўрэат першых прэміяў некалькіх прэстыжных міжнародных конкурсаў.

Адным з улюбёных ейных студэнтаў быў Уладзімер Кандрусевіч. Перш чым атрымаць кампазытарскую адукацыю, ён скончыў кансэрваторыю па клясе фартэпіяна. Гэта было тры дзясяткі гадоў таму. Маці была тады маладая выкладчыца, але ёй давяралі найлепшых студэнтаў — такіх, як Ігар Палівода, Крысьціна Паплаўская ці Ўладзімер Кандрусевіч. Прыгожы, высокі, з доўгімі валасамі, у несавецкай замшавай куртачцы з махрамі, ён выглядаў як увасобленая мара пра свабоду. А ў дадатак, ён цудоўна граў на гітары, кампанаваў песьні, сьпяваў. Акурат у гэты час гаркам камсамолу наладзіў музычны фэст для моладзі, куды запрасілі Кандрусевіча выступіць перад падлеткамі. Дзяўчынкі і хлопчыкі вар'яцелі ад захапленьня. Гэта не спадабалася нейкаму вэтэрану, які выпадкова апынуўся ў залі. Ён напісаў у ЦК партыі, адтуль рэктару кансэрваторыі Ўладзімеру Алоўнікаву даслалі загад выкінуць Кандрусевіча з кансэрваторыі. Алоўнікаў быў сябрам ЦК і ня мог пярэчыць "старэйшым таварышам". Была вясна, Кандрусевічу заставалася літаральна два тыдні да дзяржаўных экзамэнаў. Калі б яго выгналі, ён адразу трапіў бы ў армію і

ўжо ніколі ня здолеў бы скончыць кансэрваторыю.
Даведаўшыся пра гэта, маці кінулася да рэктара і прымусіла-такі яго скасаваць загад. “Калі я ледзь ня выгнаў Кандрусевіча з кансэрваторыі, — згадваў пазьней спадар Алоўнікаў, — ягоны настаўнік па спэцыяльнасьці нават парога майго не пераступіў. А Андрэева, як тыгрыца, кінулася ратаваць Валодзьку!”

Такой была мая маці — шчырай і прагнай справядлівасьці. Такой яна засталася да канца сваіх дзён. І хаця часам бывала цяжка вытрымаць ейны максымалізм, яе шанавалі і любілі. Яна пайшла з жыцьця, і ўсе мы асірацелі. Але засталіся вучні, засталося некалькі запісаў на радыё ды некалькі навуковых працаў, якія яшчэ чакаюць свайго выдаўца. Засталіся ейныя жарты і вострыя слоўкі, ейныя думкі і ідэалы. Тое, што будзе жыць, пакуль мы жывём на зямлі.
Студэнты вельмі яе любілі і не давалі ёй загрузнуць у хваробе. Маці ведала, як нецярпліва яны чакаюць ейных урокаў, і гэта надавала ёй моцы. Тэлефон у хаце званіў увесь час, і ледзь ня кожны дзень хтосьці з студэнтаў — цяперашніх ці даўніх — прыходзіў яе наведаць. Дзеля таго каб яшчэ раз адчуць ейную цеплыню, падзяліцца сваімі маркотамі і радасьцямі, параіцца ці проста падурэць і пасьмяяцца. Зь ёй было прыемна бавіць час — нават тады, калі яна была ўжо сьмяротна хворая і нядужая, і не пякла ўжо сваіх славутых пірагоў з капустай, і не рабіла фаршаванай рыбы.
Яна ўмела бачыць чалавека наскрозь — чаго ён варты, што яму насамрэч патрэбна і на што яго хопіць ды ў якой галіне жыцьця ён здольны дасягнуць сапраўдных вышыняў. Прыкладам, параіла яна Алегу Лесуну (які ў той час намагаўся рабіць кар’еру канцэртнага піяніста) заняцца дырыгаваньнем… Цяперака Алег Лясун — дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага тэатру опэры і балету. Яго называюць найбольш пэрспэктыўным з маладых беларускіх дырыжораў. Натальлі Цыганковай яна параіла напісаць дысэртацыю па музычнай пэдагогіцы. Яна падтрымлівала сваіх студэнтаў і верыла ў іх нават тады, калі ўсе вакол толькі сьмяяліся зь іхных амбіцый. Так было з Тацянай Вайтовіч, а пазьней з Канстанцінам Красьніцкім, які на першых курсах кансэрваторыі атрымліваў па спэцыяльнасьці пераважна чацьвёркі, але ўпарта практыкаваўся. Сёньня Красьніцкі — адзін з найлепшых

беларускіх піяністаў, ляўрэат першых прэміяў некалькіх прэстыжных міжнародных конкурсаў.
Адным з улюбёных ейных студэнтаў быў Уладзімер Кандрусевіч. Перш чым атрымаць кампазытарскую адукацыю, ён скончыў кансэрваторыю па клясе фартэпіяна. Гэта было тры дзясяткі гадоў таму. Маці была тады маладая выкладчыца, але ёй давяралі найлепшых студэнтаў — такіх, як Ігар Палівода, Крысьціна Паплаўская ці Ўладзімер Кандрусевіч. Прыгожы, высокі, з доўгімі валасамі, у несавецкай замшавай куртачцы з махрамі, ён выглядаў як увасобленая мара пра свабоду. А ў дадатак, ён цудоўна граў на гітары, кампанаваў песьні, сьпяваў. Акурат у гэты час гаркам камсамолу наладзіў музычны фэст для моладзі, куды запрасілі Кандрусевіча выступіць перад падлеткамі. Дзяўчынкі і хлопчыкі вар'яцелі ад захапленьня. Гэта не спадабалася нейкаму вэтэрану, які выпадкова апынуўся ў залі. Ён напісаў у ЦК партыі, адтуль рэктару кансэрваторыі Ўладзімеру Алоўнікаву даслалі загад выкінуць Кандрусевіча з кансэрваторыі. Алоўнікаў быў сябрам ЦК і ня мог пярэчыць "старэйшым таварышам". Была вясна, Кандрусевічу заставалася літаральна два тыдні да дзяржаўных экзамэнаў. Калі б яго выгналі, ён адразу трапіў бы ў армію і ўжо ніколі ня здолеў бы скончыць кансэрваторыю.
Даведаўшыся пра гэта, маці кінулася да рэктара і прымусіла-такі яго скасаваць загад. "Калі я ледзь ня выгнаў Кандрусевіча з кансэрваторыі, — згадваў пазьней спадар Алоўнікаў, — ягоны настаўнік па спэцыяльнасьці нават парога майго не пераступіў. А Андрэева, як тыгрыца, кінулася ратаваць Валодзьку!"
Такой была мая маці — шчырай і прагнай справядлівасьці. Такой яна засталася да канца сваіх дзён. І хаця часам бывала цяжка вытрымаць ейны максымалізм, яе шанавалі і любілі. Яна пайшла з жыцьця, і ўсе мы асірацелі. Але засталіся вучні, засталося некалькі запісаў на радыё ды некалькі навуковых працаў, якія яшчэ чакаюць свайго выдаўца. Засталіся ейныя жарты і вострыя слоўкі, ейныя думкі і ідэалы. Тое, што будзе жыць, пакуль мы жывём на зямлі.

[image]
[image]

№ 1 (24) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/02/18**
[image]

Уладзімер Сакалоўскі

Новае выданьне па гісторыі Беларусі

УЛАДЗІМЕР САКАЛОЎСКІ — (нар. 1930) — дасьледнік беларуска-нямецкіх дачыненьняў. Апошняя публікацыя ў нашым часопісе — рэцэнзія “Вырваны з агню” (ARCHE, № 4-2001).

Handbuch der Geschichte Weißrußlands.
Hrsg. von D. Beyrau u. R. Lindner. — Göttingen: Vandenhoeck & Ruprecht, 2001.

Пры канцы пазамінулага году на паліцах нямецкіх кнігарняў зьявілася новае выданьне па гісторыі нашага краю — ёмістая кніга пад назвай “Дапаможнік па гісторыі Беларусі”. Яна выйшла пад рэдакцыяй нямецкіх навукоўцаў Дытрыха Байрава і Райнэра Лінднэра. У прадмове да кнігі аўтары адзначаюць, што, рыхтуючы яе, ставілі сабе на мэце зьвярнуць увагу нямецкага, ды ўвогуле эўрапейскага чытача, на найбольш значныя пэрыяды і праблемы, зьвязаныя з гістарычным разьвіцьцём Беларусі, “даць шырокі агляд па пытаньнях сацыяльнай і культурнай гісторыі Беларусі ад Сярэднявечча да пачатку XXI стагодзьдзя”.

Каб акрэсьліць праблемы, зь якімі сутыкнуліся стваральнікі “Дапаможніка”, зьвернемся да гісторыі яго напісаньня.

Першым мерапрыемствам у гэтым напрамку быў калёквіюм “для тых, хто цікавіцца Беларусяй”, арганізаваны Інстытутам гісторыі і краязнаўства Ўсходняй Эўропы Тубінгенскага ўнівэрсытэту, што адбыўся ў Тубінгене 20—21 лістапада 1993 году па ініцыятыве Р. Ліндэра пад назвай “Беларусь: гісторыя і сучаснасьць”. У ім, акрамя Р. Ліндэра, удзельнічалі Бэрнгард К’яры (унівэрсытэт Франкфурту-на-Майне), Астрыд Зам (Мангаймскі ўнівэрсытэт), Дыяна Зыбэрт (Кёльнскі ўнівэрсытэт), Моніка Банькоўскі (Цюрых) ды яшчэ некалькі гісторыкаў і славістаў зь Нямеччыны і Швайцарыі. На калёквіюме ўдзельнікі абмяняліся думкамі і заявілі пра сфэру сваіх зацікаўленьняў.
Праз два гады, 17—19 сакавіка 1995 году, адбылася першая нямецка-беларуская канфэрэнцыя гісторыкаў у горадзе Кёнігштайн у Таўнусе (недалёка ад Франкфурту). Яна была арганізавана Р. Ліндэрам, А. Зам і Б. К’яры. На ёй прысутнічалі пераважна немцы, а таксама гісторыкі зь Беларусі і Швайцарыі. Было прадстаўлена шмат рэфэратаў, якія горача абмяркоўваліся.
Праз год, 10—14 красавіка 1996 году, у Бірках каля Штутгарту адбылася другая нямецка-беларуская канфэрэнцыя гісторыкаў. Яна праходзіла пад кіраўніцтвам прафэсара Дытрыха Байрава, загадчыка катэдры гісторыі Ўсходняй Эўропы Тубінгенскага ўнівэрсытэту, але арганізатарам яе быў, як і раней, Р. Ліндэр. Зь нямецкага боку зноў узялі актыўны ўдзел палітоляг А. Зам і гісторык Б. К’яры, а таксама гісторык рэлігіі Юлія Освальт. Ангельскі бок прадстаўляла Вера Рыч, а польскі — прафэсар Станіслаў Александровіч. Беларусь рэпрэзэнтавалі такія гісторыкі, як Захар Шыбека, Генадзь Сагановіч, Павал Лойка, Мікалай Іваноў, Андрэй Кіштымаў, літаратуразнаўца Іван Афанасьеў і Алег Бухавец (з Масквы). На сустрэчу прыехаў таксама і Дзьмітры Сямушын з Сомбатхею (Вугоршчына) — аўтар “Кароткай гісторыі Беларусі” па-вугорску. На канфэрэнцыі кожнаму ўдзельніку была дадзена магчымасьць выказацца наконт найважнейшых аспэктаў свайго прадмету дасьледаваньня, паразважаць, якія матэрыялы маюць увайсьці ў заплянаваны дапаможнік.

Дапаможнік меркавалася рыхтаваць ня проста як выданьне, што апісвае падзеі ці факты, а як кнігу, якая аналізуе і

раскрывае асноўныя праблемы пераломных момантаў беларускай гісторыі. Першапачатковы назоў паседжаньня “Беларусь: праблемы пэрыфэрыйнага рэгіёну” выклікаў незадавальненьне беларускага боку. Узьнікла вельмі напружаная дыскусія. Склалася ўражаньне, што паміж нямецкім і беларускім бокам не ўсталявалася паразуменьня. Арганізатары зыходзілі з сучаснай заходняй мэтадалёгіі навукі, якая змагаецца з “нацыяналістычнай” гістарыяграфіяй. Спрабавалі таксама давесьці беларускім калегам “неадпаведнасьць” і “неактуальнасьць” іх нацыянальных пазыцый, закідаючы ім схільнасьць да нацыяналістычных падыходаў. Гэта не судзеяла дыялёгу і збліжэньню пунктаў погляду. Арыентацыя на працы іншаземных навукоўцаў, што да гэтага часу не асабліва надавалі значэньня гісторыі беларускага народу (які лічылі насельніцтвам ці то ВКЛ, ці то Рэчы Паспалітай, ці Расейскай імпэрыі), прыводзіць дасьледнікаў да канцэптуальнай і мэтадалягічнай залежнасьці, а ў некаторых выпадках і да кампіляцыйнасьці. І гэтай небясьпекі не пазьбеглі і выдаўцы даведніка.
Тады, у красавіку 1996 году, каталёг тэмаў дапаможніка быў яшчэ даволі ўмоўны і неакрэсьлены. Былі “белыя плямы” ня толькі ў храналёгіі. Заставаліся незапоўненыя цэлыя разьдзелы, як, напрыклад, эканоміка, сацыяльныя і канфэсійныя праблемы, культура, дзяржаўнасьць, рэлігійныя і этнічныя меншасьці і г.д. Для іх спадзяваліся знайсьці аўтараў. Канчатковую канцэпцыю дапаможніка, якія тэмы і якія аўтары будуць у яго ўключаны, нямецкі бок зацьвердзіў самастойна. Тэксты нямецкія партнэры прымалі толькі ў расейскай мове, спасылаючыся на адсутнасьць перакладчыкаў. Гэта не адпавядае рэчаіснасьці: зь беларускае мовы перакладаюць Норбэрт Рандаў, Гундула і Ўладзімер Чапегі, Карл Гутшміт, Соня Хайль, Дыяна Зыбэрт, Моніка Банькоўскі, Герман Бідэр і шмат іншых. Пры гэтым імёны і спэцыяльныя тэрміны немцы прасілі падаваць на беларускай мове. Бальшыня аўтараў гэтага не зрабіла, і пазьней пры рэдагаваньні прыходзілася траціць шмат часу і намаганьняў, каб ізноў аднаўляць іх у беларускім напісаньні. Менавіта гэтая акалічнасьць і прычыніць некаторыя хібы дапаможніка.
Што да імёнаў, то, згодна з жаданьнем укладальнікаў, яны ў тэксьце павінны былі пісацца на той мове, якая ў адпаведны час

дамінавала ў Беларусі. Калі пасьлядоўна вытрымліваць такую пазыцыю, то паміж 1600—1920 гадамі імёны ўсіх беларусаў трэба падаваць у транскрыпцыі ці то з польскай, ці то з расейскай. На наш погляд, гэта было значным недахопам, бо адсутнасьць у нямецкай адзінай пасьлядоўнай трансьлітарацыі беларускіх назоваў і імёнаў сур'ёзна абцяжарвае разуменьне тэкстаў тымі, хто хоча вывучаць гісторыю Беларусі па арыгінальных крыніцах ці беларускіх дасьледаваньнях, а не пазаходнеэўрапейскіх і расейскіх, як раяць выдаўцы дапаможніка. Яркі прыклад такога канфузу — нямецкамоўныя карты па Дудэну, па якіх падчас другой сусьветнай вайны нямецкія афіцэры не маглі арыентавацца на тэрыторыі Беларусі. Гэта пераканаўча сьведчыць аб тым, што такі спосаб паданьня матэрыялу, які выбралі рэдактары тому, — ненавуковы і беспэрспэктыўны.

Як бачна з прадмовы і ўводзінаў, у Нямеччыне абуджаецца зацікаўленасьць Беларусяй. Нягледзячы на шматлікія практычныя перашкоды — адсутнасьць спэцыялістаў, недасьледаванасьць прадмету, нераспрацаванасьць канцэптуальных праблем, — практычная неабходнасьць атрыманьня гістарычнай і сучаснай інфармацыі стала для аўтараў прапанаванай кнігі стымулам узяцца за гісторыю Беларусі як гісторыю *эўрапейскага рэгіёну і дзяржавы* [1]. Нельга пагадзіцца і з двума палажэньнямі прадмовы. Перш за ўсё з тым, што "прапанаваны дапаможнік упершыню дае *шырокі* агляд сацыяльнай і *культурнай* гісторыі Беларусі ад Сярэднявечча да XIX стагодзьдзя". Гэта не адпавядае рэчаіснасьці. Па-другое, з тым, што пры напісаньні кнігі назваў, якія ўваходзілі цягам стагодзьдзяў у гісторыю культуру беларусаў, трэба кіравацца прынцыпам "Weimarer", якая панавала ў Беларусі ў той пэўны пэрыяд. Распачаўшы сваё дасьледаваньне з прадмовы і ўводзінаў, акрэсьліўшы ў ім свае пазыцыі і праблемы, што ставяцца перад рэдактарамі ў часе падрыхтоўкі выданьня, укладальнікі пераходзяць да разьдзелу гістарыяграфіі і геральдыкі. За тым разьдзелам ідзе самы вялікі і найбольш грунтоўны разьдзел "Храналёгія з X да пачатку XX стагодзьдзя". У ім крок за крокам, пачынаючы ад распаду Кіеўскай Русі (Лойка), праз ВКЛ (Лойка, Сагановіч), польскую Рэч Паспалітую (Сагановіч),

[1] **Handbuch der Geschichte Weißrußlands. Hrsg. von D. Beyrau und R. Lindner, Göttingen: Vandenhoeck & Ruprecht, 2001, S. 12.**

Паўночна-Заходні край (Шыбека), БССР (Марплз), Крэсы Ўсходнія (Бэнэке), пасьляваенную БССР (Марплз) і сучасную Рэспубліку Беларусь (Зам), прасочваецца гістарычны лёс нашага народу. У трэцім разьдзеле “Аспэкты сацыяльнай і культурнай гісторыі” асьвятляецца гісторыя сацыяльных дачыненьняў і эканоміка. Апісваюцца розныя слаі беларускага сярэднявечнага грамадзтва: баяры, князі, магнаты, прыгонныя, гараджане. Яны вылучаны ў наступныя разьдзелы: беларуская эліта (Зяленска), сяляне і прыгоннае права (Лойка), пераход беларускага сялянства ад прыгоннага права да калектывізацыі (Каханоўскі), пачаткі індустрыялізацыі краю ў ХХ стагодзьдзі. Важнае месца ў дасьледаваньні адведзена праблеме гарадоў (іх дзейнасьці і культуры): ад гарадоў ВКЛ (Александровіч) да ператварэньня беларускіх гарадоў з рэгіянальных цэнтраў у гарады шляхецкай рэспублікі (Родэвальд) на прыкладзе Полацку. Пры гэтым найбольш увагі аддаецца разьвіцьцю Менску ад губэрнскага гораду да сталіцы (Шыбека, Бон).

У выданьні знайшлі сваё асьвятленьне этнічныя і канфэсійныя праблемы. Артыкулы пра этнічныя зьмены ў беларускім грамадзтве ахопліваюць пэрыяд ад Сярэднявечча да новага часу (Чаквін, Церашковіч). Два артыкулы прысьвечаны габрэйству Беларусі (Ёфэ і Іваноў) і толькі адзін — канфэсійнай спэцыфіцы нашага краю. У гэтай частцы дапаможніка ёсьць пэўныя дыспрапорцыі: няма ніводнага артыкулу, нават абагульняльнага, пра іншыя этнічныя супольнасьці Беларусі. Без гістарычнага кантэксту ў тэкст уплятаюцца разьдзелы, прысьвечаныя другой сусьветнай вайне (К’яры, Іваноў), і чамусьці зусім не апісваюцца ня менш трагічныя і зьмястоўныя падзеі першай сусьветнай вайны. Непрапарцыйным падаецца таксама апошні разьдзел кнігі “Мова і літаратура”. Калі мове прысьвечаны дзьве значныя публікацыі — “Мовы ў Беларусі да канца ХІХ стагодзьдзя” (Дынглі) і “Барацьба за родную мову ў ХХ стагодзьдзі” (Бідэр), — то беларуская літаратура паказана вельмі фрагмэнтарна. Беларускаму аўтару (І. Афанасьеву) выдзелілі на гэта ўсяго 17 старонак, і працэс станаўленьня і разьвіцьця самой літаратуры як фэномэну духоўнага сталеньня нацыі раскрыты ня быў.
Прыкрымі “белымі плямамі” ў кнізе выглядае адсутнасьць артыкулаў пра рэлігійнае жыцьцё ў Беларусі, жорсткую

барацьбу рэфармацыйных і антырэфармацыйных сілаў, што складала важную рухальную сілу палітычнага і культурнага разьвіцьця Ўсходняй Эўропы; таксама пра ўніяцтва як спэцыфічную форму духоўнасьці гэтага рэгіёну і спробу аб'яднаньня цэркваў; пра беларускае кнігадрукаваньне і пра такую грандыёзную постаць усходнеславянскага Асьветніцтва, як Францішак Скарына; пра беларускі тэатар, беларускае мастацтва і беларускі фальклёр, які цягам некалькіх стагодзьдзяў (другой паловы XVII — першай паловы XIX стагодзьдзя) быў адлюстраваньнем духоўнага жыцьця беларускага народу і стаў падмуркам новай беларускай літаратуры.
Разнастайнасьць выкарыстаных крыніцаў, якія разьмешчаны ў канцы кнігі па храналягічным прынцыпе, сьведчыць пра значнасьць задумы выданьня. Даволі проста карыстацца бібліяграфіяй, якая падзелена на найважнейшыя этапы гістарычнага разьвіцьця краю, а таксама на найбольш значныя напрамкі: энцыкляпэдычны, гістарыяграфічны, архіўны і іншыя. Аднак зьдзіўляе вылучэньне ў бібліяграфічным разьдзеле асобным пунктам "Крыніцы на заходніх мовах (храналягічна)", таму што такія крыніцы прысутнічаюць і ў іншых пунктах бібліяграфіі. У той жа час сьпіс кніг, нягледзячы на вызначэньне іх як выбраныя бібліяграфіі, мае недаравальныя прагалы: прапушчаны вельмі аўтарытэтныя крыніцы і дасьледаваньні па розных галінах гісторыі Беларусі [2]. Небагата прадстаўлена ў падразьдзеле "Беларусь у гістарычным люстэрку сваіх гісторыкаў" беларускае крыніцазнаўства і асабліва аналіз нацыянальнай гісторыі ў самой Беларусі. Такія бібліяграфічныя хібы сьведчаць, што нямецкі бок мала ўвагі надае ўласна беларускаму крыніцазнаўству.

Укладальнікі, баючыся абвінавачаньняў у некампэтэнтнасьці, не захацелі парушаць прынятага ў нямецкай гістарыяграфіі статусу-кво. Іх пасіўная пазыцыя прычыніла шэраг непаразуменьняў. Напрыклад, з дапаможніка мы так і не даведваемся, што такое канцылярская мова ВКЛ. Старабеларуская гэта мова, ці так званая беларуская, ці русінская, ці рутэнская, ці расейская, ці літоўская. Нямецкі бок сьвядома ня ўлічваў новых павеваў у беларускай

гістарыяграфіі, рэдактары даведніка ня бралі пад увагу працаў такіх дасьледнікаў, як Абіхт, Я. Энгельгарт, Х. Штанг, В. Концэ, А. Іпэль. Яны праігнаравалі таксама тыя новыя падыходы, што былі сфармуляваны за міжнародным “круглым сталом” пад назвай “Беларусь у Вялікім Княстве Літоўскім”, які адбыўся ў Менску 6—7 красавіка 1992 году. У падсумаваньні вынікаў дыскусіі яго ўдзельнікі — беларускія, польскія, ангельскія, італьянскія гісторыкі і філёлягі-славісты — адхілілі канцэпцыю афіцыйнай савецкай гістарыяграфіі 30—80-х гадоў, якая адмаўляла існаваньне беларускай дзяржаўнасьці ў эпоху Сярэднявечча, і аднесьлі вытокі гэтай дзяржаўнасьці да часу ўтварэньня Полацкага і Тураўскага княстваў, а пазьней, — Гарадзенскага, Наваградзкага, Смаленскага ды іншых. А Вялікае Княства Літоўскае “круглы стол” акрэсьліў як фэдэрацыю беларускіх, летувіскіх і ўкраінскіх земляў. Тым самым нямецкія ўкладальнікі засталіся на пазыцыях чужой беларусам гістарыяграфіі.

Дапаможнік прапануе гісторыю Беларусі як гісторыю *рэгіёну*, што цікава, але не вырашае тэрміналягічнай блытаніны і не адпавядае назьве выданьня. Увогуле, дапаможнік па сваёй структуры і зьмесьце больш нагадвае звычайны зборнік нарысаў па гісторыі Беларусі.

Разам з тым, заслугоўвае пазытыўнай ацэнкі тая грандыёзная праца, якую выканалі нямецкія навукоўцы і асабліва ўкладальнікі кнігі. Такая ініцыятыва вельмі важная цяпер — калі Беларусь пачынае свой няпросты шлях да Эўропы.

---

[2] Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Менск, 1989; Біблія. Факсымільнае ўзнаўленьне Бібліі, выдадзенай Францыскам Скарынам у 1517—1519 гадах. Т. 1—3. Менск, 1990—1991; Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 1—6. Менск, 1987—1994; Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Т. 1—8. Менск, 1984—1988; Беларусы. Матэрыяльная і духоўная культура. Нарысы ў 8 тамах. Т. 1—5, 1995—2001; E. Sgambati. Il Tristano Biancorusso. Firenze, 1983; V. Rich. Like Water, Like Fire. Anthology of Byelorussian Poetry. London, 1971; Z. Kipel. The Byelorussian Tristan. New York & London, 1988; Fair Land of Byelorussia. An Anthology of modern Belorussian poetry by W. May. Moskow, 1976; O. Łatyszonek. Białoruskie formacje wojskowe

1917—1923. Białystok, 1995; A. Bergman. Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej. Warszawa, 1984; P. V. Vladimirov. Doktor Francisk Skorina. München, 1989; N. Randow (Hg.) J. Kolas. Märchen des Lebens. Berlin, 1988; F. Scholz. Weißrußland und der Westen. Beiträge. Dresden, 1998. На жаль, ня згадваецца ніводнае з больш як 10 фундамэнтальных выданьняў АН БССР, прысьвечаных Ф. Скарыну і ягонай эпосе і выдадзеных да 500-годзьдзя з дня яго нараджэньня. Назад

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/02/18

Андрэй Хамярліньскі-Дзеражыньскі

Фарфалкі старапольскія

Раздзел “Выбраныя надпісы”

На пачатку саракавых гадоў XVII стагоддзя Яся Лугоўскага, якога бацька адправіў у падарожжа па Еўропе набрацца розуму, надта ўразіла Сіенская акадэмія. Агледзеў ён яе з камічнай мешанінай захаплення і абурэння. Гэтае відовішча напоўніла душу нашага падарожніка сумам, і таму захацелася яму распавесці суайчыннікам, што такія бачыў на сценах той навучальнай установы малюнкі ды словы, накрэмзаныя рукамі студэнтаў, — казаць сорамна.

Сорамна, сорамна, але ж і ў нашых краях пісалі, ды яшчэ як пісалі, і не толькі на сценах, і не толькі пісалі, але й рэзалі, малявалі, чаканілі — а як жа інакш? І часцей за ўсё не брыдоту, а высакародныя думкі, цнатлівыя парады, афарызмы, сентэнцыі, што ўзмацняюць дух і дапамагаюць целу, і філасофскай глыбіні максімы.

Бо “Выбраныя надпісы на будынках для агульнай адукацыі” былі і ў нас надзвычай модныя, і не адно стагоддзе.

За ласку дзякуй, Пане Бажамосці,
Ды ж дай і тому, хто мне зайдросціць,
— віднелася над брамай варшаўскага мешчаніна. А другі тую ж думку ўхапіў крыху хітрэй:

Тыя, хто ў гэтым доме бываюць,
Чаго нам жадаюць, хай самі маюць!
Гасцінны шляхецкі маёнтак вітаў госця вясёлым вершам (складзеным яшчэ панам Мікалаем Рэем з Наглавіц):

Хто праз браму завітае,
Клопат у полі пакідае!
Сенатар над уваходам сваёй сядзібы загадаў выразаць словы мудрыя й па-рымску суровыя:

Разумнай парадзе,
Сціплай бяседзе,
Цноце і веры,
Адчынім мы дзверы.
А кожнага, хто наведваў плябанію ў Фірлееве ў часы, калі жыў славуты айцец Бенедыкт Хмялёўскі, стваральнік “Новых Афінаў”, вітаў ля ганка прыгожы вершык:
Ведаць, госцю, жадаеш, хто дом свой тут мае?
Той, хто добры тут Пастыр, хто ўсім тут спрыяе,
Хто як гарох пры дарозе, а не бадзяк скурлаты,
Рады госцю сэрцам і хлебам, хоць сам небагаты,
Хто рады вітаць Сакрата, чалавека навукі,
А не Мак’явелі злога, аматара здраднай штукі,
Хто не любіць Заіла, ані нахабства брыдоты,
А любіць мудрых ды сціплых — найлепшых у доме кляйноты.
Трапляліся, аднак, і менш прывабныя надпісы:

Калі без грошай завітаеш —
Кіём у карак атрымаеш,
— чыталі гулякі над дзвярыма карчмы. *“Бойся Бога ды графа Астрарога”,* — засцерагала брама графавай люблінскай сядзібы. А адзін ліхвяр на акаціцы сваёй хаты змясціў дэвіз *“Аддай, што вінен”.* А побач была вельмі выразная выява рукі, што бязлітасна сціскала мачульку, з якой у начоўкі сцякала вада.
Апроч сентэнцыяў вельмі цаніліся разнастайныя сімвалічныя

выявы, алегорыі навук, рамёсцваў дый “годнасцей і нягоднасцей” — такіх, як вернасць айчыне, сур’ёзнасць, розум, міласэрнасць, гонар ці, наадварот, жарлівасць, гультайства, неахайнасць, хцівасць, дурная злосць. У канцы эпохі Сасаў адзін пробашч на сценах сваёй плябаніі загадаў намаляваць выявы звяроў, якія адлюстроўваюць розныя бакі чалавечай натуры. Сімвалам дурноты там быў грубы парсюк, сімвалам вераломнай хітрасці — ліса, былі там заяц-палахлівец, надзьмуты індык, ядавітая гадзюка і — *“малпа перад люстэркам і з навамоднай парыжскай прычоскай крывіць морду”*. А пан Езяркоўскі, нурскі падваявода, загадаў зрабіць шырму, на трох створах якой можна было бачыць надпісы й малюнкі, што адлюстроўвалі жыццёвыя прынцыпы яе ўласніка. Перш за ўсё — складзеныя для малітвы рукі і побач гэткія словы: *“Богу — так”*. Потым — правая рука, складзеная як для поціску, і тлумачэнне: *“Прыяцелю — так”*. Пасля ж — далонь, складзеная ў дулю, а побач надпіс: *“Ворагу — так!”*.
Надпісамі ўпрыгожвалі не толькі фасады будынкаў, брамы, дзверы, уваходы ды сцены. Пісалі і ў самім доме, і на мэблі, і на ўсялякіх гаспадарчых прыладах. Амаль у кожным падворку на жылым будынку — на карнізе, пад столлю — апроч даты пабудовы быў які-небудзь дэвіз, ці пажаданне, ці проста аўтограф майстра-будаўніка, просьба аб Божай ласцы да жыхароў ці імя гаспадара навакольных земляў. Сталовы пакой вітаў вясёлым надпісам *“Найлепшыя весці, калі клічуць пад’есці”*. Агменьчык таксама запрашаў да сябе словамі, вельмі зразумелымі ў зімовыя дый восеньскія хмарныя, халодныя дні: *“Сядзеш з куфлем пры агмені — ад тугі табе збаўленне”*.
Асаблівай прыхільнасцю да падобных надпісаў вызначаўся знакаміты ў XVIII стагоддзі ксёндз канцлер Краеўскі, пробашч з Замброва. І касцёл, і званіца там былі размаляваныя рознакаляровымі сентэнцыямі, афарызмамі дый максімамі. На плябаніі польскія і лацінскія прыслоўі ды прымаўкі запаўнялі сцены, ланцужкамі віліся па бэльках, па вушаках і аканіцах, скляпеннях, пячах — з першага паверху да мезаніну. Напэўна, калі ўжо здавалася, што вольнага месца нідзе не засталося, святар раптам узгадаў пра ўсялякія патаемныя пакойчыкі.
І пачаў туды наведвацца ў хвіліны творчага натхнення. Вядомы цынік і фігляр, ксёндз Антоні Жэра пакеплiваў потым, што тыя патаемныя надпісы гэткія былі асабліва мудрыя, гэтак краналі

сэрцы і чалавечую натуру, што, седзячы ў замброўскай прыбіральні і чытаючы надпісы, чалавек пра ўсё на свеце забываўся і гадзінамі з месца не рухаўся.
Зразумела, не толькі сцены былі месцам для змяшчэння залатых думак. Напрыклад, старыя шафы хавалі ў сваіх нетрах сапраўдныя скарбніцы адбітых на шкле, парцаляне, срэбры мудрагелістых сентэнцый.

Той не варты, хто з мяне
Ўсё за сябра не глытне!
— распавядаў надпіс на вялізным келіху. А на кулаўцы, падманным келіху без нагі, з якога заўсёды трэба было піць да дна, красаваліся такія радкі:

Сабе людзі дагаджалі — і нагу маю адцялі,
Я ж ім лепей дагаджаю — і абедзве адбіраю.
А лыжкі, гэтыя даўнія польскія лыжкі — пацямнелыя, памерам амаль з апалонік, з шасціграннай доўгай роўнай ручкай, якую па абодвух канцах аздаблялі арнаменты (яшчэ Крашэўскі ў дзяцінстве еў гэткаю!) — ізноў цудоўная скарбнічка непараўнальных афарызмаў! Вядома, сярод іх былі і няўдалыя — хоць з нядрэннымі рыфмамі, але ж з досыць трывіяльным сэнсам. Але хапала й тых, якія парадавалі б і самы тонкі слых. Сталовага срэбра аж да канца XVII стагоддзя нават і магнацкія маёнткі не мелі ў дастатковай колькасці, таму госці звычайна елі ўласнай лыжкай, якую насілі, запіхнуўшы за халяву. А калі хто пра лыжку забываўся, магло здарыцца, што гаспадар падносіў яму сваю, з адметным гравіраваным павучэннем *“Хто з сабою носіць, пра мяне не просіць”*.
Але ж гэта яшчэ палова ліха. Уявіце сабе раскошную барочную бяседу, дзе ракой цякуць вытанчаныя віны, дзе дубовыя сталы ломяцца ад найсмачнейшых страваў, дзе гаспадар кожнаму рады нібы роднаму брату — а госць знаходзіць побач з сваім сталовым наборам лыжачку з дзіўным надпісам *“Не для таго мяне клалі, каб твае рукі бралі”*… Гэтак вось!
“Хто мяне схавае — таго мой пан збівае”, — прыгожанькімі літаркамі папярэджвала іншая лыжка. Другія дадавалі: *“Не капай другому ямы, сам увалішся ў яе”* ці *“Сціпласць упрыгожвае”*, — з першага погляду, агульнавядомыя ісціны, але ж тут не без пэўнага намёку. А яшчэ адна сцвярджала проста і

безапеляцыйна: *“За паху не суй, бо выляту!”*. *“Мною карыстайся, а сціплым заставайся”*, — яшчэ адзін перл у гэтай жа чарадзе, якую замыкала інквізітарскай жорсткасці пагроза: *“Схопіш — стакроць сплоціш!”*.
Разнастайныя надпісы ўпрыгожвалі не толькі сцены, шафы, посуд ды лыжкі. У парках, якія з канца XVIII стагоддзя звычайна разбівалі ў англійскай манеры, кампануючы іх так, каб прадэманстраваць краявіды ды прыгажосці ў самым натуральным стане, госця таксама чакалі перлы розуму. Блукаў госць сабе, блукаў, і раптам сустракаў на ўпрыгожанай арнаментам лаўцы каля крыніцы надпіс: *“Тут адпачынак”*.
А дзе ў іншым месцы ён знаходзіў прыгожую альтанку з тлумачэннем для неўважлівых: *“Прыгожы краявід”*. Ці бачыў камень з высечаным на ім вынікам элегічнага натхнення, ці эпітафіяй любімаму сабачку, або сантыментамі пра растанне закаханых, пра першыя пацалункі або сяброўскія развітальныя абдымкі.
Прафесар Быстрон распавядаў пра стары звычай выразаць на скурцы гарбуза надпісы, якія разрасталіся разам з ім да велізарных памераў. Вышкрэбвалі, напрыклад, гэткія вось добрыя парады, маючы на ўвазе ўплыў розных пладоў на працу страўніка:

Калі той гарбуз твой страўнік папсуе,
Расце побач рэвень — адразу ўратуе.

Ксёндз Бенедыкт Хмялёўскі над брамкаю свайго садочку змясціў словы, годныя вялікага й знакамітага паэта:

Ведай, госцю: кут гэты ёсць
Версалем сапраўдным, дзе розум ладны
Мае чым захапіцца й чаму навучыцца.

Тодар Патоцкі, бельскі ваявода з 1791 году, які лічыў сябе неверагодна таленавітым паэтам, пры ўваходзе ў сад сваёй каханай жонкі загадаў выразаць такія словы:

Тут, пры гэтай браме,
Сядзеў ваявода ў жупане.

Трэба сказаць, што гэткія выбухі натхнення для ваяводы былі звычайнай справай. А часамі палёт фантазіі ўзносіў яго значна, значна вышэй. Вось што распавёў пра ваяводу генерал

Францішак Дзержыкрай-Мараўскі: “Ён надзвычай кахаў сваю жонку Кардулю і, даўшы раскошную бяседу на яе імяніны, пасля сытнай трапезы запрасіў гасцей на вячэрні баль у суседні фальварак, які знаходзіўся за чвэрць мілі. Госці выехалі ўжо шарай гадзінай, і па доўгай ліпавай алеі шэрагам пацягнуліся тарантасы, шарабаны, каламажкі, карэты, ландо і таратайкі. На вялікае здзіўленне, на кожным дрэве яны бачылі транспарант з надпісам “Яна гэта, яна!”. Надпісы віселі ўсю чвэрць мілі, і ўсе аднолькавыя. “Яна гэта, яна!” — абвяшчалася з ліп. Нарэшце, на фальварку госці ўбачылі яшчэ больш раскошны, шыкоўны велізарны надпіс, які рыфмаваўся з першым: “Мая каханая жана”. Ну, тут былі і крыкі, і віваты, і салют з гарматаў, агромністы прывітальны келіх, расчуленая да слёз Кардуля — карацей кажучы, незвычайны трыумф сенатара-паэта.
На жаль, трыумфальнай брамы для жонкі ён не збудаваў. А мог бы. Бо ў старадаўняй Польшчы можно было ўбачыць не толькі ўрачыстыя транспаранты, але і брамы, узведзеныя з нагоды праездаў ці візітаў манархаў з манархінямі, іерархаў царквы, знакамітых сваімі перамогамі военачальнікаў. Будавалі гэтыя брамы часцей за ўсё з палатна, якое расцягвалі на драўляных рыштаваннях і аздаблялі з найбольшай стараннасцю. Сімвалічныя карціны, статуі, ілюмінацыі, кветкі, вянкі, фігуры, якія выглядалі нібы скульптуры, а на самай справе былі жывымі людзьмі і з прыбыццём госця на агульнае здзіўленне ажывалі пад музыку, рыпенне трубаў, панегірычныя вершы, — усё суправаджала гэтую эфемерную архітэктуру, якая, зразумела, без адпаведных падзеі надпісаў абысціся ніяк не магла.
З іх жа найбольшую папулярнасць знайшло данесенае да нас адразу некалькімі сведкамі прывітанне Фрэдэрыку Аўгусту, князю варшаўскаму, якога ў траўні 1810 сустрэла наступнае:

Калі ў такім крытычным часе
Праз Каліш
Да нас валіш,
Вітаем, Найяснейшы Сасе!

Лаканічнасцю гэты надпіс мог бы паспрачацца з кранаючай сэрца сваёй лапідарнасцю эпітафіяй, якой нейкі няўцешны львоўскі муж аздобіў помнік сваёй каханай палавіны:

Тут ляжыць Зялёнка,
З Бярдычава жонка.
О, калі гаворка пайшла пра эпітафіі, трэба сказаць, што сярод іх шмат было прыгожых, дый цікавых хапала. Амброзі Грабоўскі, напрыклад, прыводзіць эпітафію, якой няўцешныя сваякі аздобілі надмагільны помнік прынцыпала Брацтва Святой Тройцы з Кракава:

Тут ляжыць Міхал Пагвіздак,
Старшы брат Святой Тройцы.
Просім: кожны, хто мінае,
Прачытай за яго “Слаўся, Марыя”.
Іншая эпітафія, працытаваная тым жа аўтарам, больш падобная да анекдоту. Нібыта на магіле рамесніка, які вырабляў гузікі і быў пахаваны разам з жонкай і дачкой, былі такія словы:

Тут ляжыць гузік між дзвюма пяцелькамі,
Пане Божа, малю, злітуйся над намі!
Затое ўжо цалкам праўдзівая — ці верце, ці не — звестка пра надмагільны надпіс сямейства Боскіх са Слупцоў:

Тут ляжаць Матка Боска й Сын Боскі.
Не трэба здзіўляцца дурным,
Што мы тут, у Слупцах, ляжым.
А вось салдацкая эпітафія часоў караля Яна III:

Ляжыць тут Якуб, што меў на гербе Стрэмя.
Сарвалося яго стрэмя — атрымаў ён камень у цемя.
А вось і найкаштоўнейшая рэч у скарбніцы эпітафій, якую адкапаў у рукапісах Ягелонскай бібліятэкі й пра якую распавёў нам Раман Калета ў сваіх “Сенсацыях колішніх гадоў”:

Тут ляжыць панна Ганна, у сваім паненстве ўдала,
Бо нікому не дала,
Толькі Богу душу, дамініканцам — цела,
І добрае жыццё мела.
У касцёлах таксама ставала надпісаў — і нават цікавейшых за эпітафіі. Напрыклад, адзін вяльможны пан загадаў намаляваць выяву Хрыста, а побач, крышачку ніжэй, — уласны партрэт: у ботах са шпорамі, у парадным кунтушы, дарагім пасе, пры шаблі; а пад партрэтам вісела шыльдачка са словамі:

Згінаюся перад Нябёсным Панам,
Хоць я ў Сахачове кашталянам.

Ізноў пра тое ж: ваявода Фелікс Антоні Лось, жадаючы зрабіць прыемнае пробашчу са сваіх красенінскіх уладанняў, загадаў стварыць ягоную выяву і павесіць побач з алтаром, а пад ёй змясціць свой панегірычны вершык у гонар пробашча. Ксёндз усхваляваўся, і хутка з другога боку алтара з'явілася выява ваяводы, таксама аздобленая рыфмаваным панегірыкам. Ваявода не адступіў — і адказаў яшчэ адным вершыкам. Пробашч таксама не застаўся вінен. І пасыпаліся новыя й новыя кампліменты, усхваленні, выразы ўзаемнага захаплення й сардэчнай узрушанасці — і цягнуліся гэтая надпісы па ўсёй сцяне абапал алтара аж да падлогі.

Той пан ваявода — пасля раздзелу Рэчы Паспалітай арцыкухмістр Галіччыны й Валыні — быў, як кажуць, чалавекам сціплым, добра адукаваным, апантаным нумізматыкам і, да таго ж, аматарам тэатру, калекцыянерам старажытнага жывапісу. Хоць, па праўдзе кажучы, і дзівацтваў у яго хапала. А з іх найбольш адметным было пачуццё ўласнай сенатарскай годнасці.

Сучаснікі кпілі з яго, небаракі. Распавядалі, што калі ён загадаў пасадзіць лясок у Красеніне, то шлях да таго ляска назваў "Сенатарскім". Ваявода заўсёды вельмі пышна святкаваў атрыманне тытулаў, узнагародаў ці пасадаў. З такіх нагодаў у ягоным дваровым тэатры нават адпаведныя п'есы ставілі. Не задаволіўшыся п'есай, сенатар дадаваў да яе "панегірычныя, прысвечаныя ўрачыстасці куплеты і выдумваў асаблівыя транспаранты". Калі тыя транспаранты дэманстравалі гледачам (сваякам і двару), то тыя па сігнале сенатара павінны былі пляскаць у ладкі. Сваю годнасць найвяльможнейшы пан нястомна дэманстраваў не толькі свету, але і сабе. Слова "я" ўвогуле не ўжываў, "заўсёды пра сябе нібы пра каго трэцяга казаў: "Сенатар паедзе, Сенатар гэта любіць, Сенатар пойдзе спаць, у Сенатара галава баліць".

Здарылася аднойчы з ім непрыемная прыгода: коні ягоныя чагосьці спалохаліся, панеслі, і карэта разам з панам сенатарам ледзьве не звалілася ў страшна глыбокі дол. І тады пан загадаў пабудаваць пры дарозе каплічку, а на яе цокалі змясціць такія словы:

Таму, што Пан Пану жыццё ўратаваў,
Пан Пану тут статую ўсталяваў.
Напэўна, ёсць у гэтым анекдоце, які распавёў на старонках “Успамінаў” Дмахоўскі, нейкая доля праўды. Бо той выпадак палічыў вартым увагі і стары зласлівец генерал Дзержыкрай-Мараўскі. Аднак ён распавядае трошачку інакш.
Нібыта месцам катастрофы была Танва, цераз якую ваявода перапраўляўся й ледзь не ўтапіўся. “Ледзь стаяў ён на чоўне, змоклы, дрыжэў ад холаду і адразу ж загадаў перавозчыкам і рыбакам падзякаваць Богу за тое, што даў ім шчасце выратаваць Сенатара”. А крыху ачуняўшы, даслаў да пробашчаў сваіх уладанняў кур’ераў з загадам прачытаць за ўратаванне Яго Вяльможнасці “Te Deum”. І касцёл загадаў пабудаваць з гэткім вось надпісам на франтоне:

Таму, што Пан Пану жыццё ўратаваў,
Пан Пану касцёл ля Танвы збудаваў.
“Калі ваявода памёр (а памёр ён падчас пабудовы касцёлу), — дадае Мараўскі, — пра той надпіс, на шчасце, забыліся”.
Пераклалі з польскай Валянціна Лаўрэцкая і Зміцер Магілеўцаў паводле: Andrzej Hamerliński-Dzierożyński. Farfałki staropolskie. — Warszawa: Iskry, 1982.

[image]
[image]

№ 1 (24) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/02/18**
[image]

Лісты Яна Станкевіча да Антона Адамовіча (Працяг)

* **Пачатак у папярэднім нумары.**

20.I.45
Дарагі сябру,
учора я паслаў Самым (гэта ня значыць, што я адкідаю “Ваша”) ліст, а сядня пасылаю разгляд радзімы словаў із каранём “гляд” і “зір”. Шкада, што яшчэ ня маю разгляду радзімы з каранём “цем” (*цеміць* і пад.), бо яны блізкія значаньням да менаваных. Мо’ што з пасыланых згодзіцца да вайсковае тэрмінолёгіі. А як будзеце маці час і ахвоту, дык прачытайце ўсё ўважна, парабеце свае зацемкі і зацемкі прышлеце мне, пры гэтым пасыланага машынапісу мне не варачайце, а толькі назавеце слова й пакажэце бачыну.
Жыве Крыўя!
Я. Станкевіч

Глядзець і назіраць
У мове крывіцкай “наглядаць” і аднакарэньня зь ім маюць значаньне балей меней актыўнае, зьвязанае з большай або

меншай работаю, тым-жа часам значаньне дзеяслова “назіраць” і аднакарэнных ізь ім пасыўнае, значыцца, адказуючае пайму “*observatio*”, “наблюдение”. Ляпей гэта будзе відаць із разгляду цэлых групаў словаў із гэтымі каранямі.

Глядзець — п. patrzeć, м. смотреть. Аднаразны (м. “однократный”) дзеяслоў ад “глядзець” ё

Глянуць — п. spójrzeć, м. взглянуть і напару (часамі) “посмотреть”. Дыкжэ дзеля таго што м. “взглянуть” із сваім прэфіксам *вз* энэргічнейшае за нашае “глянуць”, апошняе перакладаецца м. “посмотреть”. Загадны лад ад “глядзець” ё “глядзі”, а ад “глянуць” — “глянь”. “Глянь” ё барджэйшае, энэргічнейшае за “глядзі”. Ёсьць у загадным ладзе й “гля”, здаецца, з аслабленым мамэнтам загаднасьці.

Гледзячы — п. patrząc, м. смотря, глядя. Ёсьць і

Глядзеньне — п. patrzenie, м. смотрение. Адгэтуль, як ад “насіць, нашэньне” ё “нашэньнік” (п. tragarz, м. носильщик), “нашэньніца”, ад “грабіць, грабеньне” — “грабеньнік, грабеньніца”, ад “прасіць” — “прашэньнік, прашэньніца” (п. proszący, -ca, suplikant, -ka, м. проситель, -ница), так той, тая, што глядзіць, будзе

Глядзеньнік, **глядзеньніца** — п. widz, м. зритель. Магчыма такжа й “глядач” як “сякач” — той, хто сячэ лес, як “капач” — хто капае зямлю; не перашкаджае гэтаму тое, што ё такжа снадзівы “капач” і “сякач”.

Гледзішча — п. punkt widzenia, м. точка зрения. “З гледзішча” — z punktu widzenia, з точки зрения.

Агляд — п. obejrzenie, przegląd, м. осмотр. Пайшлі на агляд жыта. Кр. сл. Чэрв. Адгэтуль

Агляд — п. przegląd, rzut oka, м. обзор, обозрение.

Агледзіны — п. oględziny, м. смотрины. Нашы паехалі на агледзіны аж у Дукору (Там-жа). У тым-жа значаньню кажацца й “аглядзіны”.

Аглядацца — ск. аглянуцца — п. oglądać się, obejrzeć się, м. оглядываться, оглянуться.

Аглядаць, ск. агледзіць — п. oglądać, obejrzeć, м. [illegible] осмотреть. Архітэкт аглядаў, агледзіў царкву. “Аглядаць, агледзіць” ужываецца яшчэ ў значаньні “прыводзіць штось да добрага стану, прыкладам, аглядаць, агледзіць хату, будынкі, вульлі, зн. направіць, забясьпечыць, каб не

* **Адны лікі**
[illegible]
[illegible]
**[illegible]

праходзіла сьцюжа, каб не працякалі і пад. Апрача таго, “агледзіць” адказуе яшчэ п. “wypatzeć”, м. “высмотреть, подсмотреть”. Нехта агледзіў маю схоўку. 357 *.
Агляда́ны — п. oglądany, м. осмотриванный, осмотриваемый. Шкода аглядана. 357.
Агляданьне — 1) oglądanie, осматривание, 2) dogląd, присмотр, призор, двор пакінуў на чужое агляданьне. 357.
Агледжаны — 1) obejrzany, осмотренный. Шкода агледжана. 2) прыведзены да добрага стану. Пчолы агледжаны. 357. Твае сані не агледжаны добра. 357.
Агляда́цца — ск. агледзіцца — 1) папраўляць свой матар’яльны стан, папраўляць сваю гаспадарку. Маладыя нашы патроху аглядаюцца, ужо агледзіліся каля сябе. 2) м. “быть осматриваему”. У нас і звычаю такога няма, каб аглядаліся стагі. 357.
Апрача таго, “агледзіцца” ўжываецца ў гэткіх двух значаньнех: 1) азнаёміцца з абступаючымі спакменямі (прадметамі), прывыкці. Не хацеў жыць у нас, а цяпер агледзіўся; прывык. 357. 2) у значаньню блізкім да “ахамянуцца, схамянуцца” (п. spostrzeć się, м. “спохватиться”. Агледзіўся, ды ўжо позна. 357.
Калі дзеяслоў “аглядацца, агледзіцца” датычыць хатняе работы, дык ён знача тады “рабіць воглядку”. Да “воглядкі” жаноцкай у сялянскай хаце належыць: заслаць ложкі, падмесьці хату, накарміць хатніх, сьцерці із столу, лаваў, памыць судзьдзё, замяшаць і даць сьвіньням, каровы падаіць і пад. “Воглядка” мужчынская вельмі малая. Узімку да яе належыць: напаіць жывёлу і даць жывёле. У гэтым значаньню словы “Аглядацца, агледзіцца, воглядка” запісаны ў пав. Ігуменскім, Койданаўскім, Ашмянскім і інш. Паедзем пад вечар, а не-то заўтра раніцою, — так сказаў ды пайшоў ён аглядацца. Скончыў воглядку Юстап — перасьціхла і мяцеліца. Калюга: Нядоля Заблоцкіх. Ужо вечар: трэба пайсьці аглядацца. (Кр. сл. Чэрв.). Шмат воглядкі ў гаспадыні: пакуль агледзіцца, дык і жаць ісьці пара. (Ашм. павет.) Дык гэтае значаньне словаў

Аглядацца, **агледзіцца** (у хаце, дома) п. sprzątać, м. делать уборку (в домашнем обиходе).
Воглядка — sprzątanie, уборка (в домашнем обиходе).
Як ад “дагляд, нагляд” паўсталі ў народнай мове “дагляднiца,

наглядніца”, так ад “воглядка” будзе “воглядніца” — тая, што аглядаецца (у хаце), м. уборщица. У русыфікатарскім жаргоне, каторы маскоўскія бальшавікі прынукалі ўжываць Крывічоў, было “прыбіраньніца”, але крывіцкае “прыбіраць” не адказуе м. “убирать”, але м. “украшать”, дык “прыбіраньніца” тая, што прыбірае (“украшает”).
Аглядны — належачы да агляданьня чаго. Аглядныя камісянты яшчэ не зьяжджаліся. 358.
Дагляд — п. opieka, staranie, м. призор, уход. Дагляду няма ніякага. 137.
Без дагляду — м. без ухода, без призора.
Бездаглядны — м. беспризорный. “Бездаглядныя” (прыкладам, дзеці) — “беспризорные”.
Даглядаць — як 1) п. doglądać, м. присматривать (за чем), досматривать. Дагляд дай рою, каб ня ўцёк. 137. Бацька нейдзе даглядае жывёлу. (Кр. сл. Чэрв.) 2) “даглядаць хворага, дзяцей” і пад. адказуе маск. “ухаживать” (за больным, ребятами). А што яна робіць, толькі дзяцей даглядае. Кр.сл. Чэрв.
Дагляданы — п. doglądany, м. присматриваемый. Ня так было даглядана дзіцё, як трэба было. 137.
Дагледзіць — п. dopatrzeć, zaopiekować się, dopilnować, м. присмотреть, досмотреть, не потерять из вида. Мы паедзем на кірмаш, а ты дагледзь нашыя дзеці. Ашм. пав. Дзіцё не дагледзіў, як умерла. 137. Дагледзь, куды ён ходзіць. 137.
Дагледжаны — п. dopatrzony, dopilnowany, м. присмотренный, досмотреный. Усё будзе дагледжана, як трэба. 137.
Даглядны — 1) што можна лёгка дагледзіць. Даглядная пожня. 137. 2) любячы, умеючы даглядаць. Даглядны хлопец. 137.
Дагляднае — плата за дагляд. Дасі дагляднага, дык буду даглядаць. 137.
Даглядніk, -ца — той, тая, хто даглядае. На даглядніка не спадзявайся, а сам даведавайся. 137.
Нагляд — п. nadzór, dozór, м. надзор, надсмотр.
Наглядніk, жанчына — “наглядніца” — п. dozorca, -czynia (“więzienny” і пад., але “dozorca domu” ня будзе “наглядніk”), м. надзиратель, -ница, смотритель, -ница, надсмотрщик, -ица, надзорщик, -ица.
Наглядніцкі — п. nadzorczy, м. надзирательский, смотрительский, надсмотрщический.
Нагляднічыха — жонка наглядніkава;

Наглядаць — dozorować, м. надзирать, надсматривать.
Нагледзіцца — п. napatrzyć się, м. насмотреться.
Нагледжаны — п. upatrzony, м. высмотренный. Гняздо нагледжанае. 302.
Нагледзіць, многаразны, ляпей — [неразборліва], дзеяслоў “нагледжаваць” — opatrzyć, wypatrzeć, высмотреть. Нагледжаваць, нагледзіць сабе заручніцу. 302.
Недагляд — п. niedopatrzenie, niedozór, м. недосмотр. Дзе недагляд, там усяды наклад. 330. Ад недагляду пчолы пагінулі. 330.
Ненагляда — м. ненаглядная.
Пагляд — п. spójrzenie, м. взгляд. Дурны маець пагляд. 436. Кажнае маладое баіцца пагляду. 436. Адгэтуль і ў значаньню пераносным, як пагляд на якую справу, як сума перакананьнеў — нацыянальныя, рэлігійныя пагляды. Дык яшчэ
Пагляд — 1) п. zdanie, м. мнение. Які твой пагляд аб гэтым чалавеку? 2) п. pogląd, м. взгляд. Пагляды выробляюцца ўзгадаваньнем. Як у мове маскоўскай два значаньні слова “взгляд” пазнаюцца з контэксту, так у нас із контэксту пазнаюцца тры значаньні слова “пагляд”. Напару, калі перакананьне (м. убеждение) аб чым слабое, малапэўнае, дык п. “zdanie” м. “мнение” можа пакрывіцку перадавацца словам “думка”, хоць звычайна “думка” адказуе п. і м. “мысьль”.
Паглядаць — п. spoglądać, м. посматривать, поглядывать. Скоса паглядае на нас. 436. Паглядаць на неба, назад, на дзяўчыну. 436.
Паглядзець — дзеяслоў ск. (скончанага трываньня) ад глядзець — 1) п. popatrzeć, zobaczyć, м. посмотреть, 2) м. постеречь, присмотреть. Паглядзі тут майго малога. 436.
Пагляднае — плата за дазвол паглядзець. Пакажу, калі дасі пагляднага. 436.
Пагляданьне — spoglądanie, посматривание, поглядывание. Работа ня любіць пагляданьня на бакі. 436.
Паглядны — паказаваны, даваны паглядзець. Не пагляднае, не пакажу. 436. Паглядны гасьцінец (кажацца на сьмехі, знач. паказаны, але ня даны).

Адгэтуль яшчэ “паглядны, паглядная” (лекцыя, мэтода навукі, вучэньня) — п. poglądowy, м. наглядный.
Паглядна (прыкладам вучыць) — п. poglądowo, наглядно.

Пагляднасьць — poglądowość, наглядность.
Адгэтуль пагляд на сьвет будзе
Сьветны пагляд — п. światopogląd, мировозрение.
Зацемлю, што
Сьвет — п. świat, м. мир, вселенная, а прыметнік ад яго
Сьветны — п. światowy, м. мировой, вселенный. Вялейскі павет.
Паглядзецца — п. zobaczyć, przejrzeć się, м. посмотреться. Паглядзішся, што на маім будзе. Кр. сл. Чэрв. Ашм. пав. Ну паглядзіся цяперака ў люстарка, які ты харошы. Там-жа.
У слоўніку Насовічавым 436 ё яшчэ
Пагледзіць — п. zauważyć, м. заметить. Каго ты там пагледзіў? Не пагледзіў таго, як ён гэта зрабіў.
Падглядаць, **падгледзіць** — 1) м. подчищать, подрезывать (говоря о пчолах). Пара падглядаць, падгледзіць пчолы. 440. Сьцяпан падглядае пчолы. Кр. сл. Чэрв.; 2) п. podglądać, dostrzegać, м. подсматривать, подмечать. Падгледзіць чужую схоўку. 440. Падгледзь, куды ён часта ходзіць. 440. Прыцікаўся ды падглядае, што мы робім. Кр. сл. Чэрв. Нехта падгледзіў, дзе ляжалі грошы, ды ўкраў. Там-жа.
Падгледзены, **падгледжаны** — 1) м. подрезанный, подчищенный (о пчолах). Пчолы кімсь падгледзены, пласты чатыры выразаны. 440. 2) п. podpatrzony, м. подсмотренный, подмеченный. Схоўка наша падгледзена, падгледжана. 440.
Перагляд — 1) п. przejrzenie, м. пересмотр. 2) разгляд другім наваротам таго самога.
Пераглядаць — п. przeglądać, м. переглядывать, пересматривать.
Перагляданы — п. przeglądany, пересматриванный, пересматриваемый.
Перагледзіць — п. przejrzeć, переглядеть, пересмотреть.
Перагледжаны — п. przejrzany, пересмотренный.
Перагляданьне — п. przepatrywanie, przeglądanie, м. пересматривание.
Перагледзіны — агледзіны, аглядзіны. Бацька паехаў у пераглядзіны да маладога. Ашм. павет.
Прыгляд — 1) п. dogląd, dozór, м. присмотр. Работнік без прыгляду нярупатлівы 499. 2) прынуканьне, прашэньне частуючы есьці, піць. Усяго было, але прыгляду ня было. 499.
Прыглядаць, **прыгледзіць** — п. doglądać, присматривать.

Прыглядай, прыгледзь дзіцё, каб не звалілася з лаўкі. 498.
Прыглядацца, ск. прыгледзіцца — п. wpatrywać się, м. присматриваться. Прыглядаешся, як-бы пазнаеш. 498. Прыгледзіўся дый пазнаў. 498.
Прыгледзіцца — 1) гл. прыглядацца, 2) п. przypodobać się, приглянуться. Дзеўка прыгледзілася мне. 498. 3) аслабці зрокам. Вочы мае прыгледзіліся ўжо. 498. 4) п. rozpatrzyć się, м. осмотреться. Як прыгледзімся, дык і жыць будзем. 498. Блага, пакуль прыгледзімся. 498.
Прыгляднік, -ца, прыгледнік, -ца — п. dozorca, -czyni, м. присмотрщик, -ца. На прыгледнікаў не спадзявайся, а сам прыгледзь. 498. Дзе прыгляднікаў шмат, там парадку мала. 499. Хто цябе паставіў прыглядніцаю на намі? 499.
Прагляд — п. przejrzenie, przeoczenie, niedopatrzenie, м. просмотр, недосмотр, пропуск мимо ушей. За прагляд рою пакараць цябе трэба. 521. Нябось, ня дам прагляду. 521.
Прагледзіць — 1) прашукаць зрокам. Прагледзь сваіх між народам, можа лучыцца хто. 521. 2) прапушчаць зрокам. Прагледзь іх, куды яны йдуць. 521. 3) гледзячы ня ўбачыць, упусьціць з аччу, прапусьціць. Не прагледзь рою. 521. Другі рой прагледзіў 521. 4) Марыць, псаваць вочы даўгім глядзеньням. Вочы свае прагледзіла я, пакуль ты зьвярнуўся. 521. 5) п. przejrzeć, м. проглянуть. Вочы засыпала, ледзь прагледзіў. 521.
Разгляд — п. rozbiór, rozpatrzenie, roztrząśnienie, м. разбор (дела), рассмотрение. У сыботу будзе разгляд нашае справы ў судзе.
Разглядаць, **разгледзіць** — п. rozpatrywać, przeglądać, roztrząsać, rozpoznawać, рассматривать, разглядывать, разбирать, обсуждать. Суд разглядаў іхную справу. Разгледзілі колькі навуковых пытаньнеў (п. “kwestia”, м. “вопрос”). Разглядай цяпер коні, каторы твой. 547. Што вы тут добрае разглядаеце, разгледзілі? 547.
Разглядацца, **разгледзіцца** — п. rozglądać się, rozpatrywać się, м. разглядываться, осматриваться. Разглядайся, разгледзь добра, ці туды мы едзем. 547. Разгледзіўся я, аж гэта ня мой кажух. 547.

Разгляданы — п. rozpatrywany, przeglądany, roztrząsany, rozpoznawany, м. рассматриванный, рассматриваемый, обсуждаемый.

Разгледжаны — п. rozpatrzony, roztrząśnięty, м. рассмотренный, обсужденный. Здаецца, дарога добра разгледжана. 547. Між разгледжанымі рэчмі нічога свайго не пазнаў. 547.
Разгляданьне — п. rozpatrywanie, przeglądanie, roztrząsanie, rozpoznawanie, м. рассматривание, обсуждение, разбирательство.
Углядаць, ск. угледзіць — п. postrzegać, uważać, м. усматривать, примечать. Углядай, як яны паедуць. 46. Ня ўгледзілі, як час прайшоў. 46. Ня ўгледзіш яго, куды ён ходзіць. 46. Здаецца, што “угледзіць” адказуе яшчэ п. dopatrzeć, м. досмотреть.
Углядацца, ск. угледзіцца — 1) п. wpatrzywać się, wpatrzyć się, przyglądać się, przypatrzywać się, м. всматриваться, всмотреться, пристально смотреть на кого или что. Углядаешся, быццам у знаёмага. 46. 2) мыляцца пазнаючы. Вашэць угледзіўся; то не вашэцін конь, а мой собскі. 46.
Угледжаны — п. postrzeżony, zauważony, м. примеченный. Рой ня ўгледжаны ўцёк. 650.
Выгляд — п. zewnętrzność, powierzchowność, м. наружность, внешность. Гарэцкі: Нев. беларуска-маскоўскі слоўнік. “На выгляд” — м. на взгляд. Конь на выгляд добры. 80.
1. **Выглядаць** — п. wyglądać, м. выглядеть, представляться на взгляд. Дзеўка выглядае хораша. 80.
2. **Выглядаць**, ск. выглядзіць — 1) п. wypatrzywać, podglądać, wypatrzyć, м. высматривать, подсматривать что. Што ты тут выглядаеш, можа ўкрасьці што выглядзіў? 80. Выглядзілі каня дый укралі. 80. Выглядаць, выглядзіць жонку. 80. 2) п. wyglądać, wyjrzeć, м. выглядывать, выглянуть. Выглядае з-за вугла. 80.
Заглядаць — п. zaglądać, м. посматривать. Куды ты заглядаеш? 164.
Заглядацца, ск. загледзіцца — 1) п. zapatrywać się, zapatrzeć się, gapić się, м. засматриваться, зевать. Не заглядайся нікуды, часам загледзішся, а тут з возу сьцягнуць што. 164. 2) п. patrzeć z zazdrością, м. смотреть с завистью. Не заглядайся на чужое дабро. 164.
Загледзіць — п. podpatrzeć, м. подсмотреть. Ён ужо тут нешта загледзіў. 164.
Заглядуха — харошая, складная жанчына. Узяў жонку

заглядуху. 164.
Згледзіць — 1) п. dojrzeć, м. чуть завидеть. Толькі згледзіў бацьку, дык і пабег к яму. (Кр. сл. Чэрв.). Чорт яго згледзіць, куды ён бегаець. 202. 2) страціць гледзячы. Пчол глядзелі дый згледзілі. 202.
Згледзіцца — гледзячы мыляцца пазнаючы, прыняць кагось, прыкладам, за Пятровіча, калі ён Сідаронак. Ашм. пав. Таго-ж значаньня "укляпацца". Там-жа.
З вышпрыведзенага матар'ялу можна было пераканацца, што, як зацемлена на пачатку гэтага артыкулу, значаньне словаў із каранём "гляд" зьвязана з работаю, наагул із актыўнасьцю, а тыя із словаў, што займаюць цэнтральнае месца ў гэтым матар'яле, як "агляд, аглядзіны, воглядка, дагляд, нагляд, пераглядзіны", адзначаюцца ладнай актыўнасьцю, чаго нямашака ў поймах, выказаных польскім (з лацінскае) obserwować, obserwacja і м. "наблюдать, наблюдение" і пад. Апрача таго, вышменаваныя словы маюць шмат значаньнеў, мноства розных значэльных адценьняў, і калі-б мы прыдавалі ім яшчэ значаньне "наблюдать" і пад., дык стварылі-б блытаніну, хаос.
Разгледзім цяперка словы з каранём "зір", "зер", "зор" (*і, е, о* — гэта розныя ступені самагуку).
Зіркаць — п. zerkać, м. стрелять глазами, бегать взглядом. Нечага зіркае ён па куткох. Кр. сл. Чэрв. Паміж "зіркаць" і "паглядаць" тая розьніца, што паглядаем памалей і ўважней, а зіркаем надта борзда, але няўважна.
Зірнуць — п. zerknąć, м. быстро взглянуть. Крывіцкае "глянуць" не такое борздае, як маск. "взглянуть", але "зірнуць" барджэйшае за гэта маскоўскае, але не такое ўважнае, як "глянуць". Зірні ты сюды. Кр. сл. Чэрв.
Зір, зірк — выклічнікі ад дзеяслова "зіркаць" — м. "глядь". Абодва ўжываюцца дзеля абазначаньня барзьдзіні, быстрыні пазіраньня. Зір назад і паблядзеў. 208. Зірк — ды нічога ўжо няма. Кр. сл. Чэрв.
Зі́ркі — п. bystrooki, spostrzegawczy, м. зоркий, наблюдательный (у дачыненьню да людзёў). Тваё вока зіркае, здалеку зерыць. 208.
Зе́рыць, **зьзе́рыць** — "посматривать вкось" 208. Куды ты зерыш? 208. Нешта ты там зьзерыў. 208.
Зе́ркі (толькі ў мн. ліку) — 1) п. ślepie, м. глаза. Толькі

пралупіў зеркі дый за хлеб, не памаліўшыся Богу. 208. 2) зоркі. Ясныя зеркі на двары. 208. 3) Іскры. Удырыўся, ажно зеркі пасыпаліся з аччу. 208.
Зазе́рыць — п. podpatrzeć, wyszpiegować, м. подсмотреть. Тваё вока тут зазерыла нешта. 168.
Зазе́рыцца — п. zagapić się, м. зазеваться. Зазерыўся, а з возу і сьцягнулі. 168.
Дазе́рыць — дзеяслоў скончанага трыванья да “зерыць” — п. podpatrzeć, м. подсмотреть. Дазерыў, што вы тут робіце. 138. Нехта дазерыў схоўку маю. 138.
Назерыць — п. wypatrzeć, м. высмотреть. Назерыў сабе хатку купіць. 307. Злодзей нешта тут назерыў. 307.
Пазе́рыць — п. postrzeć, ujrzeć, м. завидеть, усмотреть. Я здалеку пазерыў вас. 455. Ён тут пазерыў нешта. 455.
Азе́рыцца — войстра зарэагаваць, рэагуючы войстра на каго накінуцца. Ар. Ашм. пав.
Празе́рыць — п. przejrzeć, odzyskać wzrok, м. прозреть, снова видеть. Троху празерыў, а то зусім быў асьлеп. 522.
Узерыць — як-бы ўхапіць вокам, п. ujrzeć, spostrzeć, м. усмотреть. Ён тут нешта ўзерыў. 653. Як узерыш іх, скажы мне зараз. 653.
Зіркаты, зяґраты, зяграты — маючы быстрыя, войстрыя вочы і крышку на версе. Гэта той, хто мае зяґратыя вочы. Ля Дзярэчына Слонімскага пав. Вой, які нехарошы: лупаты, зякраты. Кр. сл. Чэрв. “Зяґраты” запісана ля Дзярэчына Слонім. пав., “зякраты” ў Ігуменскім пав. і ў с. Арляняты Ашм. пав., але кілёмэтраў 7 ад Арлянят у бок Крэва у с. Чухны кажуць “зіркаты”. Як відаць, спачатна былі два словы “зіркаты” й “зеркаты”, з чаго з прычыны аканьня “зяркаты”, з каторага пераскокам гукаў “рк” сталася “зякраты”, у каторым “к” прыпадабнілася да “р” і паўстала “зяґраты”.
Зярок, **зрэнка** — п. źrenica, м. зрачок. У воку прапаў зярок. Кр. сл. Чэрв. “Зрэнка” запісана ў Ашм. павеце.
Зырка — п. jasno, żywo, jaskrawie, м. ярко.
Зыркі — п. jasny, żywy, jaskrawy, м. яркий.
Зыркасьць — п. jasność, żywość, jaskrawość, м. яркость. “Зыркі” запісана, між іншага, у пав. Койданаўскім.
Зырыць — дзяржаць у дысцыпліне, устанаўляць дысцыпліну, м. дисциплинировать. Бацька дзяцей зырыць. Ар. Ашм. пав.

Зазырыць — устанавіць дысцыпліну. Там-жа.
Зазыраны — прыведзены да дысцыпліны, паслушнасьці, м. дисциплинированный. Дзеці зазыраны. Там-жа.
Прызырыць — крыху, балей меней падняць дысцыпліну, паслушнасьць. Як прызырыла, дык выпіў зельля, а так не хацеў. Кр. сл. Чэрв.
Зыр — п. karność, м. дисциплина. Зыру на іх няма. Ар. Ашм. пав.
Азірацца, **азірнуцца** — тым розьніцца ад “аглядацца, аглянуцца (назад)”, што азіраюцца барджэй, але зь меншай увагаю. Ідзі ты адсюль ды не азірайся. Кр. сл. Чэрв., Ашм. п. Што ты йдзеш азіраючыся, як злодзей? Там-жа. Яшчэ нечага назад азірнуўся. Там-жа.
Дазіраць — п. doglądać, obserwować, м. присматривать, наблюдать. Дазірай за імі, каб ня ўкралі якой меркі. 138. Дазірай за вазамі. 138.
Дазрэць — дзеяслоў скончанага трываньня ад “дазіраць” — п. dopatrzeć, dopilnować, м. досмотреть, присмотреть. Не дазрэў, як яны што робяць. 138. Ня было каму дазрэць, куды паляцеў рой. 138.
На́зіркам — п. zdaleka patrząc, obserwując, м. издали смотря, наблюдая. Назіркам пайшоў за ім. 307. Ашм. пав. А ён назіркам за імі дый падгледзіў усё. Кр. сл. Чэрв.
Назіраць — п. obserwować, uważać, м. наблюдать. Назірай за пчоламі. 307. Ашм. павет. Назірай, куды ён пойдзець. Там-жа. Назірай добра, каб статак ня лез у шкоду. Кр. сл. Чэрв.
Назіра́ньне — п. obserwacja, м. наблюдение. Адгэтуль
Назіра́ньнік, **назіра́ньніца** — п. obserwator, -ka, м. наблюдатель, -ница.
Назіральны (прыкладам пункт) — п. obserwacyjny, м. наблюдательный.
Назіральнасьць — п. obserwacyjność, spostrzegawczość, м. наблюдательность.
Незір — прыслоўе — п. nie oglądając się, м. без оглядки, не осматриваясь. Пойдзеш ты, у мяне, чалавеча, з хаты незір. Кр. сл. Чэрв.
Пазіраць — п. spoglądać, м. посматривать. Ня туды пазіраеш, кот ты сьляпы! Кр. сл. Чэрв., Ашм. пав. Пазірае ў вочы, як той дурань. Там-жа.
Пазор (зап. у Парх. і Докшыцах Глыбоцк. акр.) — п. piękność

(zewnętrzna), м. красота (внешняя).
Пазорны — piękny (zewnętrznie, z powierzchowości), м. красивый (на вид).
Пазорная дзяўчына. 456. Пархвенава Докшыцы. Пазорная царкоўка. Там-жа. Вось пазорны пояс; аж у ваччу мяняецца! Кр. сл. Чэрв.
Пазаркí = пазорны. Якія-ж пазаркія, твае, дзеўка, ручнікі, аж не нагледзіцца. Кр. сл. Чэрв.
Непазорны — м. невзрачный. Непазорны жбаночак — не хачу купляць. Кр. сл. Чэрв.
Празіраць — адчыніць вочы ў вочнай хваробе, адзержаваць зрок. "Аль-Кітаб" 21aII.
Узірáцца — п. uważnie wpatrywać się, м. пристально всматриваться. Няма чаго ўзірацца на мяне. Кр. сл. Чэрв., Ашм. пав. Чаго ты ўзіраешся, нябачыў мяне, ці што? Там-жа.
Вызірáць — ск. вызірнуць — п. wyglądać, wyjrzeć, м. высматривать, высмотреть, выглядывать, выглянуть. Дзяўчына вызірае з аконца. 82. Нехта вызіраў з-за вугла. 82.
Зазірáць — ск. зазірнуць — м. поглядывать вкось, глянуть вкось. Куды гэта тваё вока зазіраець? 168. Чаго ён усё зазірае сюды? Кр. сл. Чэрв. Зазірні, што яны там робяць. 168.
Зазірацца — п. zapatrywać się, gapić się, м. засматриваться, зевать. Не зазірайся на чужых дзявок. Кр. сл. Чэрв. Не зазірайся, глядзі чаго трэба. 168.

Weissruthenisch
02.II.45
Дарагі сябру!
Я адзержыў ад Вашэці пісулькі, грошы і сядня ліст із 30.I. Пішу аб тэрмінах. "**Сарачня**" для "эскадрилья" добрае. "Галаўнік" для "капітана" слова дасканальнае. Але ня толькі для "капітана". Я згаджаюся, што "павадыр" — гэта "вожатый слепых", але й **"правадыр"** значыць толькі тое, што "проводник". **Галаўнік**, зн. тый, што стаіць у галаве, будзе й капітан і кажны *führer*. "Лідэр партыі" знач. тый, што стаіць на чале партыі, будзе **галаўнік партыі**. Можа быць і галаўнік усяго народу й гаспадарства. **Гаспадар** у знач. "государь" ведама застанецца, бо ня тое самое значыць, што **галаўнік**. У Італі, прыкладам, гаспадар быў кароль, але галаўнік Мусаліні. У Гішпані й Партугалі **галаўнік** ён-жа і **гаспадар**. **Гаспадар**

гэта агульны назоў для вялікага князя, караля, цэсара, прэзыдэнта.

[на палёх] Нельга сказаць, каб націск на *нік* пераважаў. “**Палкоўнік**”. Спакменьнікі на **-нік** маюць адны націск на карані (*сэднік, сэтнік, кр**ы**ўднік, р**ы**бнік, ве́рнік, ме́рнік, абара́ньнік, абаро́ньнік* і мноства інш.), іншыя на суфікс **-нік** (**дзяньні́к**, менаванае **галаўні́к**, **сяньні́к** і інш.). Калі, у якіх прыпадках бывае адзін націск, а калі другі, дагэтуль, паколькі мне ведама, не ўстаноўлена. Дзеля таго ўва ўсіх прыпадках трэба пакідаць той націск ізь якім слова ўжываецца дагэтуль, зь якім яно ведама, бо валей няпэўнае пакінуць, чымся няпэўным замяніць. Значыцца, хай застаецца “палкоўнік” (із націскам на *ко*).
“Ладзь” подле такіх, як *снадзь*, *кадзь*, можа быць (“*роскладзь*” — таксама, здаецца, ніштo). Дзеясловы да *ладзь* ёсьць гэт’кія: **ла́дзіць** (а ня **зладжваць** — штучнае й зусім непатрэбнае, гэта савецкі ўплыў, як **арыштоўваць**, **параўноваваць**, **падслухоўваць** і інш. зам. **рыштаваць**, **раўнаваць**, **падслухаваць** і інш.), сконч. **зладзіць**; **ладзіцца** й **зладзіцца** (= м. строить, построить, выстроить, строиться — построиться). Прыметнік ад **ладзь** мог бы быць **ладзявы**. Ад **ладзьба́** прыметнік быў-бы **ладзьбяны** (як ад **сяўба** ё **сяўбяны**). Але **ладзьба́** значыць “построение”. Усі спакменьнікі на *-ба́* былі спачатна абстрактныя, значылі дзеяньне, процэс, а пасьлей некаторыя зь іх (*га́ньба*, *дрэжба*) адзержылі конкрэтнае значаньне, а іншыя з[ь іх] адзержылі абстрактнае і адначасна вытварылі конкрэтнае, гэтак **сяўба́** й **садзьба́** значаць і “сеяньне” й “саджэньне” і тое, што сеяць і садзяць, прыкл. авёс, бульбу, прызначаныя на сяўбу, садзьбу.

Фэльдфэбэль можа быць **ладзьбі́т**, гэта найляпей (подле *сяўбі́т, малацьбі́т, скарадзьбі́т*) і ні ў якім прыпадку *ладаўнік*, каторае магло-б толькі быць ад *ладаваць*, што папольску значыць “накладаць”, “кратаць”, м. “грузить” да *ładunek* (зь ням.), як **прадаўні́к** ё ад **прадава́ць**, **кіраўнік** ад **кіраваць**, **купаўнік — купаваць**, **жартаўнік — жартаваць**, наагул спакменьнікі на **-аўнік** — дзеяслоўныя і паходзяць ад дзеясловаў на **-аваць**. Ваша выйшаў зь няправільнага поду (падставы), што бальшыня рангаў мае мець суфікс **-нік**; такой

сыстэмы не павінна быць, бо хорма назову тае ці іншае рангі залежыць не ад таго, што гэта ранга, а ад паходжаньня новага слова, ад таго, ад чаго й як яно ўтворана.
Каб скончыць із *ладзяй* зацемлю яшчэ, што аднак месца націску ў **ладзявы** няпэўнае, знач. няма ведама, ці мае быць *ладзяв***ы**, ці *ла́дзевы*.
Пачэску і "знамя" — prapor, і "баталён" — prapor. У нас павінен бы быць "баталён" — **сьцяг**, бо апошняе слова лішне вялікае для назову роты, а баталёну добрае, а "знаменосец" зусім добрае — **сьцяганоша** (не сьцяган**ош**).
"Вяршнік" і мне не падабаецца, тут і пераклад благі, бо *major* значыць "большы". Калі ня хочаце пакідаць "маёра", дык вазьмеце "**вышнік**" — ад "вышшы", ці ня ў картах (гуляць) ё **вышнік**, а прынамся ё *ніжнік*. **Гаругва** зусім добра для "роты" і назоў гістарычны. Маючы **галаўнік** для "капітана", Ваша блытаешся, калі для рангі адказуючай пасадзе харужнага (= ротнага) шукаеш яшчэ слова, бо звычайна **капітан**, значыцца **галаўнік**, бывае "ротным".
Калі "ротнага" назавіце "**харужны**", дык "лейтэнанта" ня можна зваць "харужнік", бо будзе блытаніна, апрача таго, "лейтэнант" не стаіць-жа на чале харугвы ("роты"). Валей хай застаецца "лейтэнант", назовы рангам можам даваць толькі пэўныя, бо й так "рангі" будуць "бунтавацца".
"Пакоўе" напэўна значыла-б "упаковачный материал", ды ў "пакоўю" ё яшчэ іншая загана — карэнь у ім быў-бы чужы, хіба нямецкі, а калі тварыць новае слова, дык трэба толькі ад свайго. Шукаючы слова для "багаж", я крышку спыніўся на чэскім назове гэтага пайма. Чэскія тэрміны ў вялізарнай бальшыні добрыя, бо іх тварылі мованаведы. Але чэскі назоў багажу — "*zavazadlo*" нельга назваць добрым, бо не "*zavazadlom*" (багажом) вяжуць, але сам багаж вяжуць, зьвязаваюць. Але тут я прыпомнеў, што пакрывіцку маем нар. слова **зьвязак** = м. "узелок", прыкладам, калі возьмем таго сяго (ўсё роўна чаго) і зьвяжам гэта, дапусьцім, у хустачку, дык і будзем маці "зьвязак". Зьвязак можа важыць ад 1/2 грама да колькіх кілёґрамаў. Дык вось калі ад **завязаць** на спосаб ці подле **зьвязак** утварыць такі спакменьнік, каторы значыў-бы штось зьвязанае або завязанае якое хаця вагі, дык гэта й будзе "багаж". Гэткі спакменьнік адзержым, калі заміж прэфіксу **з** паставім прэфікс **за** — **завязак**, р. склон **завязку**, прм.

завязкавы (завязкавы схоў, вагон, прадзела і пад.), дарма што некаторыя сутнікі не завязуюць (хоць нярэдка й завязуюць), даволі таго, што часта “багаж” бывае завязаным. Нічога таксама, што **за́вязка** (націск на з**а**, хіба такое слова ёсьць) значыць шнурок, каторым завязуюць, прыкладам, мех, а **по́двязка** значыць шнурок, каторым падвязуюць шкарпэтку, панчоху або калашу ў нагавіцах, бо ня толькі што розны націск, але часта словы з рознымі родамі ладне розьняцца значаньням, дый тутка паміж **завязак** й **за́вязка**, **по́двязка** тая-ж розьніца, як паміж існуючым ужо **зьвязак** і паміж **завязка**, **подвязка** дый, напасьледак, усі — і **вузёл**, і **зьвязак**, і **завязак**, і **завязка**, **подвязка** паходзяць ад таго-ж караня **ęz** і маюць дачыненьне зь вязаньням, пр. яшчэ пол. *obowiązek* і нашае зь яго **абавязак**. Калі памятуеце, што ё запраўды слова **завязка**, дык зазначце ў лісьце да мяне. Няма ў нас слова для “галстук”, “*krawat*” і я думаў па аналёґіі з **подвязка** ўжыць **за́вязка** (Чэхі маюць *vazanka*). Ага, дазвольце яшчэ пашырыцца. Мы ўжываем цяпер **сэвязь** = м. связь. “**Сувязь**” выдумаў у Вільні Ластоўскі ў 1918 г. дзеля пераданьня “союз”, але сталі яго ўжываць у значаньню “связь”, ведама пад уплывам гэтага апошняга. Ведама, “сувязь” і для “союз” ня годзіцца (тут маем добрае “зьвяз”), а наагул **связь** і **сэвязь** гэта тае самое слова, адно розьніца ў хорме таго самога прыймені (як **сусед** і **сосед**). Дык я вось падумаваю, ці не ўжываць нам валей **зьвязак**, **у зьвязку** заміж **сувязь**, **у сувязі**, значыцца прыдаць існуючаму слову яшчэ новае значаньне. Украінцы маюць **звязо́к**, **у звязкэ**, палякі таксама *związek*, *w związku*. Чэхі маюць ладне накш — *souvislost, v souvislosti*.

Страло — снаряд. Выходзім, ведама, ад **страла**, **страляць**. Суфікс **ла**, пасьлей звычайна пашыраны суфіксам **ъка** (**кача́лка**, **пушча́лка**) абазначае рэч, каторай што колечы робім (**стралой** страляем). Гэтае самое значаньне мае суфікс *дło, ło* (шыла, рыла, біло, сіло і інш.). **Стралы** ня можам узяць для назову “снаряду”, бо страла мае конкрэтнае й абмежанае значаньне рэчы, каторай страляюць із луку. Але **страло** зусім годзіцца, бо, з аднаго боку, стаіць у лёгічнай сувязі із **страла**, **страляць**, а, з другога боку, розьніцца хормаю ад **страла**, розьніцца гэтулькі, колькі розьніцца **сіло** (сіляць птушкі) ад **сіла** (моц). Пры гэтым ад **страло** ня трэба ствараць мн. л.

стрэлы, бо гэта будзе зыходзіцца з множным лікам ад **страла**, але заміж мн. л. ўжываць зборную хорму — **стральлё** або **стрэльле**. **Стрэля** подле **куля** ня можа быць, бо сустрэлася, узятым ад аднаго слова, можам ад іншага каранёвага ствараць новае слова, калі карані падобныя, чаго тут нямашака. “**Стралень**” значыў-бы толькі тое, што **стралéц**, мо маем. А што **стралень** сам страляў-бы (пэўне, як **стралец**), дык жа **стралом** і стралялі-б, і яно **страляла**-б выбухаць, разрываючыся.

“**Намет**” ня годзіцца, бо гэта чыста папольску (*namiot*), **наметка** — гэта тое, што жанкі заміж хусткі надзяваюць на галаву. У нас для палаткі ё зусім добрае сваё слова, -ны, -оў.

Не забудзьцеся, што ў нас ня можа быць ніякіх **галоўнакамандуючых**, бо ё гістарычныя **польны гатмáн**, таксама ня можа быць **маршал** і **фэльдмаршал**, бо ё гістарычныя **марышалак**, **польны маршалка**.

NB. Знайшоў я ўжо хорму прыметніка ад **ладзь**. **Ладзь** і **медзь** тыя самыя жаноцкія і-асновы, дык як ад **медзь** ёсьць **медзяны**, так ад **ладзь — ладзяны**.

Ізь Сіняўскага * можна балей меней скарыстаць, бо ў студыях яго можа паўставаць ініцыятыва шукаць чагось падобнага або накшага, як у Украінцаў. Заганы ягоныя дзьве: гэта праца аб мове ўкраінскай, а, другое, што яна наагул практычная, а не навуковая. Калі-б была навуковая, дык давала-б агульнейшыя, шыршыя поды — асновы, з каторых можна было-б выходзіць.

NB. Выглядае што “ефрейтор” будзе **паводнік** (націск на *-во*), а **не павадні́к**, бо маем у Насовіча **падводнік** — той, што едзе з падводаю, а *падвода* слова нашае, ё ў старой мове масава, калі ня было ўплываў маскоўскіх.

З кніжкамі зраблю так, як жадаеце, і ўсё магчымае, каб іх пераслаць.

Было-б надта добра, каб Ваша прыехаў на колькі дзён у Прагу. Едучы, вазьмеце із сабою, калі ласка, фотакартачкі сваю і бацькоў, мы хочам іх маці на памятку. Могуць быць і такія, як на легітымацыі, усё-ж памятка, абразок і малая розьніца ад мастацкай.

Гэтым скончу адказаваць на апошні ліст і перайду да адказаў на ранейшыя.

---

* Мікіта Сіняўскі, **Нарысы ўкраінскага словаўтварэньня**, **Аляксандрыя (Олекса Синявський). Нарыси українського словотвору, Українське видавництво, 1941**

Літаратурная мова. Паміж нас ё незразуменьне ў назовах. Ваша **літаратурную** мову завеш моваю **нацыянальнай**, а мову **мастацкую**, мову **мастацкай літаратуры** завеш моваю літаратурнай. Ведама, што гэтую твораць пісьменьнікі-мастакі, ды бадай вылучна яны. Але твораць, могуць тварыць, прынамся могуць добра тварыць на подзе (аснове) мовы літаратурнай (у Вашэці нацыянальнай), накш будзе такое харство, як у М. Багдановіча: мова харошая, калі ня ўмееш, або абстрагуеш ад чыстае мовы крывіцкае. Стара крывіцкая мова літаратурная мастацкай рэдка калі была.

Ці так, як Ваша, і іншыя завуць **нацыянальнай** і **літаратурнай**?

У кажным прыпадку такое званьне нельга назваць правільным. І народная мова таксама нацыянальная. Ужо тое нядобра, што мы, па маскоўскаму прыкладу, словам “народ” завём збор людзёў, люд, а народ завём чужым словам “нацыя”. Ня добра й адрозьненьне — подле французскага спосабу — люд (“народ”) крывіцкі і **народ** (“нацыя”) крывіцкая, а трэба было-б адрозьневаць толькі прыметнікамі — “сьвядомы”, “несьвядомы” або “актыўны”, “пасыўны”. Адрозьневаньне паміж даным людам (“народам”) і такім жа народам (“нацыяй”) уведзена пануючымі народамі з мэтаю ня даць правоў паняволеным імі і дзеля таго пасыўным, несьвядомым народам.

Старая крывіцкая мова літ. мала правапіс царкоўна-славянскі, але-ж правапіс гэта ня мова, гэта адзежка мовы, не балей. У XVI стаг. ужо можна гаварыць аб правапісе крывіцкім, паўсталым на аснове правапісу царкоўна-славянскага, дзеля таго адбіваючым толькі некаторыя крывіцкія асаблівасьці фонэтычныя (s/e), цьвярдое **р**, цьвярдыя *ж, ч, ш, ц* і некат. іншыя). Недасканальны гэты правапіс ня быў тады й шкодны, бо не было на нашую мову тады маскоўскіх і ўкраінскіх уплываў, а цяпер ён шкодным быў-бы. Ведама, правапіс гэта тое, што так ці накш перадае фонэтыку, а асаблівасьці морфолёгічныя не належаць да правапісу. Морфолёгія і іншыя часьці граматыкі ў поўнай меры былі відаць у старой крыв. мове літар., а фонэтыка заўсёды вымаўлялася, дарма што не заўсёды пісалася.

Жыве Крыўя. Прывітаньні!

Я. Станкевіч

NB! Ліст гэты нармальнае цяпер вагі — 20 грамаў.

Weissruthenisch
Дарагі сябру,
а) што да *ўсе* і *ўсі*, дык спачатна ў назоўным склоне мн. ліку былі тры хормы муская *вьси*, ніякая *вься* і жаноцкая *в[ъ]сђ*. Хорма ніякага роду (*вься*) шчэзла. Хорма муская *вьси* захавалася ў усходніх і часткава сярэдніх гутарках цэнтральнага дыялекту і ў паўночна-ўсходнім дыялекце, фонэтычна зьмяняючыся ў *усі* (значыцца, *і*, як заўсёды ў мове крывіцкай, засталося бязь зьмены, *ь* слабы шчэз, а *в* перад сугукам перашло ў *у* або *ў*). Хорма жаноцкага роду *вьсђ* захавалася ў заходніх і часткава сярэдніх гутарках цэнтральнага дыялекту, пры гэтым да XVII ст. *ђ* вымаўлялася тут як дыфтонг, а пасьлей і перайшло ў *е*, ды ў паўдзённа-заходнім і палескім дыялектах, у якіх дагэтуль *ђ* захавалася як дыфтонг, як і кажнае націсьненае *ђ*; што да *ь* і *в*, дык зьмены іх звычайныя. Дык цяперака з *вьсђ* маем у часьці цэнтральнага дыялекту *усе* або *ўсе*, а ў паўдзённа-заходнім і палескім *усіе* або *ўсіе*. Гэтая-ж жаноцкая хорма *вьсђ* захавалася ў мове маскоўскай у хорме *все* (адно *ђ*, як кажнае *ђ* у маскоўскай мове, перайшло ў *е* і шчэз *ь*) ды ў мове ўкраінскай у хорме *усі*, *всі* (*ђ*, як кажнае *ђ* у ўкраінскай мове, перайшло ў *і*, *ь* шчэз ды *в* вымаўляецца як *ў*, хоць зь меншым элемэнтам галосным, як ў крывіцкае). Усё сказанае гэтта агульна ведамае. Таксама як і тое, што калі-б муская хорма *вьси* захавалася ў мове ўкраінскай, дык яна-бы вымаўлялася *усы*, *ўсы*, бо сугукі перад *і* ў мове ўкраінскай ацьвярдзелі, але хормы *усы*, *ўсы* (паўкраінску пісалася-б *уси*, *вси*) нямашака ў украінскай мове. Значыцца, крывіцкая хорма *усе*, *усіе* аднолькавая з хормаю маскоўскай і ўкраінскай, а крывіцкая хорма *усі*, *ўсі* аднолькавая із старакрывіцкай хормаю літаратурнай гэтага займені, што вельмі важна.
б) Да *тый* яшчэ дадам, што зусім такая самая сваім канчаткам, як *тый*, ё агульна крывіцкая хорма займені *гэты* (*тый* з *тъјь,* а *гэты* з *h* + е + *тьј*); што ў гэным захавалася *й*, а ў гэтым сьцягнулася, дык гэта дзеля таго, што першае адно-, а другое дву-складовае.
в) Ваша назіраў у масквічоў вымову з членам *тот, та, то*, а гэта адзін із довадаў таго, што гаворка Масквы належа да

паўночна-маскоўскага нарэчча.

г) Колас фотографуе і людзёў, і мову. Калі яму даводзіцца апісаваць здарэньне, пры каторым ён чуў добрую мову, дык ён і перадасьць яе добрай, а калі благую, дык перадасьць благой. Ня ён валодае моваю, але прыпадковая мова валодае ім.
Заміж даўгога, які хацеў напісаць, пасылаю гэты кароткі ліст: мо' кароткі дайдзе. Пісульку Вашэцеву з 21.II. я адзержыў. Ішла яна 11 дзён. Не адпісаў я адразу на яе, бо думаў, што пакуль яна да мяне прыйшла, Ваша адзержыў прынамся часьць маіх лістоў. Але зь ліста перасланага 8.III. перазь Немца, за каторы дзякую, я бачу, што мае лісты загінулі. 8 ці 15.II. я паслаў Вашэці 2 ці 3 лісты, 19.II. й зноў паслаў 2 ці 3 лісты і 25.II. — два лісты, усяго за менаваны час паслаў 7—8 лістоў. Лісты былі даўгія, але не перавышалі 20 грамаў. Мо' дзеля таго згінулі, што нумараца бачынаў ішла ад першага ліста. У гэных лістох я адказаў на Вашэцін ліст із 30/I і на лісты з пачатку студня, значыцца, на колькасны мамэнт пры ацэне словаў, з каторым я — дый ніхто — не згаджаюся, на ўручныя снадзівы із суфіксам *ло* < *дло* (даводзячы, што не адно "ўручныя" маюць *ло*), аб старой мове літар., аб проектаваных Вашэцям асаблівасьцех новае мовы літар. Адказаў я, значыцца, такжа на Вашэцевы лісты із 7.II., 8.II., і на часьць ліста із 10.II. (аб "накраце" й вывадных).
Заміж часьці згінулых лістоў напішу іншыя, але ўсіх паўтарыць не змагу, бо надта ня маю калі.
Кніжкі ўжо будзе два тыдні, як камітэт паслаў, бо камітэт нажаль не адразу паслаў пераданы мною пачок.
Калі які з дагэтуль высланых мною лістоў адзержыце, дык накажэце мне пісулькаю, каб я яго не паўтараў.
Прывітаньне бацьком!
Жыве Крыўя!
13.II.45

Weissruthenisch
21.II.45
Дарагі сябру,
пішу далей аб асаблівасьцях, што маюць або ня маюць быць у сучаснай мове літаратурнай.
4. Што да 1 ас. мн. л. дзеясловаў "1-га спражэньня", дык ня

ведаю, як гэта Бузук давёў, што хормы на *-ом, -ам* заміж *-ём, -ем* (*нясом, будам,* заміж *нясём, будзем*) зьявіліся тут із даўнейшага аорысту. Калі-б гэтак было, дык менаваныя хормы мусілі-б быць старыя й адбіліся-б у старой літаратурнай мове, чаго аднак ня сталася. Бузук тут абмыліўся, хіба надта хочучы штось “адкрыць”. Зьява гэтая вельмі нядаўная й аналягічная (подле 1 ас. адз. л. *нясу-нясом* і подле хормаў 1 ас. мн. л. з ацьвярдзелымі сугукамі перад *-е — бяром — нясом*). Зьява гэтая дыялектычна даволі ткі агранічаная; ё зьяваю адно **паўдзённай часьці паўдзённа-заходняга дыялекту**, а дзе крышку захапіла ўзьмежак цэнтральнага дыялекту, там гэта сталася пад уплывам часьці паўдзённа-заходняга. Як такую, гэтую зьяву няможна накідаць усім Крывічом, значыцца, ня можна ўводзіць у мову літаратурную. Што да **вонкашнае** орыгінальнасьці, на што Ваша націскаеш, дык яе тут нямашака. Бо з чым тутка маем дачыненьне? З ацьвярдзелымі сугукамі перад *о(ё) а(я)*. Гэта самое маем ува ўсёй мове ўкраінскай. А што ў вадных прыпадках маем *о* заміж *э* (*нясом* заміж *нясэм*), дык тут агульна-крывіцкая зьява пераходу *е* ў *о* па мяккіх сугуках перад цьвярдымі (*нясём = n’asom*, каторае прыраўнуйце з *нясом = n’asom* — самагук і хорма морфолёгічная тут не зьмянілася), а ў другіх прыпадках маем *-ам* заміж правапіснага *-ем* (*будам* заміж *будзем*), дык-жэ гэтае *-ем* толькі правапіснае заміж вымаўлянага *-ам* (*будзям = budz’am*) — значыцца йзноў толькі ацьвярдзелы сугук перад самагукам асновы. Тое, што ў мове ўкраінскай ё *о* на канцу (несемо, будемо), дык гэта ўжо іншая зьява і не мяняе таго факту, што перад *е* ё цьвярдыя сугукі. Але побач із хормамі на *-мо* ў мове ўкр., хоць меней ужываныя, ё і хормы на *м* (*несем, будем*) у першай ас. мн. л. абеснага ладу. Дык, хоць разгляданая зьява ў нас іншага й накшага паходжаньня, як у Ўкраінцаў (у нас аналягічная, у іх фонэтычная), то аднак рэзультат абедзьвіх зьяваў і выгляд іх зусім аднолькавы. Дайце ўкраінскія хормы тыпу *несем, будем* вымавіць Крывічу (значыцца вымавіць із усекрывіцкімі асаблівасьцьмі, як пераход націсьненага *е* па мяккіх сугуках перад цьвярдымі у *о* і аканьням) і ён вымавіць толькі як *нясом, будам*. Калі глядзець на выгляд, на тое, што ўсім кідаецца ў вочы, дык кажнаму будзе характарным і тое, што разгляданая асаблівасьць пашырана на прасторы, сумежнай із украінскай.

Наапошку, хоць разгляданая асаблівасьць у нас накшага паходжаньня, то аднак, зыходзячыся з украінскім ацьвярдзеньням сугукаў перад *е*, будучы ўведзена ў мову літаратурную, яна памагала-б пашырэньню ўкраінскіх уплываў на нашым паграніччу з Украінцамі. Дык увядзеньне яе ў мову літаратурную было-б падвойна шкодным і дзеля таго што гэта асаблівасьць найменей зіндывідуалізаванай часьці меней зіндывідуалізаванага дыялекту (можам яе з гэтага боку прыраўнаваць да саканьня — *мыюса*) і на'т дзеля таго, што пракладала-б дарогу чужым уплывам.

А што да таго, ці ў 1 ас. мн. л. "1 спражэньня" маюць быці хормы на *-ём, -ем (-ям)* ці *-ом (-эм)*, *ем (ям)* (*нясём, бяром, чытаем ці нясем, бярэм, чытаем*), дык хіба што першыя, але яшчэ гэтае пытаньне трэба дасьледаваць.

5. Што да хормаў 3-яе ас. адз. л., дык Ваша тут лінгвістычна ўмела схапіў істоту зьявы ды сынтэтычна. Правільна тут узята на ўвагу роля націску. Абраз тутка гэткі: а) хормы з канчаткам *-ць* ад усіх дзеясловаў ёсьць у пэўнай палавіне або ў бальшыні цэнтр. дыялекту і ў цэлым паўночна-ўсходнім дыялекце; б) хормы без канчатку *-ць* ёсьцека ад дзеясловаў "1-га спражэньня", а ад дзеясловаў "2-га спражэньня" націсьненых на карані (*чытае, бярэ, кажа, носе, водзе*, але *крычыць*) у паўдзённа-заходнім, у палавіне або крыху меншай часьці цэнтральнага і ў усім вяціцкім. У канчатку *-ць* трэба адрозьневаць 2 мамэнты-зьявы: першая зьява тая, што канчатак **ёсьць** і гэта зьява супольная з маскоўскай, бо там таксама **канчатак ё**, другая зьява, што **канчатак мяккі** — розная ад адпаведнай маскоўскай.

Але розныя хормы ў залежнасьці ад націску — добра, значыцца будзе: *кажа, піша, чытае, носе, водзе, гавора*, але — *бярэць, вядзець, нясець, крычыць, глядзіць*. Аднак у вершах можна было-б дазваляць і хормы без *ць* у дзеясловаў "1-га спражэньня" нат калі націск на канцу.

6. Да *мыесься* < *мыешся*. Асаблівасьць гэтая ўсекрывіцкая, а таксама агульнамаскоўская, польская, ўкраінская й некат. інш. слав. моваў. Значыцца, нічога асабліва крывіцкага ў ёй нямашака. Вымаўляць так і будзем *-сься* (*вадзісься*), але на пісьме няма патрэбы мяняць канчатак 2 ас. *ш* на *с* перад зваротным займём *-ся*, як мы **на пісьме** перад ціхімі сугукамі не мяняем звонкага на ціхі (пішам *дудка*, дарма што вымаўляем

дутка). Асыміляца ў 3 ас. адз. й мн. л. (*мыецца*, *мыюцца*) і ў неазначаным ладзе (*мыцца*) зьява накшая. У *мыесься* і пад. папярэдняе *ш* (*мыеш*) упадабняецца да наступнога *с*, а ў прыпадку другім наступное *с* упадабняецца да папярэдняга *ц'* (*мыць -ся*, *мыець -ся*, *мыюць -ся* > *мыцца* і г.д.)
7. Атэматычныя дзеясловы *ем, дам* і вывадныя ад іх цяпер у дыялекце палескім, паўдзённа-заходнім і адно ў часьці цэнтральнага маюць у 1 ас. мн. л. хорму на *мо* (*ямо, прадамо*). Што да хормы 2 ас. мн. л., дык думаю, што ўвесь або блізу ўвесь цэнтральны дыялект мае хорму на *-сьцё* (*ясьцё*, *дасьцё*), як і паўдзённа-заходні. Але даўней увесь цэнтральны дыялект меў у 1 ас. мн. л. хорму на *-мо*, а ў 2 ас. мн. л. хорму на *сьце* (*ямо, дамо, ясьмо, ясьце, дасьце*) і адно пасьлей гэтыя хормы былі часткава заменены ў цэнтральным дыялекце хормамі аналягічнымі подле такіх, як *нясём, вядзём, нясіцё*. У старакрывіцкай мове літ. маем вылучна хормы *ямо, дамо, ясьмо, ясьце, дасьце, ясьце*.
Гэтыя хормы на *мо* стаяць у беспасярэдняй сувязі з хормамі на *ма* < *мо* 1 ас. мн. л. загаднага ладу (*нясема* < *нясемо* або *нясіма* < *нясімо*, *чытайма* < *чытаймо*), так што адных ад другіх адлучаць ня можна. Польская мова мае *jemy, damy, jesteśmy, wiemy*, значыцца на *мы*. Укр. мае на *-мо*, але таксама мова сэрбская мае хормы на *мо*, так што гэтыя хормы нас вылучна з моваю ўкраінскаю ня лучаць. Хормы *ядзём, дадзём* адно крышку розьняцца ад маск. *едим, дадим*, першыя як *нясём*, другія як *глядзім*. Дык спражэньне атэмат. дзеясловаў павінна застацца гэт'кае: *ем, дам, ясі, дасі, есьць, дасьць, ямо, дамо, ясьце, дасьце, ядуць, дадуць*. З-цяга атэм. дзеяслова засталася адно хорма 3 ас. адз. л. *ё, ёсьць* і прыслоўе *ёсьцека*.
8. Хормы на *эць, эў* дзеясловаў канечне павінны быць (*дрыжэць, верашчэць, дрыжэў, верашчэў*).
9. Таксама павінны быць хормы на *-аю* ў вінав. скл. прыметнікаў із націскам на аснове (*новаю хату*, *белаю сьцяну*), але толькі ў вымове, бо накш надта цяжка было-б вымаўляць простаму народу з прасторы паўдзённа-заходняга й палескага дыялектаў, дзе кажуць *нову хату, белу сьцяну*. Значыцца, просты народ гэных мясцовасьцеў вымаўляў-бы сабе як напісана — *новую хату*, але інтэлігенца і ў школах — *новаю хату, сіняю крэйду*.
Я маю наўвеце ня мала асаблівасьцеў фонэтычных і

морфолёгічных, каторыя трэба ўвесьці ў літар. мову, але няма магчымасьці іх разглядаць у лістох, бо дзеля гэтага трэба пісаць цэлую кніжку, калі не вялікую кнігу. Калі не 9/10 дык 4/5 іх разгледжана ў мяне ў працы аб “Аль Кітабе”. Я думаў, праверыўшы машынапіс, паслаць адзін экзэмпляр Вашэці гэтае працы, але тымчасам ня можна стала па пошце пасылаць. Дык возьмеце гэны экзэмпляр машынапісу, калі прыедзеце ў Прагу.

***

Сынтакс... малачапаная галіна. Парадак словаў... Палякі пісалі цэлыя працы аб парадку словаў і прыйшлі да выснову, што ў польскай мове няма азначанага парадку словаў у праказаньню. Гэта яшчэ ня значыць, каб у нас не было. Але патрэбны грунтоўныя дасьледаваньні подле навуковае мэтоды. Ня можна сябе ані іншых заваражыць, што гэтак мусіць быць, а ня гэнак, але трэба навукова давесьці. Жадаючы цэлай сыстэматычнай працы аб сынтаксе крывіцкім і робячы яе, трэба адначасна без адвалокі рабіць дасьледаваньні над асобнымі пытаньнямі із сынтаксу.

Месца прыметніка-азначаньня. Як агульнае правіла, у мове праславянскай і ў васобных цяперашніх мовах славянскіх, з выняткам польскае, прыметнік-азначаньне стаіць перад азначаным спакменьнікам. Але так сама ў усіх сучасных мовах з выняткам польскае і мо’ маскоўскае * прыметнік ставіцца просьле спакменьніка ў гэткіх прыпадках, калі ён прыметнік ставіцца лягічны націск, калі ён падчыркнецца. Прывяду колькі з выпісаных мною прыкладаў. Із сярэдніх Ніс. Работа *пачатая* ляжыць 479. Булка хлеба *пачатая*. Гаўшчыну Важыш, паночку, што дорага; зваж-жа і працу *маю вулырую*. 12. Пан *наш* трацьціну лесу *свайго* прадаў. 639 пад “Пастанова”. Караліха просіць яго, каб ён вярнуўся: што ёй тубыла *напісана* ім. 36. Па абразіньню яго відаць, што ён злодзейна ліс. 351. З і Нікіфароўскага 227: Які сядня дзень *даўгі*! Із собскіх запісаў беспасярэдніх: А матачка *родная*, мо ў мяне, сталася! Солы Ашм. У зімку *такую маразяную* каля *запрэжанага* трэба даць бясконнаму чалавеку. З прыкметніка. Тут ня вершы, на’т не поэтычная проза, а звычайная штодзенная гутарка. Што пры падчыркненьню спакменьніках, ставіцца па спакменьніку, ня можа быць ніякага мо’ дзеля таго можна зацеміць толькі адно: дзеля таго што гэтак ня было

* **Чытаў я пастанову зьезду крывіцкай царквы ў Менску 1942 г. ў справе аўтокефалі (даў мне яе Архува перакласьці на Крывіцкую мову).**

Пастанова была напісана памаскоўску і ў ёй часьцей, чымся ў мяне, сталі прыкметнікі на спакменьніках, мо’ дзеля таго што ўжо была

па спакменьніку залежыць ад падчыркненьня, **захаваная** **зачыркнуў і** некаторую ролю мамэнт індывідуальны: што падчыркнуў адзін, **склаўся** таго ня мусіць падчыркаваць іншы, залежыць гэтаксама **характару** чалавека. У маім, прыкладам, характару ё падчыркаваньня **цікавейшая** і ў жыцьцю, і ў пісаньню. У сувязі із сказаным цікава было-б дасьледаваць, ці і іншыя часьці праказаньня ня ставяцца на канцы ці пад канец праказаньня тады, калі падчыркуюцца. Прывяду два прыклады: Ні ад кога не пацярпеў **я** такога зьневажэньня, як ад цябе! Насовіч 215. Б'е з-пад муру **крыніца**. Ю. Віцьбіч ("Раніца". № 5 ізь 17/I.45). У вабодвых праказаньнех на дзейніку ё лягічны націск, і ў першым ён пастаўлены просьле выказьніка, а ў другім аж на канцу. Ня цяжка зацеміць, што ў другім праказаньню націск на дзейніку мацнейшы.

б) Другі прыпадак, калі прыметнік ставіцца просьле спакменьніка, бывае тады, калі прыметнік прыналежны. Прыкл.: Памагала мне Марыля Харлапава малаціць (мой запіс у Вял. п. Тут прыналежны прыметнік Харлапава — утвораны ад прозьвішча майго суседа Харлапа — пастаўлены па спакменьніку). Шмат падобных прыкладаў я прывёў у "Роднай мове" ізь "Сьцежкаў-дарожкаў" Зарэцкага. Ёсьць гэта і ў "На чырвоных лядах" Лынькова. (Колькі прыкладаў: бразгае свайме бляшанкамі ды іншым якім судзьдзём *рыбалкавым,* 10. Усё багацьце *Напрэева*, 22. Напрэй вялікі дружака *Яўхімаўна*, 14. Ты вось служка Хрыстова, 44. Перавязаны палец Хвядзюшаў, 10. З раману "Сын": Захлупіла ў грудзёх *Агапіных*, 20. Ня ў скрынях ды кублох *жончыных*, толькі дагадавацца **Маўчаць** было, 13. Голас *Любін* — ціхі й чысты, 11. Загаварыў **ўласьцівасьці** сябры *Паўлюковы*, 10. Верх застаўся *Ігнасёў*, 10. **Ён** сьлёзаў *матчыных*, 9. Свае пяшчоты *матчыны* **ніякага** выказаваць найляпей толькі ў пацалунках, 7. Ан **Ён** *Агапін*... ня меў аднолькавых думак з усімі, 21. На другое думкі *Агапіны*, 25. Прыклады зь менаваных **Пасьля** ўсе прыводжу. Ня можа быць ніякага падазрэньня менаваныя тры аўтары ўжываюць гэт'кія хормы пад уплывам польскім, наадварот, можна з пэўнасьцяй дапушчаць, што пад уплывам маскоўскім ужылі іх меншую колькасьць разоў. Сюды-ж належаць прыналежныя прыметнікі на *-скі, -цкі*. Дзеля таго й "Дудка *беларуская*" й "Смык *беларускі*". Гэтак сама пачэску: *Dějiny jazyka českého*. Гэта піша

захаваная **зачыркнуў і** **склаўся** **характару** **цікавейшая** **калі вялікімі.** **я** **крыніца** **Маўчаць** **ўласьцівасьці** **Ён** **ніякага** **Пасьля** **Ён** **менаваныя** **яны** **студэнтам.**

найлепшы чэскі моваведHujer *.
Адылі бывае, што прыналежнасьць у прыналежным прыметніку выветраўшы і тады ён ставіцца перад спакменьнікам. Прыкладаў на першы прыпадак, знач., калі прыметнік падчыркуецца, зь пісьменьнікаў не прыводжу, бо Ваша згаджаешся, што ў поэтычнай прозе падчыркненыя прыметнікі ставяцца па спакменьніку. Прывяду толькі адзін прыклад, дзеля таго што ён агульна народны: аддай якому чарту *лысаму*. На чырвоных лядах, 23. Дык возьмуць чарту *лысаму* служыць, няма ведама каго бараніць. Там-жа, 38. А нідзе ня скажуць *лысаму* чарту, бо падчыркуецца чужасьць гэнага “чарта”.
в) Трэйці прыпадак, калі прыметнік ставіцца па спакменьніку, бывае, здаецца, тады, калі колькі прыметнікаў датыкаецца аднаго спакменьніка.
Зацемка. Што датыкаецца 1-га прыпадку, дык па спакменьніку ставіцца ня толькі прыметнік, але й іншыя часьці мовы, служачыя азначаньням, што й відаць із прыкладаў.
Дзеяпрыметнікі на *-чы, -ны, -ты* і *-лы* (аб апошніх Ваша нічога ня кажаш у лісьце). Ваша кажаш, што першыя тры дзеяпрыметнікі можна ўжываць — і то як компроміс дзеля згоды — адно ў тых прыпадках, калі яны не кіруюць іншыя словы. Шкада, што Ваша не падмацаваў свайго цьверджаньня ніякімі аргумэнтамі, ніякімі моўнымі фактамі, бо не аргумэнтжа тое, што гэтага вымагаў Яз. Лёсік. Даводзіцца гэтых моўных фактаў і аргумэнтаў шукаць мне. Выбіраю з прыкладаў, прыведзеных мною ў “Роднай мове” 114—116 ізь “Сьцежкідарожкі” Зарэцкага, дарма што *я* ня маў наўвеце гэтак пастаўленага пытаньня, калі іх выпісаў із Зарэцкага. Вось яны: Баяцца змачыць **набраклае** *жыцьцёвым сокам* гальлё, 34. Воды Дняпра хаваюцца пад *нізка* **навіслае** вецьце, 59. Ён ледзь выбраў сярод **навіслага** *над вадой* лазовага вецьця месца, 85. Такое даймо робяць старадаўнія **шчарнелыя** *ад часу* патрэты, 85. *Далёка* **запалыя** вочы іскрыліся чорным агнём, 89. Вокал яго вырасла шчытнае роўнае кола **застыглых** *у войстрай цікавасьці* сялян, 120. Абы толькі пачуў каторы касец іх *недалужна* **завязлае** ў траве зьвіненьне, 140. Устрасянулася тое **застыглае**, **закаржэлае**, *што было з Макрынай*, 156. Захроп **асіплы** *ад зморы* паравік, 177. Патрэбны штуршок **застыгламу** *ў заледзянелых хормах* жыцьцю, 174. Пачаў выціраць *густа* **спацелы** твар, 182. мільгнуў **аброслы** *ласкавай расьліннасьцю*

твар, 203. Зь *недалужна й неяк сьмешна* **адвіслай** левай рукой, 287. У лесе пахла… цёплым дыханьнем *пышна* **набраклых** пупушак, 282. У *сьцеражліва* **застыглай** цішы выразна адзначыўся драбны трэск агню, 294. Нешта ціснула *тупа* **навіслым** цяжарам, 297. Тапілі ў цягучых хвалях *парна* **застыглага** ваду, 321. Ня мог знайсьці месца сваім *убога* **асалавелым** вачом, 376.
Адначасна з кіраваньням дзеяпрыметнікам на *-лы* ў Зарэцкага можа пачынацца прыданае праказаньне. Вось прыклады ізь "Сьцежкаў-дарожкаў": Ён пачаў гаварыць… выкідаючы шурпатыя словы, **аброслыя** *мохам* густой хрыпоты, 30. Мужчына з драбным тварам, **аброслым** кароткай *бародкай,* 70. Ён, **абамлелы** *ад страху*, адмахаваўся ад іх ценькім сваім кіёчкам, 82. Усё гэта даходзіла ў сяло ў перакручаным выглядзе, **аброслае** *карой* выдумак, 154. Гэта трупік сіўкі-варонкі, ужо *добра* **загнілы,** 181. У водным бандыту, **аброслым** купкаватай *расьліннасьцяй* — здалося Л. нешта знаёмае, 376.
Падобнае ўжываньне ё ў мове польскай, але нельга дапусьціць польскі ўплыў на Зарэцкага.

Затое, калі падобнае ўжываньне ё ў мове маскоўскай, дык, апіраючыся на адных творах Зарэцкага, нельга давесьці, што тут няма маскоўскага ўплыву, як і нельга давесьці адваротнага, што разгляданая асаблівасьць ёсьць адбіцьцём у Зарэцкага маскоўскага ўплыву. Праўда, прыведзеныя праказаньні робяць даймо чыста крывіцкіх, але даймо можа мыліць. Дык трэба шукаць патрэбных фактаў у іншым месцу. Проф. І. Агіенка (Огієнко) разгледзіў драбязна мову "Крэхаўскага апостала" 1560 г. Апостал гэты перакладзены на тагачасную крывіцкую мову літаратурную, але, відавочна, Украінцам, бо ё ўкраінскія асаблівасьці. Пераклад зроблены з польскага орыгіналу. Агіенка, як звычайна, проста ўважае гэты пераклад за ўкраінскі. Але ня ў гэтым справа, а вось у чым. Агіенка там кажа: "У "Крэхаўскім апостале" дзеяпрыметнік на *-лы* можа пачынаць і прыданае праказаньне, чаго жывая ўкраінская мова ня знае; у "Крэх. апост." падобныя хормы можна ўважаць за полёнізмы". Але там-жа праз колькі радкоў аўтар (Огієнко) дадаў: але напару бачым, што перакладнік "Крэх. апост." пачынае прыданае праказаньне {NB! Бяру назад

“*спусклівы*” = “бреющий”, бо *адпусклівы* мае значаньне склоннасьці. Зусім добра будзе **кашэльны лёт**. Я. Ст. 23.II. [1945]**}** хормаю на *-лы* на’т тады, калі гэтага няма ў польскім орыгінале”. Ясна, калі-б у стара-крывіцкай мове літ. гэтая асаблівасьць была толькі адбіцьцём польскага ўплыву, а не сваёй асаблівасьцяй, дык перакладнік ня ўжываў-бы яе там, дзе яе няма ў польскім орыгінале. Тут я разгледзіў крышку адно дзеяпрыметнікі на *-лы*, бо троху аб іх матар’ялу надрукавана ў “Роднай мове”. Выпісаваў я яго калісь дзеля іншых мэтаў, наймя, каб паказаць, што ў нас дзеяпрыметнікі на *-лы* заступаюць шчэзлыя дзеяпрыметнікі на *-шы* і што вельмі пашырыўшыся. Але подле дзеяпрм. на *-лы* можна думаць, што ў такіх-жа зваротах ужываюцца й дзеяпрыметнікі на *-чы*, *-ны*, *-ты*, асабліва два апошнія.
Аб дачынных займёнах. Тут толькі адно пэўнае *што*, а што да *каторы* й *які*, дык аб іх трэба яшчэ дасьледаваньне.
Што да *карыстаньня із слоўніку* дыялектаў, дык я ўжо пісаў аб гэтым у “Biełar. hołasie” і тут магу адно паясьніць, што дзеля таго што мы ня маем магчымасьці спачатку ўсё дасьледаваць, а потым выбіраць, а мусім дасьледаваць і выбіраць — ужываць адначасна, дык практычна пяршынство цэнтральнага дыялекту ў слоўніку зводзіцца да таго, што калі маем колькі чыста **крывіцкіх** словаў із розных дыялектаў, у тым ліку з цэнтральнага, дык пяршынство маем аддаць слову з цэнтральнага дыялекту.
Індывідуальнае творства я ўважаю канечне патрэбным у слоўніку, але толькі згоднае з духам, із законамі (народнае) мовы і тады, калі чаго няма ў слоўніку народнае мовы.

Дысыміляцыйнае аканьне гэта асаблівасьць дыялекту крывіцкага. Дзеля таго што дысым. аканьне ніколі не было ў мове літаратурнай, яно пад уплывам аканьня недысым. а на’т, з боку маскоўскага оканьня ўвесь час слабла, заціралася й цяперака на’т у сярэдзіне свае прасторы яно ня ўсюды такое моцнае, як было ўперад, а надта пацярпела на сваіх сумежжах із аканьням недыс., а асабліва ў Пскоўшчыне й Цьвершчыне з моваю маскоўскаю, у вялікай меры замяняючыся там на аканьне недысыміляцыйнае. Калі глянуць на цяперашнюю прастору дыс. аканьня вачыма ляіцкімі, дык прастора ягоная меншая за даўнейшую і калі аднак прыгледзецца вачыма

ўзброенымі навукаю, залічаючы да дысым. аканьня й прасторы з дысыміляцай аслабленай (але толькі па цьвярдых сугуках), дык наагул даўнейшая прастора аканьня за паўставаньня нашае старое мовы літаратурнае і цяперашняя аднолькавыя. *Яшчэ болей пацярпела цоканьне* і наша й маскоўскае — з тых жа прычынаў. Дзеля таго цяпер межы цоканьня меншыя за даўнейшыя, а даўней яны ў нас зыходзіліся з дыс. аканьням, будучы асаблівасьцю крывіцкаю. Маскоўскае цоканьне — розных тыпаў — абыймае (гісторычна) ўсю маскоўскую (значыць паўночна-маскоўскую) мову і зьяўляецца орыгінальным маскоўскім, напэўна не паўсталым пад нашым дыялектычным (крывіцкім) уплывам, аб гэтым сьветчаць найстаршыя памяткі. Я ўперад думаў, што й наша, і маскоўскае цоканьне паўстала пад уплывам заходніх Фінаў, але выясьнілася, што гэткі пагляд ня выдзержуе крытыкі, бо цоканьне ёсьць і ў бальшыні (народнай) мовы польскай і ў некаторых іншых мовах славянскіх. Цоканьне, відавочна, паўстала дыялектычна ў пару праславянскую, але з гаворкаў крывіцкіх (непляменных) і польскіх захапіла толькі часьць, што ў мовах бывае нормальнай зьяваю. Крывіцкі дыялект маў, асабліва ў сваёй пскоўскай часьці, і аслабленую яшчэ мае прынамся ў Пскоўшчыне, іншую асаблівасьць падобнага роду — гэта пераход *ś* у *š* (шела) і *ź* у *ž* (жямля), узноў такі супольную з дыялектамі польскімі і хіба моваю кашубскай. Маскоўская мова гэтай асаблівасьці ня знае й ня знала, а гэта згаджаецца з тым, што ў пару праславянскую, як і цяперака, маскоўскія гаворкі ляжалі далей ад кашубскіх і польскіх, чымся крывіцкія. У пару праславянскую крывіцкая мова (дыялект) уся мусіла займаць гэт'кае палажэньне: на поўначы і крышку на паўночным усходзе гранічыла з моваю маскоўскаю (з моваю ільменскіх славенаў, што аднак тады яны ня мусілі жыць ля воз. Ільменя), на ўсходзе із жаднай моваю славянскай не межавала, на паўдні з украінскаю, на паўдзённым заходзе із славенскаю і на паўночным заходзе з кашубскаю.

Тый ёсьць у часьці цэнтр. дыялектаў і ў усім паўночна-ўсходнім. У **тый** нормальны фонэтычны развой із *tъjь*, як і ў прыметніках (малады з *tołdъjь*). Што ў *тый* захавалася *й*, дык гэта дзеля таго, чаму яно захавалася і ў іншых кароткіх формах у цьвярдых канчатках (*мый, рый, вый, крый,* на't *шый і чый*). З маскоўшчынаю *тый* ня мае нічога супольнага, там прыметнікі,

займёны й дзеясловы із *ъјь* маюць *-ой* (*молодой*, *крой*) із *ьјь — ей* (*чей*), а займя *тъ* з падваеньням, як і ў нас дыялектычна, дало *том* (*тътъ > том)*. Затое *той* аднолькавае й аднолькавага паходжаньня з украінскім. *Тый* зусім нашае орыгінальнае.
Прывітаньне бацьком! Жыве Крыўя!
Я. Ст.

[image]
[image]

№ 1 (24) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/02/18**
[image]

Васіль Аўраменка

Літаратура і рынак: лепш пазьней ці ніколі?

Ужо стала звычкай бэсьціць беларускі лад за адсутнасьць рэформаў і свабоднага рынку. Яно й сапраўды, у рынкавым сацыялізьме значна больш “сацыялізму”, чым “рынку”, а ў адсутнасьці свабоднай рынкавай канкурэнцыі шмат каму бачыцца галоўная прычына тутэйшых эканамічных цяжкасьцяў. Што ж тады казаць пра наш літаратурны рынак, дзе сацыялізму яшчэ больш, чым у эканоміцы, а скаргі пісьменьнікаў на бездухоўнасьць ці нежаданьне публікі чытаць іхныя творы — лішняе сьведчаньне жывучасьці “беларускага літаратурнага камунізму”. Думаю, значная частка насельніцтва сумняецца ў наяўнасьці ня толькі рынку, але й самой беларускай літаратуры, не клясычнай (Купалы—Коласа), а сучаснай: папулярнай, сур’ёзнай, забаўляльнай — адэкватнай патрэбам XXI стагодзьдзя. Дзякуй богу, канфлікт вакол СБП нагадаў грамадзтву пра існаваньне саміх пісьменьнікаў, але ж трэба неяк нагадваць і пра іхную творчасьць. Тут, мяркую, скандалы й сэнсацыі — ня самы апошні сродак. Трэба вучыцца жыць у

новых умовах, бо за рынкам эканамічным прыйдзе рынак літаратурны, а там “плач па беларускай літаратуры” нікім пачуты ня будзе. Па вялікім рахунку, нашыя пісьменьнікі за савецкім часам (у 60—80 гады) існавалі ў цяплічных умовах. На Захадзе няма прафэсіі “паэт”, а жыць зь літаратурнай творчасьці могуць сабе дазволіць або сусьветныя знакамітасьці, або вельмі плодныя празаікі. Савецкая ж дзяржава ўтрымлівала немалое войска творцаў самых розных жанраў, бо прыпісвала іх да ведамства агітацыі й прапаганды. Ідэалягічны “парасон” не даваў пісьменьнікам расьці занадта высока й вольна, але гарантаваў пэўныя жыцьцёвыя стандарты (пры ўмове ляяльнасьці да ўлады). Да таго ж таталітарны рэжым пакідаў шмат каму маральнае апраўданьне: ня здолеў, маўляў, таму, што “прыціскалі, не друкавалі, выразалі” і г.д. Спасылацца на гэта маглі ня толькі апальныя ці сапраўды гнаныя, а й проста няздатныя. А што цяпер сказаць у сваё апраўданьне? Няма забаронаў. Кожны вольны пісаць што і як хоча. Але чаму так маркотна, чаму няма радасьці ад новых даляглядаў? Мо для беларускіх творцаў трэба прымус? А каб справакаваць іх на нешта значнае, патрэбны штуршок звонку ці проста — шок ад знадворных абставінаў. (Тады за апошнія 10 год мусіла б зьявіцца нямала геніяльных твораў!) Але таталітарызм рынку яшчэ больш імпэратыўны й усюдыісны, чым таталітарызм камуністычны. Ад свабоды не схаваешся й не апраўдаешся, перад ёй усе голыя й роўныя. А за свой кавалак трэба кожны дзень змагацца. Зубы й локці, кемлівасьць і хіжасьць, талент і цярплівасьць — усё тут мае значэньне й кошт. Жорстка? Нязвыкла? Страшна? Але так наладжаны сьвет і толькі так сёньня можа выжыць і асобны творца, і асобна ўзятая беларуская літаратура.

Будзе несправядліва не згадаць яшчэ адной акалічнасьці — нашым літаратарам даводзіцца канкураваць ня столькі паміж сабою, як з расейскамоўнай літаратурай і культурай. І гэта, бадай, самы складаны момант беларускага літаратурнага жыцьця. Як бы мы ні хавалі галаву ў пясок і ні прыкрываліся лёзунгамі накшталт “Не вместо, а вместе”, рана ці позна пытаньне стане рубам: чыя кашуля бліжэйшая да цела — свая альбо расейская? Адказ у палітыцы й эканоміцы практычна гатовы, неўзабаве ён акрэсьліцца і ў сфэры культуры. Трэба

спакойна, без гістэрыкі й енкаў, грунтоўна й праўдзіва рыхтаваць свае аргумэнты (хай і супраць фактаў!). Што для нас ёсьць беларуская літаратура й культура? Якое месца ў ёй (ці па-над ёй?) займае расейская?
Большасьць беларусаў добра знаёмая з адной і другой, і ўсім відавочна, што расейская культура значна багацейшая. Ёсьць у ёй шмат знаёмага й зразумелага, элітарнага й простага, больш стромкіх вяршынь і глыбокіх прорваў, інтэлектуальных спакусаў і спажывецкіх пастак. Але ў сёньняшнім адкрытым сьвеце ёсьць і значна багацейшыя культуры — амэрыканская, ангельская, кітайская, французская, нямецкая ды інш. І як бы цікава ні было падарожнічаць па іх, жыць лепш у сваёй “хаце”, прыстасаванай да твайго памеру, тэмпэрамэнту й нацыянальных звычак. Адно каб інтэр’ер — культурны ляндшафт — быў сучасным і функцыянальным. Больш важная нават ня колькасьць у ім архаікі й клясыкі, а мас-культуры й авангарду. У гэтым сэнсе беларушчына ёсьць прывабнаю для творцаў, бо тут шмат незанятых нішаў і нескароных вяршынь. Але для спажыўцоў тут ня так “сытна”, як у расейскім культурным асяродзьдзі. Паколькі ж без параўнаньня ніяк не абысьціся (а яно схіляецца ня ў наш бок), то адкрыты канфлікт з расейшчынай цяпер будзе хутчэй шкодны, чым карысны. Для пачатку трэба мадэрнізаваць сваю культуру. Для гэтага, як і ў эканоміцы, трэба не “даганяць” кагось у традыцыйных галінах, а асвойваць найноўшыя галіны ці лепш ствараць свае, арыгінальныя. У дачыненьні да літаратуры гэта азначае пісаць не раманы-“апупеі” ці грувасткія паэмы, а кароткія эсэ-фэнтэзі, показкі, афарызмы, сэрыялы міні-баек, нават рэклямныя скетчы ды песенныя “хіты”. Усё гэта могуць лёгка падхапіць электронныя сродкі інфармацыі, усё гэта можа быць пастаянна на слыху ды на віду і, нарэшце, стаць часткай нашай мовы, культуры, сьвядомасьці. Можна абурацца засільлем рэклямы, прымітывізмам многіх песень ці мэлядрам, усё большым цытаваньнем у пабытовым маўленьні тэлевізійных штампаў, але нельга спыніць наступ новых вартасьцяў ды жыцьцёвых стандартаў, запатрабаваных часам і грамадзтвам.

Будзе несправядліва не згадаць яшчэ адной акалічнасьці — нашым літаратарам даводзіцца канкураваць ня столькі паміж сабою, як з расейскамоўнай літаратурай і культурай. І гэта,

бадай, самы складаны момант беларускага літаратурнага жыцьця. Як бы мы ні хавалі галаву ў пясок і ні прыкрываліся лёзунгамі накшталт “Не вместо, а вместе”, рана ці позна пытаньне стане рубам: чыя кашуля бліжэйшая да цела — свая альбо расейская? Адказ у палітыцы й эканоміцы практычна гатовы, неўзабаве ён акрэсьліцца і ў сфэры культуры. Трэба спакойна, без гістэрыкі й енкаў, грунтоўна й праўдзіва рыхтаваць свае аргумэнты (хай і супраць фактаў!). Што для нас ёсьць беларуская літаратура й культура? Якое месца ў ёй (ці па-над ёй?) займае расейская?

Большасьць беларусаў добра знаёмая з адной і другой, і ўсім відавочна, што расейская культура значна багацейшая. Ёсьць у ёй шмат знаёмага й зразумелага, элітарнага й простага, больш стромкіх вяршынь і глыбокіх прорваў, інтэлектуальных спакусаў і спажывецкіх пастак. Але ў сёньняшнім адкрытым сьвеце ёсьць і значна багацейшыя культуры — амэрыканская, ангельская, кітайская, французская, нямецкая ды інш. І як бы цікава ні было падарожнічаць па іх, жыць лепш у сваёй “хаце”, прыстасаванай да твайго памеру, тэмпэрамэнту й нацыянальных звычак. Адно каб інтэр’ер — культурны ляндшафт — быў сучасным і функцыянальным. Больш важная нават ня колькасьць у ім архаікі й клясыкі, а мас-культуры й авангарду. У гэтым сэнсе беларушчына ёсьць прывабнаю для творцаў, бо тут шмат незанятых нішаў і нескароных вяршынь. Але для спажыўцоў тут ня так “сытна”, як у расейскім культурным асяродзьдзі. Паколькі ж без параўнаньня ніяк не абысьціся (а яно схіляецца ня ў наш бок), то адкрыты канфлікт з расейшчынай цяпер будзе хутчэй шкодны, чым карысны. Для пачатку трэба мадэрнізаваць сваю культуру. Для гэтага, як і ў эканоміцы, трэба не “даганяць” кагось у традыцыйных галінах, а асвойваць найноўшыя галіны ці лепш ствараць свае, арыгінальныя. У дачыненьні да літаратуры гэта азначае пісаць не раманы-“апупеі” ці грувасткія паэмы, а кароткія эсэ-фэнтэзі, показкі, афарызмы, сэрыялы міні-баек, нават рэклямныя скетчы ды песенныя “хіты”. Усё гэта могуць лёгка падхапіць электронныя сродкі інфармацыі, усё гэта можа быць пастаянна на слыху ды на віду і, нарэшце, стаць часткай нашай мовы, культуры, сьвядомасьці. Можна абурацца засільлем рэклямы, прымітывізмам многіх песень ці мэлядрам, усё большым цытаваньнем у пабытовым маўленьні тэлевізійных штампаў,

але нельга спыніць наступ новых вартасьцяў ды жыцьцёвых стандартаў, запатрабаваных часам і грамадзтвам.

Вядома, што традыцыйная мара беларускага пісьменьніка — патрапіць у падручнік. Але сёньня больш актуальная патрэба ня ў “школьных клясыках”, а ў чорнарабочых мас-культуры, майстрох кічу й папсы, адмыслоўцах тэле- ці інтэрнэт-культуры. Менавіта ў іхных руках будучыня і нашае мовы, і самой Беларусі.
А што да рынку, то яго няма (на шчасьце?!) ня толькі ў беларускай літаратуры. Гэта часовая фора, дадзеная лёсам нам, беларусам, і ў палітыцы, і ў гаспадарцы, і ў іншых галінах, але ёй прыходзіць канец. Хто ведае, мо гэта будзе канец ня толькі для сёньняшніх улад, а і для нашых патаемных мараў і спадзяваньняў на лепшае? Ці гатовая беларуская літаратура й культура ўвогуле да самастойнага плаваньня ў адкрытым акіяне касмапалітычнага сьвету? Ці выжыве яна пры рынку, хаця б так, як пры камуністах? Кажуць — лепш пазьней, чым ніколі. Але ці не занадта ўжо позна?
Васіль Аўраменка, Магілёў

[image]
[image]

№ 1 (24) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/02/18**
[image]

Вінцэнт Масіяш-Крывавячэрскі

Шоў я плошчаю аднойчы, ды крывымі вечарамі… (казка-шоў з архетыпамі)

Вельмішаноўныя тыпы з ARCHE, хай будзе пахвалёная Вашая абложная праца на карысьць Бацькаўшчыны, жыве Крыўя, вітаю Вас.
Але ж адначасна маю крыўду вялікую на Вашаць. Рэч вось у чым.
Тыдні два пасьля таго, як я прачытаў у 3-м нумары ARCHE за 2003 г. верш Уладзімера Арлова “Мне прысьніўся Хадановіч”, гэтыя два маладзёны, бы Люцыпар з шайтанам, пачалі да мяне прыходзіць штоначы і шаптаць свае вар’яцкія рымы. Кажуць, пакуль не запішаш, не дамо спаць. Не раўнуючы Вашыя сябры ў “Нашай Ніве”: дык падпісвайся, а то прападзеш! Разладзіўся сон, тонус прапаў, усё нейкія паўявы трызьняцца.
А сёньня дык вось каляднае ігрышча прысьнілася. Стаю я бытта

на нейкім шырокім пляцы, як бы ў Менску. А тут трыптых-шоў — *Шоў я плошчаю аднойчы*. Праваруч — Дубавец і Сокалаў-Воюш, леваруч — Хадановіч. Дубавец, рыхтык як у канцы 80-х, калі ўжо ладна бралася на адраджэньне, раве, як бы на лёгкім падпітку, свой чумацкі хіт “Валэ мае палавуя”, Сокалаў-Воюш ірве струны пад “Цок-цок, цок-цок — вершнікі на конях”. А Хадановіч, у рымскай позе ды пурпуровай тозе, паўляжыць, як у грэцкім сымпозыюме, на бел-чырвона-белым раялі з блакітна-жоўтай дэкай і рэцытуе нешта наўсуцэль шчырае ў атачэньні ўкраінскіх маладзіц, спрэс у блакітна-жоўтым. Вохці мне, гляджу: хто ў міні, хто ў бікіні — усё пры іх, хоць вады напіся. Тут жа і валы пры іх: у ёрмах, з дышлам — усё як мае быць. Адным словам, цоб-цабэ! А яны, значыцца, маладзіцы ды кабеты, да Хадановіча па аўтограф стаяць, як ён тое ў “Arche” расказваў. Яно добра, сабе думаю, тут ня толькі для выдавецтва прыбытак будзе... І ўсё так неяк ідзе гуртам, весела. Мне, старому, трохі і як бы штося, трохі ніякавата, але цікава... А тут раптам скуль ні вазьміся — Уладзя Арлоў з бутлем чырвонага віна пад пахай. Па колеры не то рыоха, не то маладое бажале. А пры Валодзю нейкая не то мулатка, не то цыганка. Схапіла яго за бараду, раскярэчылася, не раўнуючы Лайма Вакуле, ды будзе гаварыць: “Ты дзе маю тальму са сьцеклярусам дзеў, падла? Але Барысаўне падараваў, няйначай, калі ў Каталёніі зь ёй у басэйне боўтаўся?” І гэта гавора чыста па-расейску, як у Максіма Горкага, а пішчыць не раўнуючы армянка. І тут неяк Уладзя зьніякавеў, бо віно ў бутлі неяк так афарбавалася, як вада ў каталёнскім басэйне пасьля Алы Барысаўны, і Вівальдзі зайграў... І Ўладзя зусім зьнік-прапаў, і валы ўжо як бы не валы, а гнілыя кабылы, як у Бадлера. І на гэтым грудзе мяса нейкі дзядзька сядзіць, зьнешне як бы Ханок ці Лучанок. А можа, Бадлер? Лысаваты, але чамусьці з вусамі. А леваруч ад яго — амаль зусім лысы і таксама з вусамі, як бы цыган. І вось гэты як бы цыган гэтаму як бы Лучанку нейкую праваслаўную кляйноту і букет кветак удэчыць хоча. У кветках цэтлік, а на ім напіс вялікімі літарамі па-французску, як у Брэхта для эфэкту ачужэньня: Les fleurs du mal. Гэты як бы Лучанок не ўпіраецца ды так чыста па-французску кажа: “Мэрсі, мсьё лё Прэзідан!” І кажа так акурат зь вялікай літары, рыхтык акадэмік Падлужны!

А тут і Дубавец схамянуўся, падлабуньваецца да прэзыдэнта (зь вялікай літары, канечне) ды й будзе гаварыць: “Я, спадар Прэзыдэнт, не за супрацоўніцтва, а за разумнае спаборніцтва з уладай. Можа, і мне б якую кляйнотку, а то ўсё Дударову ды Фінбэргу...” А тут Хадановіч з Воюшам неяк так, як бы анёлы з воблака, перад Дубаўцом апускаюцца ды шчэраць зубы: “Сяржук, ты ашукаўся: гэта ж Вэрлен. Ён жа таксама лысаваты і з вусамі!”
А тут раптам адкуль ні вазьміся — певень, ды як крыкне, а Дубавец як скікне ды дзікім мэтам зарагоча, як тая Багушэвічава каза паміж Кянам і Смургонямі (гэта, пэўна, з Дубаўца чорт выскачыў), і ўжо хоча на іх воблак-самаплаў ускочыць.
А Хадановіч так неяк абыякава Дубаўца з воблака-самаплава — таўхель! А сам далей так па-сяброўску сьлібізуе: “Ты імкні да Вострае Брамы, ды праз Прагу ляці-ляці...” — ды левым клубом Воюша — штурхель! І гэты разам з Дубаўцом пластуном долу паляцеў.
А Хадановіч сам на воблаку стаіць ды рэцытуе. А потым не раўнуючы вясёлка бел-чырвона-белая да адной з плоймы жоўта-блакітных нахіляецца ды прыцюцьквaецца. А яна такая валавокая-валавокая, ані ня горш за Геру. А ён прыцюцьквaецца да яе гэдак як бы няўласна па-аўтарску (гэта, маўляў, я і адначна ня я! Відаць, пра алімэнты думае...), а сам правым вокам так хітра на месьцічаў касавурыцца, што край пляцу стаяць. І, значыць, выводзіць так рэзыгнавана-рэзыгнавана: “Эх, пакласьці цябе на раяль бы...”. А тут іншыя, якім ён яшчэ свой напіс не паставіў, так жаласна-жаласна падводзяць: “І мяне, і мяне, і мяне...” Але Хадановіч, не раўнуючы Генадзь Пашкоў у апошнім цыкле вершаў, зьвяртаецца ўжо да прыцюцьканай абранкі ды адмаўленча-вызвольна туруе: *“Традыцыйна ар’ентава-ны/ вазьму толькі з сабою цябе/ і згублюся з табой у тумане/ цоб-цабэ, цоб-цабэ, цоб-цабэ...”* А жоўта-блакітная абранка ўжо клянецца бел-чырвона-беламу Хадановічу ў вернасьці ды цытуе ягоную перадапошнюю страфу з “Альбарутэнікі”: *“падбіраць беларускія словы/ і крычаць іх адно табе/ зразумелыя да паловы/ і ня ўсім жыхарам эрбэ...”*
І вось на Хадановіча, як ён ужо так зусім аглабельна за дышла трымаўся, накаціліся сьвежыя радочкі. І ён гэтыя радочкі-рымачкі разьвітальна, адным дыхам, у навакольле хрыплавата

выгукнуў, як бы крумкач у Вольгі Бабковай: *“Я паехаў у Кыів па словы!”*. Маўляў, мяне тут ня тое што грамадзяне — палова паэтаў эрбэ не разумее. Я тут не раўнуючы Чайльд Гарольд пачуваюся...

А маёю рукою ў сьне як бы нехта водзіць. Дзе мая сьветлай праўды сіла дзелася? І радкі неяк так як бы ў мяне не з-пад сьціла, а з-пад коўдры — на каляндар, што над ложкам вісіць, — толькі шпок, шпок! Запісалася аж пяць слупкоў. Так зрабілася мне вусьцішна-вусьцішна. А потым тыя аматаркі аўтографаў загаласілі, як па ўміручаму, і ўсё чысьценька змоўкла, як у труне. А самі такою як бы хаўтурнай вяткаю, як бы ў вырай, пацягнуліся за арбою і падняліся клінам у паветра... А Хадановіч з гэнай аднэй у арбе паехаў...
Тут зноў як бы певень другі раз (ці, можа, ужо трэці?) пракукарэкаў, і я прачнуўся. Гляджу: на вялікім календары, што ў мяне над ложкам, чорным маркерам пяць слупкоў напісаныя. Неяк вусьцішна стала. У мяне дома маркера ніколі не было. Ды і рука не мая. Я ў вершах кожны радок зь вялікай літары пачынаю. А тут яшчэ глядзь я на стол — а там... маркер з аб’едзеным каўпачком, а пад сталом — тазік з вадой і пустая пляшка з-пад кагору, а на ёй цэтлік з чыста французскім напісам: Absinthe. От, думаю, мне яшчэ абсэнту не хапала — замятуць! Плюнуў цераз плячо ды кажу: “Згінь, прападзі, дух шатанскі!” І, дзякаваць Богу, усё прапала. А вершы засталіся. Пытаюся ў жонкі, што б гэты сон мог значыць. Каб чаго дрэннага не было: гэтыя ж рымы на маім каляндары як той жыдоўскі мэнэтэкэль зьявіліся. Можа, будзе вайна ў Іраку ды нашых хлопцаў ваяваць за Хусэйна пашлюць? Яна кажа, супакойся, сёньня нядзеля, а ў нядзелю сны добрыя сьняцца і наўсуцэль спраўджваюцца. Думаю, сон неблагі. Утворыцца Балта-Чарнаморскі Зьвяз, з элемэнтамі веча (зважай: пляц, месьцічы, валы...), Зьвяз будзе прэзыдэнцкім *прэдуратам* — прэзыдэнт і прэзыдэнтка, адтуль і ад нас. Прэзыдэнцкае кіраваньне будзе моцна абрэзаным, абмежавана вечам: ты ж маракуй, усяго два дні да Абразаньня Гасподняга засталося. Першы супрэзыдэнт з нашага боку будзе мужчына, такой паставы, як Арлоў ці сам Хадановіч. Невыпадкова ж Хадановіч на бел-чырвона-белым раялі з блакітна-жоўтай дэкай, як на стальцы, транаваў-тураваў, не раўнуючы Кірыла Тураўскі. Але

супрэзыдэнт будзе абавязкова творчай прафэсіі, як во ў чэхаў стаў Гавэл. І яшчэ ведаеш, кажа мне жонка, на Ўкраіне нечакана вялікай моцы набярэ жаночы рух (во ўзгадай гэтых дзявок каля раяля ды на арбе), і зь іхнага боку першай партнэркай нашага супрэзыдэнта будзе кабета. Во, можа, тая іхная Дзьвінка Маціяш. Хадановіч кажа, яна добры рухавік... Да таго ж, і прозьвішча ейнае — ого! Этымалягічна на Мацея ці аж на самога Майсея пацягне. Узгадай Майсея: хто сваіх жыдоўскіх людцоў з палону вывеў?
Вось так жонка крыху супакоіла. Авохці мне, самае галоўнае забыўся — вершы. Вось яны: слова ў слова і ў правапісе аўтара. І, ведаеце, людцы вы мае архіўныя, усё ж баюся, каб чаго дрэннага не было, каб больш гэтыя рымы ноччу не прыходзілі...

Я паехаў у Кыів па словы
зразумелы я да паловы
нат ня ўсім паэтам эрбэ
зноў паеду ў кыів па словы
на скрыпучай валовай арбе

там душою і целам жыву я
там зьбіраю mes fleurs du mal
бо тамтэйшы майдан хвалюе
не раўнуючы place pigalle

там на пляцах плазам дзяўчаты
на раялях зьнямоглыя сьпяць
сярод альбаў маіх ды сырвэнтаў
як пшаніцу прадаўшы храпяць

гэй ты нэнько мая украіна
я андрэ казанова з эрбэ
прытулі крывічоўскага сына
да сябе да сябе да сябе

доўнт край фо мі краю мой родны
гуд бай браначка маці-эрбэ
наўсуцэль я паэта свабодны

цоб-цабэ цоб-цабэ цоб-цабэ
Заўвага аўтара:
Цоб! (укр. разм.) — вокліч, якім накіроўваюць валоў налева (гл. Лемцюгова В. П. Українсько-білоруський словник. Мінськ: “Вышэйшая школа”, 1980. С. 654.).
Вінцэнт Масіяш-Крывавячэрскі
У ноч 12. 01. 2003 г. юл. кал.,
два содні перад Абразаньнем Гасподнім

[image]
[image]

№ 1 (24) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/02/22
[image]